# Маладосць

**1**

**Штомесячны літаратурна-мастацкі**
**і грамадска-палітычны**
**ілюстраваны часопіс**

**(638) СТУДЗЕНЬ**

**Выдаецца з 1953 года**

Галоўны рэдактар
**Раіса БАРАВІКОВА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:**
**Наталля АЎДЗЕЕВА,**
**Алесь БАДАК** (намеснік галоўнага рэдактара),
**Вадзім ДРАЖЫН, Алеся ІНАЗЕМЦАВА,**
**Анатоль КРЭЙДЗІЧ, Ірына КУЗНЯЦОВА,**
**Юрый ЛАТЫШ, Серж МІНСКЕВІЧ,**
**Таццяна СІВЕЦ, Павел ТАТАРНІКАЎ,**
**Андрэй ФЕДАРЭНКА, Віктар ШНІП**

**Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова**
**«Літаратура і Мастацтва», г. Мінск**

## У НУМАРЫ:

**Р. БАРАВІКОВА.** Моладзь выбірае літаратуру?! . . . 3
**Вольга КОВАЛЬ.** Мелодыі лятункаў залатых... Вершы . . . 4
**Алесь БАДАК.** Апавяданне-2007 . . . 6
**Альгерд БАХАРЭВІЧ.** Пагроза. Сустрэнемся пасля адзінаццаці. Апавяданні . . . 7
**Анатоль БУТЭВІЧ.** Пацалунак. Чубатая. Варонін выбранец. Апавяданні . . . 20
**Алеся ЛАПІЦКАЯ.** Вечар на падаконні. Валік. Апавяданні . . . 33
**Андрэй ЛАТЫГОЛЕЦ.** Бялявая дзяўчына. Апавяданне . . . 45
**Юры СТАНКЕВІЧ.** Вельмі смачная рыба фугу. Мільярд удараў. Апавяданні . . . 48
**Анатоль ЗЭКАЎ.** Руды кот. Апавяданне . . . 60
**Зміцер ВІШНЁЎ.** Малюю восеньскіх жырафаў . . . 62
**Валянціна КОЎТУН-ЯСЕЛЬДА.** Крыж Ігуменні.
Драматычная містэрыя ў дзвюх частках . . . 65
**«ПАДАРЫ часцінку дабрыні...»** Вершы. Студэнцкі праспект . . . 95
**Георгій МАРЧУК.** Давыд-гарадоцкія каноны . . . 100
**Ала РАЛЬКЕВІЧ.** «Ды толькі песня не знікае...» Вершы . . . 117
**КАЛЯНДАР «Маладосці».** Студзень . . . 120
**Аксана БЯЗЛЕПКІНА.** Сучасны чалавек Адама Глобуса . . . 121
**Ірына КЛІМКОВІЧ.** У маладых свой Шэкспір, або Дыялогі ў тэатральнай гасцёўні . . . 127
**Алесь БАДАК.** Важкі набытак . . . 131
**Мікола МІРШЧЫНА.** Аршанскі мерыдыян . . . 134
**Ала НІКІПОРЧЫК.** Скрыжалі мрояў залатых... . . . 138
**Андрэй МАЛАХОЎСКІ.** Экспрэс «Бярэсце—Брэст» . . . 141
**Аляксей ЧАРОТА.** Папытай у кнігарні . . . 144

***ДА ВЕДАМА ЧЫТАЧОЎ І ПАДПІСЧЫКАЎ:***

***на I паўгоддзе 2007 года працягваецца падпіска.
Льготная для ўстаноў Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Ведамасны льготны індэкс — 00731;
падпісная цана на 1 месяц — 5200 руб.***

***Індывідуальная падпіска. Індэкс — 74957. Цана на 1 месяц — 4700 руб.
Ведамасная падпіска. Індэкс — 749572. Цана на 1 месяц — 6300 руб.***

Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютэрная вёрстка
*Святланы СТАРАВЕРАВАЙ*

Стыльрэдактар *Марыя ГІЛЕВІЧ*

Рэдакцыя не ўступае ў перапіску з чытачамі, не рэцэнзуе і не вяртае дасланыя рукапісы.
При перадруку спасылка на «Маладосць» абавязковая.

Адрас рэдакцыі: 220034, Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефон: 284-79-85.

Падпісана да друку 05.01.2007. Фармат 84×108 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Умоўн. друк. арк. 15,12 + 0,42 (укл.). Ул.-выд. арк. 15,25 + 0,66 (укл).
Тыраж 3018 экз. Зак. 54.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79.

Часопіс «Маладосць» зарэгістраваны ў Дзяржаўным камітэце РБ па друку. Рэг. нум. 9.
© «Маладосць», 2007.

**Заснавальнік — Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь**



# МОЛАДЗЬ ВЫБІРАЕ ЛІТАРАТУРУ?!

*Неяк сама па сабе з'явілася такая назва для гэтых маіх кароткіх нататкаў. З аднаго боку, безумоўна ж, у вольны час моладзь, у каго ёсць такая магчымасць, прынікае да сваіх камп'ютэраў. І большасць, вядома, не для таго, каб пазнаёміцца там з навінкамі літаратуры. Ужо нават прыжываецца ў грамадстве думка: а ці патрэбны сёння кнігі, калі ўсё, што заўгодна можна знайсці ў камп'ютэры?! Думка, безумоўна ж, памылковая, таму што не-не ды і прыйдзе ў нашу рэдакцыю ліст накшталт гэтага: «Пішa вам чытачка з вёскі Маркавічы Гомельскага раёна. Мяне завуць Белкіна Марыя. Мне 14 год. Вучуся ў 8-м класе Маркавіцкай школы. Я паважаю ваша выданне і з задавальненнем чытаю. Дзякуй вам за вашу працу. Многія публікацыі я выкарыстоўваю на ўроках беларускай літаратуры і атрымліваю за гэта вышэйшыя балы. Я вельмі люблю пісаць вершы... і некаторыя з іх дасылаю вам. Бяру нумары часопіса «Маладосць» у бібліятэцы, а ці ёсць яны ў продажы?..»*

*І вось тут хочацца паразважаць. А ці многія карыстаюцца камп'ютэрам? Марыя Белкіна аддае перавагу нашай «Маладосці», і яна, вядома ж, не адна, хто чытае наш часопіс. Пра гэта сведчаць вершы старшакласнікаў, якія мы атрымліваем. Наша выданне ведаюць у школах, але не ў кожнай школьнай бібліятэцы, на жаль, яно ёсць. У маркавіцкай школе парупіліся, за гэта вялікі дзякуй! Марыя пытаецца, ці можна набыць часопіс у кіёсках Саюздруку? Адказ яна знойдзе на гэтай старонцы: нельга! Мы не трапляем у рэспубліканскі розьнічны гандаль. Магу параіць дзяўчынцы выпісаць «Маладосць», але тут жа ў мяне самой узнікае вялікае пытанне. Выпісаць ёй часопіс павінны бацькі, таму што ў яе яшчэ няма ўласных сродкаў. А ці змогуць яны гэта зрабіць, маю на ўвазе фінансавы бок жыцця? Таму з гэтай жыццёвай формулы вынікае адно-адзінае: трэба, каб у кожнай школьнай бібліятэцы было літаратурнае выданне — і «Маладосць», і «Полымя», і «ЛіМ»... І не толькі для таго, каб дзеці атрымлівалі па роднай літаратуры вышэйшыя балы (хоць гэта і цудоўна!), але і для развіцця іх уласных талентаў. На ўзорах вучацца майстэрству.*

*Калісьці, у апошнія дзесяцігоддзі мінулага стагоддзя, у нас быў дэфіцыт на ўсё, уключаючы і добрыя кнігі. Але ўсё цячэ, усё мяняецца. Часы дэфіцыту змяніў час выбару. Выбірай, што хочаш, на што ляжа вока, абы грошы былі! Гэта тычыцца і кніжнага рынку: на любы чытацкі густ можна набыць кнігу. І вось тут зноў пытанне: выбраць можа чалавек, які сам зарабляе грошы. Падлетак, ці нават той жа студэнт у гэтым плане цалкам залежыць ад фінансавых сродкаў бацькоў, і задаволіць ягоны выбар можа толькі бібліятэка. Але, калі параўнаць нашы тыражы з колькасцю бібліятэк, міжволі зробіш сумныя высновы. Атрымліваецца, што мы, дарослыя, самі штурхаем падлеткаў, каго да камп'ютэра, каго да тэлевізара, а каго яшчэ куды-небудзь...*

*Нярэдка кажуць, што ўсё новае — гэта добра забытае старое. Дык давайце прывучаць нашых падлеткаў да такога новага, каб, прыйшоўшы ў бібліятэку, яны наведалі і камп'ютэрную залу, і залу з кніжнымі паліцамі, дзе стаіць не толькі класіка, а і шмат чаго з сучаснага літаратурнага працэсу, уключаючы і штомесячныя літаратурныя выданні! Пагадзіцеся, камп'ютэр — для рабочага моманту, а кніга — для душы... Самае каштоўнае ў чалавеку, усе нашы памкненні і жаданні ідуць з душы, і кніга яе выхоўвае. А, што да «Маладосці», дык пра ўсе свае рэдакцыйныя планы і задумкі, пра новыя рубрыкі і творы, якія намерваемся друкаваць, мы шырока расказвалі ў самых розных перыядычных выданнях падчас нядаўняй падпісной кампаніі. Таму мне застаецца адно: сказаць вялікі дзякуй усім, хто лічыць нас сваім выданнем і застаўся з намі, а дакладней, з сучаснай беларускай літаратурай і ў новым 2007 годзе.*

*З найлепшымі пажаданнямі!*

Ф. Баравікова.



*Вольга КОВАЛЬ нарадзілася ў 1980 г. у г. Бабруйску. У 1998 г. скончыла сярэднюю школу з залатым медалём. У 2003 г. скончыла музейнае аддзяленне гістарычнага факультэта БДУ. Працавала ў Літаратурным музеі Янкі Купалы, з 2003 г. — аспірантка кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта. Выйшлі з друку зборнік «Пасля», кніга вершаў «Пацалунак Эола». Друкавалася ў газетах «ЛіМ», «Наша Ніва», «Бабруйскае жыццё», літаратурна-мастацкім альманасе «AVE».*

Вольга КОВАЛЬ

# МЕЛОДЫЯ ЛЯТУНКАЎ ЗАЛАТЫХ...

## У ВАНДРОЎКУ

Я збяру ў вандраванне
Дзесяць тысяч лепшых слоў
Да наступнага спаткання,
Калі будзем побач зноў.

І няхай бароняць словы,
Гэта лепшы мой прысуд,
Як нястомныя анёлы.
Я цябе чакаю тут.

* * *

Мае сто слоў — у вершах пра каханне,
Шчаслівы позірк — толькі аднаму.
І за яго бывае хваляванне,
Яму пісала, ім цяпер жыву.

Усе ўзлёты падзялю спакойна,
Паразы без адчаю падзялю,
Ды пачуццё маё расце няўмольна.
За гэта ўсё аддам... і аддаю.

Мае сто рухаў — цёплая пяшчота.
Я моцная, бо дадзена кахаць,
А сэрца забівае адзінота,
Яно павінна шчасце адчуваць.

* * *

Я тая, хто прыходзіць зрэдку,
Прыносіць холад у пакой,
Пакіне брудную сурвэтку
І сыдзе, быццам бы жывой.

Я тая, хто шукае сны,
Хто блытае жыццё і мроі.
У снежні чуе пах вясны,
Ахвяры для мяне — героі.

Я тая, хто палюе днём,
А па начах ужо не спіць.
Мой бедны, стомлены анёл
Не паспявае бараніць.

* * *

Яна тут болей не жыве,
Сышла яна зусім раптоўна.
І толькі постаць у акне,
Здаецца, прамільгне ўсё роўна.

Яна тут болей не жыве,
Яна знікае назаўжды,
І было «так», ды стала «не»,
А шчасце раптам — знак бяды.

Яна тут болей не жыве...

* * *

Калі скончацца вершы,
я буду чытаць табе прозу.
Калі скончыцца ноч,
абдыму цябе сонечным ранкам.
Я вядзьмачка твая,
і не бачыш у гэтым пагрозы,
Будзеш лепшым маім і апошнім,
напэўна, каханкам.

Калі скончацца словы,
я буду глядзець табе ў вочы,
Толькі бойся маіх
дзівавіжна-зялёных вачэй.
Наша неба палае,
звіняць нашы доўгія ночы...
І ратуйся ў няпамяць,
ратуйся, мой любы, хутчэй...

* * *

Сусед рабіў рамонт занадта гучна,
Шматпавярховы дом — звычайны
інтэрнат.
Мы навучыліся глядзець у вочы штучна,
І прывітанні мы даўно ўзялі напракат.

Наступны дзень падобны на мінулы.
Пакойчыкі павінны падзяляць,
А гаспадар нервовы і пануры
Увечары ідзе адпачываць.

* * *

Гучыць мелодыя знаёма.
Паслухаю чарговы раз,
Як аб’яднала босанова
Мой верш і твой шыкоўны джаз.

Я танчу, можа, як звычайна,
Мне не патрэбна гледачоў.
І абдымаю віртуальна
Магічнасць музыкі і слоў.

* * *

Вітаю дрэннае надвор’е,
За кубак кавы — паўжыцця.
Дзе казка, мроя? Дзе прымор’е?
І мора шчасця, пачуцця?

На небе сёння адпачынак,
Даждамі восень плача зноў.
Нязначны свой раблю прыпынак,
Мяняю вобразы сяброў.

**РАНІЦА**

Абдымае пакой паступова
І з’яўляецца першы прамень.
Быццам здраднік, ён невыпадкова
Нашу ноч памяняе на дзень.

Надыходзіць насупны світанак,
Мы пароўну падзелім яго,
Мой каханы, а, можа, каханак,
Першы шум, прахалоду, святло.

* * *

Калі восень марудна міне,
Калі будзе нарэшце халодна,
Вельмі ціха прыйду да цябе
Развітацца аднойчы самотна.

Самы блізкі і самы далёкі,
Незвычайны мой небакрай.
Нават побач са мной адзінокі.
Пакахай мяне... Пакахай!

# Апавяданне-2007

*Апавяданне — жанр своеасаблівы. Лічыцца, што масавы чытач больш аддае перавагу аповесці альбо раману, нават з чыста прагматычных меркаванняў: калі ён ужо вырашыў набыць кнігу, то падавай яму твор, каб перажыванняў хапіла не на адзін вечар ці, прынамсі, не на адну паездку ў метро. Адным словам, аповесці і раманы маюць, у пэўным сэнсе, тую ж перавагу перад апавяданнем, што і тэлесерыялы перад кароткаметражным фільмам. Але, дзякуй Богу, чытач бывае розны, і не перавяліся яшчэ кніжныя гурманы, што могуць па-належнаму ацаніць усе тонкасці і магчымасці гэтага жанру, які патрабуе ад аўтара віртуознага валодання мастацкім словам. Невыпадкова ж ён лічыцца не толькі адным з самых вытанчаных, але і адным з самых складаных, у сэнсе напісання, жанраў. І нават некаторыя класікі, стварыўшы выдатныя ўзоры аповесці альбо рамана, баяліся яго таемных глыбінь.*

*Тым не менш, гісторыя беларускага апавядання мае багатую гісторыю, і многія імёны айчынных творцаў упісаны ў яе залатымі літарамі.*

*Прынята лічыць, што першым у нас да гэтага жанру ў сярэдзіне XIX стагоддзя звярнуўся Адам Плуг. Праўда, захавалася толькі адно яго апавяданне «Кручаная баба», асновай для якога паслужыў бытавы вясковы анекдот. Аднак першы сапраўдны росквіт беларускага апавядання адбыўся ў 20-я гады XX стагоддзя, калі ў літаратуру прыйшлі альбо ўжо актыўна працавалі ў ёй Якуб Колас, Максім Гарэцкі, Цішка Гартны, Міхась Зарэцкі, Кузьма Чорны, Платон Галавач, Міхась Лынькоў, Ян Скрыган...*

*Нешта падобнае адбылося, пачынаючы з другой паловы 50-х, калі замест схематызму, спрошчанасці, неўтаймаванага аптымізму ў літаратуры з'явіліся шчырасць, надзённасць, імкненне (і магчымасць!) шукаць новыя тэмы, новых герояў. Адзін за адным у прозу прыходзілі Іван Навуменка, Іван Шамякін, Васіль Быкаў, Аляксей Кулакоўскі, Уладзімір Дамашэвіч, Міхась Стральцоў, Іван Пташнікаў, Вячаслаў Адамчык, Уладзімір Караткевіч, Іван Чыгрынаў, Барыс Сачанка...*

*Калі ў 60-я гады ў моду ўваходзілі не проста раманы, а цэлыя трылогіі (і не толькі тры-), калі празаік, які ў сваім творчым актыве не меў ніводнай аповесці, а не тое што рамана, лічыўся маладзёнам, — тады наўрад ці хто з пісьменнікаў мог прадбачыць: пройдзе якіх сорак гадоў, і рэдакцыі літаратурна-мастацкіх выданняў востра адчуюць на сабе недахоп твораў (прынамсі, цікавых твораў) буйных празаічных жанраў. Прытым, што прафесійнымі літаратарамі сёння ў нас сябе называюць, па сціплых падліках, больш чым 800 чалавек. Як бы там ні было, але беларускае апавяданне на сённяшні дзень, сапраўды, адзін з самых папулярных жанраў сярод аўтараў. І, карыстаючыся момантам, яно пачало актыўна пашыраць свае межы. Традыцыяналісты і наватары аднолькава занятыя актыўнымі пошукамі: хто — новых тэм і сюжэтаў, хто — новых формаў.*

*Увазе чытачоў прапануецца толькі невялікая частка таго, што апошнім часам з'явілася ў партфелі «Маладосці». Але і адабраныя для студзеньскага нумара часопіса апавяданні, думаецца, у значнай ступені адлюстроўваюць тую разнастайнасць, якая апошнім часам назіраецца ў гэтым жанры — такім няпростым і такім цікавым.*

***Алесь БАДАК***



Альгерд Бахарэвіч нарадзіўся ў 1975 годзе ў Мінску. Аўтар кніг «Практычны дапаможнік па руйнаванні гарадоў» (2002), «Натуральная афарбоўка» (2003) і «Ніякай літасці Валянціне Г.» (2006).

Альгерд БАХАРЭВІЧ

# ПАГРОЗА

*Не дайце* яму падняцца з месца!

Позна.

Вось ён, Калтуноў, выходзіць з тралейбуса: глядзіць, ці на месцы кашалёк, тэлефон, ключы, супакоена робіць некалькі рашучых крокаў і потым зноў, нібы папярэдняя праверка магла стацца падступным сном, спыняецца, устрывожана тыцкае сябе пад рэбры, ляпае па грудзях, гладзіць маланку на сумцы. На ім скафандр кітайскай вытворчасці, раздзьмуты ва ўсе бакі так, што Калтуноў не бачыць, што ў яго пад нагамі. Да дому, да ягонага пад’езда, над якім і дзень і ноч гарыць рэдкім хваравітым святлом жоўтая лямпа, адсюль ужо зусім недалёка. Прабегчы пад ліхтарнымі сузор’ямі, абагнуць школу і спусціцца па адпаліраванай санкамі лесвіцы. Ён нырае ў шалік і мкне наперад між купак бітай ледзяной гонты.

Колькі ён сябе памятаў, яму заўсёды хацелася жыць паблізу ад метро. Так блізка, каб вушы не паспявалі замерзнуць, пакуль дойдзеш ад пад’езда да станцыі. Аднак у кратовых гульнях, якімі цешыліся апошні час гарадскія ўлады, для Калтунова месца не знаходзілася. Варта было яму пакінуць бацькоўскі дом, як запаветны пункцір на схемах мэтрапалітэна прарос менавіта там, дзе месціўся родны мікраараён. Каля цешчынай сталінкі, куды яму давялося перабрацца, зрэдчас таксама нешта капалі — але толькі затым, каб выдастаць з-пад зямлі якое-небудзь рэха вайны. А там, дзе яны з жонкай цудам прыдбалі ўрэшце ўласны кут, метро сапраўды мусіла неўзабаве з’явіцца — праз паўстагоддзя.

— Каля метро? — пахмурнела маці. — У свой час мы з тваім бацькам марылі не пра дзе, а пра што!

Калтуноў моршчыўся і адным глытком дапіваў гарбату. Такіх, як маці, не пераканаеш. Тыя, хто нарадзіўся ў камуналцы, у высакароднай паваеннай нішчымніцы, да скону будуць загрувашчваць кватэру мэбляй, ратуючыся такім чынам ад страшнага, амаральнага лішку прасторы, хлеб у іх заўжды будзе ўсяму галава, нават дыетычны, а запасу запалак у кладоўцы хопіць да траўня 2045 года.

Лямпа над пад’ездам вяла адганяла ад сябе цемру. Калтуноў са спадзяваннем зірнуў на вокны сваёй кватэры і расчаравана затупаў нагамі, абтрасаючы снег. Жонкі зноў

не было дома, і хаця ён дакладна ведаў, дзе яна і з кім, у Калтунова з’явілася такое адчуванне, што яго жорстка падманулі. Дарога з працы дахаты праз увесь горад, зімовы і няветлы, з трыма перасадкамі, была нялёгкай — ён уяўляў сябе героем-палярнікам, які ледзь не загінуў сярод таросаў, і вось ён дома — а навошта?

Паскардзіцца на сваю закінутасць ён не мог. Кватэра была абачліва запраграмаваная на абагаўленне Калтунова: яшчэ цёплая вячэра ля мікрахвалевай печкі, вымыты посуд, на падлозе ні пылінкі, у лазніцы сохне ягоная любімая кашуля. Калтуноў з апетытам паеў, зрабіў сабе каву, падумаў і дадаў туды некалькі кропляў каньяку, уключыў тэлевізар і стаў глядзець у акно. Нязгасная лямпа над пад’ездам ледзь даставала сваім святлом да тратуара. У доме на другім баку вуліцы, на першым паверсе, жонка бавіла ягоны, калтуноўскі, вечар.

З музыкантам Лісіцам яна пазнаёмілася ледзь не на наступны дзень пасля іхніх улазінаў. У тое, што жонка яму здраджвае, Калтуноў не верыў — хутчэй яна задавольвала з гэтым грубаватым і гаваркім вісусам нейкія свае духоўныя інстынкты: такая фармулёўка Калтунову не зусім падабалася, але ў глыбіні душы ён разумеў, што так яно і ёсць. Спачатку яна пачала забягаць да Лісіцы на чвэрць гадзіны пасля працы, потым стала траціць на яго выхадныя, падкармліваць з сямейнага стала — то катлет занясе, то кавалак пірагу з разынкамі, то супу ў тэрмасе. Аддала старыя джынсы Калтунова, і куртку джынсавую, яшчэ і бляшанку згушчонкі ў яе загарнула. Паводле слоў жонкі, Лісіца расплачваўся хатнімі канцэртамі, а граў ён непараўнальна — зноў жа такі, Калтунову паслухаць выкананне генія-самотніка яшчэ не даводзілася. Аднойчы Калтуноў не вытрымаў, выказаў сваю крыўду, і хаця ні ў чым жонку не падазраваў, дазволіў сабе розныя намёкі... Выслухаў ён у адказ шмат: пра мастацтва, чалавечнасць і паталагічную рэўнасць, пра сваю прыземленасць і абыякавасць, пра чужую бяду. Жонцы пашанцавала: размова гэтая прыпала на тыя крытычныя дні, калі на Калтунова найшла прыкрая экзістэнцыяльная ангіна — хто з нас не хварэў на такую — дзякуючы ёй, за вырашэнне любой праблемы ён браўся не з таго канца; вось і тады Калтуноў паразважаў да раніцы і прыйшоў да высновы: а і праўда, чаго гэта я? Няўжо стаў настолькі стандартным, што не магу адрозніць любоў да бліжняга ад пошлага адзюльтэра? Так Лісіца стаў для Калтунова кімсьці кшталту прыёмнага сына.

Бачыць сыночка, аднак, Калтунову зусім не карцела. Жонка пра гэта ведала і Лісіцу прывяла да іх толькі аднойчы, на стары Новы год. Калтуноў назіраў за ім з гідлівай зайздрасцю. Лісіца то бесперапынна пазяхаў, паныла пазіраючы на двор, то раптам пальцы ягоныя пачыналі імпэтны бег па нябачных клавішах на кухонным стале, і ногі ў калтуноўскіх тапачках мясілі дыванны ворс. Відавочна, іхні госць усяго толькі бессаромна гуляў у беднага генія, прынамсі, у той вечар — хто ведае, можа, у сваёй аднапакаёўцы Лісіца выглядаў больш шчырым. Жонка ж старанна ўдавала, што яна таксама чуе тую музыку, якую прынёс у адрамантаваную нядаўна кухню Калтуновых аб’ект яе спачування — прынёс быццам бы неўпрыкмет, разам са слотай на распухлых чаравіках. Так яны сядзелі і нячутна гралі ў чатыры рукі, а Калтуноў вырашыў: плюну і буду есці індыка. Не чуў ён ніякай музыкі. Чуў, як сігналізацыя спрацавала ў суседавай машыне, як прачнуўся прастылы дух халадзільніка, як радыё мармыча, і патрэсквае свечка за віннай бутэлькай. А музыкі не было.

— І ўсё ж вы, журналюгі, толькі абслуга, — казаў Лісіца праз паўгадзіны, жуючы мяса Калтунова. — Нельга вас называць творчымі людзьмі. Нехта грамадзян чабурэкамі корміць, нехта ў пральнях працуе, нехта інфармацыяй забяспечвае. Бытавое абслугоўванне.

Калтуноў тут жа пакрыўдзіўся; ён ужо даўно ўпотай занатоўваў тое-сёе, марыў раман напісаць. Не цяпер, вядома, а гадоў так праз дзесяць. Жонка заўважыла, абві-

лася вакол шыі, лізнула мімаходзь у вуха. «Толькі дзеля яе», — зміры́ўся Калтуноў і выціснуў з сябе:

— А вы чым на хлеб зарабляеце, дазвольце пацікавіцца?

Чамусьці ён з самага пачатку размовы з Лісіцам узяў такі тон, і не ведаў, як яго змяніць.

— Гофман вось падзяляў усіх людзей на музыкантаў і немузыкантаў, — таямніча прамовіў Лісіца, накладаючы сабе капусты Калтунова, і потым дабрадушна засмяяўся. — Ну, ведаеце, у чэргах па месца ў тралейбусе раніцай не стаю. Дзесяць верных слуг... Мае пальцы не даюць мне памерці з голаду.

Жонка паглядзела на пальцы Лісіцы і ледзь прыкметна пасміхнулася. Калтуноў кісла хітнуў галавой. Вечар ніяк не хацеў заканчвацца.

— Гэтая ваша нязгасная лямпа — проста лухта, — насмешліва казаў Лісіца, дапіваючы віно. — Я вось ведаў адну цётку — дык у яе электралічыльнік круціўся ў адваротны бок. Уяўляеце, колькі вінен ёй энерганагляд!

Жонка апранулася праводзіць Лісіцу, яны хацелі яшчэ пазабаўляцца каля школы з петардамі, выпіць шампанскага на марозе — звалі з сабой і Калтунова, але ён пайшоў спаць. «Божа мой, як гэты Ліска мне надакучыў», — пазяхнула жонка, вярнуўшыся, і сонны Калтуноў са злаславай радасцю закашляўся. А назаўтра ён зноў бавіў вечар у адзіноце.

Прыгадваючы ўсё гэта, Калтуноў так расхваляваўся, што пайшоў да шафы па цыгарэты. Яны з жонкаю дазвалялі сабе зрэдку такое задавальненне. Адчыніў фортку, запаліў і няўмела скінуў попел у кафейную гушчу. Акно Лісіцы пагасла, і тут жа святло ў ім запалілася зноў.

Потым быў жа яшчэ візіт у адказ. Калтуноў шчыра ўразіўся, наколькі бедна жыў жончын навязлівы сябра. У Лісіцы не было нават пліты. «Як жа вы...» — здзіўлена выцягнуў шыю Калтуноў, а Лісіца махнуў стомлена рукой: «Я дома рэдка харчуюся... А калі што, у суседкі кіпеню можна ўзяць і — магі, магі».

— А дзе ж ваш інструмент?

Лісіца нехаця сцягнуў з чагосьці, што падавалася Калтунову вялікім пашарпаным камодам, кучу анучаў. Падняў накрыўку, ускудлачыў клавішы — чорна-белы рад мільгануў і знік.

— Няма настрою. Тут у мяне мускат, сыр...

Калтуноў роспачна слухаў, як заміраюць незнаёмыя гукі. Магчыма, гэта было паведамленне, паведамленне на музычнай мове для яго, Калтунова, кароткі здзеклівы тэкст. Ён павярнуўся да жонкі. Тая наразала сыр, падняла галаву, зірнула на яго з вясёлым пытаннем у вачах.

А была ж яшчэ трэцяя сустрэча. Трохі п’янаваты (у рэдактара быў дзень нараджэння), Калтуноў бег дахаты па сваім звычным вячэрнім маршруце, і каля школы, там, дзе за кустом арэшніку, як перыскоп субмарыны, тырчаў проста са снегу іржавы кран, спаткаў Лісіцу, які хадою касманаўта адольваў ледзяную дарожку.

— Жывым вы мне падабаліся больш, — сказаў Лісіца замест прывітання. Калтуноў спыніўся і з выклікам прамовіў:

— Нам трэба пагаварыць.

— Што вы сказалі? Вы бурчыце ў ваш тоўсты шалік, і словы заблытваюцца ў нітках.

Балансуючы на лёдзе і раз-пораз хапаючыся адно за аднаго, каб захаваць раўнавагу, яны пачалі высвятляць адносіны. Калтуноў імкнуўся трымаць сябе з годнасцю, але неўзабаве ўжо крычаў, і рэха білася ва ўнутраным двары школы, нібы там, у поўнай цемрадзі, праводзілі лінейку. Цішэй, цішэй — Лісіца, не падымаючы пакуль пальчаткі, адно падносіў палец да ўсмешлівых тонкіх вуснаў, Калтуноў выбачаўся

збянтэжаным шэптам і потым лемантаваў зноў. Ён абрынаў на Лісіцу белыя касмылі пары і абвінавачанняў, а той маўчаў, і толькі ногі ягоныя нервова ездзілі па шэрым лёдзе.

А калі пара ў роце Калтунова скончылася, Лісіца ўздыхнуў і нягучна пачаў сваю водпаведзь. Гэты прайдзісвет думаў адбрахацца дурнымі сваімі жартачкамі, а калі Калтуноў падступіў бліжэй, стаў несці ўжо поўную лухту. І раптам, па маркотным зялёным агеньчыку ў вачах Лісіцы, па брыдоцці, якое той таропка прамаўляў, быццам спяшаючыся як найхутчэй схавацца за нагрувашчаннямі неймаверных нейкіх, няісных у прыродзе рэчаў, Калтуноў ясна ўсвядоміў: ён меў рацыю, і роля падманутага мужа яму не пагражае. Як бы Лісіцу гэтага не хацелася.

Ён загасіў цыгарэту, прайшоў у спальню, распрануўся і лёг. Уключыў тэлевізар. Сон адразу ж наваліўся на Калтунова, задушыў Калтунова, пасадзіў яму на павекі белых птахаў, пахаваў яго між гарадское мерзлаты... Калтуноў пабачыў сябе пад агромністым сталом, з якога на мяккі дыван марудна падаюць шматкі гарачага попелу — апускаюцца на ворс, буйныя, шэрыя, несучы з сабой ружовую памяць агню... Дыван успыхвае, і кватэра напаўняецца дымам. Калтуноў бегае пад сталом, па ножках якога ўжо караскаецца полымя, Калтуноў крычыць штомоцы, аднак ніхто яго не чуе. А ці праўда, ці затушыў ён цыгарэту?

Ён усё ж выдзер сябе са сну. На экране і праўда нехта крычаў — гэта і дапамагло яму прачнуцца. Калтуноў кінуўся стрымгалоў на кухню, адкуль непрыемна пахла тытунём. Трупік недапалку паволі пагружаўся ў багну недапітае кавы. Калтуноў адчыніў фортку і выплюхнуў змесціва кубка ў снег.

Некалькі дзён таму Лісіца захварэў — нічога дзіўнага, ён не меў нават зімовага абутку, пакуль жонка не аднесла ў майстэрню старыя Калтуновы унты, якія там за падвоеную плату рэанімавалі яшчэ на адзін сезон. Наступным ранкам, перад працаю, Калтунову давялося ісці ў аптэку — наўрад ці ён зрабіў бы гэта, але калі а сёмай раніцы жонка абыходзіцца з табой так пяшчотна — з табой, якога яна бачыць кожны дзень ужо восем гадоў і восем месяцаў, з табой, які ўвечары засынае адразу ж, як толькі прыме гарызантальнае становішча, з табой, які... Лісіцу, па аповедах жонкі, сапраўды добра скруціла: даводзілася нават выклікаць хуткую.

Калтуноў узгадаў, як учора, калі ён апранаўся на працу, жонка сказала яму, расчэсваючыся ў ванным пакоі:

— Ведаеш, я ўчора... Ён нарэшце заснуў, і мне — я якраз сядзела каля ўзгалоўя... мне падалося...

— Што?

— Ягоныя пальцы варушыліся, быццам ён... Быццам ён граў у гэты момант. Цікава, што за музыку ён чуў?

Калтуноў з палёгкай высмаркаўся, апынуўшыся ў сваім скафандры. Ён напнуў на галаву мехавы капялюш і зазірнуў у лазніцу:

— А калі я буду валяцца з тэмпэратурай пад сорак, ты будзеш сядзець каля майго ўзгалоўя?

Яна павярнулася і выцягнула ўмольна рукі:

— Ну што ты такое гаворыш! Буду! Буду! І каля твайго, і каля Кацькінага, і каля бацькавага, і каля Міхаіла Пятровіча буду! Бо калі ў маіх сілах палегчыць...

У вачах жонкі блїснулі доўгачаканыя слёзы:

— Ён жа ў гэтым горадзе абсалютна адзін...

Калтуноў пацалаваў яе і пайшоў на працу.

Каля ўзгалоўя. Узгалоўе. Коўдра. Ложак. Падушка. Праз хвіліну ён ужо спаў, трымаючы руку паміж ног, у той позе, у якой чакаюць свайго з’яўлення на свет усе зародышы свету, ад чалавечых да рыбіных.

Назаўтра ён доўга не мог падняцца, быццам яго трымалі схаваныя пад прасцінай нечыя белыя цёплыя лапы, — і таму ад сняданку давялося адмовіцца. Калтуноў спешна сабраўся і цалкам мог бы паспець на працу, калі б не заўсёдныя яго ранішнія страхі. У пачатку кожнага працоўнага дня яны аднімалі ў Калтунова даволі шмат часу: яму ўсё здавалася, што ён забыў выключыць газ, і Калтуноў, аж пакуль у яго не пачыналі балець вочы, усё вяртаўся і вяртаўся на кухню, ужо абуты, і ўзіраўся ў праклятыя ўключальнікі на пліце. Калі ж наважваўся нарэшце пераступіць парог, і тады страх даставаў да яго, ужо пакідаючага кватэру — з незвычайнай выразнасцю ён уяўляў жонку, якая бесклапотна спіць, пакуль паветра вакол яе напаўняецца нябачнай і страшнай атрутай, і Калтуноў адмыкаў дзверы, вяртаўся і наноў упіваўся вачыма ў шэраг бяскрыўдных на выгляд колцаў, кропачкі на якіх, здавалася, толькі і чакаюць, каб падскочыць уверх адразу пасля сыходу Калтунова.

Якімі ж лёгкімі былі раніцы, калі жонка прачыналася разам з ім! Не трэба было траціць час на задаволенне ўсіх гэтых фобіяў. Аднак часцей за ўсё жонка яшчэ спала. Вось і сёння гадзіннік паказваў восем, калі Калтуноў, у думках ужо плачучы на жончыных хаўтурах, выйшаў на мароз, пад святло нязгаснае лямпы.

— А і праўда, дзе ж яна выключаецца? — падумаў ён сонна, узбіраючыся на ўзгорак да школы. Яго чакаў працяг ранішніх кашмараў — тралейбусны прыпынак. Камунальныя рогі гэтых пачвараў ужо гайдаліся ўнізе ў прадчуванні Калтунова, ужо ляскалі іхнія прагныя сківіцы... Калтуноў абагнуў школу і пабачыў яшчэ адзін небяспечны недагляд. З жалезнага крана, які тырчаў убаку ад дарожкі, за прутамі замерзлага арэшніку, біў тонкі струмень гарачай вады. Яна лілася ў снег, паступова ўтвараючы пад кранам шырокую ледзяную шапку, празрысты блін з маленькім вірам кіпеню пасярэдзіне. Калтуноў, зачараваны выглядам крана, спачатку прайшоў міма, але потым вярнуўся і паспрабаваў закруціць яго. Рукі ў пальчатках саслізгвалі ўніз, і неўзабаве ледзь не трапілі пад струмень. Ён зняў пальчаткі. Уключальнікі пліты стаялі ў Калтунова перад вачыма. Люты холад, які, аднак, па-садысцку абяцаў пякучую вечную цеплыню праз пару хвілін — толькі пацярпі! — працяў далоні. Калі кран і паддаўся, то хіба на некалькі сантыметраў. Калтуноў удыхнуў пах гарачае вады і рушыў да прыпынку.

— Сёння ноччу яна сказала, што яму лепей, — падзяліўся ён з Косцем, калегам, які быў у курсе калтуноўскіх праблем, у сталовай НДІ, дзе яны часам абедалі. Паверхам вышэй рэдакцыя арандавала тут памяшканне.

— Каму?

— Ну гэтаму, музыканту. Прыйшла апоўначы, легла як ні ў чым ні бывала. Булён, сказала, учора еў, — Калтуноў усміхнуўся і задуменна дажаваў сасіску. — Упершыню за тры дні.

— Дзяцей вам трэба завесці, — сказала раптам Башмакова з аддзела рэкламы. Калтуноў здзіўлена падняў на яе вочы. — Ёй проста хочацца даглядаць каго-небудзь, хочацца, каб быў нехта капрызны і шумлівы, за кім трэба... А ў цябе занадта мала патрэб. Дзеці, толькі дзеці.

Калтуноў здзіўлена зірнуў на Косцю, але той апусціў вочы і схапіў паднос. «Дзяцей!», — крыкнула ім услед Башмакова і пераможна паглядзела на павернутыя да яе галовы.

Жонка патэлефанавала пасля абеду — Калтуноў ужо рыхтаваўся паставіць кропку і вісеў над клавіятурай, раздумваючы, ці не запусціць усё ж пару крытычных стрэлаў.

— Яму зноў стала горш, — сказала яна і потым, нібы просячы прабачэння, дадала: — Я пасяджу сёння ў яго да раніцы, добра?

Ён зарохкаў нешта няўцямнае; на экране, за чорнымі радкамі, што вылезлі з Калтунова за некалькі пасляабедзенных гадзін, яму бачыўся кран у рудой лусцы

іржы, і вада лілася ў снег, бы мача. У слухаўцы пачуліся гудкі. Ён доўга замыкаў дзверы, зноў і зноў правяраючы, ці блішчыць у шчыліне палоска металёвага язычка.

Ідучы каля школы, ён на гэты раз вырашыў не глядзець у бок кустоўя, аднак нехта выгукнуў з цемры, менавіта адтуль, дзе ён сёння а восьмай рабіў ранішнюю гімнастыку: «Малады чалавек, дапамажыце!». Калтуноў паскорыў хаду, але яго пазвалі зноў.

Каля крана стаяў, развёўшы рукі ў ненатуральна вялікіх рукавіцах, дзядок — з тых, якія вечна лезуць не ў свае справы. «Што робіцца, га?» Налягаючы ўсім целам, Калтуноў пад мацюканні дзядка зноў паспрабаваў закруціць кран, і прамачыў-такі нагавіцы, так што да пад'езда ён падыходзіў з ледзяной коркай на каленях. Перад тым, як легчы спаць, ён сунуў у сумку гаечны ключ.

Жонка прыйшла, калі Калтуноў абуваўся — пад вачыма чорна, на галаве абы-што, нейкая хустка. «Я не ведаю, што рабіць», — яна таропка пацалавала яго і зморана пашыбавала на кухню. «Я яму кажу: табе ў лякарню трэба, а ён ні ў якую. Давядзецца адпрасіцца сёння з працы». Калтуноў моўчкі выйшаў за дзверы.

На гэты раз ён абышоў школу з другога боку і такім чынам змог падкрасціся да крана ззаду. Хвілін праз дваццаць яму ўдалося закруціць кран амаль напалову; нейкая настаўніца, ідучы па замерзлай сцежцы да школьнага ганка, ухвальна крыкнула яму: «Даўно б так!». Струмень і праўда біў ужо не з такой сілай. Успацелы Калтуноў схаваў гаечны ключ у сумку і пабег да прыпынку, ён адчуваў неймаверны ўздым. Тралейбус быў паўпусты, метро падалося прасторней — Калтуноў спазніўся на працу больш чым на паўтары гадзіны. У калідоры ён наткнуўся на рэдактара, і той нават не павітаўся з Калтуновым.

Увечары дома ён знайшоў на стале цыдулку ад жонкі. «Прыязджала Кацька. Ліска ў лякарні. Я павезла яму рэчы. Пяльмені ў лядоўні. P. S. Там напісана, як гатаваць». Калтуноў доўга стаяў пад душам, яму ўсё здавалася, што вада недастаткова гарачая, і ён усё нахіляўся і нахіляўся да крана, аж пакуль не адчуў, што хутка ён зварыцца зажыва. У пэўны момант ён пачуў, што нехта звоніць у дзверы, але вылазіць з-пад душа, як з-пад цёплае коўдры, яму не хацелася. Потым ён загарнуўся ў халат, выпіў каньяку і ледзь не заснуў на кухні.

На наступны дзень кран абараняўся ад Калтунова больш удала. У пэўны момант Калтуноў нават падумаў адмовіцца ад змагання і амаль з роспачу схапіўся за ключ, перад тым як пайсці да прыпынку. Аднак наляцелы знянацку вецер, які павярнуў струменьчык акурат на абутак Калтунова, прымусіў яго напаследак яшчэ раз як след напружыць сілы, і пару міліметраў ён выйграў. Жонка патэлефанавала яму на працу — яна вырашыла, пакуль Лісіца ў лякарні, пажыць у Кацькі — адтуль да абласной было два кварталы. Калтуноў з дзіўным спакоем выслухаў вынікі аналізаў — яны, на жаль, пакуль не ўнушалі асаблівага аптымізму — і, перадаўшы Кацьцы прывітанне, паклаў слухаўку.

Назаўтра, па звычцы сем разоў пералічыўшы ўключальнікі на пліце, Калтуноў пабег да крана. Мароз прыкметна саслабеў, снег стаў ломкі, як шакалад, але ўсё ж Калтуноў некалькі разоў паслізнуўся, перад тым як апынуцца ля кустоўя. Да турніка на школьным стадыёне былі прыслоненыя лыжы, побач нарэзваў колы нейкі бамбіза. Працуючы па чарзе, яны дасягнулі таго, што вада цяпер толькі крапала з крана. Увечары занепакоены Калтуноў двойчы хадзіў да школы праверыць, ці не давядзецца заўтра пачынаць усё спачатку. Але з крана, з прыемным і прымальным інтэрвалам, падалі на падталы, раскіслы лёд такія ж цяжкія кроплі.

Раніцай у пад'ездзе ён сустрэў суседа. Той быў відавочна ўзрадаваны тым, што да прыпынку яны пойдуць разам, пачаў нешта распавядаць пра сваю новую машыну. Спыніўшыся пад лямпаю, Калтуноў развітаўся з ім і пакрочыў па вуліцы

ўніз. Дачакаўшыся, пакуль расчараваны сусед адолее слотныя прыступкі, Калтуноў шпарка пайшоў уздоўж школы і пастаяў трохі, укрыўшыся за яе доўгай сцяной. Дзеці з цікаўнасцю глядзелі на яго ў акно, і маладая настаўніца раздражнёна завесіла фіранкі. Калтуноў паволі падышоў да крана і скінуў скафандр. Лёд амаль растаў, і пад ім агалілася выспа бруднай, бурай травы, у якую падалі каламутныя кроплі. Ён прымружыў вочы, пастаяў крыху, і потым узяўся аберуч за вентыль і павярнуў яго. Неймаверная палёгка агарнула Калтунова, і падхапіла Калтунова, і шпурнула яго кудысьці ўбок, і падняла над вуліцай, над усім тым рухомым, рухавым, няспынным і шумным, цеплакроўным і вібруючым, што няўхільна пасоўвалася ў накірунку метро.

## СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ

*Калісьці,* шпацыруючы па праспекце і разглядваючы мемарыяльныя дошкі на сценах дамоў, Кармушкін пачасту разважаў пра тое, што класікі айчыннага мастацтва так і не здолелі стварыць нічога вартага ўвагі менавіта з прычыны пражывання ў цэнтры горада — вокны іхняга заслужанага жылля выходзілі на самыя шумлівыя і загазаваныя вуліцы, што, натуральна, замінала плённаму творчаму працэсу. Вось і кватэра народнага кампазітара Івана Хруля, дзе пасля смерці гаспадара адкрылі ягоны музей, глядзела з-пад фіранак, нібыта з-за цёмных акуляраў, на вуліцу Бэндэ, адкуль да праспекта было рукой падаць; уся зарослая платнымі аўтастаянкамі, з консульствам невялікай, але ўплывовай замежнай дзяржавы ў адным канцы і будынкам банку ў другім, вузкая, тлумная, яна не належала да тых, дзе Кармушкін хацеў бы адшукаць сваю неўміручасць. Дамы тут не мелі больш за чатыры паверхі, аднак вышынёй пераўзыходзілі любую хрушчоўку: усё таму, што пакоі ў тутэйшых кватэрах былі прасторныя, столі высокія, вокны шырокія — нібы ў школьных тэмах па замежнай мове. Цяпер практычна кожная кватэра ў гэтым раёне была здадзена гаспадарамі ў арэнду пад офіс, і старыя, рамантычныя вокны трапілі за краты, пад апеку шклопакета, і толькі музей народнага кампазітара вылучаўся сваімі састарэлымі шыбамі, шызымі, як галубы, якія любілі кахацца на ягоных падваконнях. Бо кватэра, дзе некалі жыў і тварыў Іван Хруль, месцілася на апошнім паверсе.

Не, Кармушкін хацеў бы працаваць у вежы са слановай косткі і бачыць праз байніцы белыя ветразі на марскім даляглядзе ці, прынамсі, тралейбус раз на гадзіну. Аднак пасля таго, як са сваім дыпломам менеджэра культуралагічных праектаў трыццацігадовы Кармушкін так і не здолеў знайсці працы, яму давялося задаволіцца пакуль пасадаю супрацоўніка музея Івана Хруля.

Зусім нядаўна пераступіў ён парог гэтай змрочнай кватэры, адлюстраваўся ў партрэтах, пакінуў адбіткі пальцаў на кнігах, пазнаёміўся з чатырма сімпатычнымі старымі: Нінэль Пятроўнай, Адэлаідай Самойлаўнай, Нінай Баляславаўнай і Ядвігай Карлаўнай, якія ўсміхаліся яму добрымі шчарбатымі ратамі і паабяцалі не нагружаць лішняй працай, бо «ў маладых павінны быць іншыя клопаты — хіхі», мілыя бабулькі ў аднолькавых фартушках, падобныя адна на адну як кубачкі з гарбатнага набору; еў варэнне срэбнай лыжачкай, выцер пыл з піяніна, зламаў пішучую машынку мэтра, правёў экскурсію для аўтобуснага парка нумар пяць і даў кароткае інтэрв'ю сямейнаму тэлеканалу пра ўдзел Івана Хруля ў вялікай і вельмі айчыннай вайне. Мінуў месяц.

У той дзень яны скончылі працу раней чым звычайна — назаўтра мусіў быць дзяржаўны выхадны. Першымі сышлі, памахаўшы Кармушкіну сухенькімі ручкамі, Адэлаіда Самойлаўна і Ніна Баляславаўна, потым, пачаставаўшы яго хатнімі піраж-

камі, адправілася адпачываць Ядвіга Карлаўна. Кармушкін даўно і сам мог бы быць дома, аднак у музей завітала дачка класіка Ларыса, прывезла нейкія накіды, знойдзеныя сярод рэчаў Івана Хруля на лецішчы, і Кармушкін як адзіны, хто быў абазнаны ў нотнай грамаце, мусіў праверыць, ці не пашчасціла музею адкрыць новыя старонкі творчасці кампазітара. Як высветлілася, накіды былі ўсяго толькі чарговымі чарнавікамі вядомых Хрулевых хітоў. А палове на пятую Кармушкін правёў Ларысу да таксі, вярнуўся, развітаўся з Нінэль Пятроўнай, якая паводле дакументаў лічылася загадчыцай музея, і выйшаў на лесвічную пляцоўку. Ён дачакаўся ліфта, у шчаслівым прадчуванні выхаднога даехаў да першага паверха; дзверы расчыніліся, ён спусціўся да дзвярэй пад'езда, сунуў руку ў кішэню, каб па звычцы запаліць цыгарэту, і ўспомніў, што забыў пачак разам з запальнічкай на балконе музея.

Гэта быў маленькі балкончык, памерам не больш за ванначку для немаўлятаў — такіх шмат на дамах у цэнтры горада: старыя выходзілі туды, каб паліць кветкі, Кармушкін — каб цыгарэты. Нішто не магло сапсаваць Кармушкіну настрою; ён вярнуўся, шпаркай хадою прайшоў у далёкі пакой, забраў пачак і запальнічку, паклаў у кішэню. У гэты ж час Нінэль Пятроўна мімаходзь агледзела памяшканні, усміхнулася свайму адлюстраванню, паправіла фатаграфію, на якой Іван Хруль прымае ў падарунак ад тульскіх майстроў катрынку, выйшла на пляцоўку і з пачуццём выкананага доўгу замкнула масіўныя музейныя дзверы з залатой шыльдай на тры рашучыя вісячыя замкі. Мінула трыццаць секунд: Кармушкін, перадолеўшы раптоўнае галавакружэнне, дабраўся да перадпакоя — Нінэль Пятроўна села ў ліфт. Яшчэ хвіліна: Кармушкін усё торгае за ручку; Нінэль Пятроўна выходзіць на вуліцу Бэндэ. Яшчэ шэсцьдзесят секунд: Кармушкін кідаецца на балкон — Нінэль Пятроўна адкрывае парасон, бо Гідраметэацэнтр зноў памыліўся — Кармушкін бачыць унізе некалькі дзесяткаў аднолькавых парасонаў, знясілена праводзіць ілбом па шкле і вяртаецца ў кватэру — Нінэль Пятроўна падымае вочы, усміхаецца балкончыку, глытае некалькі дажджавых кропляў і рушыць у метро. Дождж ідзе не даўжэй за рэкламны ролік. Зноў з'яўляецца сонца, вуліца ўспыхвае, як ахопленая пажарам ювелірная крама, Кармушкін сядае да тэлефона, але ўсе працоўныя ўжо, а ўсе хатнія — яшчэ.

На кухні адмыслова для супрацоўнікаў музея быў адгароджаны куточак — там бабулькі звычайна пілі гарбату з печывам, вялі свае мудрыя размовы; там ля акна стаяла невялікая пліта, а злева — чатыры нічым не адрозныя тумбачкі, у якіх старыя захоўвалі свае сціплыя асабістыя рэчы. На тумбачцы Нінэль Пятроўны блішчэў імбрычак, усаджаны на драўляную падстаўку, побач у слоічку жаўцеў цукар, кульгаў слон цераз пачак гарбаты: усё гэта было агульнае, захацеў — падыходзь ды гатуй. На падваконні ляжаў стос газет, на ім — яшчэ адзін слоік, у якім захоўваліся лыжачкі. Завяршалі інтэр'ер гэтага пакоя адпачынку букецік высахлых ландышаў у старой вазе, пакет з апетытнымі крошкамі ды фатаграфія маладога Моцарта ў рамцы.

Кармушкін сваёй тумбачкі не меў — не заслужыў пакуль, дый якія асабістыя рэчы ён мог сюды прыносіць — хіба што сродак супраць молі. Ён з уздыхам абвёў вачыма закуток, паставіў на пліту імбрык; пакуль кіпяцілася вада, ён паспеў папаліць у фортку ды пагартаць нейкую газету з першага дзесятка. Навіны, як заўсёды, не ўразілі: першая паласа прапаноўвала рэпартаж з адкрыцця новай станцыі метро, прычым шуму было столькі, нібыта на горад зваліўся марсіянскі касмічны карабель; на другой ішлі бадзёрыя рапарты аб падрыхтоўцы да галоўнага дзяржаўнага свята; трэцяя была аддадзеная спартсменам, а на чацвёртай псавала зрок чытачу мноства дробных інфармацый пра культурнае жыццё сталіцы — у філармоніі меўся выступіць ансамбль «Яромка», недзе адкрываўся нейкі чарговы тэатр-аднадзёнка пад дзіўнай назвай «Мінус», а культавы ў асяроддзі сталічнай моладзі мастак быў

заняты праектам да ўсё таго ж доўгачаканага свята... Карацей, шмат рознай лабуды. Сярод яе ўзгадваўся і мемарыяльны музей Івана Хруля — ён, ведаеце, запрашаў на выставу «Пастаю над ракою жыцця...», прысвечаную дваццацігоддзю з дня першага выканання гэтай песні.

Кармушкін вярнуў газету на месца і з кубачкам у руцэ пайшоў акурваць параю сваю турму.

Перш-наперш ён усё ж накіраваўся да тэлефона, аднак той, на злосць, цяпер не выдаваў нават гудка. «Трэба было заводзіць мабільны», — ледзь не расплёскаў гарбату Кармушкін, ды хутка супакоіўся: у рэшце рэшт, можна нешта прыдумаць, каб вырвацца з гэтага нечаканага палону. Не сядзець жа яму тут да паслязаўтра, у гэтай кватэры, дзе без добрых бабулек адчуваеш сябе як у адной дамавіне з самім Хрулём.

Урэшце пасля задуменных блуканняў па музеі ён спыніўся ля вялікага, на палову сцяны, партрэта Івана Хруля, выкананага перад самай смерцю маэстра адным заслужаным, узнагароджаным усім чым можна і ўсім чым нельга, да немагчымасці народным мастаком. Аўтар партрэта спецыялізаваўся на партызанах — за сваё жыццё ён напісаў іх столькі, што ўрэшце кожны, хто трапляў пад пэндзаль мастаку, атрымліваўся на палатне падобным да народнага мсціўцы. Вось і тут Іван Хруль глядзеў на наведнікаў гэткім дзедам Талашом: сялянская сівізна ў ягоных валасах не абяцала нічога добрага, а знакаміты гармонік, здавалася, таіў у нутры бомбу. Белыя геніяльныя пасмы на макаўцы маэстра гнеўна стаялі тарчма, нібы за спінай Івана Хруля быў уключаны фен; з-пад расшпіленай кашулі пад відавочна малым кампазітару пінжачком віднеліся кранальныя старэчыя грудзі, таксама парослыя сівымі валасамі. Іван Хруль сядзеў на лаве ля хаты, а справа ад яго падслепавата вызіраў з-за плота банальны айчынны далягляд.

Кармушкін адышоў на крок і ўважліва паглядзеў кампазітару ў вочы. «Бутэлечку пустую можна будзе ўзяць?» — адказаў нашчадку позірк славутага майстра, і Кармушкіну стала сорамна.

У гэтым жа пакоі былі і іншыя цікавыя экспанаты. На стале пад шклом захоўваліся чарнавікі вершаў яшчэ жывога паэта Петруся Жучка — менавіта на ягоныя радкі Хруль клаў сваю неўміручую музыку. Чарнавікі, праўда, былі падазрона чыстымі, аднак у прастадушных наведнікаў гэта ніколі не выклікала падазрэння. А каля самага акна ў чорным футарале на пюпітры ляжаў бінокль.

Хаця Кармушкін працаваў у музеі яшчэ зусім нядоўга, яму ўжо былі вядомыя некаторыя тутэйшыя таямніцы — з тых, пра якія не пішуць у газетах і кніжках. Прынамсі, у зборніку «Нашы славутыя землякі», выпушчаным летась, пра гэта не было ані слоўца. Вось, напрыклад, бінокль — спачатку Кармушкін ніяк не мог даўмецца, навошта кампазітару быў бінокль (Нінэль Пятроўна паставіла за мэту захаваць усе рэчы, якія знаходзіліся ў кватэры перад смерцю гаспадара, у поўнай наяўнасці і на сваіх месцах). Праўда Кармушкіна вельмі пацешыла. Ад гэтага часу многія песні Хруля сталі ўспрымацца ім не так адназначна...

Дакладна вядома, што знакамітая «Сяброўачка» была створаная 25 ліпеня ў 197... годзе. У той дзень пад вечар да Івана Хруля прыйшоў у госці Пятрусь Жучок. Жонка Хруля, цяпер нябожчыца, корпалася ў гэты час на лецішчы і мелася прыехаць заўтра. Творцы выпілі па бутэльцы гарэлкі, закусваючы капустай ды салам, і паэт дастаў з партфеля бінокль — моцную, учэпістую, вастравокую вайсковую штуку. Хруль і Жучок сталі ля акна, прыкрыўшыся фіранкаю, і пачалі высвятляць, што дзеецца ў доме насупраць. Амаль адразу ж Жучок натрапіў на прыгожую піянерку гадоў чатырнаццаці, якая, ратуючыся ад невыноснай спёкі, хадзіла па сваёй

хаце ў чым маці нарадзіла. Больш моцны фізічна, менш п'яны і больш валявы Хруль забраў у Жучка бінокль і цэлую гадзіну натхняўся сузіраннем чыстае красы. Жучок жа, якому перапала хіба дзве хвіліны далучэння да хараства, быў пасаджаны за пісьмовы стол з заданнем не марудзячы выдаць тэкст. За ўсім гэтым назірала праз шчылінку ў дзвярах дачка Хруля Ларыса, якая і распавядала цяпер кожнаму гісторыю стварэння песні — за цыгарэту або шклянку віна.

А хіт усіх часоў і народаў «Таварыш блізка і далёка»? Ларыса, якая часта заставалася ў дзяцінстве дома з п'яным бацькам, пакуль мама была на працы, распавядала неяк, як стваралася гэтая песня. Адзін маёр, вялікі прыхільнік хрулёўскай творчасці, завітаў неяк да кампазітара з каньяком. Выпілі, паглядзелі балет, ацанілі ногі ў кожнай лебедзі. Маёр вырашыў пастраляць па птушках — адчыніў акно, дастаў пісталет, ды і вылецеў вонкі. Хруль кінуўся на падаконне, хацеў дапамагчы, аднак раптам дэман натхнення сказіў ягоны праставаты твар, маэстра схапіў гармонік ды за пяць хвілін прыдумаў прыпеў для «Таварыша». Тэрмінова быў выкліканы Жучок, і праз месяц твор атрымаў галоўную ўзнагароду Елабускага фестывалю патрыятычнай песні.

«Мора», пад якое так шмат было выпіта за апошнія гады насельніцтвам, таксама мела сваю патаемную крыніцу. У суседнім пакоі музея знаходзіўся яшчэ адзін партрэт: Іван Хруль на палубе цеплахода, прыхінуўшыся да парэнчаў, спявае пад уласны акампанемент — рот кампазітара раскрыты, і ў глотцы можна заўважыць хвосцік непражаванай музы. У свеце толькі дзесяць чалавек, улучна з Кармушкіным, ведалі, што за ўнушальнай рамай карціны знаходзіцца адмысловая ніша, прыкрытая дзверцаю. Тайнік змяшчаў у сабе невялікі, але заўжды гатовы задаволіць усе душэўныя парыванні бар, дзе знаходзілася месца не толькі любімым прадуктам заводскай вытворчасці, але і класічнаму самагону, чыстаму і гаючаму, нібы вада з пахмелля...

І піяніна стаяла ў гэтым пакоі, як жа яму тут не стаяць — хаця было агульнавядома, што Іван Хруль заўжды аддаваў перавагу вясёламу гармоніку, жонка трывала і іншыя інструменты. Апрача піяніна, ад кампазітара засталіся гітара ручной работы, скрыпка, якую ён купіў за бутэльку чарніла падчас нейкай агіткамапаніі ў рыкаючага ўжо ад п'янства маладзёна, — на такой скрыпцы, мусіць, граў калісьці сам Сымон-музыка; кампанію ім складалі кларнет, труба і, невядома чаму, барабанныя палачкі. Усё гэта было звалена ў суседнім пакоі — Кармушкін аднойчы хацеў прывесці калекцыю да ладу, аднак Нінэль Пятроўна забараніла: «Знікне аўра!»

Кармушкін паставіў на піяніна кубачак і паспрабаваў зноў скарыстацца тэлефонам. Пракляты апарат маўчаў. На вуліцу, між тым, неяк непрыкметна ўпалі першыя вечаровыя цені, навялі рэзкасць на абрысы прадметаў, зайшло сонца, па вызваленых гарачых каляінах праляцеў вецер, астудзіў горад, нагадаў пра нядаўні кароткі дождж. Кармушкін адчыніў акно, цяжкія фіранкі здрыгануліся і зноў налеглі жыватамі на падаконні, лянотна скінуўшы свежыя пылінкі. Кармушкін прагна ўдыхнуў прахалоду, і гэта надало яму рашучасці. Дапіўшы рэшткі гарбаты, ён накіраваўся да балкона.

Да бліжэйшай вадасцёкавай трубы было метраў пяць, і пры вялікім жаданні і ўпэўненасці ў нагах можна было паспрабаваць адолець гэтую адлегласць, рухаючыся па гранітным гаўбцы, што апярэзваў дом. Справа ад балкончыка сыходзіла яшчэ мокрымі пасля дажджу металічнымі прыступкамі ўніз пажарная лесвіца. Да яе было рукой падаць — была б толькі рука сантыметраў на трыццаць даўжэйшая. Кармушкін агледзеўся, і перажагнаўся ў душы, і нават тарганууся наперад, але тут жа ўцягнуў сваё перапуджанае цела назад і адчуў вялікую сарамлівую радасць. У пятках кальнула, сэрца заныла, і потым яшчэ колькі секунд страх соладка таяў унутры.

— Дзяўчаты, — крыкнуў Кармушкін дзвюм юным істотам, што ў непрасохлых футболках і міні-спадніцах праходзілі якраз пад акном — так блізка, што можна было заўважыць адсутнасць станікаў. — Дзяўчаты, — паўтарыў ён, але зразумеў, што насамрэч усяго толькі шэпча. Дзяўчаты аддаляліся. Кармушкіну было вельмі няёмка. Аднак гэта было ўсё ж прасцей, чым лезці на слізкі і вузкі гаўбец. Ён заплюшчыў вочы і цяпер ужо напраўду заенчыў:

— Дзяўчаты!

Тыя пачулі, спыніліся, павярнуліся, пашукалі, паціснулі плячыма, потым нарэшце паднялі коратка стрыжаныя галовы ўверх.

— Дзяўчаты, дапамажыце, калі ласка. Мяне тут замкнулі выпадкова, не маглі б вы патэлефанаваць, я вам нумар скажу, і паведаміць, што Сяргей...

Адна з дзяўчын нецярпліва пацягнула за сабой другую. Другая паморшчылася.

— Гэта праўда, нумар тэлефона — дзвесце дваццаць... не, гэта не той... дзвесце...

— Хадзем, Кацька, — і дзяўчаты рушылі наперад, паказаўшы Кармушкіну ладныя спіны, з-пад маек выпіралі вострыя лапаткі, патыліцы былі выстрыжаныя так мудрагеліста, што іх можна было прыняць за твары. Каля аркі адна з іх павярнулася і памахала Кармушкіну рукой:

— Парань, ты не каціш! Не каціш!

Кармушкін хацеў паспрабаваць яшчэ, але няўдача раптам забіла ў ім усю рашучасць. А вуліца, звычайна такая ажыўленая, дзелавая вуліца, была цяпер паўпустая. Кармушкін стаяў на балкончыку, паліў, углядаўся ў прахожых, і чамусьці яму траплялiся адны бамжы. Чорнай кропкай у канцы вуліцы мігцеў схаваны ў будцы каля консульства міліцыянт. Справа няўхільна ішла да шарай гадзіны. Кармушкін вярнуўся ў кватэру, пабарабаніў у сцяну, хаця цудоўна ведаў, што за ёй кватэру здавалі пад офіс, і ў такі час напярэдадні выхаднога тамака нікога няма, — і потым бяссільна апусціўся ў фатэль.

Заставалася чакаць, пакуль не ўключыцца тэлефон. Кармушкін паказаў язык партрэту Івана Хруля, дастаў нейкую газетку за семдзесят дзевяты год і паглыбіўся ў чытанне. Дакладней, вельмі хацеў паглыбіцца — у галаву палезла ўсялякая дрэнь, як мышы, набеглі пытанні без адказаў: шкодная рэч для чалавека гэты вольны час, нічога добрага не прыносіць, пачынаеш шукаць сэнс жыцця ці прыдумваць вершы, замест таго каб наталяцца здаровым адпачынкам і зараджацца моцаю дзеля заўтрашняга радаснага працоўнага дня. Кармушкін трымаў на каленях пажаўцелую газету, а Іван Хруль пaглядаў на яго спадылба са сцяны, і ўжо не прасіў пустую бутэлечку, а відавочна задумваў нядобрае, фатэль быў мяккі, гадзіннік цікаў так пяшчотна-падступна-ўтульна, у пакой запаўзала шарая гадзіна і танчыла перад Кармушкіным эратычны танец...

Ён прачнуўся ў цемры і не адразу зразумеў, дзе знаходзіцца. Па кватэры былі развешаныя нечай не пазбаўленай густу рукой водбліскі ліхтароў, за акном зноў ішоў дождж, і па няўлоўнай мернасці ягонага шуму было зразумела, што гэта надоўга. Фортку зачыніць ён забыўся, і цяпер у музеі стала халаднавата. Кармушкін, крэкчучы, падняўся. На сівых валасах Івана Хруля бледна ззяў прадаўгаваты водсвет.

Кармушкін прайшоў на кухню, уключыў святло, прыгатаваў гарбату. Тут жа цвынкнуў у суседнім пакоі тэлефон, цвынкнуў ціха, але гэтага хапіла, каб Кармушкін стрымгалоў кінуўся да апарата.

— Іван Мікалаевіч перакульваецца ў труне, — сказаў ясны, выразны, лялечны голас, хутчэй за ўсё, жаночы, і слухаўка хіхікнула.

— Алё! Алё! Гэта Нінэль Пятроўна? Гэта я, Сяргей!

— Перакульваецца ў труне, у труне, — на гэты раз слухаўка ледзьве не пырснула смехам, і побач захіхікаў нехта яшчэ.

— Алё! Хто гэта?

— А чаму перакульваецца? Чаму перакульваецца?

Кармушкін не ведаў, што сказаць. Цяпер яму стала па-сапраўднаму жудасна.

— Таму што ён заўсёды спаў на левым баку. На левым, на левым. А яны паклалі яго на спіну. На спіну, на спіну.

І слухаўка абрынулася на беднае вуха Кармушкіна тысячай хіхіканняў, лялечных, гідкіх, бяззубых. Кармушкін выпусціў слухаўку з рук, і яна пляснулася акурат на належнае месца. Ён падняў яе, але ці варта казаць, што цяпер у ёй зноў панавала цішыня.

Кармушкін не стаў уключаць святло — уключальнік знаходзіўся там, там, у страшным куце, пад змрочным нагрувашчаннем цемры. Ён кінуўся на ратавальную кухню, якая перакідвала праз маленькі калідорчык у пакой хісткі светлы масток, прабег па гэтым мастку, прыклеіў сябе да кута каля тумбачак. Аддыхаўся, імкнучыся не глядзець у цёмны правал дзвярэй, запаліў цыгарэту. І тут погляд ягоны, што шалёна рыскаў па прадметах, нібы яны, прадметы, былі ад пачатку хаўруснікамі Кармушкіна, — загнаны погляд ягоны ўпаў на кубак з гарбатай. Кармушкіна закалаціла — на чорнай паверхні напою, паволі тонучы, плавала пасма сівых валасоў.

І зноў яму давялося заплюшчыць вочы, быццам ад гэтага нячыстая сіла, у існаванні якой Кармушкін ужо не сумняваўся і не будзе сумнявацца да канца сваіх дзён, перапыняецца на рэкламу; ён праімчаўся праз д'ябальскі пакой, навобмацак уключыў святло і апынуўся перад партрэтам: Іван Хруль усміхаўся яму, шчэрачы зубы, пальцы яго па адным адгіналіся, адрываючыся ад клавіятуры гармоніка. Кармушкін кінуўся ў калідор, да суседняга пакоя, адкуль шлях вёў да замкнёных дзвярэй, якія калісьці — як даўно! — вялі жывых людзей на лесвічную пляцоўку. Аднак і наступны пакой не адпавядаў сваёй мірнай назве. Ледзь Кармушкін ступіў туды, як піяніна, дыхнуўшы на яго пылам, выдала дзіўны, бразгатлівы гук, і ў паўзмроку, у водбліскаў ліхтарнага святла Кармушкін заўважыў, як падымаецца накрыўка, і клавішы бязладна, сумбурна, быццам здзекуючыся, уціскаюцца і пругка вылятаюць на месца... Як яму ні было страшна, ён на нейкі момант разабраў у гэтым чортавым віхуры безнадзейна сапсаваны, скажоны нечай замагільнай воляй матыў песні «Пастаю над ракою жыцця». Чуючы, як у бакавым пакоі адгукаюцца пачварным найгрышам барабанныя палачкі, як мяўкае кларнет, распрацоўвае свае сатанінскія лёгкія труба і рэжа кагосьці на жывую скрыпка, Кармушкін кінуўся назад, у кухню.

У тое імгненне, калі нага Кармушкіна ў роспачы ступала на запаветны масток святла, электрычнасць, нібыта яе здзьмуў вецер, выключылася — адна за адной згаслі лямпачкі ў пакоі з партрэтам і на кухні. Кармушкін апошнім намаганнем зачыніў за сабой дзверы і зараз жа прыпёр іх лёгкім, як пух, дубовым сталом, з якога на падлогу абрынулася шкло, дзе захоўваліся сямейныя фота Хруля. Шоргат фатаздымкаў пад нагамі прымусіў Кармушкіна падскочыць і палезці на падаконне, адкуль не марудзячы зляцелі слоік ды ваза.

Ён, аднак, здолеў неяк узяць сябе ў рукі, узгадаў, дзе ляжаць запалкі, і хутка па кутах кухні заскакалі цені — сіняе полымя асвяціла надзейна прыпёртыя дзверы; Кармушкін падняў з падлогі мокрыя цыгарэты, знайшоў адну яшчэ прыдатную, ды запаліць не змог — трэсліся рукі, як пасля тыднёвага запою. Урэшце ён асцярожна прысеў перад тумбачкамі бабулек-супрацоўніц: пераконваючы сябе, што шукае ліхтарык або паўбутэлькі гарэлкі (ну хаця б на дне!), насамрэч ён шукаў крыж.

Ліхтарык тут і праўда быў — мякка скочыў у руку, пальцы інстынктыўна моцна заціснулі яго, так што ажно хруснулі суставы; гэта насуперак усяму надало Кармушкіну моцы, і ён прадоўжыў агляд. Спачатку з тумбачкі дрыжачая рука

Кармушкіна выцягнула доўгі маток тоўстай вяроўкі. Потым пальцы наткнуліся на нешта халоднае. Кармушкін узяўся лацвей.

У ягонай руцэ ляжаў востры і доўгі нож з зазубрынамі на лязе, якое слаба блішчэла ў кухоннай паўзмрочнай мітусні; потым Кармушкін выцягнуў з тумбачкі цэлы набор кайданкоў, сапраўдны гішпанскі боцік, яго часта паказвалі ў апошні час па тэлевізіі, — а потым, адкрываючы іншыя тумбачкі, Кармушкін узбагаціў гэты арсенал сякерай, жалезнымі абцугамі, цяжкім ланцугом, прыладаю для таўравання жывёлаў, яшчэ двума нажамі рознай даўжыні, але аднолькава пагрозлівых памераў, шлемам, які з дапамогаю адмысловых шрубоў мог памяншацца амаль удвая... Было яшчэ дзіўнае прыстасаванне, металічнае, рупліва змазанае, навюткае — Кармушкін так і не змог здагадацца пра ягонае прызначэнне, зразумеў толькі, што змайстраванае яно не дзеля прыемных спраў.

Тыцкаючы незапаленай цыгарэтай сябе то ў нос, то ў шчокі, Кармушкін прыціснуўся да сцяны і быў гатовы ў любы момант схапіць з падаконня самаробны крыж, утвораны з дзвюх алюмініевых лыжачак. За дзвярыма ў гэты час рыпелі крокі, надрываўся гармонік, енчыў голасам чалавека, якога рэжуць без наркозу, і мярзотнае хіхіканне начным матыльком білася па сценах. У гадзіне стала шэсцьдзесят секунд, стагоддзе цягнулася не даўжэй за жыццё дажджавой кроплі. Кармушкін не ведаў ніводнай малітвы, і шаптаў усё, што прыходзіла ў галаву — кінематаграфічнае, галівудскае, савецка-праваслаўнае, старaславянскае, гэта супакойвала, але ненадоўга — варта было шклу на дзвярах афарбавацца раптам у пранізліва-жоўты колер, і дубоваму сталу заварушыцца пад націскам невядомай, але жахлівай, нетутэйшай, вечнай, як самое зло сілы, як Кармушкін кінуў у гэтае жоўтае пекла лыжачкі, рвануў на сябе аконную шыбу, ускочыў на падаконне і рушыў наперад. За сто метраў ад яго нехта парэзаўся, голячы спрасоння неба, на дах ратушы ўпаў першы прамень, і гадзіннік на яе вежы запілікаў песню народнага кампазітара Івана Мікалаевіча Хруля.



Анатоль Бутэвіч
нарадзіўся ў 1948 г.
на хутары Язавец
Нясвіжскага раёна.
Скончыў філфак БДУ.
Працаваў у газеце
«Чырвоная змена»,
дырэктарам выдавецтва
«Мастацкая літаратура»,
у ЦК ЛКСМБ
і ЦК КПБ,
старшынёй
Дзяржкамітэта РБ
па друку,
міністрам інфармацыі,
міністрам культуры
і друку Беларусі,
на дыпламатычных
пасадах.
Аўтар кніг «Прыгоды
памаўзлівай Рыскі»,
«Расстайны пах асоту»,
«У гасцях у вечнасці»,
«Званы Нямігі»
і інш.

Анатоль Бутэвіч

# ПАЦАЛУНАК

***Дзе матка плача —***
***там рака цячэ.***
***Дзе сястрычанька плача —***
***там крынічанька.***
***Дзе дзеткі плачуць —***
***ручайкі цякуць.***
***Дзе жана плача —***
***там расы няма...***
***Там расы няма —***
***пажары гараць!***

З народнай песні

*Сэрца хватанула* нечакана і моцна. Сціснула так, што не дыхнуць. Аж свет здаўся з аўчынку. Як бы ў паветры раптоўна знік кісларод.

Так было ўжо некалі. Вельмі даўно. Сцяпан тады быў малады. Толькі што пасля арміі. Не захацеў вяртацца ў бацькаву хутарскую хату, дзе і без яго дзяцей як маку. Завербаваўся на шахту. Падахвоцілі сябры. Паехалі на Данбас. Казалі, заробкі там добрыя. Але як вераб’ю не стаць ластаўкай, так чалавеку, чые продкі звекавалі ў працы на зямлі, не звыкнуцца з падземным зарабляннем грошай. Ён прывык пры сонцы араць, касіць, сеяць, жаць. Гэта ён умеў, гэта яго. А вось каб калупацца ўнутры зямлі — не ляжала душа. Ён жа не доктар.

Ды характар у Сцяпана быў цвёрды, як сухі гарох. Не любіў адступацца. Вырашыў: «Калі не навучуся з зямлёй спраўляцца, не я буду. Дамоў не вярнуся, бо засмяюць. Слабаком назавуць». А гэта для Сцяпана горш за смерць...

Дабіўся свайго. Пакрысе, праз крывавыя мазалі, пераадольваючы ўнутраны супраціў. Неўзабаве шахцёрам сталі называць, грамату нават пад Кастрычніцкае свята далі. Мо і застаўся б Сцяпан там, грошы добрыя, кампанія сяброўская. Прывыкаць стаў да новых мясцін. З дзяўчатамі мясцовымі на лад пайшло. Ды раптам здарылася непрадбачанае. Аварыя на шахце. Праўда, і да гэтага featurea рознае бывала, шмат хто калекам заставаўся, а некаму не пашчасціла больш жыццём цешыцца. Сцяпана пакуль што Бог шкадаваў. І на табе...

У забоі адбыўся выбух. Змену заваліла пародай. Вось тады Сцяпан напоўніцу спазнаў удушша. Ты хаўкаеш ротам, як рыба, намагаешся напоўніць лёгкія, а яны не

могуць разгарнуцца. Міжволі крычыш, але ніхто цябе не чуе, нават сам сябе. Сцяпан страціў прытомнасць. Гэта яго і ўратавала. Бо тыя, хто яшчэ мог нешта рабіць, кінуліся разграбаць завал. Відаць, парушылі раўнавагу, і парода абрынулася зноў. Ратаўнікі паднялі іх на паверхню ўжо нежывымі. Сцяпана адхадзілі. Хапіў надземнага паветра, ажыў. Дыхаў так часта, што, здавалася, бярэ ў запас.

Пасля гэтага Сцяпан пачаў баяцца глыбіні. Як толькі ўзгадае пра забой, пачынаецца ўдушша. Яго адпусцілі. Вярнуўся на свой хутар. Пайшоў у калгас. Проста ў брыгаду. Як жартаваў, быў старшым, куды пашлюць. Але шахта яшчэ доўга не адпускала. Часам прачынаўся ноччу і бег да акна: паветра ўхапіць, каб у грудзях палягчэла. Аднак нездарма характар гарохавы быў. Перамог і гэтую бяду. Працай заглушыў.

А тут акурат пачалося вялікае ссяленне з хутароў. З палявых прастораў і ўзлескаў адасобленых людзей кучкавалі — перавозілі ў перспектыўныя вёскі. Спатрэбіліся печнікі. Сцяпан трохі валодаў гэтай нязвыклай у іхняй сям'і справай — у арміі набіў руку. Паспрабаваў дапамагчы аднаму сваяку, другому. Атрымалася.

Пагалоска пра Сцяпанава ўмельства пабегла па навакольных вёсках. Просьбаў было столькі, што каб працаваў нават ноччу, усё адно не ўправіўся б. А яшчэ ж і ў калгасе трэба мінімум вырабіць, бо на сходзе пясочыць будуць. Праўда, старшыня зліставаўся, падтрымаў людскія просьбы. Дазволіў Сцяпану займацца толькі печамі. Працаваў так, што ажно жылы трашчалі. Але людзі былі задаволеныя. Ні разу не падвяла ніводная печ, ніводную перарабляць не давялося. Сцяпанавым цяплом саграваліся многія.

Неўзабаве ажаніўся. Узяў маладую даярку з суседняй вёскі. Высокая, паўнацелая і нябрыдкая. Даспадобы прыйшлася Сцяпанавай сям'і. Ягоная маці вельмі хваліла нявестку. Калі задумалі свой дом будаваць — вядома, у вёсцы, маці ўгаварыла аддаць Сцяпану частку гумна. Даўнейшае смаловае бярвенне было як звон, прыдалося на хату. Светла, прасторна, а неўзабаве і голасна — спачатку ад сынапершынца, а пасля і ад дзвюх дачок было ў ёй.

Зося аказалася не толькі працавітая, але і гаспадарлівая. Хата трымалася на ёй. Бо Сцяпан за чужымі печамі не бачыў ні свят, ні Каляд, не ведаў ні выхадных, ні прахадных. Працаваў як вол. Грошы, і вельмі добрыя, аддаваў Зосі. Тая трацiла іх з розумам, адкладвала ў запас. Калі ж Сцяпан загадаў не скупіцца — бо прападуць, так людзі дасведчаныя кажуць, — купілі халадзільнік, тэлевізар. Ажно два веласіпеды. А праз нейкі час першымі ў вёсцы і машыну прыдбалі.

Сёй-той мо і зайздросціць пачаў. Ведама, чужое багацце вока коле. Невядома чаго пачала праяўляць камандныя ноткі і Зося. Сцяпан спачатку аджартоўваўся, што на каровах некалі натрэніравалася, як на ферме працавала. Але іскра, укінутая ў хату, тлела. Часам і ад яе хапала куродыму. Для іншых жа яны жылі па-ранейшаму зладжана і працавіта.

Ды нечага непрыкметнага, але так патрэбнага ў сямейным жыцці, стала бракаваць. Штораз, то ўсё больш.

Разважаць, што знікае, Сцяпану не было калі. Ён па-ранейшаму ўлягаў у працу. Сам старшыня не аднойчы хваліў. Але вось граматы, як некалі ў шахце, Сцяпан ад яго не атрымаў ні разу.

Грошы цяклі ў кішэню няспынна. Ужо і сыну, які ажаніўся і ў суседнюю вёску пераехаў, хату збудавалі. Не хату, а сапраўдны дом — цагляны. Сам Сцяпан і будаваў. Прыхваткамі, пасля печаў. То калі-нікалі ў нядзелю, то позна вечарам. Дзівіліся людзі: нейкі двухжыльны гэты Сцяпан. Усюды паспявае. А вясковыя жартаўнікі з хітрынкай пакеплівалі:

— Не, не ўсюды. Дзе-нідзе адпачывае, бо знясіліўся...

Што яны мелі на ўвазе, Сцяпана мала турбавала. Пасля працы ледзь дабіраўся да ложка. Чуйная Зося заўважала, што за ноч ні разу пружына пад ім не рыпне, спіць, як пшаніцу прадаўшы. Дзе тут ужо да кахання-мілавання. Пра пацалункі і тыя даўно забыліся. Адно Сцяпан, калі падап'е часам, нейкую незразумелую прымаўку паўтарае:

— Трудна, Зося, так прыйшлося.

— Ідзі ты са сваімі балаболкамі, — адпрэчвае тады жонка. — І так галаву задурыў. Дай спокуй...

— Добра-добра... Я і даю, — згаджаўся Сцяпан. — Але не спокуй, а грошы. Скажы, у каго яшчэ столькі на кніжцы? Не скажаш. Бо адно ў Сцяпана твайго. А ты касірам стала. Як у калгаснай канторы. Ужэ і мне на пляшку шкадуеш. Шкадуй-шкадуй, мяне людзі і напояць, і накормяць, калі захачу. От так... Але мне ўсяго хапае...

Сям'я трымалася на Сцяпанавай працы ды грашах. Зося па-ранейшаму калупалася ў градах. Дзеці паразыходзіліся па сваіх сем'ях. Кожнаму справілі не адно абстаноўку, але і аўто.

І тады нечага вельмі важнага стала не хапаць у сваёй нязвыкла маўклівай хаце. Часцей пачала сварыцца Зося. Нават без дай прычыны. Знешне то ўсё як бы заставалася па-ранейшаму. Праца, гаспадарка, дом, пасцель. Але пасцель для сну. Спаў без задніх ног. Адно ў сне пальцамі варушыў, нібыта гліну перабіраў, каб каменьчык які не трапіў, бо тады не спаркуецца цагліна з цаглінай.

— Ведай: печ павінна моцна на зямлі стаяць, — любіў паўтараць Сцяпан. — Каб на вякі. Каб усе казалі: Сцяпанава работа!

Стома адбірала ўсе эмоцыі.

Сцяпан пачаў папіваць, але Зося прыстрашыла:

— Калі не перастанеш, кіну. Дальбог, кіну і да сваіх на Украіну паеду. Паглядзіш...

— Едзь, вялікая мне бяда, — храбрыўся Сцяпан. — Як пабудзеш без грошай, то сама прыляціш.

Казаць то казаў, але ў самога нешта трымцела, каб і праўда не заартачылася Зося. Яна такая, на ўсё здатная.

Але час улагоджвае ўсе беды. Калі пайшлі ўнукі, Зося пеклавалася над імі, як квактуха над куранятамі. Сцяпану, які з печамі больш не важдаўся, таксама весялей стала. Грошай не шкадавалі ні дзецям, ні ўнукам.

Жыццё кацілася, як купальскае кола з гары. То з падскокам, то кулялася, то падала. Але ўсё дагарала і дагарала...

Неўзабаве Сцяпан зразумеў, што за плячыма ўжо больш, чым перад вачыма. Пазіраў на пакручаныя вузлаватыя пальцы, спрабаваў выпраміць спіну, тупаў балючымі ў каленях нагамі, але адчуваў, што былой сілы ўжо няма.

— Знасіўся, — казаў ён кожнаму пры нагодзе. — Печам сілу параздаваў...

Мо хацеў, каб пашкадавалі. Але ў кожнага і сваіх бед хапае, не час з чужымі разбірацца. А да Сцяпана ўсё часцей прыходзіла разуменне, што не дзеля грошай жаніўся, сям'ю заводзіў. Так жыццё пакіравала. Дзе, у чыёй печы замураваў сваё каханне? Ён і сам не ведае. Гатоў быў хоць усе печы па цаглінцы разабраць, абы толькі вярнуць той светлы і памятны час першых сямейных гадоў. Каб ажыло захапленне жыццём, каханнем, Зосяй... Хоць і надгаладзь жылі некалі, ды ўспамінаецца ўсцешна. Але як не саскочыць рыбе с патэльні ў раку, так не мог і Сцяпан вярнуць пражытае.

Калі ўжо вельмі даймаў сваімі крыўдамі, Зося казала:

— Не адно ты такі. Я таксама во ледзь хаджу. Скурчыла. Свінні з каровамі давялі...

Часам даходзіла ўжо да бойкі. А гэтага пад ложкам не схаваеш. Суседзі дзівіліся: чаго гэта людзі падурэлі? Ад грошай бесяцца. Чаго ім не хапае? Ад дабра дабра не шукаюць. Самі ўсё маюць, дзеці дагледжаны. Унукі прыязджаюць то з Баранавіч, то з Клецка.

Але як чужая душа — цёмны лес, так чужое ўмяшанне — не лякарства. Мірыць Зосю са Сцяпанам не збіраліся. Хоць часам перад Зосяй пачыналі хваліць Сцяпана, што майстравіты і працавіты. До-обры мужык, галавасты. А яна тады злосна адказвала:

— Ат, зава́ла. Заваліў рукі, што і не выпрастаеш...

Хто са шкадаваннем, а хто з радасцю назіралі: што ж далей будзе.

Дачакаліся. Сцяпана схапіла сэрца. Затахкала, зачасціла, як матор, які не заводзіцца.

«Гэта шахта мяне даганяе», — скрушна падумаў Сцяпан, і яго ажно жаль працяў.

Прыскочыў сын, каторы бліжэй, пераапрануў Сцяпана ў чыстае і ў Нясвіж на сваёй машыне паімчаў.

— Дурны, — казала пасля Зося. — А каб не дай Бог па дарозе што сталася? Трэба было «хуткую» выклікаць.

Але давёз. Там адразу ў рэанімацыю паклалі. Праз два дні палепшала, а пасля перавялі ў агульную палату. Туды і з'явілася Зося. Нечакана. Сцяпану яшчэ не дазвалялі ўставаць, і ён ляжаў дагары. То пазіраў у столь, то навальвалася дрымота. Не заўважыў, як увайшла Зося. Кінулася да ложка. Валюхалася на хворых нагах, як качка, але бегла, калі гэта можна было назваць бегам.

— Я тут, Сцяпан... я тут, — паўтарала раз за разам. — Ой, Сцяпанка мой, як схуднеў, бедны, — падышла да ложка, падняла галаву мужа і моцна ашчаперыла за шыю.

Сцяпан і ўцяміць не паспеў, што адбываецца. А Зося падняла яго, пасадзіла, абняла і цалавала. То ў вочы, то ў шчокі, а пасля ў губы. Сцяпан не ведаў, што рабіць. Адштурхнуць — пакрыўдзіш жонку. Прыгарнуць — адвык. Ды і сілы нехта адабраў. Сэрца збілася з рытму, паляцела некуды ўніз. Ён сілком падняў рукі і паклаў на плечукі жонкі. Як бы абняў яе.

А ў Зосі слёзы гарохам па рудых ад загару шчоках. Сцяпан намагаўся вылузацца з абдымкаў, але дзе ты справішся з дзябёлай і ўсё яшчэ дужай жонкай.

— Не абслюньвай ты мяне, — адно паспеў прамовіць. — А то слязамі заліла. Кашуля мокрая...

Калі ўжо добра нацалавалася, паспела выказаць мех шкадаванняў, вохканняў і пажаданняў, Зося нечакана прамовіла:

— Я пайду ўжэ, бо доктар дасць прачуханца.

І пакуль Сцяпан няўцямна пазіраў на яе, нічога не разумеючы, патлумачыла:

— У бальніцы я. Тут. На другім паверсе. Ціск падскочыў... Кажуць, крыз нейкі... Забралі ўслед за табой, — і павалюхалася да дзвярэй. — Я зайду яшчэ. Я буду часта заходзіць...

— Не хадзі... калі ціск, — казаў Сцяпан наўздагон, але Зося была ўжо за дзвярыма.

Сцяпан павярнуўся да суседа.

— Бачыў? — прамовіў і моўчкі пазіраў у твар. Трымаў паўзу. — А ў цябе жонка ёсць? — спытаў нечакана.

— А як жа...

— А твая такая, як мая Зося? Бачыш, якая... якая... — і не знайшоў з кім альбо з чым параўнаць. — Бачыш, як цалуецца? Як маладая... От так... — пахваліўся Сцяпан, а ў самога ажно падбародак дрыжаў.

Сэрца ж нечакана зайшлося, стала так мілосна-млосна, што на вочы наплыла мокрая плямка, засланіла зрок.

Сцяпан крактануў і лёгка апусціўся на падушку.

# ЧУБАТАЯ

*З самага ранку* мора было спакойнае, а вада незвычайна празрыстая. Сонца выкацілася на чыстае неба, нібыта вырасла проста з марской глыбіні, і мо таму здавалася добра вымытым.

Чубатая звыкла кінула навокал сваім пільным спрактыкаваным вокам і моцна, гартанна крыкнула, што азначала не толькі задавальненне, але і сігнал для супляменнікаў: будзьце напагатове. Пасля сарвалася з надбярэжнай сасны і на шырока распасцёртых дужых яшчэ крылах пачала планіраваць над водным люстрам.

Найбольш нецярплівыя чайкі хацелі падтрымаць яе сваім лётам, але Чубатая не любіла самавольства, яшчэ больш рэзка і пранізліва загадала: «Заставайцеся на беразе», і тыя паслухмяна паселі на дрэвы. Прадчуванне не падманула яе — ля берага сапраўды было шмат рыбы. Ад вастраплаўніковых спін вада ажно кіпела. Пра тое ж сведчылі і шматлікія лодкі з даўгавудымі рыбаловамі, што выстраіліся на значным аддаленні ад берага.

Чубатай яе празвалі даўно. Спачатку зласліва, на што сердавала і яна сама. Пасля прывыкла — Чубатая дык Чубатая. Сілы гэта не адбірала, а паважлівасці дадавала. Сапраўды, чубатай яна станавілася ў небяспечных сітуацыях, калі трэба было бараніць супляменнікаў альбо папярэдзіць іх пра небяспеку. Тады яна імкліва падымалася на ўсю даўжыню сваіх даўгалыгіх ног, што дадавала не толькі росту, але і моцы, страшна крычала і лапатала крыламі, пасля нечакана прысядала, нібыта хацела стаць непрыкметнай, з усёй сілы выцягвала ўперад галаву з моцнай дзюбай, ад чаго цела яе станавілася прадаўгаватым і дужым, як марская тарпеда. Яна бачыла іх саміх і іхнія выбухі падчас марскіх вайсковых вучэнняў ля Севастопаля. Гэта моцна напалохала яшчэ маладую Чубатую і іхняга важака Бліскавічнага.

Вось тады ўпершыню над яе галавой сам сабой уздыбіўся высокі і бухматы чуб. Пасмяяліся чайкі з палахлівасці малодшай сяброўкі, але з часам зразумелі, што гэта азначала яе асаблівую сканцэнтраванасць і скіраванасць на справу. Чуб і стаў яе мянушкай, а неўзабаве іменем. Здаралася, нават у палёце, калі пагражала небяспека, а яна пачынала моцна крычаць, над галавой пагрозліва чубіўся снапок пярынак. Чапаць яе ў такія моманты было небяспечна: кожнаму дасць здачы, пачне так матлашыць, што ажно пер'е сыплецца.

Сярод іншых чаек Чубатая выдзялялася сваім дужым і вялікім целам. Зласліўцы казалі, што гэта яна ад старасці распаўнела. Але Чубатая не звяртала на такія казанні ўвагі: хай гавораць, яна ж дасць фору любому маладому. Як рабіла, так і рабіць будзе сваю справу апекавання родам. А наконт цела...

Такая ўжо, відаць, у яе канстытуцыя. Бацька таксама дужы быў і рослы. Калі распусціць, бывала, крылы, то як сапраўдны планёр, якіх апошнім часам пабольшала над марскімі хвалямі. Ніякай буры не баяўся, аніякі шторм для яго не перашкода — любіў пабарукацца са стыхіяй. Здавалася, у ягоным голасе з'яўляецца нейкая асаблівая радасць і паклічнасць. У бацьку пайшла Чубатая. Мо таму і стала галоўнай гаспадыняй, парушыла традыцыю, згодна з якой справамі роду заўсёды апекаваўся *ён*, а не *яна*. З клопатам сваім спраўлялася не горш за папярэднікаў, супляменнікаў абараняла годна і надзейна. За тое і сама павагу мела, і род свой сярод найдужэйшых яшчэ больш умацавала.

Чубатая мерна планіравала над морам, пільна прыглядалася да вады. Яна заўважыла, што да берага падыходзяць касякі рыбы. Добра, каб гэта была невялікая рыбка, для нявопытных маладзёнаў зручней. Але трэба браць тое, што ёсць, а не чакаць таго, што хочацца.

Чубатая гатова была даць сігнал супляменнікам на пачатак ловаў, як раптам заўважыла, што рыба сплывае ад берага. Да Чубатай падступілася трывога, але

аказалася, што не варта панікаваць раней часу. Ды і наогул паніка не спрыяе ніякай добрай справе.

Вада толькі нейкі час пабыла бязрыбнай, а тады яе паверхню зрабацінілі плаўнікі новага касяка. І не аднаго. На гэты раз да берага набліжаліся акуні. Добрая рыба, але занадта буйная. Цяжкавата давядзецца чайчанятам. І не толькі таму, што вопыту мала — дзеля таго і задумваўся гэты «паказальны ўрок», сённяшнія іспыты, а таму, што справіцца з такой важкай рыбай няпроста і вопытным ды спрактыкаваным лаўцам. Але — спажывай тое, што мора пасылае. У простых сітуацыях — кожны майстар, а ты пакажы свае здатнасці ў няпростых.

Чубатая наблізілася да берага, павярнула цела ў кірунку рыбнай чародкі, уладна і поклічна крыкнула і імкліва саступіла з паветранай дарогі. Каб не зрабіла гэтага, то магла б апынуцца пад ударамі крылаў згаладалых па сапраўдных ловах маладых чаек. У такія моманты яны гублялі галаву, не азіраліся на іншых. Спрыт кожнага быў галоўным рухавіком усёй гэтай бязладнай і мітуслівай, калі глядзець збоку, чарады.

Так яно і аказалася. У адно імгненне паветра пачалі малаціць дзесяткі дужых крылаў, чайкі з радасным ваяўнічым крыкам пусціліся на пошукі здабычы.

— Не спяшайцеся, — параіла наўздагон Чубатая. — Рыба сёння буйная. Не марнуйце сілы...

Але хто ж яе пачуе, апантаны разняволенасцю і ўласнай значнасцю. Пачыналася сапраўднае ап’яненне ад прадчування вялікай здабычы і настойлівай барацьбы за яе. А падчас гэтага ўсялякае можа здарыцца...

Неўзабаве моладзь заўважыла рыбны касяк. Некаторыя пачалі як не падаць на ваду, намагаліся хутчэй ухапіць вёрткую рыбіну. Ды не ўлічвалі сілы сваіх памкненняў і іхняе пікіраванне заканчвалася глыбокім ныраннем, маладыя целы сапраўды як тарпедай разразалі водную глыбіню. Ухапіць рыбіну ў такіх умовах было цяжка. Але гэта толькі паддавала імпэту. Шум, крыкі абурэння і радасці, незадаволенасці і падтрымкі запанавалі над вадой. Тут не толькі іншага не пачуеш, свой уласны голас і то не чуцен. Але для ўдзельнікаў ловаў гэта найлепшая музыка — музыка барацьбы, спрыту, сілы, вынослівасці. Маладосці, адным словам.

Хапала і проста здзіўляючай, як для нявопытных, хітрасці. Аматары паказытаць нервы падымаліся вышэй за іншых, трошкі кружлялі над усімі і каменем кідаліся ў ваду. Не далятаючы да яе, марськануць беражком крыла па гладкай паверхні і маланкава ўздымаюцца ўгару. Адно свіст крылаў ды дробныя хвалі па паверхні. Вопытныя акуні ведалі гэткія штучкі, таму абачлівасці не гублялі, збіваліся ў клубок і апускаліся ніжэй, да самага дна.

Такая гульня працягвалася доўга. Але перахітрыць адным другіх станавілася ўсё цяжэй. Бо чайкі, нагуляўшыся ўволю, пачыналі сапраўднае паляванне. Над вадой як бы нават пацішэла. Гэта, відаць, і падманула рыбіную пільнасць. Што тады пачыналася — не перадаць. Чайкі, ухапіўшы здабычу, намагаліся як мага хутчэй адарвацца ад вады. Але, зрабіўшы бяду, не надта ўцячэш. Важкія рыбіны, здавалася, не адпускалі, цягнулі ўніз. Даводзілася на ўсю моц працаваць крыламі, каб узляцець альбо хоць бы спланіраваць да берага. Удавалася гэта не ўсім.

У адных вёрткая рыбіна выслізгвала з дзюбы і плюхалася назад у ваду — на вялікі жаль лаўца і здзеклівую пацеху іншым. Такіх было шмат. Іншыя моцна трымалі рыбіну папярок, за спіну, і з усёй сілы ляцелі да берага, каб не знясільвацца над вадой. Часам садзіліся на яшчэ не нагрэты бетонны пірс, на якім любілі запальваць на сонцы свае целы курортнікі. Гэта часам моцна замінала чайкам, але дзе ты дзенешся ад такога назойлівага суседства. Паступова людзі прывыклі да чаек, а чайкі прымірыліся з людзьмі. Прысутнасць назіральнікаў толькі дадавала імпэту.

Вось і цяпер Чубатая заўважыла, што самыя раннія купальшчыкі ўжо мераюць ваду ўзмахамі рук. Акурат ля месца ловаў. «Каб гэта не прывяло да нечаканасцей, — трывожліва падумала вопытная гаспадыня. — Захопленыя справай чайкі часам ні на што не звяртаюць увагі».

Так і было. Маладыя нібыта пазабываліся на ўсю сваю ранейшую навуку. Ведама, нейчы расказ — гэта не самастойная праца, не ўласны вопыт. Гэткія вось ловы — во дзе вопыт! Чубатая была побач з маладымі. Яна назірала, хто і што робіць, каму не стае вынослівасці, у каго бракуе абачлівасці, каго захлістваюць эмоцыі, а хто проста ад злосці з усёй сілы матлошыць злоўленую рыбіну. Пра ўсё гэта Чубатая грунтоўна раскажа на «разборы палётаў», каб ведалі, што можна, а чаго нельга, каб навучыліся з меншымі выдаткамі забяспечваць сябе.

Першая атака чаек не разагнала акунёў. Адны чайчаняты, як іх вучылі, намагаліся ўхапіць рыбіну за галаву і адразу ж праглынуць — сабе спажыва і для іншых не спакуса. Але дзе там — хіба пачнеш круціць тое трапятлівае цела, каб знайсці галаву? Ды яшчэ ў лёце. А тыя, хто неразумна спрабаваў рабіць гэта, адразу гублялі здабычу, якая са спалоханай радасцю плюхалася ў ваду. Гэта выклікала ў чаек злосць, абвастрала іхні паляўнічы імпэт. А тут, як на здзек, іншая чайка нясе ў дзюбе здабычу, ды такую буйную, што зайздрасць бярэ. І тады тая, што згубіла сваю, кідаецца да сяброўкі і з крыкам, у якім змяшаліся і адчайная радасць здабыўцы, і сорам за страчаны спрыт, і жаданне некаму адпомсціць, выхоплівае ў раптоўна разгубленай чайкі яе ўлоў. Тая ад нечаканасці не разумее, што адбылося, а пасля кідаецца наўздагон. Ды дарма, бо не дагоніць крыўдзіцелькі. А ў тае самое ўжо нехта іншы адабраў няправедна здабытую спажыву.

Новая хваля крыку, шуму, галасу абрушваецца на ўсё большую купку купальшчыкаў. Яны ад здзіўлення ажно з вады павылазілі і назіраюць за бясплатным і жывым фільмам з цыкла «Жывая прырода»...

Але вось нехта хітрэйшы ўхапіў акуня і намагаецца адляцець ад суродзічаў: каб не адабралі. Важкая рыбіна цягне ўніз, сіліцца выслізнуць з дзюбы. Бедалага з усёй сілы лапоча крыламі, каб хутчэй да берага дацягнуць, і адначасова не губляе пільнасці: па баках азіраецца, каб не адабралі. Аматары лёгкай спажывы і сапраўды побач. Бедны здабыўца паддае сілы, адчайна махае крыламі, мацней сціскае дзюбу, імкнецца да збаўчага берага. Яшчэ адно намаганне, яшчэ крышку, і, здаецца, уздых палёгкі вырываецца з задыханых грудзей — даляцеў. Ад радасці выпускае рыбіну з дзюбы, перакананы, што яна ўпадзе на гальку, а не ў ваду.

Стомлены здабыўца радасна апускаецца побач, гучным крыкам абвяшчае ўсім, што гэта яго здабыча, яго, а не некага іншага! А побач панасядала процьма тых, хто не супраць падзяліць чужое снеданне. І таксама крычаць, таропка ходзячы па круглых камянях. Падыходзяць усё бліжэй і бліжэй. «Адбяруць, сапраўды, адбяруць», — трывога апаноўвае нядаўняга пераможцу. І ён пачынае са злосцю дзяўбці рыбіну, але супернікі набліжаюцца імкліва. І тады з адчаю ён хапае рыбіну за галаву, хоча праглынуць. Яшчэ хвіліна, і чужым не дастанецца нават хваста.

Але... прагнасць ці не заўсёды бывае пакаранай. Рыбіна засела ў горле. Як ні кеўкае лавец, а яна не пасоўваецца, не глытаецца. Каб не дасталася іншым, здабыўца падымаецца ў паветра. Цяжка, рыбіна цягне ўніз. А калі разам з ёю ўпадзеш у ваду, то можаш і на дно пайсці. Спалоханы лавец намагаецца выпусціць яе, хай сабе зваліцца ў мора, хай іншыя падхопяць, абы яму самому бяды не мець...

Ды не падае рыба з дзюбы, плаўнікі не пускаюць. І невядома, што было б далей, як бы выбавіўся з бяды няўдачлівы маладзён, каб не прагавітасць іншых. Падскочылі найбольш увішныя і ўхапіліся за хвост акуня. Здабыўца турзануўся ў адзін бок, адбіральнік у іншы, пасля яшчэ раз, і распалавіненая рыба дасталася кожнаму.

Ва ўсёй гэтай мітусні спрактыкаванае вока магло б заўважыць і нечаканых гасцей-супернікаў. Гэта качкі-ныркі. Яны даўно пасуцца ля берага і паказваюць сапраўдныя рэкорды падводнага плавання. Вось і цяпер чорныя манішкі качак нязвыкла глядзяцца сярод белых сурдутаў чаек. Але гэта зусім не перашкаджае маўклівым ныркам знаходзіць сваю здабычу. І мо больш удала, чым гаманкім чайкам. Аднак рыбы наплыло столькі, што яе не бракуе ні адным, ні другім. Каб аб'явілі спаборніцтва, то невядома, ці паддаліся б вёрткім чайкам не менш увішныя ныркі...

Чайкі ж працягваюць сваё паляванне. Чубатая звярнула ўвагу на паводзіны Крывадзюба. Малады, дужы, спрытны, яна даўно яго прыкмеціла і глядзіць з захапленнем і зайздрасцю. Ён не губляе паважнасці, не паддаецца ні кпінам, ні чужой сіле. Чубатая разумее, што верхаводзіць ёй не вечна, давядзецца некалі саступаць. Крывадзюбу можна перадаць апекаванне родам, ён справіцца, адно каб прага панавання над іншымі не зацьміла розуму.

За ім заўсёды цікава назіраць, кожны раз што-небудзь адпаліць. Вось і цяпер вырашыў падражніцца з адным з купальшчыкаў.

Крывадзюб злавіў акуня, але не паляцеў з ім на бераг, а пачаў трыбушыць проста на вадзе, ледзь не пад носам у аднаго з плыўцоў. Той заўважыў гэта і давай кіравацца да Крывадзюба, мо каб адабраць рыбіну ці проста напалохаць. Толькі наблізіцца да чайкі, а тая наперад адскочыць. Чалавек следам, а Крывадзюб яшчэ далей. Так увагнаў у азарт плыўца, што не заўважыў, як той і сапраўды ледзь не па хвасце рукой пляснуў. Ад нечаканасці Крывадзюб выпусціў здабычу і мусіў падняцца над вадой. Задаволены плывец ажно галаву задраў, пазіраючы на чараду чаек.

«Не, Крывадзюб не даруе гэткага», — падумала Чубатая, і як у ваду глядзела. Той і сапраўды пачаў кружыцца акурат у тым месцы, дзе на гладкай паверхні была бачна бліскучая лысіна крыўдзіцеля. «Няўжо дзеўбане?» — спалохалася Чубатая і хацела грозна крыкнуць, каб не чапаў, але яе апярэдзіў Крывадзюб. Плывец і апамятацца не паспеў, як яму на галаву пляснулася нешта цёплае і з непрыемным пахам. Ягоны абуральны крык заглушылі насмешлівыя, здавалася, галасы чаек.

Падалося, што гэтага галасу напалохаліся качкі-ныркі. Яны нават паляванне сваё прыпынілі. Калі дагэтуль паважна плавалі па вадзе, неяк смешна крывілі галоўкі, нібыта нешта вышуквалі, пасля чорнымі маланкамі кідаліся ўглыб і трывожна доўга не выплывалі, ласуючыся спажыўнай здабычай, то цяпер адно здзіўлена пазіралі на гурт чаек і Крывадзюба, на абражанага плыўца. А мо проста прытаміліся ад працяглага падводнага плавання і гэткім чынам аднаўлялі растрачаныя сілы. Вось адна пара пераляцела на пірс, дзе мітусілася шмат белакрылых чаек. Ныркі парастапырвалі свае прамоклыя крылы, сагнулі іх, як людзі рукі ў локцях, выцягнулі ўгару дзюбы і пачалі лавіць сонца. А каб хутчэй збавіцца ад вады, патрасалі крыламі, з якіх ажно пырскалі бліскучыя кроплі. Доўга траслі, чорнымі пірамідкамі стоячы сярод белых чаек. А пасля зноў за промысел свой узяліся.

Чубатая заўважыла, як адзін са здабытчыкаў адлучыўся ад іншых з вялікай рыбінай у дзюбе і пакіраваў да пляжа, дзе не было чаек і мала людзей.

«Хітрун свае фокусы паказвае, — пазнала Чубатая. — Вось каму цяжка давядзецца ў жыцці, — падумала яна. — Ніяк не хоча агульных правілаў прытрымлівацца. Намагаецца хітруючы свет перайсці...»

А Хітрун ужо блізка да пляжа, неўзабаве сядзе і пачне снеданне. Ды суродзічаў не падманеш. Шмат іх апынулася побач. Хітрун пагрозліва-папераджальна закрычаў і сеў на буйную гальку. Побач апусціліся іншыя чайкі, акружылі. Хітрун шырока распусціў крылы і паспешліва адскочыў у адзін бок, пасля ў другі. Рыбіну з дзюбы не выпускаў. Але і праглынуць адразу не мог. Адчуў, што задыхаецца. Мусіў выпусціць і пачаў таропка дзяўбці. Чайкі сталі набліжацца. Хітрун з усіх сіл трапе-

ча крыламі. То па адным з дамагальнікаў ударыць, то па другім. Да іншых спіной павернецца.

Пасля ж ухапіў рыбіну і ўзляцеў. Чайкі за ім. Хітрун нешта грознае крыкнуў ім, а акунь узяў і выпаў з дзюбы. Хітрун наўздагон. Злавіў ужо ў вадзе. Падняўся ў паветра і пакіраваў на пірс. Адварочваецца ад вёрткіх даганяльнікаў, матляе ў паветры рыбінай — каб іншыя не адабралі. Даляцеў, апусціўся і пачаў трывожліва азірацца. Чайкі да яго, а ён убок. То адбяжыцца, то ўгору падскочыць.

Так і цягаў нежывога ўжо акуня па бетонным пірсе, хаваючы ад іншых. Пасля пачаў прагна дзяўбці. І не заўважыў, як застаўся адзін. Адступіліся чайкі, збоку назіраюць за баляваннем Хітруна. Ні адна не падыходзіць, не адбірае спажывы.

Чубатая ж за ўсім з палёту цікуе. Пасля бліснула сваім натомленым за доўгае жыццё вокам, нібыта ўсміхнулася, і паляцела да таго гурта, што з віскам, крыкам, шумам насіўся над вадой, дзе ўсё яшчэ віравалі крутабокія акуні.

# ВАРОНІН ВЫБРАНЕЦ

*Не шанцавала* Колічку ў жыцці. Як павялося з малых гадоў, так дагэтуль і цягнецца. Нездарма, відаць, кажуць: на каго Бог, на таго і людзі. Спярша называлі цыганом. Пакуль быў малы, то не разумеў гэтага — цыган дык цыган, якая яму розніца. Гуляе разам з іншымі вясковымі дзецьмі — не крыўдзяць. Разам чыжыка ганяюць, разам па мячу лупяць, на рэчку з сабой клічуць. І толькі калі засярдуе хто на Колічка, то адразу злосна праганяе: «Пайшоў прэч, цыган». Яго і прозвішча мала хто назаве, калі спытаеш, нават з дарослых.

Колічак і ёсць Колічак.

Мо за малы рост назвалі, а мо праз тое, што надта худы, ці мо што адзін ён у маткі, няма ні брата, ні сястры. Нават бацькі і то няма. Старэйшыя за яго хлопцы часам кажуць, што Колічкаў бацька паехаў сабакам сена касіць. А калі пад злосць, то яшчэ і дадаюць, што гэта яго чэрці забралі на той сенакос. Колічак не разумее гэтага, але надта чакае, калі ўжо ён накосіць таго клятага сена, каб сабакам хапіла і каб чэрці адпусцілі? Мо тады і вернецца дамоў. Хоць ты едзь ды памагай яму. Да маці Колічак з роспытамі не прыстае, бачыць, што гневаецца яна тады, хоць і маўчыць. Адно часам скажа, што з'ехаў некуды, мо ў горад, мо ў чыстае поле. Недзе там згубіўся ці заблудзіўся.

Крыўдна Колічку, што такі нягеглы ў яго бацька: не можа знайсці дарогу дадому, не здольны сена сабакам накасіць, не хоча маці якую капейчыну перадаць, што за сена перападае. Не падзеліцца, каб Колічку на марожанае дасталося, бо надта ж смачнае яно. Так здаецца яму. Іншыя часта ядуць, ліжуць, смокчуць, а ў Колічка адно сліны поўны рот ды буркатанне жывот пераварочвае. Але нічога, вось накосіць бацька сена, заробіць грошай, знойдзе дарогу, вернецца да іх, і тады Колічак наесца марожанага ўволю. Ажно сем «стаканчыкаў» адразу з'есць. Чаму менавіта сем, ён і сам не ведае, проста ад дарослых найчасцей чуў пра гэтую лічбу, вось і запомнілася.

Калі падрос, валасы на галаве трохі закучаравіліся, сталі чорныя, як смоль, вочы бліскучыя і быстрыя, таксама чорныя, нібыта вугалькі свецяцца з-пад бухматых броваў. Нават твар пасмуглеў. Тут ужо ад цыгана не адкруцішся. Але і да гэтага прывык Колічак. Хай хоць гаршком называюць, абы ў печ не пхалі.

Бацька ж, відаць, і праўда заблудзіўся, ці мо тыя сабакі парвалі яго, якім сена касіў, ці чэрці моцна на прывязі трымаюць. Не едзе і не едзе, хоць ты плач. А Колічку ўжо і марожанага таго не хочацца, хай малеча ім ласуецца. Ён жа дарослы стаў, за

гаспадара, на ім хата трымаецца, як часам любіў даказваць сябрам. А раз дарослы, то не марожанае яму патрэбна. Ён ужо не супраць і на корак наступіць. Маці, праўда, злуецца тады, сварыцца, нават плача, кажа, што з такім характарам і Колічку давядзецца сена касіць тым самым сабакам. На што Колічак злосна агрызаецца:

— Хопіць і аднаго касца, калі ён такі мудры. Я без яго выжыў? — пытаецца найперш сам у сябе і сам жа адказвае: — Выжыў. І цяпер выжыву...

— Ат, мой ты сыночак, каб жа і праўда выбіўся ты ў людзі... Колькі можна тут цялятам хвасты круціць... Хіба ад гэтага паразумнееш?

— Ну ты, мама, і скажаш! Як бы і неразумны ўжо я ў цябе, — прымірэнча кажа Колічак, і светлая ўсмешка кранае яго вусны. У такі момант твар яго робіцца добры, нават нейкі па-дзіцячы бездапаможны, хоць ты вазьмі ды пашкадуй хлопца. — Не ўсе ж неразумныя тут засталіся. І не ўсе разумныя ў горад з'ехалі...

— Дак я ж, Колічак, што... Я не пра цябе... Гэта я так, як людзі кажуць...

— Людзі хай сабе кажуць, а ты сваім розумам жыві, — нечакана дае параду сын.

— Дак ужо ж... Я хіба супраць? — губляецца маці ад такога сынавага шкадавання.

Да ласкі яны не надта прывычныя. За працай не было калі пасміхацца ды мілавацца. Але душу Колічак мае спагадлівую. Да падлеткаў і малых дзяцей у яго асаблівыя пачуцці, як бы шкадуе іх. А яшчэ да жывёлы. Колькі разоў, бывала, прынясе дадому пакалечаную пташку, лечыць яе, даглядае, размаўляе з ёй. А каб сабаку калі выцяў, то барані Божа! Не зачэпіць. І Мурза аддзячваў яму тым жа. Прыйдзе, бывала, Колічак на падпітку, а Мурза з будкі вылезе, насустрач кінецца, на грудзі скача, нібыта абдымацца хоча, твар ліжа — як бы непатрэбны хмель вылізаць намагаецца. А Колічак адно ўсміхаецца сваімі белымі зубамі і сапраўды абдымае Мурзу, дзякуе за тое, што не дае яму хістацца.

А вось каго не любіў Колічак, дык гэта варон. Ён і сам не ведае, чаму. Проста агіду выклікаюць яны. Сваім знарочыстым нахабствам, бязмежнай прагавітасцю і ганарыстай бязбояззю. Як ні крычы на іх, як ні пляскай у далоні, а не згоніш з градаў, калі буракі там пасееш альбо каліва жыта — не адагнацца, хоць ты лопні. Мала дапамагала і пугала, якое ставілі пасярод сотак — на накрыж збітыя палкі адзявалі стары Колічкаў пінжачок, да верхняй патычкі, дзе галава павінна быць, прывязвалі пусты цэлафанавы мяшэчак, каб лапатаў ад ветру. А гэтай поскудзі хоць бы што, нават на плечы пугалу пасядуць і гергечуць на ўсё наваколле, як бы насміхаюцца, смеласцю сваёй выхваляюцца.

«А каб вы падохлі, — злосна шэпча сам сабе Колічак. — Няма ад вас спасу. У лес ляціце, там спажывы хопіць. А то, бач, прывыклі з чужога ласавацца. Як паны некалі. Дак і іх жа звялі са свету. А з вамі во ніяк і ніхто не справіцца...»

На гэта вароны яшчэ больш гучна і злосна каркалі, як бы нешта адказвалі Колічку, наракалі за ягоную крыўду, прычыненую чорнаму воінству, упрыгожвалі пінжак на пугале сваімі меткамі і зляталі на пасеянае. Ды так хітра рассаджваліся, што адразу і не сагнаць — разбягаліся па ўсім полі, ты яе спудзіш у адным месцы, а яна да сяброўкі сваёй, што ў іншым канцы капошыцца.

А яшчэ кажуць, што вароны дурныя, і чалавека з імі параўноўваюць, найбольш чамусьці мужыка. Дарэмна, гэткіх хітруноў пашукаць трэба! Не адчэпішся ад іх, не абдурыш. Яны цябе з носам пакінуць, а то і пасмяюцца, калі хочаш. Неяк ранняй вясной Колічак назіраў за іхняй кемнай хітрасцю. Знайшлі недзе добры кус хлеба. Але такі цвёрды, што не ўдзяўбці. Як ні мучыліся, а малы наедак. І тады адна з іх пакаціла хлеб да лужыны. Іншыя кінуліся памагаць. Упхнулі ў ваду, пакачалі там, пакуль хлеб не размок. А тады ўжо лёгка справіліся з ім. Так што не такія дурныя вароны, як пра іх кажуць...

Аднак для Колічка вароны сталі моцным і непатрэбным раздражняльнікам. Бо калі ўсім кагалам падымуцца над полем, то такі гармідар наладзяць, так моцна кры-

чаць, што ў яго ажно галава не вытрымлівае. Уцякае ад іх, хаваецца дзе і як можа, бо ў такім стане недалёка і да бяды, не помніць сябе Колічак. Ды гэтая чорная злыбеда як усё-адно адчувае яго стан, падлятае да хаты, кружыцца над страхой і каркае, каркае... Колічак накрывае галаву падушкай, але яму здаецца, што карканне залазіць і туды, варонін крык выкручвае нервы, сціскае сэрца.

Маці ўжо і так яго супакойвае, і гэта раіць, і тое, а яго ўсё адно круціць. Настойвае, каб да знахаркі схадзіў, або да бабы Жэні, якая пярэпалах вылівае.

— Нашто мне той пярэпалах? — пытаецца раззлаваны Колічак. — Выдумала... Мо яшчэ скажаш да бабы Вангі з'ездзіць альбо да Кашпіроўскага? То давай грошы, паеду...

— Ты не выдурняйся. Я табе праўду кажу: схадзі да бабы Жэні, — неяк вінавата настойвае маці. — Калі не паможа, то й не пашкодзіць, — а сама хітра так і пільна пазірае на Колічка, як бы недагаворвае нечага.

А і праўда — недагаворвае. Не прызнаецца ў здарэнні адным.

Даўно тое было. Яшчэ калі Колічак бязмоўна на людзей пазіраў, на неба, на сцены хаты, на людзей. Адно сам сабе шчыра ўсміхаўся ружовымі дзяснамі, як бы з самім анёлам-ахоўнікам вачыма размаўляў. Пайшла тады Колічкава маці палоць калгасныя буракі, дзялку далі і ёй, нягледзячы на малое дзіця на руках. Пакладзе Колічка на падасланы мяшок, разапне вялікую хустку-канаплянку на трынозе з галін алешыны, каб сонца не пякло малога, а сама з лебядой ды пырнікам ваюе. Свой кавалак хлеба і сыночкаў правіянт побач з Колічкам пакладзе, ражком мяшка прыкрыўшы. Калі заплача малое, падыдзе, абатрэ рукі аб хвартух, дастане бутэльку з малаком і поіць сына. А тады і сама скарынку ў рот укіне, загоніць малаком і зноў у бурачныя градусы.

Напачатку не зважала нават, чаго гэта вароны над полем кружацца, каркаюць, як на дождж. Аж гэта яны абхітрыць яе намерваліся, прывучвалі да сябе, пільнасць гасілі, каб не баялася, не праганяла. Маці і праўда не звяртала на іх увагі, працай занятая. Ды раптам як бы штурхануў яе хто, нібыта падказаў нехта на сыночка зірнуць. Зірнула — і ледзь не самлела, да малога кінулася, у лебядзе блытаючыся і ледзь не падаючы. Бо там, убачыла, вароны спаважна ходзяць, пад навес з хусткі пазалазілі і нешта там чвэраць.

— А каб на вас халера! — закрычала маці. — А кыш, — забылася, што зусім не куры перад ёй, але як прагнаць іх, то й не прыдумала. — Кыш, чаго вас прыгнала сюды?

Сама ж кінулася да сыночка, размахвала рукамі. Вароны не спяшаліся ўцякаць. Яны сваімі моцнымі дзюбамі адгарнулі мяшок, растрэслі клуначак, дзе хлеб з малаком, і пачалі ласавацца. Дзюбы так і мільгаюць ля Колічкавай галоўкі. Убачыла гэта маці, і сэрца яе зайшлося ад страху, унутры як абарвалася нешта. Але і сілы адначасова дадалося, падужэлі ногі, самі неслі на збавенне сына. Пачала гучна пляскаць у далоні, але на хаду гэта не надта ўдавалася. Папусціць грудай баялася: каб у сыночка не папасці.

Вароны ж толькі часам здзіўлена паглядвалі на яе, аднак справы сваёй спажыўчай не пакідалі. Толькі падскочыць адна, як бы адганяючы другую, замахае крыллем і зноў побач сядзе. Тады дзве разам дзеўбануць хлебную скібку, і кожная намагаецца сцягнуць яе у свой бок. А тады пачалі сварыцца між сабой, адганяць адна адну, яшчэ мацней лапатаць крыллем, сягаючы і на Колічкаў твар. Калі маці падбегла, усё яшчэ пострашна махаючы рукамі, вароны няспешна, як бы нехаця, з гучным крыкам незадавальнення падняліся ўгору. Уцякаць, аднак, не збіраліся, усё кружылі над гэтым месцам, спадзяваліся, відаць, на працяг.

Убачыла маці твар сыночка з чырвонымі пісягамі ад варонiных крылаў і закрычала, заплакала, загаласіла:

— А сыночак ты мой, а што ж яны з табой нарабілі? А Божачка мой! А каб яны

падохлі ўсе да адной. Не нажарэцца ніяк, плойма гэтая. На людзей ужо нападаюць. Канец свету...

Маці ўсё гаварыла, вылівала свой гнеў, сваю бяду і крыўду, а сама схапіла на рукі сына, пачала цалаваць, лёгенька дакранаючыся губамі да чырвоных шнараў. Пасля перахрысціла яго і зноў пачала цалаваць, прыгаворваючы:

— А Колічак мой, а сынок! А за што ж яны цябе так? Ніяк не спрындзяцца, заразы гэтыя, не падохнуць. І не баяцца нічога!

Колічак жа, які спачатку плакаў, аціх і нават ласкавая ўсмешка кранула ягоныя вусны. Для маці гэта было так нечакана, што яна ажно заплакала знянацку і невядома чаму прамовіла:

— Будзеш жыць, сыночак мой, — як бы яму і сапраўды пагражала смяротная небяспека...

Такое вось далёкае здарэнне было ў Колічкавым жыцці. Хоць і невядомае яму, але, відаць, не бясследнае. Мо з таго часу і наладзілася між імі такая вось «дружба». І на дух не пераносіць Колічак гэтых чорных дамагальнікаў і нахабнікаў. А яны толькі каркаюць-крычаць ды кружацца няспынна над хатай і соткамі, як бы ўвачавідкі даказваюць сваю нязводнасць і Колічкаву бездапаможнасць.

Але не ўсё гэтак воблачна і хмарна ў Колічкавым жыцці. Бывае і прасветленая хвіліна. Вось нядаўна прыязджала ў вёску суседская Янка, а калі па-гарадскому, то ўжо Яніна. Яшчэ некалі заглядаўся на яе Колічак. Не брыдкая была, працавітая. Адно што высокая надта, Колічак мог пад паху ёй схавацца. І левае вока трохі касіла, як бы ўбок пазірала. Аднак калі з’ехала ў горад, калі апранулася ў гарадскія ўборы, то, здаецца, яшчэ больш папрыгажэла, і ніякага дэфекту не відно.

Сама яна пра гарадское жыццё нічога не расказвала, але дасведчаныя сяльчане казалі, што няўдала выйшла замуж, а калі зразумела гэта, не пабаялася прагнаць нягеглага мужыка, засталася з сынам у ягонай кватэры. Не раз прыязджала да маці ў вёску, вяскоўцы хвалілі, што харошага сына мае, ветлівы, быстры і з твару не брыдкі. Гарадскі, адным словам. Хоць якое тое гарадское адрозненне, то Колічак і сказаць не мог. Іхнія вясковыя таксама не горш апранаюцца, на дыскатэкі звыклі хадзіць, з камп’ютэрам многія знаюцца. Адно мо ў гарадскога пад ногцямі чыста, бо не капаецца ў зямлі...

Так ці інакш, а прачнуліся ў Колічка ранейшыя пачуцці. Бачыў, што і Янка не супраць, гатова да яго прыхінуцца. Як і што там між імі было, невядома, але аднойчы Колічак на радасць маці заявіў, што хоча пабрацца з Янкай. Дзеля парадку маці трохі паплакала, пажалілася, што адна ў хаце застаецца, на што Колічак бадзёра паабяцаў: «Не бядуй, знойдзем і табе падпорку!», але ў душы парадавалася за сына, пацешылася, што нарэшце да яго шчасце ідзе. І няхай сабе падпорчаная Янка, але свая, знаёмая, ды і маці яе таксама не чуж-чужаніца... А там неяк выйдзе. Бо маці не сумнявалася, што Янка забярэ яе сына ў горад.

Так яно і сталася. Запрасіла Янка Колічка ў госці, на свой юбілей — трыццаць пяць ёй. Прыадзеўся Колічак, грошай на падарунак захапіў і паехаў у Мінск. Ехаў на дзень нараджэння, а застаўся назусім. Спадабалася яму Янчына кватэра. Двухпакаёўка, вокны на сонечны бок выходзяць, таму сонца служыць замест будзільніка. Як толькі яно выпырхне на неба, дык Колічак і прачынаецца, пачынае ў хаце занятак сабе шукаць, то тое падправіць, то там падаб’е — ведама, гэтулькі часу без мужчынскай рукі кватэра. І зноў жа добра, што сквер побач, дзе ліпы пахкія. Калі цвітуць, у адчыненыя вокны такі водар даносіцца, што не горай як у іхняй з Янкай вёсцы.

І жыў бы, відаць, Колічак шчасліва, гадаваў бы сына, а там, глядзіш, і свайго хлопчыка альбо дачушку прыдбалі б, ды на табе — не так сталася, як гадалася...

Адным надвячоркам адчуў Колічак нейкую трывогу. Зноў нешта пачало нервы круціць. Не мог зразумець ад чаго, пакуль не пачуў за акном знаёмы гідкі крык.

Вызірнуў, а над скверам сапраўдная чорная хмара — усё неба вараннё закрыла. І гергеча, і крычыць, і каркае, ды так, што вясковым з ім і не зраўняцца. Пакружылася гэтая хмара над скверам, а тады на дрэвы расселася. Бедныя ліпы ажно галіны ды верхавіны прыгнулі — гэтулькі панасядала варон, як мух на ліпучку.

Колічак не вытрымаў, зачыніў акно. Але гукі даляталі і праз шкло. Колічкаў твар ажно збялеў, яго цягнула на ваніты. Ён адчыніў акно, пакрычаў на варон, але так, каб не пачуў ніхто з суседзяў, бо засмяюць. Нават у далоні моцна папляскаў. Ды вараннню гэта як мёртваму прыпарка. Здаецца, яшчэ гучней пачалі каркаць. Уздымуцца, пакружацца ў паветры, злятаюць некуды ўбок, і назад вяртаюцца, сваю даймальную песню заводзяць, зямлю лепякамі ўсцілаючы, хоць ты бручку там сей.

Яшчэ горш было ранкам. Не паспее сонца па звычцы разбудзіць Колічка, як зробіць гэта гарластае вараннё. Крык стаіць неверагодны, быццам перад канцом свету. Не ўтрымаўся Колічак, схапіў пустую бутэльку ад мінералкі, наліў вады з-пад крана і з усёй сілы запусціў у чорную хмару. Але дзе там — не дакінуў, адно, здаецца, яшчэ большы варонін гармідар пачаўся, як бы насміхаліся яны з Колічкавай няздатнасці.

Адзін дзень трываў Колічак, другі. Нанач пачаў зачыняць акно, на што сварылася Янка. Але нічога не дапамагала, а нервы падымаліся ўсё больш. Адчувае Колічак, што не стае сілы, не можа яго натура выцерпець гэтага. Успомніў, што ў суседа па лесвічнай пляцоўцы ёсць малакаліберная вінтоўка. Выпрасіў і на двор, у сквер падаўся. А там і прыцэльвацца не трэба — гэтулькі таго варання. Бабахнуў раз, стрэліў другі: «Наце вам, халеры! Ведайце, як даймаць людзей!» Упала пад дрэвы адна, другая ў галінах заблыталася. Ад нечаканасці паднялася ўся чарада, закружылася, трывожна закаркала, у бок іншай вуліцы паляцела.

Аднак рана радаваўся Колічак. Не паспеў выйсці са сквера, як новая хмара, яшчэ большая за ранейшую, з'явілася. Каркае, крычыць, на дрэвы апускацца не жадае, уніз пікіруе, ледзь не да зямлі далятаюць, як бы дзеўбануць Колічка хочуць. Падняў Колічак стрэльбу, каб яшчэ ахвяр нарабіць, але не страляе, патроны скончыліся. Вароны нібыта зразумелі гэта, закаркалі больш азартна. І над самай Колічкавай галавой кружляюць.

А тады вунь да чаго дадумаліся, га́даўкі. Адна частка робіць заход на чалавека, з усёй сілы выпускае на яго свае экскрэменты і адразу адлятаецца ўбок. На змену ёй новая чарада налятае. І так адна за адной, нібыта марскія хвалі падчас шторму. Як ні бараніўся Колічак рукамі, як ні хаваўся пад ратавальныя ліпы, дарэмна. Неўзабаве ўвесь касцюм і нават галава былі заплёханы варонінымі лепякамі. Ажно пад носам засмярдзела.

Нічога не заставалася беднаму змагальніку з вараннём, як вяртацца пераможаным. Так, відаць, знерваваўся, што ажно ногі калаціліся. Не ўтрымаўся, пакаўзнуўся і пляснуўся на адно калена, добра праехаўся па густым варонінам «дабры». Ускочыў — і бегма дамоў. Падняўся на свой чацвёрты паверх, скінуў пінжак і хутчэй у ванну — вароніны падарункі змываць.

А тут акурат Янчын сын прыйшоў. Убачыў ён расфарбаваны і смярдзючы пінжак і на ўвесь голас здзіўлена запытаў:

— Ой, мама, а што гэта ў нас за такі зас...нец?

Пачуў гэта Колічак, і так крыўдна яму стала, што ажно слёзы нагарнуліся на вочы, даўкі клубок засеў у горле. Як ні суцяшала яго Янка, як ні прасіла даравання за сынаву паспешнасць і неабачлівасць, не паддаўся Колічак. Сабраў небагаты свой скарб, падзякаваў за ўсё і тым жа вечарам на электрычку падаўся. Не мог змірыцца з такой абразай. Не, не хлапечай. Варонам не мог дараваць. Што дасталі яго і тут, што напаскудзілі, што душу абразілі сваёй настырнасцю. Лепей ужо ў вёсцы ганяць іх па адной, чым у горадзе хадзіць пад іхняй чорнай хмарай...



Аляксандра Лапіцкая нарадзілася ў 1987 годзе ў Мінску, вучылася ў гімназіі № 2. Цяпер — студэнтка архітэктурна-будаўнічага каледжа.

Алеся ЛАПІЦКАЯ

# ВЕЧАР НА ПАДАКОННІ

*Я стаяла на лесвічнай* пляцоўцы ў швэдары і хатніх парэпаных джынсах, трымаючы ў руцэ сметніцу. Дзверы ў кватэру не адчыняліся. Там нікога не было. Яшчэ колькі разоў тарганулўшы ручку, я канчаткова зразумела, што вярнуцца ў кватэру немагчыма. Звычайна для таго, каб зачыніць наш замок, трэба вельмі моцна на яго націснуць, але цяпер гэта нейкім чынам атрымалася само па сабе. Бо, выходзячы, каб вынесці сметніцу, я толькі прычыніла дзверы, вядома, не ўзяўшы ні ключоў, ні курткі. Бацькі вярталіся з лецішча каля адзінаццатай, брат менш чым гадзіну таму знік і наўрад ці прыйдзе раней. Была сярэдзіна кастрычніка, субота, палова на восьмую, на дварэ — каля дзевяці градусаў. Ехаць да сяброўкі халодна, тым больш што невядома, хто ў яе дома. Грошай і тэлефона няма. Заставалася ўвесь вечар правесці ў пад'ездзе, не зрабіўшы нічога з таго, што трэба. Я злосна зірнула на дзверы і дала па іх нагой, з прыкрасцю ўсведамляючы поўную няздольнасць чалавека змагацца з такімі нечаканымі абставінамі. Адзінай магчымасцю не марнаваць зусім час было пайсці ў бібліятэку і ўзяць падручнік па філасофіі, каб падрыхтавацца да заняткаў. Гэтая думка прыйшла мне ў галаву неяк адразу, і трэба было б спяшацца, каб паспець, але менавіта тады ў пад'езд увайшла наша суседка з ніжняга паверха са сваім сабачанём. Па лесвічнай клетцы разляцеўся залівісты брэх, і пачулася, як звіняць ключы. Напэўна, суседка адчыняла паштовую скрыню, а сабачанё з усёй моцы цягнула яе ўверх, бо брэх рабіўся злосны і нецярплівы. Я стаяла каля сваіх дзвярэй.

— Ну что ты, сейчас пойдём. Нужно же газету забрать. Тише, Кешенька, тише, — сказала жанчына там, унізе, з ласкавым папрокам, як звычайна звяртаюцца да мілых маленькіх дзетак.

Сабачанё на імгненне сціхла і забрахала зноў.

— Ай, как нехорошо так гавкать... Дурик ты. Думаешь, тебе одному холодно тут стоять? Мамочке тоже холодно. Ну давай, иди, — зашамацела папера, і чатыры лапы панесліся па лесвіцы, — погуляли мы с тобой, да, зайчик мой...

Праз імгненне маленькі касматы чорны Кешачка бегаў па пляцоўцы ля сваёй кватэры і брахаў на мяне, а яго гаспадыня, нешта чытаючы, падыходзіла да дзвярэй.

Мае бацькі лічылі яе крыху вар'яткай. Што да мяне, гэта была проста не вельмі шчаслівая жанчына, якая палову дня працавала недзе ў фірме, жыла разам з сынам, без мужа, і часта паліла, гледзячы ў акно, заўсёды з непрыбранымі валасамі. І голас у яе быў такі, нібы яна ўвесь час знаходзіцца паміж замілаваннем-захапленнем і поўнай кволай роспаччу. І я думала, што цалкам зразумела, чаму менавіта гэта жанчына так любіць свайго Кешачку.

— И чего ты опять злишься? — яна падняла вочы ад газеты.

— Добры вечар, — павіталася я.

— Добрый вечер, — даволі абыякава адказала яна. — Ну всё, — суседка зноў паспрабавала супакоіць Кешачку. — Вот мы и пришли, солнышко, сейчас будем кушать... Заходи, моя лапонька...

Яна адчыніла дзверы, сабачанё патапталася і забегла ў кватэру, і жанчына ўвайшла за ім. Дома яна хіба толькі не цалавала гэтую брахлівую істоту.

Я пакінула сметніцу на пляцоўцы і хутчэй пайшла ў бібліятэку, каб паспець да васьмі. Але вялікага плёну з гэтага не атрымалася: вярнуўшыся і пагартаўшы кнігу, я зразумела, што чытаць яе доўга немагчыма. Ды і ў пад'ездзе было гэтаксама халодна, як і на вуліцы, бо яшчэ не ўключылі ацяпленне. Лесвічную пляцоўку асвятляла цьмяная лямпачка, і было змрочна ад перакрыжаваных ценяў парэнчаў і прыступак. Разам з тым я даўно ўжо хацела есці, і так блізка, але ў недасяжнай зараз лядоўні (я кінула на дзверы спапяляючы позірк) ляжалі катлеты, а на пліце стыла вараная бульба. Тут я з палёгкай падумала, што добра, што хоць выключыла газ да таго, як пайшла выносіць сметніцу. Інакш быў бы сапраўды жах...

І вось, сціснуўшы плечы і абхапіўшы сябе рукамі, каб было цяплей, я сядзела на падаконні (а яно, на шчасце, у нас нізкае), і гартала кнігу. Але чытаць мне не йшло. Усё здавалася неакрэсленым, і было вельмі складана вылучыць кароткую дакладную думку. Блытаная, няпэўная кніга, а можа проста не было настрою разбірацца. Наогул філасофію цікава крыху пачытаць ці паслухаць, але не вывучаць да дробязі. Бо зразумела, што да тэорый, ідэй і светапоглядаў, якія нібыта належаць розным філосафам, шмат удумлівых людзей прыходзяць самі і прыходзілі яшчэ да іх. Сваімі назіраннямі, разважаннямі, жыццёвым вопытам. Сэрцамі. І іх высновы нават больш цікавыя за тыя, што змешчаны ў падручніках, і, дакладна, не менш вартыя ўвагі. Бо больш жывыя і прачулыя. Бо кожная выснова непаўторная і адзіная для чалавека тым, што ён прыйшоў да яе сваім шляхам, і, дарэчы, незалежна ад таго, колькі яшчэ людзей думае гэтаксама, ці кім з вялікіх яна ўжо запісана. Проста вялікія гэтыя высновы распрацоўвалі, абгрунтоўвалі і тлумачылі. А людзі жылі і думалі самі па сабе. І нашто дакладна ведаць, хто з філосафаў за што спрачаўся і якімі словамі пра што пісаў?

Такім чынам, я адклала кнігу і, паразважаўшы, паспрабавала ўявіць, чым яшчэ заняцца. Але ніякіх заняткаў больш не знаходзілася. Недзе зверху смажылі мяса з цыбуляй, і гэты пах паволі разыходзіўся па пад'ездзе. У мяне пацяклі слінкі. Сям'я, напэўна, збіралася вячэраць у светлай цёплай кухні... «Усе хлопчыкі і дзяўчынкі напіліся малака, спяць у цёплых ложках, адзін я сяджу на мокрым лісце», — сумна і жаласліва паўтарыла я пра сябе словы Бураціна. Ён казаў так, калі Карабас-Барабас закінуў яго ноччу ў халоднае возера. Напэўна, тады Бураціна гэтаксама адчуваў сябе пакінутым, бездапаможным і няшчасным, і было яму гэтаксама няўтульна і маркотна.

Я ўздыхнула і вырашыла, што замест таго, каб бедаваць, лепш разлічыць, як патраціць наступную стыпендыю. У гэты час у пад'езд увайшоў стары на падпітку з першага паверха і праз працяглыя паўзы стаў звяртацца да некага густым басам:

— Проходи, проходи, чего щемишься? Заходи, гостем будешь... Хоть погреешься у нас тут, в тепле живём... Да располагайся, будь как дома... Только угощать мне тебя нечем, ты не обижайся... Не обижаешься ведь, правда?..

Ніхто не адказваў, у рэшце рэшт стары, напэўна, забыўся на суразмоўцу, і некалькі хвілін з пыхканнем адчыняў свае дзверы. Я падумала, што разам з ім прыйшоў нехта надзвычай маўклівы, а ў доме, дарэчы, магло быць і цяплей.

Па ўсіх падліках атрымлівалася, што на новыя джынсы ў гэтыя два месяцы грошай не хопіць. Я расчаравана паглядзела ўніз і — ого! — убачыла на лесвіцы кошку. Звычайную вулічную кошку, худую, шэрую і зеленавокую. Такім чынам, гэта яна была госцем, і я вельмі ўзрадавалася... Яна ішла павольна, прыслухоўваючыся і насцярожана, напэўна, прывабленая пахам мяса. Пераняўшы мой позірк, кошка некалькі імгненняў уважліва глядзела на мяне, пасля паднялася на лесвічную пляцоўку, падышла і адразу пачала, муркаючы, круціцца каля ног, ледзь дакранаючыся да іх поўсцю, выгінаючы спіну хваляю, а ўзнятым хвастом паводзячы па каленях. Але яна лашчылася без пяшчоты, толькі разумеючы, што калі зрабіць чалавеку прыемнае, тое, што яму спадабаецца, то больш верагодна, што ён пакорміць. Без аніякае там любові ці прыязнасці. І вочы ў яе былі незалежныя і недаверлівыя. Маўляў, адштурхнеш нагою — падыму хвост угору і пайду, куды захачу, і не пакрыўджуся, бо нічога ад цябе не чакаю, акрамя як трошкі малака. І зусім не прыніжаюся: дасі, дык дасі, а не — дык не.

Мне было вельмі шкада, што я ніякім чынам не магу пакарміць кошку, а яна вось так завіхаецца каля ног, галодная, можа, у пяць разоў больш за мяне.

— Бедная... — ціха сказала я і пагладзіла яе па спіне. Кошка паглядзела на мяне і перастала мяўкаць. Вядома: спачатку даюць, а пасля гладзяць... Я вельмі хацела, каб яна засталася. Я яшчэ раз правяла рукой па кароткай жарсткаватай поўсці і ўзяла яе на рукі. Кошка сядзела роўненька і стрымана, нібы асобна ад мяне, хаця і на маіх каленях. Часам яна паварочвала галаву ці стрыгла вушамі, нібы штосьці высочваючы альбо пільнуючы каго ў пустым пад'ездзе. Я гладзіла яе і думала, як добра, што ў гэты халодны пад'езд зачыненых дзвярэй пусцілі кошку, бо, напэўна, ёй такі лепш сядзець тут са мною, а я ўжо не адна і магу глядзець на яе і гладзіць, з дзіцячай радасцю ад адказнасці за жывую істоту.

Але мы нядоўга пасядзелі так разам з кошкай. Хутка з кватэры на другім паверсе, што каля лесвіцы, выйшла наша суседка, Кешачкіна гаспадыня. На ёй быў доўгі халат, сіні, у чырвоныя, усходняга кшталту, кветкі, з тканіны напэўна цёплай і падобнай на аксаміт, а ў руцэ яна трымала пачак цыгарэтаў і запальнічку. Суседка звычайна паліла на ніжняй пляцоўцы, але, ўбачыўшы нас з кошкай, пайшла па прыступках уверх. Твар яе быў заклапочаны і крыху паружавелы.

— А, так это к нам кошка забрела... — яна села на кукішкі каля падаконня і пагладзіла кошку. — Вот почему мой Кешенька такой, — голас у яе быў глыбокі і глухаваты, і яна вельмі расцягвала словы. Ад яе патыхала півам і адчувалася, што яна, напэўна, выпіла некалькі куфляў моцнага. — Это не ваша кошка, нет? — спыталася яна і паглядзела на мяне.

— Не, не наша, — адказала я. У жанчыны былі сумныя, неспакойныя і нейкія цьмяныя вочы. Яна доўга моўчкі глядзела на мяне, штосьці вызначаючы, ці проста задумліва.

— А почему вы тут сидите? — пацікавілася суседка. — Домой не пускают?

Я расказала пра сметніцу.

— А, вот как... Слухай, а ты што, па-беларуску размаўляеш? — з радасным здзіўленнем спыталася яна. — Ты, наверно, из белорусской школы, да? У меня есть подруга, она работает в белорусской школе учителем... Это хорошо...

Я звыкла сказала, што не, хаця мову ў нас выкладалі выдатна. У рэшце рэшт,

тое, што чалавек размаўляе па-беларуску, вызначаецца не толькі школай, якую ён скончыў.

— Да, это хорошо. Надо, надо... Я тоже когда-то... Давно, — яна засмяялася — Очень давно... Я вот сегодня целый вечер знаешь, что делала? Ой! — нібы аб нечым простым здагадаўшыся, усклікнула яна. — Тут же так холодно, что это я... Сейчас, сейчас... — суседка ўстала, абапершыся аб падаконне, і пайшла ўніз, шлэпаючы пантофлямі па лесвіцы. — Ты не куришь? — крыкнула яна, заходзячы ў кватэру.

— Не, не палю, — адказала я.

— Молодец. Тогда ладно. Подожди, сейчас...

У нас з суседкай ніколі не было іншых адносін, акрамя вітання ў пад’ездзе. Але сёння, на падпітку, яна, напэўна, хацела са мной паразмаўляць, а мне, вядома, не заставалася нічога іншага, як далей сядзець пад сваімі дзярыма.

Хутка жанчына выйшла ў доўгай чырвонай вязанай кофце, трымаючы на руцэ куртку, а ў другой несучы батон і пластмасавую пляшку са смятанай.

— Вот, бери, куртку надевай, батон ешь. Он свежий. А сметану будем ей давать, — суседка зноў села на кукішкі. — Кошка! Кошка! — радасна паклікала яна і адкрыла каля котчынага носа смятану. — Иди сюда, кушать будешь.

Кошка злезла з маіх каленяў, падышла да суседкі і пачала па коле хадзіць вакол яе. Жанчына села на падаконнік, пераліла трошкі смятаны ў накрыўку і паставіла на падлогу. Кошка, вядома, стала хуценька есці, а я тым часам надзела куртку. Цёплую, на сінтэпоне... Суседка моўчкі глядзела на кошку жаласлівымі змрачнаватымі вачыма.

— Дзякуй вам вялікі, — сказала я.

— Не за что, — адгукнулася жанчына, — ешь батон, не стесняйся. А она вон какая, бедняжка, голодная...

Я адламала кавалак батона. Самы звычайны, «Сямейны дыетычны». Часам у суседніх крамах нічога іншага няма, нібыта некалькі дамоў вырашылі разам, цэлымі сем’ямі сесці на дыету. Але гэты батон быў цудоўны...

— Бедняжка... Всю жизнь, наверно, ищет еду по мусоркам и зимой мёрзнет... Жалко, правда? — я ў згоду кіўнула галавою. — Слушай, а ты можешь взять её к себе? Можешь? — суседка з надзеяй зірнула на мяне.

— У мяне — мама, — сумна адказала я.

— Да, а у меня Кешенька. Вот и мы ей никак не поможем, — сказала яна гэтаксама сумна і зноў маўчала, гледзячы, як кошка, спяшаючыся, злізвае смятану,— Не, ты ведаеш, мне неяк няёмка. «Няёмка» — хорошее слово, правда? Насамрэч такое... Я ж таксама беларускую мову ведаю, — гаркавата сказала яна, і мне здалося, што суседка наўрад ці належыць да тых, хто заўжды размаўляе па-расейску. — Мы з сяброўкай разам хацелі паступаць. Усе кніжкі чыталі па беларускай літаратуры, у гісторыі разбіраліся. Яна цяпер настаўніца. Вучыць. Я з ёю яшчэ з таго часу па-беларуску размаўляю. І цяпер з табою буду. Добра?

— Добра, вядома... — відавочна, у яе і зараз былі вельмі шчырыя і цесныя адносіны з тою сяброўкай. Людзей, якія па розных падставах сапраўды валодаюць мовай, я сустракала неаднойчы, і тое, што яны пачыналі размаўляць па-беларуску, заўсёды радавала і ўзрушвала. Вось і цяпер мне было прыемна і разам з тым трошкі дзіўна.

— Так. Яна верыць, разумееш... Верыць, што тут будзе гучаць родная мова. Бо так павінна быць, — у вачах у суседкі з’явілася захапленне. — Яна ў кожнае слова верыць, што кажа і што чытае... Вартае... І што мова ў нас... «прыўкрасная», і яе трэба любіць. І гэта вялікі моц... І здольнасць... Не стаміцца, не расчаравацца, не збіцца, а ўвесь час верыць і быць шчырай. Такіх мала. А ў Іркі заўсёды гурткі, канферэнцыі, вандроўкі, пастановы, яна захапляе, заахвочвае дзяцей, у яе атрымліваецца. І яны ў яе шмат бяруць, толькі, можа, не ўсе... Яна сапраўды вучыць,

яна дае. І яе жыццё не пустое. Бо яна верыць і змагаецца. Толькі такія жывуць. А іншыя — проста...

Між тым кошка вылізала накрыўку, азірнулася на жанчыну і тоненька мяўкнула. Суседка наліла яшчэ смятаны, і кошка зноў пачала есці, павольней ужо.

— Але вось, гэта кошка... Ёй было б лепш, калі б усе тут размаўлялі па-беларуску? — узнёслы настрой жанчыны раптам змяніўся злосным абурэннем. Яна наогул амаль усе словы казала з рознай інтанацыяй.— Ці тады яе б нехта да сябе ўзяў? Ці яе б бясплатна кармілі? Людзі б таксама жылі сваім камфортным жыццём, а ёй было б дрэнна... А з тых, хто пашкадуе, таксама большасць нічога не зробіць... Бо спазняюцца, бо два дні да заробку... Бо дома жонка, бо камандзіроўкі... Так? І амаль ніхто звычайна не здольны дапамагчы нават адной кошцы...

Суседка замаўчала, а я прыгадала, як некалі даўно збіралася купляць бяздомным жывёлам сасіскі і малако, калі з'явяцца ўласныя грошы. Але каты і сабакі яшчэ да гэтага вылецелі з галавы, і я перастала заўважаць іх на вуліцы, а стыпендыі не хапала, нягледзячы на тое, колькі я патраціла на не самыя значныя рэчы... І мне стала сумна і крыху сорамна, як заўсёды, калі прыгадваеш добры намер ці мару, якія не ажыццявіў, хаця магчымасць была. Я ведала, што цяпер у мяне наўрад ці хапіла б імпэту нават на тое, каб увесь час падкармліваць гэтую кошку, і, так ці інакш, я таксама належу да тых, хто не дапаможа.

— І што — мова? У мяне не выйшла б, як у Іры. Не... Я падумала б так пра кошку і ў нечым расчаравалася... Бо не толькі кошка, можа, і народ будзе больш шчаслівы, калі ўсе вернуцца да роднай мовы? Кожны асобны чалавек будзе? Усе кінуць быць абыякавымі, злоснымі, несумленнымі, сварыцца, крыўдзіць, піць? Не ж. Не абрынецца разам з моваю на нашу зямлю шчасце... і доля ўсім, — крыху тэатральна сказала суседка. — Вось запытайся ў француза: ён лічыць сябе наогул больш шчаслівым, бо ў іх уся краіна размаўляе па-французку? Ён здзівіцца, скажа: ну, так, але... але ў мяне няма грошаў на новую машыну, ці маці хварэе, ці праца мая абрыдла... Бо мова-такі не мае дачынення да самых галоўных праблем... І таму... таму ў мяне б не выйшла. Але кожная мэта так, — суседка ўздыхнула. — Трэба пераканаць сябе, што яна вартая, на штосьці заплюшчыць вочы, стрымацца ў нейкіх разважаннях і ісці да яе. А інакш — будзеш блытацца ўсе жыццё ва ўласнай няўпэўненасці і нічога не зробіш. Нічога-нічога, — жанчына пасунулася бліжэй і з цікавасцю зазірнула мне ў вочы. — А ў цябе ёсць мэта? Ну такое, самае галоўнае...

Я расказала, што ў нас яшчэ ў школе быў гурт, мы спявалі песні па-беларуску і па-польску, і зараз мы таксама збіраемся і выступаем, і гэта галоўнае. Самае лепшае, што мы робім. Суседка слухала мяне, але думала аб нечым сваім.

Кошка тым часам амаль даела смятану, падышла да жанчыны і стала церціся аб яе ногі, але неяк таропка, зноў без асаблівай мяккасці і пяшчоты. Мне пачало зусім сур'ёзна здавацца, што кошка робіць гэта толькі паводле вядомага ёй этыкету, бо ў яе так і не з'явілася нічога падобнага да ўдзячнасці ці даверу. Нягледзячы ні на наша шкадаванне, ні на смятану яна заставалася «кошкай, якая гуляе сама па сабе».

— Ну што, пад'ела, так... Тады хадзі да мяне, — жанчына ўзяла яе і пачала гладзіць.

— І гэта добра, — суседка зноў звярнулася да мяне. — Абавязкова трэба, каб была мэта, гурт, нешта яшчэ... Ведаеш, я сёння цэлы дзень чытала адзін сшытачак... Выпадкова знайшла ў антрэсолях, бо шукала лямпу. Свой дзённік, які вяла вось тады, у школе, калі мы хацелі паступаць, і крыху пасля. Я пісала тады вершы... Шмат каму падабаліся... Друкавалі нават... Мы хацелі разам з Ірай вучыцца... А аднойчы я падумала: а вось калі — усё жыццё, то пра што пісаць? І неяк не знайшла, — яна пачала расказваць спакойна, але зараз яе голас стаў злосны і ўзбуджаны, суседка выпрасталася і нервова адкінула галаву, а кошку пасадзіла на падаконне. — І пра што пісалі? Што навокал, пад нагамі, на кожным кроку — дзярмо і бруд? Што

ніхто не хоча гэтага бачыць і заўважаць, і таму ідуць і глядзяць роўна наперад, не на неба з зоркамі і не ўніз? Што шмат хто, паслізнуўшыся, трапляе ў гэту смярдзючую кашу і не падымаецца з яе, а іншыя не звяртаюць увагі і ідуць далей? Ды яны і не дапамаглі б хутчэй за ўсё... Што ў кожнага знутры тое ж — бруд і дзярмо, побач з самым... узнёслым і высакародным... Што гэта ўсё роўна ўсе адчуваюць... І проста глушаць гэта адчуванне ў сабе ці шукаюць нейкае выйсце, разгадку, сакрэт... Як вырвацца ці змяніць... Жывеш і думаеш: немагчыма, каб усё марна і пуста. Павінна ж нешта быць, вось цяпер я зразумею і знайду. І не тое, зноў не тое, — яна заўважыла маё здзіўленне і з пагардлівай паблажлівасцю ўсміхнулася, перасмыкнуўшы плячыма. — Ты, можа, не чула, каб трыццацідвухгадовая, — суседка амаль па складах сказала гэтае слова, — жанчына так размаўляла? Ты не думай, што тое, што чалавек расказвае — гэта ён увесь. Гэта ён у нейкіх сваіх праявах... Выпадковых... А ўвесь, увогуле, — ты ніколі не будзеш ведаць, які ён. Проста сёння кажу, што хачу, і ўсё. І ведаеш, такія думкі часта шмат каму прыходзяць у галаву... Скажы, скажы, а ты чаму не пішаш? — раптам нецярпліва спыталася суседка.

— Ну, нeяк не цягне...

— Вось-вось. А навучыцца карыстацца словамі не самае складанае, і вельмі шмат людзей насамрэч маюць гэтую здольнасць. Толькі каб пісаць павінна сапраўды цягнуць... разумееш, трэба мець мэту. У якасці падставы і ў якасці сэнсу. Падставы — чаму пісаць і дзеля чаго. Сэнсу — як наяўнасці ідэі ў напісаным. І, калі ёсць мэта, то ёсць і ўпэўненасць. А ў мяне яе не было. Пісаць пра дзярмо і бруд? Што ты так зменіш? Вось калі б я знайшла гэты сакрэт, тады так... Ці калі б у мяне была вера... Ці штосьці, што я спасцігла сама і ўпэўнілася, што трэба сцвердзіць іншым... Але не... Дый бацькі не хацелі ніякага філфака. Вершы перастала пісаць, калі... калі Толік нарадзіўся, — яе твар пазмрачнеў. — Даўно было... І ні радка... Ненавіджу гэтае дурноцце.

Жанчына паглядзела ўверх: на маім паверсе ў суседняй кватэры гучна ішоў серыял.

— У мяне была цётка, — зусім раздражнёна працягвала яна. — Усё жыццё чытала раманчыкі і глядзела розныя серыялы. Ну, вядома, пра вялікае каханне, расстанні і вяртанні, крутыя павароты лёсу, ракавыя памылкі... І, думаеш, такія жанчыны больш разбіраюцца ў гэтых рэчах? Ставяцца з паразуменнем? Больш спагадаюць? Хаця б чуць, як яна кажа пра мяне «мать-одиночка»! З такой пагардай, адмаўленнем і пачуццём уласнай дабрадзейнасці... Нібы я самая непрыстойная з усёй яе радні. Проста смешна: яны глядзяць меладрамачкі, каб адпачыць і паказытаць сваю пачуццёвасць, а калі ў жыцці здараецца тое ж, толькі на самай справе, то знікае і суперажыванне, і чуласць... Застаецца правільны і самазадаволены чурбан, якому нічога не перашкаджае цябе тыкаць і абражаць, калі дазволіш... Яны ж не падумаюць, што вось тая дзяўчына кахала гэтаксама моцна і шчыра, як якая-небудзь Патрысія ці Анамарыя, і што яна верыла, а цяпер у роспачы... Не, яны проста лічаць яе дурай...

Жанчыну перапыніла кошка. Яна спрытна саскочыла з падаконня, падышла да накрыўкі, чысценька вылізала яе і паглядзела на мяне і суседку. Позірк яе быў аддалены, нібы са свайго, чужога нам свету.

— Што, кошка? Куды ты? — з пяшчотным шкадаваннем спыталася жанчына. Кошка пайшла ўніз па прыступках. У рэшце рэшт яна хоць пад’ела і пагрэлася, але нам абедзвюм стала сумна.

— Трэба выпусціць, калі яна на двор...

Суседка захінула кофту і пайшла па лесвіцы следам за кошкай.

— Бывай тады. Я смятану каля лаўкі пастаўлю — прыходзь, еш, — пачула я ўнізе яе голас, і дзверы пад’езда ляснулі, але неўзабаве адчыніліся, і нехта пачаў падымацца.

Толькі замест суседкі па лесвіцы прайшла бабулька з пятага паверха і так коса-коса паглядзела на мяне, на сметніцу і на смятану... Ёй наўрад ці падабаліся жанчыны на падпітку альбо вулічныя кошкі ва ўласным пад’ездзе. Я падумала, што бацькі таксама не ўзрадаваліся б, і таму лепш, каб першым вярнуўся брат. Але мне ўсё роўна не было куды пайсці, і я была ўдзячна суседцы за мову, куртку і батон, а галоўнае — за тое, што яна накарміла кошку. Я сядзела і проста слухала, менавіта проста, бо як яшчэ можна слухаць такую размову незнаёмай раней жанчыны, амаль у два разы старэйшай за цябе. Слухала з цікавасцю, часам — са здзіўленнем, спагадай, і імкненнем зразумець, хаця напрыканцы гэтага няўдалага вечара я ўжо не магла рэагаваць на кожную думку і адэкватна яе асэнсоўваць. Са спагадай — напэўна, з-за суседчынай шчырасці, хаця, дакладней, гэта была не шчырасць: яна казала тое, што вось зараз думае, не стрымліваючыся ў тым, што і як, і не вельмі турбуючыся наконт таго, якім чынам я магу яе ўспрымаць. Дый жанчыну наўрад ці насамрэч цікавіла маё ўспрыманне, асэнсаванне і стаўленне, бо яна была цалкам ахоплена сваімі разважаннямі. А тое, што яна нібыта расказвае мне, толькі дазваляла ёй часам спрошчваць ці перапыняць нейкія роздумы.

Зноў пачуліся крокі, і на гэты раз на пляцоўцы з’явілася суседка. Яна вярнулася чамусьці вельмі паніклая і разгубленая. Магчыма, ёй было так шкада кошку, ці прыгадалася штосьці сумнае, альбо тая бабулька прычапілася... У яе, суседкі, наогул хутка і часам рэзка змяняўся настрой ад нейкага разважання ці выпадковага ўспаміну.

— Слухай, мы з табою так даўно ўжо тут сядзім, а я нават не ведаю, як цябе зваць, — панура сказала жанчына, напэўна толькі каб пачаць.

— Стася.

Суседка села, абхапіла пальцамі падбароддзе, утыкнула локці ў калені, і яе спіна адразу згорбілася. Седзячы так, яна здавалася зусім гаротнай і безнадзейнай.

— А я Оля, — яна раптам узяла сухі афіцыйны тон, — Вольга Аляксандраўна. Узрост — трыццаць два гады. Склад сям’і — адзінаццацігадовы сын Толік і Кешанька. Адукацыя вышэйшая тэхнічная. Восем гадоў працую інжынерам у прыватнай арганізацыі. Іншыя істотныя біяграфічныя дадзеныя адсутнічаюць. Ты разумееш: восем гадзін на працы, гадзіна ў метро, крамы, пральня, майстэрня і іншая мітусня. Дома прыбіраю, гатую, мыю. У мяне ж такі сям’я, — яна замаўчала і задумалася над нечым. Зараз суседка наогул пачала часта вось так спыняцца. — Проста калі падтрымліваеш гэты знешні, тыповы лад, робіш хатнія справы, тады і ў душы ўсё нібы больш правільна... утульна... адчуваеш сябе хаця б гаспадыняй... І таму я іх не кідаю... Ну і з Толікам займаюся... Ён, дарэчы, у такім узросце, калі ўжо не ідэалізуеш дзяцей... А ўвечары — тэлебачанне, газеты, Ірыны кнігі, мае любімыя красворды, уночы часам сяджу за камп’ютэрам. Калі выхадны дзень, то госці, ці лецішча, ці напрыклад, тэатр... Звычайнае жыцце адзінокай інтэлігентнай жанчыны. І здаецца, усё добра: не вельмі стамляюся, адпачываю, нават культурна, усё камфортненька, матэрыяльных цяжкасцей не маю, сын расце.

Яна зноў замаўчала, а я падумала, што суседчына ўладкаванасць, увогуле, — сацыяльнае дасягненне развітых краін і вялікае жаданне шматлікіх нашых грамадзян. Толькі расказвала яна занадта млява.

— Але нечага галоўнага ў гэтым жыцці няма. І яно такое... нібы п’еш і п’еш несалёны таматны сок... падкіслы... І нічога не надае яму смаку... Хаця б якое-небудзь захапленне... Ну, растуць у мяне кактусы... і бягоніі... я іх даглядаю, і ўсё. Я вядома, рада, што яны стаяць у мяне на акне, бо аддаю ім большую перавагу, чым іншым раслінам... але неяк спакойна, звычайна. І ўсё так. А захапленне нельга прыдумаць альбо выбраць. Гэта — адразу... проста... разам з чалавекам... Вось у маёй знаёмай муж: вольныя грошы — шукае нейкія прыстасаванні для рыбалкі, вольны час — збіраецца з сябрамі на возера... А пасля: «Ведаеце, якога я ўчора шчупака злавіў!» І вочы блішчаць, і твар шчаслівы... А куды ідзе мой час і мае грошы, якія застаюцца, якія я зарабляю? Можа, я не здольная захапляцца, я не ведаю... Такая...

І да мяне прыйшла думка, што суседчына кранальная прыязнасць да Кешачкі — проста спроба абвергнуць самую сябе.

— Разумееш... Часам прачынаешся і адчуваеш сябе адзінокай самотнай птушкай у пустэчы жыцця, — зусім засмучана пачала яна. — Адзінокай — адзінокай... І як тыя вераб'і ў Кітаі — ты ведаеш? Калі людзі не давалі ім апусціцца на зямлю, і яны падалі мёртвыя ад стомы. І яшчэ ад безнадзейнасці, ад немагчымасці змагацца, бо неяк, і ад такога птушынага адчаю... маленькай і па-сутнасці слабай істоты вельмі мала на што ўвогуле здольнай... Ты сама ўяві, як памірае верабей, які больш не можа махаць крыламі... не патрэбны нікому. Так, не патрэбны... Не, я ўвогуле патрэбна — каб прыгатаваць сняданне, зрабіць сваю частку працы, выслухаць бедную Жанку... А да майго настрою, думак, да таго, што турбуе, справы нікому няма. Так, каб ставіліся заўсёды з удзячнасцю і ўважліва, разумелі, падтрымлівалі, турбаваліся, ці добра табе... Ды інакш і не можа быць. Амаль ніхто... амаль нікому... амаль заўсёды... амаль не патрэбны. Таму я папраўдзе і люблю Інтэрнет: кінеш пост, табе адкажуць — о, некага цікавіць тваё меркаванне, некага закранула... А што я? — раптам здзівілася суседка. — Вось тут, на першым паверсе, жыла адна бабуля... Адна. Муж памёр, сын недзе занадта заняты, не прыязджаў, не званіў... Яна зімой руку зламала. Правую. А левая даўно аднялася, ад інсульту. Серафіма Мікалаеўна... І ты ведаеш, як яна ела? Заціскала паміж ног сухары і грызла. Некалькі месяцаў... Суседзяў не хацела турбаваць, прасіць... Васьмідзесяцігадовая бабуля! — у вачах у жанчыны былі абурэнне і крыўда. — Я сама выпадкова даведалася: ішла з Кешанькам, а тут — наша ўрач, разгаворлівая такая... Ну і расказала. І я да яе хадзіла. Звару супу ці кашу і занясу місачку ёй. Што — я на другім паверсе, яна на першым. Пакармлю. Ну, прыбяру ў пакойчыку, памыю штосьці. Яна ж не магла... І такая добрая бабуля, праўда, «божий одуванчик», ёй увесь час неяк няёмка было, што я ёй дапамагала, яна кніжкі прапаноўвала, посуд, з пенсіі хацела плаціць. А я што... У адным доме жывём. Пасля вось была ў адпачынку, паехалі з сынам на мора, і яна памерла. І я часам думаю: яна ж даўно тут жыла, і хварэла, і таксама была нікому не патрэбнай, і ўсё, а я не ведала... І што мне цяжка было? Паўгадзінкі...Не, гэта добра, што я ёй дапамагала, — праз паўзу працягвала яна, крыху акрыяўшы. — І часам прыгадваеш, што зрабіла і штосьці істотнае. Яшчэ ў школе адна мая сяброўка ледзь не атруцілася таблеткамі... Я ёй не дала. Выпадкова так атрымалася, але... І ўсё ў яе склалася пасля. Іру таксама крыху натхніла, каб яна ішла на філфак. Сама калі вучылася... тлумачыла штосьці на практычных, дапамагала. Аборт не зрабіла. Сын вось... Да Серафімы Мікалаеўны хадзіла. Грошы пляменніцы падаравала на вяселле — каб яны кватэру купілі... А хацела сабе машыну... Не, у яе такая маці, што шлюб доўга не пратрымаўся б. І увогуле — хлопцамі не круціла, бацькоў і родных імкнулася не засмучаць... сябрам... была сябрам, на працы ... Ну, ведаеш, ёсць такія асобы... калі скласці, колькі часу самыя розныя людзі прахадзілі з-за іх з сапсаваным настроем, то атрымаецца разы ў тры больш за працягласць іх жыцця... І нашто так? А я справу сваю ведаю, з супрацоўнікамі адносіны добрыя. Вось... І атрымліваецца, што для іншых ты жывеш не марна, не абы як... але для самой сябе жыццё пустое, бо менавіта сутнасці, галоўнага ў ім няма, — жанчына зноў стала засмучаная. — І ты не ведаеш, які ў ім сэнс і радасць, і нашто тады яго клопаты і турботы... Захапленняў няма, мэты таксама няма, такой — дзеля іншых, ці нечага вялікага... Іх вызначаюць у юнацтве ці ў маладосці, і калі нечага хапае ў душы, то яны ўжо — справа жыцця. Як у Іры. А я — бачыш... Толік нарадзіўся — і ўсё знікла. Спачатку — толькі б скончыць універсітэт з Толікам... Бацькі, вядома, дапамагалі, але шчыра — я тры гады напэўна толькі хацела спаць. Пасля — толькі б хадзіць на працу з Толікам, каб ён не хварэў і каб вучыўся... А чаму так: калі цяжка, і насамрэч не жывеш, а змагаешся за існаванне, то вядома, марыш, каб стала лягчэй і спакайней... а калі пачынаецца такое жыццё, з усіх бакоў вельмі нядрэннае, то нечага ў ім

не хапае? — суседка няпэўна махнула рукою. — Шмат хто пачуў бы мяне і сказаў «с жиру бесишься, тетка». А можа і сапраўды? — яна ўшчыкнула сябе за кубел, хаця мела даволі зграбную постаць. — Пайду займацца фітнесам, і ўсё. Я, напэўна, проста не звыклася з тым, што на працы сталі нармальна плаціць, і з'явілася вольная хвілінка... Вось-вось, вольная. Ды не, усё як трэба... а мэты — можа мне сёння толькі так здаецца... Гэта сшытачак той...

І я нарэшце зразумела, што суседка пад вельмі вялікім уражаннем ад гэтага, што, і размаўляючы са мной, і шкадуючы кошку, яна разам з тым думала менавіта аб напісаным у ім. Такім чынам, адны яе разважанні былі пераплецены з іншымі, і таму тое, што яна казала, здавалася крыху незвычайным. Яна ўвесь час штосьці вызначала, суадносіла, аспрэчвала, і гэта было няпроста, і праз гэта настрой у жанчыны быў такі зменлівы, а яна — нервовая і задумлівая.

— Чуеш? — спыталася суседка.

На гэты раз сварыліся на першым паверсе, і між іншым даволі даўно. З адчаем узвісквала жанчына, і гучна крычаў стары, які прывёў кошку. Зараз ён, напэўна, падышоў бліжэй да сваіх дзвярэй, і мы пачулі мацерную цынічную лаянку, у адказ на якую яго жонка стала неяк дзіка крычаць, то зусім пранізліва ад шаленства, то ледзь не пачынаючы хрыпець і рычаць...

— А калі мы пераязджалі, гэты сусед нам так дапамог, — з сарказмам працягвала Вольга Аляксандраўна. — Зіма была, мароз. Толіку пяць гадоў. І так выйшла: машына затрымалася, мае сябры, што павінны былі пераносіць мэблю і рэчы, неяк не паспелі... І цёмна ўжо, а палова ўсяго стаіць на вуліцы. Я разгубілася — што рабіць... А гэты стары прывёў яшчэ аднаго мужыка, і яны насілі пакункі, каробкі, стосікі кніг перавязаныя... Да ночы. І казаў: мы ж суседзі, трэба дапамагаць, вы — мама... За так. У мяне і не было неяк нічога, каб даць... А мог і не дапамагчы. І я ўсё думала — добры чалавек... А цяпер? Як ён п'е, як п'е... А жонка яго — яна нам коўдры тады нейкія прыносіла... ледзь не вешаецца ад такога жыцця... Гэта ж страшна... З дому ўсё цягне... Калі яны сварацца, ты ведаеш, якімі словамі ён яе называе? Яму прыемна яе абражаць! Жанчыну, што столькі гадоў з ім жыла і дапамагала, і падтрымлівала, і цярпела, і есці гатавала! Думаеш, супакоіліся? — суседка злосна зірнула на мяне. У пад'ездзе сапраўды стала ціха. — Можа і так... Але ведаеш, ён яе б'е! Добры чалавек! Бачыш, паўсюль адно і тое ж — дзярмо і бруд. Можна апраўдаць ці не, па розных падставах, але ўсё роўна... Ужо не ўпэўніваешся, а проста — бачыш. Не ўпэўніваешся, — суседка паглядзела на мяне так, нібы знянацку зразумела штосьці вельмі важнае і істотнае для сябе. — У гэтым і справа. Каб была мэта, трэба верыць не толькі ў яе... Неабходна верыць у людзей... У штосьці годнае і вартае ў іх сэрцах. Разумееш? Бо ўсе мэты заканчваюцца на людзях. Нават калі жанчына жыве дзеля шыкоўных футраў, то ў першую чаргу таму, што ёй прыемна бачыць чалавечую зайздрасць ці захапленне і адчуваць сваю перавагу над некім. А калі мэта па-сутнасці карысная, то абавязкова — трэба верыць, што... дзеля людзей варта да сваёй мэты ісці, і што... яны вартыя таго, каб ты дзеля іх яе дасягала... І ў паплечнікаў трэба верыць таксама. Каб давяраць ім і дзяліць з імі... «радасць перамог і горыч паразаў». А гэта немагчыма, калі ты жывеш і амаль заўсёды прыходзіш да высновы — дзярмо і бруд, калі думаеш увогуле пра людзей і абавязкова ўзгадваеш такіх, як гэты сусед ці мая цётка. Толькі калі не верыш у людзей, не будзе і мэты. Сапраўднай... якая дае сэнс... і трымаецца не толькі на амбіцыях... А ў цябе напэўна яшчэ можа атрымацца... І дай Бог, каб жыццё не пазбавіла цябе веры... Не — людзі... жорсткія... ці абыякавыя... Хаця гэта адно і тое ж, — суседка, нібы штосьці прыгадаўшы, паглядзела на накрыўку, што ляжала на пляцоўцы. — Кошка. Жорсткія — калі з-за цябе некаму дрэнна. А яе можа даўно ніхто не крыўдзіў. Проста кошка мерзне ці хоча есці, і ўсім усё роўна. І яны ўсе па-сутнасці жорсткія, бо забываюцца, не думаюць, што маглі б ёй дапамагчы. А ёй дрэнна. Абыякавасць — гэта жорст-

касць... Бяздзейная... І яна забівае веру. Без якой не можа быць мэты. І атрымліваецца проста расліннае існаванне... як сказаў Міша.

Жанчына замаўчала, а я таксама падумала пра нашу кошку. Што, напэўна, галоўнае гэта тое, што ёй сапраўды не было за што любіць людзей. І таму яна не верыла ў іх, і таму не давярала нам. Раптам суседка зірнула на мяне крыху здзіўлена, нібы як я ўвогуле магу слухаць такую лухту, хаця менавіта цяпер мне было цікава.

— Ну так, Стасечка, цікавы вечар у цябе атрымаўся,— змрочна-насмешліва звярнулася яна да мяне. — Сядзіш і слухаеш нейкую жанчыну. Звычайную. Без мэты, без сапраўдных захапленняў. І нікому асабліва непатрэбную... якіх шмат. Ты не бяры да галавы тое, што я тут кажу... Можна замест аднаго сказаць нешта іншае, і тады ўжо будзе не такое разважанне, не такія высновы, і ты з іншага боку на ўсё паглядзіш... Бакоў жа шмат: бакоў свету чатыры, а далей — градусы, хвіліны, секунды... Пад іншым вуглом, дакладней... наступны раз пра тое ж думаеш, і па-іншаму атрымліваецца... І нічога няма асаблівага ў гэтых думках, гэта ж не адкрыццё, а так — вярзе штосьці нейкая жанчына... А што тут да чаго? І нашто ўвогуле? І якая розніца, якія разважанні хто плёў з таго часу, як людзі пачалі разважаць? Усё роўна ж з-за нечага няшчасныя, нечага не хапае... І я такая ж, і нічога цікавага не адбудзецца... Я не ператваруся ў вядзьмарку, і мы не будзем лятаць з табой у мінскім небе... На самай справе, бо ў мяне нават мятлы няма... Ёсць толькі... як ён будзе, пыласмок, напэўна... Хаця маглі б і на ім... А ён бы ператварыўся ў пылацмока і пляваўся на ўсіх з хобата чым-небудзь атрутным і брыдкім, і за ім заставаўся бы электрычны іскаркавы хвост, — і жанчына засмяялася знарок вядзьмарскім смехам. — І банк рабаваць мы не пойдзем, і ў падарожжа не выправімся, і якая-небудзь выбітная асоба сюды наўрад ці завітае... Усё звычайна. Я нават цябе да сябе не запрашаю. Бо ў кватэры зусім не прыбрана... Толік на выхадных у бабулі, а я вырашыла вось сёння не прыбіраць: абрыдла... Я з ім учора пасварылася. Школа з эканамічным ухілам, там сур’ёзная падрыхтоўка. А ён гультайнічае... Ай, гадуеш, гадуеш...

Нехта ўвайшоў у пад’езд, і праз хвіліну я ўбачыла на лесвіцы брата.

— Здравствуйте, — са здзіўленным тварам сказаў ён.

— Вечар добры, — амаль адначасова адказалі мы з суседкай.

— А ты чего тут? — спытаўся ў мяне брат.

— Ды так атрымалася. Пасля растлумачу... У цябе ключы ёсць?

— Конечно, — у яго голасе пачулася абурэнне.

Я чамусьці не вельмі ўзрадавалася.

— Тады ідзі. Я зараз.

— Ну давай...

Брат падняўся наверх, адчыніў дзверы і забраў у кватэру няшчасную сметніцу.

— Вось і ўрачыстае ўз’яднанне сям’і, — заўважыла жанчына. — Так, трэба, напэўна, па дамах разыходзіцца... Ці, дакладней, па кватэрах... Дзякуй табе, Стасечка... Мы так добра паразмаўлялі... на роднай мове... Прыбег да мяне неяк Толік з бляшанкаю ад кавы, і крычыць: «Мама, а што такое «гатаваная вада»? Это по-нашему кипяток, да? Скажи, прикольно!» Дрэнна, праўда? Іра мне ўсё кажа, што варта было б аддаць яго ў беларускую школу, але гэта далёка... Трэба было б на тралейбусе ехаць, а нашая тут, пад вокнамі...

І суседка стала развітвацца далей:

— І за тое, што з кошкай пазнаёміла, дзякуй.

— І вам таксама дзякуй за ўсё, — шчыра сказала я. — Вось толькі куртку бярыце! — я, схамянуўшыся, зняла куртку і аддала жанчыне.

— Ну вось, а так я б на яе і забылася,— суседка ўважліва паглядзела на мяне.— І яшчэ дай Бог, каб... што? Песні? Каб вы там спявалі і верылі: ёсць каму вас пачуць... І ў людзей ёсць тое, што чуе і можа адгукнуцца... Толькі тады гэта будзе сапраўды мэта... Усяго табе добрага, Стася,— вельмі сур’ёзна скончыла яна.

— І вам.

— Ну ўсё, тады да пабачэння...

— Бывайце.

І яна пайшла па лесвіцы ўніз, а я ўверх, з нейкай сумнай думкай, што ў суседкі ўсё жыццё нечым нагадвае адзінокі пачатак гэтага вечара на падаконніку...

# ВАЛІК

## 1.

*Валянцін Аляксандравіч Мароз* нарадзіўся ў вёсцы Шарагі і пражыў тут усё жыццё.

У дзяцінстве гуляў з Дзімкам і Лёнькам у вайну, еў яблыкі і ездзіў з мамкай на ровары даіць карову.

Калі прыйшоў час, стаў наведваць мясцовую сярэднюю школу, без вялікай ахвоты да вучэння, а таму і без якіх-небудзь поспехаў. Затое на выпускным балі адным разам выпіў у заклад бутэльку белай і тады ўвесь вечар ванітаваў.

Пасля школы сем гадоў працаваў на свінаферме, дзе канчаткова набыў звычку спажываць вялікія колькасці алкаголю. Звычку, дарэчы, шкодную для сябе, гэтаксама як і для бацькі, двух дзядзькоў, чатырох стрыечных братоў, шасці пляменнікаў, дзвюх пляменніц і яшчэ шмат каго з аднавяскоўцаў. Піў, як усе: і ўзімку, і ўлетку, і ў будні, і на святы, і адзін, і з хлопцамі. Адметнасцю Валіка было змрочна казаць за чаркай «Эх, храновая мая жызня!» і расчаравана махаць рукою. У гэтай фразе, напэўна, злучаліся ўсе высновы, падставы і тлумачэнні. Праўда, па словах Дзімкі і Лёнькі, штосьці падобнае яны ў дзяцінстве разам бачылі ў кіно.

Той самай парою Валянцін Аляксандравіч прыдбаў і жонку, ужо амаль адразу з дачкою. Дужа ён рабіць не любіў, але любіў крычаць, каб «хутчэй там строілі есці» і нязменна працягваў любіць гарэлку. Жонка год цярпела, два крычала, адзін білася і нарэшце кінула мужа. Праз гэта ён вярнуўся ў родную хату, а неўзабаве перастаў працаваць. Бацькам дапамагаў слаба, але суседзям за гарэлку абкошваў сена, сёк дровы і прапаноўваў невядома дзе ўзяты кумпяк ці кошык ігрушаў. Усіх турботаў меў: знайсці, каб выпіць ці пахмяліцца, а п’яным быў бадай што самы шчаслівы. Часам Валік такі прыгадваў жончыны катлеты і крапаныя клёцкі, але заміряцца яна не хацела. Дачку, здаралася, бачыў на сяле. І аднойчы яна, малая, доўга ўглядаючыся ў Валікаў зямлісты няголены твар, назвала яго дзедам.

Так і пражыў Валянцін Аляксандравіч ледзь не сорак гадоў. А неяк увесну вяртаўся з крамы і, ідучы па кладцы, зваліўся ў сажалку і ўтапіўся. У абедзвюх кішэнях нябожчыкавай ватоўкі знайшлі па бутэльцы. «Віно каменем на дно пацягнула», — сурова зазначылі старыя.

## 2.

Чалавек у швэдары і плямістых вайсковых штанах, запханых у боты, крочыў уздоўж зіхоткага блакітнага возера, гледзячы то туды, то сюды, і ў яго галаве блыталіся злосныя і яшчэ не зусім цвярозыя думкі. Толькі што, здаецца, на пыльную шарагоўскую дарогу сыходзіў вечар, а цяпер ззяла цёплае сонца, навокал зелянелі бясконцыя ўзгоркі і ціхія празрыстыя хвалі плёхаліся аб бераг. Наперадзе пачынаўся бярэзнік, і мужчына паскорыў хаду, з надзеяй убачыць хаця б там што-небудзь звыклае: сцежку, лодку ці нарэшце пустую бутэльку.

За тры крокі ад першай бярэзіны, высокай і стромкай, ён знянацку спыніўся.

Ля яе, прытуліўшыся спіною да камля, сядзела дзяўчына з русяваю касою, у доўгай белай вышыванай кашулі. Яна няўважліва глядзела на яго, і яе твар быў светленькі і засмучаны.

— ...і багатыя, і старыя, і хлопцы, і настаўнікі, і гандляры — іх шмат, — стомленым нягучным голасам жалілася некаму дзяўчына. — Яны пражылі жыццё і не ведалі, што такое Радзіма, а я не ведаю іх. Яны з’яўляюцца тут адзін за адным... І я ўжо не разумею... Нашто былі коннікі са сцягамі, капліцы і тоўстыя кнігі ў скураных вокладках? Ці варта было?

І невядома як узніклае тут рэха, велічнае і спакойнае, пераканана адгукнулася:

— Варта было!

— Варта было, — задумліва паўтарыла дзяўчына. — Тое, што стваралі і аб чым дбалі продкі, засталося на іх зямлі, але не стала гэтым людзям спадчынай. Засталася яшчэ мова і, — яна акінула позіркам бераг, — наша прыгажосць. Толькі яны не бачаць і не чуюць, яны як пні... І ва ўсім іншым былі пнямі, таму... іх там цэлы ўзгорак, — дзяўчына кіўнула галавой да бярэзніку. — І чаго яшчэ яны заслугоўвалі?

— Цэлы ўзгорак, — з абурэннем паўтарыла рэха.

Зараз мужчына нават не ўяўляў, якім чынам трапіць назад і чым усё можа скончыцца.

Яму было зусім ніякавата ў гэтым дзіўным месцы з чароўным рэхам і дзяўчынай, якая казала штосьці незразумелае.

— Чаму ты так жыў? — раптам звярнулася яна да чалавека ля возера.

— Эх, храновая мая жызня, — павагаўшыся, сказаў ён і расчаравана махнуў рукою.

Толькі зараз гэта чамусьці падалося недарэчным. Пытальныя і нібы спакутаваныя вочы дзяўчыны сталі яшчэ больш маркотнымі.

— Іншыя хаця б працавалі ці выхоўвалі дзяцей, а ты?

Мужчына маўчаў, утаропіўшыся ў траву. У звыклым тлуме свядомасці не знаходзілася аніякіх адказаў, і цяжкая безвыходнасць ахоплівала яго ад гэтых сумных пытанняў.

— Толькі піў, — працягнула дзяўчына. — А як цябе зваць?

— Ммм... Валік, — адказаў ён.

У рэшце рэшт, за ўсе 40 гадоў да яго ніколі не звярталіся інакш. Але дзяўчыне раптам стала смешна.

— Валік! Ха-ха-ха, мне яшчэ ніхто так не адрэкамендоўваўся... Валік... Не, нашто ператвараць усіх у пнёў? Пабудзь лепш сапраўды валікам! Год ці два! Зробіш больш вартага, чым за ўвесь адведзены табе час! — пракрычала яна і захлынулася нервовым смехам. — Якая справа табе да намаганняў дзядоў ці да Радзімы? І да таго, што робіцца з ёю цяпер? Ніякай, і яго зваць Валікам!

— Ніякай, ніякай справы! — грозна паўтарыла рэха.

— Валік! — уладна і гучна выклікнула дзяўчына.

Мужык з жахам адчуў, што ўзлятае ў паветра і нібыта змяншаецца і сціскаецца.

Узбярэжжа стала пустым.

## 3.

— Ого! Валічак, футравы, новенькі! Гэта ж у тры разы хутчэй будзе! — узрадаваўся Санька, прыйшоўшы па інструмент. На бляшанцы з эмаллю ПФ-115 насамрэч ляжаў шэры касматы валік. — Пракопавіч з першай змены, напэўна, прынёс. Вось добра, а то корпаешся тут з пэндзлем!

І Санька, весела махаючы набыткам, пакрочыў да недафарбаванай сцяны новага ФАПа.

Андрэй ЛАТЫГОЛЕЦ



# БЯЛЯВАЯ ДЗЯЎЧЫНА

*У трэнажорнай зале* было людна, як заўжды звінела жалеза, на ўсю моц гучала радыё, і цяжка дыхалі стомленыя хлопцы. Ужо даўно я са сваім сябрам Янкам вырашыў хадзіць туды, у час, калі амаль што няма вольнай хвіліны, у час, калі займацца больш трэба розумам, мы ўсё ж пакінулі месца і ўласнаму целу, хоць для якойсьці разрадкі, каб канчаткова не здурнець у гэтым «вясёлым» свеце. Цягаць жалеза, канечне, не выйсце, але я лічу — лепей, чым заглушаць дэпрэсію за бутэлькай спіртнога ў свой юнацкі век. Паклаўшы ў сумку спартыўную вопратку, мы з таварышам ішлі на чарговыя трэніроўкі, каб пасля праз сілу дадыбаць дадому. І ўсё б так магло працягвацца паціху-памалу, пакуль не з'явілася ў гэтай зале бялявая дзяўчына. Здавалася б, што яна тут згубіла, але гэта нікога не цікавіла, галоўным стала яе прысутнасць.

Тым вечарам, звычайна як пачынаюцца заняткі ў зале, цягнулася тая ж лямка: хто больш за ўсіх падняў штангу ці гіру, ці гантэлю і з якой вагай, у каго большы аб'ём біцэпса, хто п'е якія бялковыя дабаўкі, каб арганізм дужэў, а чалавек станавіўся сапраўдным волатам, — з'явілася яна, дзяўчына ў белым спартыўным касцюме, з натуральнымі бялявымі пасмамі валасоў. Памятаю яе блакітныя вочы, такіх я яшчэ ніколі не бачыў, светлыя, як марскія кроплі, так, так, як самыя лепшыя, як з самага дна самага светлага і празрыстага мора свету. Даволі прыгожы тварык, румяныя шчокі амаль адразу зачаравалі ўсіх нас. Росту дзяўчына была невялікага, таму і выглядала сярод нас нібы ягня сярод шэрых ваўкоў. У той вечар, калі яна з'явілася, усе мы перасталі падымаць сваё жалеза. Дзяўчына сціпла ўвайшла ў залу, агледзелася і пачала размінацца. Хлопцы, ды і я, некалькі хвілін стаялі ў поўнай разгубленасці, займацца зноў пачалі пазней, але неяк нерашуча. Потым з дзяўчынай пазнаёміўся наш трэнер, якога мы празвалі Геркулес. Трэба было бачыць вочы нашых хлапцоў, якія ў думках, відвочна, уяўлялі сябе на яго месцы і зайздросцілі яму. А я паступова прывык да яе, не адчуваючы ніякай сарамлівасці, нейкай там няёмкасці перад ёй. Аднойчы Янка пасля трэніроўкі мне сказаў:

— А яна нічога сабе.

Я з ім пагадзіўся.

І пацягнулася чарада заняткаў з прысутнасцю гэтай мілай бялявай дзяўчыны. Яна пачала наведваць іх кожны

*Андрэй Латыголец нарадзіўся ў 1988 г. у г. Мінску ў сям'і рабочых. У 2006 г. скончыў школу. Друкаваўся ў «Бярозцы», «Маладосці», «Літаратуры і мастацтве», у кнізе «Наша Перамога».*

раз, заўжды прыходзіла першай, каб хуценька пераапрануцца і пайсці займацца на трэнажорах. Мясцовыя волаты, пачаў я прыкмячаць, фанабэрыста захадзілі перад ёй, пачалі напружваць свае накачаныя грудзі, надзімаць шчокі, каб яна ведала, якія тут ёсць асілкі. Трэніроўкі зрабіліся весялейшымі. Хлопцы пачалі жартаваць, падміргваць ёй, запрашаць у сваю кампанію. Некаторыя, каб прыцягнуць да сябе ўвагу, пачыналі цягаць да канчатковага знясільвання цяжкую штангу. Неяк Шурка Цульгін, хударлявы хлопец, схапіў адну з такіх, яго ледзь не прыдушыла ёй, дзяўчына ўбачыла гэты выбрык, войкнула, але хлопцы загадзя падхапілі штангу.

А вось мой сябар наадварот, — пачаў нерваваца, не зводзіў вачэй з дзяўчыны, мне пачало здавацца, што ён толькі і прыходзіў сюды дзеля гэтага.

Дзяўчына ж старалася не звяртаць ні на кога ўвагі. Адзінымі яе словамі да ўсіх нас былі, здаецца, «прывітанне» і «да сустрэчы». Праўда, аднойчы мне з ёй давялося перакінуцца параю слоў, калі мы размінуліся ў дзвярах, яна выходзіла, я заходзіў.

— Мяне Каця завуць, — сказала яна і лагодна мне ўсміхнулася.

Пра тое я, не памятаю чаму, расказаў Янку. Вочы ў таго заіскрыліся радасцю. Ён нечакана пачаў выпытваць усё ў падрабязнасцях.

— Ты што, закахаўся? — пажартаваў я.

— Ды якое там... — Янка змоўк.

Праз некаторы час Каця пачала прасіць дапамогі ў трэнера, каб ён прасачыў, ці правільна яна выконвае практыкаванні, назіраць, каб не гнулася спіна, дзе і прытрымаць. Калі трэнер быў заняты, Каці з вялікім задавальненнем дапамагалі хлопцы. Аднаго разу Жэнька Шпакаў, наш лавелас, прытрымліваючы яе за паясніцу, узяў ды прытуліў да сябе. Ох, дасталося яму тады, такую аплявуху адхапіў, што аж іскры з вачэй пасыпаліся. Мне таксама выпадала ёй дапамагаць. У тыя хвіліны я бачыў, як мой сябар засмучана адварочваўся, а ў мяне не было выйсця. Паўсюль у трэнажорным зале, ведаеце, вісяць вялізныя люстэркі, каб чалавек мог бачыць сябе ў розных ракурсах. Дык вось яна заўсёды станавілася насупраць якога-небудзь з іх і пачынала выконваць сваё практыкаванне. Дапамагаючы Каці, я стараўся не глядзець ёй у вочы, калі ж мімалётна спыняў на ёй свой позірк, яна з усмешкай глядзела на мяне. Аднойчы Каця неяк рана пайшла з трэніроўкі. Я не звярнуў на гэта ўвагі, а Янка імгненна занепакоіўся.

— Выбачай, мне трэба ісці, зусім забыўся, важная справа, бывай, — нечакана прабубнеў ён над маім вухам, ляпнуў мяне па плячы і пайшоў услед за ёй.

Як я потым даведаўся, ён праводзіў Кацю да самага дому, а што там між імі адбылося, так ніхто і не даведаецца. Каця ж перастала наведваць трэнажорную залу. Ізноў для нас пачаліся шэрыя дні, глухі грукат жалеза і цяжкае дыханне хлопцаў. Некалькі тыдняў бялявая дзяўчына зусім не з’яўлялася ў зале, некаторыя хлопцы звыкліся, некаторыя...

З’явілася яна ў той дзень, калі яе ніхто не чакаў, да таго ж і Янкі не было. Прыйшла Каця ў чырвоным спартыўным касцюме з накручанымі валасамі. Хлопцы як адзін аслупянелі, паразяўлялі раты, я таксама ў захапленні загледзеўся на яе, але, заўважыўшы выраз твару Кірыка, самага дужага хлопца з усіх нас, адразу адвёў вочы.

Вось ізноў тая ж весялосць, зноў жарты, зноў бялявая дзяўчына. Тым вечарам я па-сапраўднаму адчуў, што яна мне падабаецца, такой я яе ніколі яшчэ не бачыў. З радыё загучала песня групы ДДТ «Любовь». Я ўзяўся за гантэлі і толькі падумаў пра каханне, як пачуў ціхі пяшчотны Кацін голас:

— Дапамажы мне, калі ласка.

Я ахвотна згадзіўся. Хлопцы, нібы па загадзе, пачалі крыўляцца, дражнячы мяне, калі я пачаў дапамагаць ёй, але ў глыбіні душы я ўсё ж разумеў крыўду кожнага з іх — чаму менавіта я — разумеў зайздрасць.

Каця выконвала практыкаванне на прэс, мне ж трэба было лічыць колькасць выкананых разоў. Яна спрытна ўладкавалася на спецыяльным трэнажоры, разагнула спіну і пачала. Усё б так і было далей, пакуль я неўзабаве не заўважыў, што куртачка на ёй загалілася. Мне стала зразумелым, чаму яна сюды прыходзіла і што хавала. Гэты поўненькі жывоцік, такі прывабны, адцягнуў мяне ад падліку і я забыўся на ўсё. Як цяпер памятаю, яе дзявочы стан падкрэслівалі прыгожыя грудзі, кроў мая ўскіпела, нібы ў вены ўпырскнулі нешта шыпучае. Я доўга глядзеў на яе светлы тварык, калі яна згіналася, ён напружваўся і моршчыўся, а заплюшчаныя вейкі лёгка ўздрыгвалі. Каця дыхала павольна, зусім нячутна, але я адчуў, што сэрца маё пачало грукаць у такт яе дыханню. Забыўся я на ўсё, нават на яе голас, нібы праз сон мне чуліся яе словы:

— Колькі яшчэ? Га?

— Чаго? — разгублена прабубнеў я.

— Разоў колькі?

— А... ужо ўсё, усё...

Мне стала крыху сорамна за сябе, а што калі яна заўважыла, куды я глядзеў, тым больш у яе, верагодна, нейкая сувязь з маім сябрам…

Калі Каця збіралася ўжо сыходзіць, нешта і мяне пацягнула пайсці следам. Я адчуў, што павінен сказаць гэтай дзяўчыне нейкія важныя словы. Але не ведаў, якія, нават калі дзверы ў раздзявалку зачынілася і мы засталіся адны.

— Можа, ты выйдзеш? — сур’ёзна сказала яна.

Я, адчуваючы, што пачынаю чырванець, нечакана для яе і для сябе выпаліў:

— Мой сябар Янка цябе кахае.

Каця паглядзела на мяне з дакорам, нейкі нібыта боль прамільгнуў у яе вачах, і яна ледзь вымавіла:

— Але мне падабаешся ты…

Імгненна я зразумеў, што замест «мой сябар» хацеў сказаць «я» ды не асмеліўся. Тады я не ведаў, што больш ніколі яе не пабачу…



*Юры Станкевіч нарадзіўся ў 1945 годзе ў г. Барысаве. Скончыў БДУ, факультэт журналістыкі. Працаваў карэспандэнтам Барысаўскага раённага радыёвяшчання, у рэдакцыях часопісаў «Маладосць», «Крыніца». Выдаў некалькі кніг прозы, аўтар шматлікіх п'ес. Працуе ў жанры кіно і драматургіі.*

Юры СТАНКЕВІЧ

# ВЕЛЬМІ СМАЧНАЯ РЫБА ФУГУ

*Фізіялагічны раствор* з хуткасцю прыкладна тры кроплі ў дзве секунды бязгучна сцякаў з кропельніцы па празрыстай пластыкавай трубачцы і ўліваўся ў вену на локцевым згібе. У палаце бальніцы хуткай дапамогі разам з ім было чацвёра хворых. Была раніца, час абходу. У калідоры бразгалі посудам. Чуліся чыесьці галасы, у дзверы часта заглядвалі санітаркі. Якраз у гэты момант маладая доктарка ўвайшла ў палату.

І тады адразу нешта навокал змянілася, быццам адбылося не больш не менш, як сашэсце свяшчэннага агню, сэрца яго на нейкі момант спынілася, і яго нават кінула ў гарачыню, бо ён адразу зразумеў, што гэта жанчына і ёсць тая самая, якую ён шукаў. Кожны чалавек шукае сваё. Адны знаходзяць (іх, пэўна, меншасць), другія (якіх большасць) так і жывуць, не асэнсоўваючы сваёй абдзеленасці і набываючы комплексы. Дык вось, гэта і была яго жанчына. На ўсё жыццё.

Доктарка прысела на зэдлік і пачала мерацъ ціск хвораму каля самых дзвярэй. Гэта быў звычайны рабацяга, цягавіты і цярплівы. Ноччу ён моцна хроп. Урэшце, храплі ўсе. Магчыма, і ён таксама.

Яна загаварыла. Голас у яе быў нізкага тэмбру, спакойны, словы ветлівыя, без лішніх эмоцый. Ён услухоўваўся ў рытм яе невялічкай лекарскай прамовы, не ўспрымаючы сэнсу. У доктаркі быў асіметрычны твар з вострым, крыху зрэзаным падбародкам, цёмныя валасы пад белай шапачкай проста зачасаны назад і забраны ў вузел. Ногі прыгожыя, праўда, крыху крываватыя, невялікія грудзі. Так, яна не была прыгажуняй. На прыгажунь ён і не надта западаў: іх штодня можна сустрэць на вуліцы. І не адну. А вось такую — не часта. На выгляд ёй было гадоў дваццаць пяць. Можа, больш.

Ён чакаў. Вольнай рукой адразу пасунуў зэдлік, каб яна магла сесці побач, ледзь не перакуліў кропельніцу.

Урэшце яна скончыла слухаць бязладныя скаргі рабацягі, сказала яму нешта звыкла абнадзейваючае, падышла да яго ложка, а потым села насупраць і зазірнула ў яго картку.

— Вы Ліс? Арцём Алегавіч?

— Так, гэта я, — хутка і па-армейску адказаў ён.

— Як сябе адчуваеце? На ваш погляд, вы зараз у парадку?

— Вам меркаваць.

Яна зрабіла паўзу і зірнула яму ў твар, сустрэлася позіркам. Вочы ў яе былі зусім зялёныя з ледзь улоўнай стомленасцю і тугой у зрэнках.

— Вас прывезлі ў непрытомнасці. Суткі вы былі ў рэанімацыі, а цяпер вы тут. Я ваш лечачы ўрач.

— А магу я даведацца ваша імя?

— Можаце, — яна крыху памарудзіла. — Мяне зваць Вера Антонаўна.

«Значыць, Вера, — падумаў ён. — Вось яно як».

— Што з вамі здарылася? — спытала яна. — Вас учора ледзь адкачалі. Вы малады і толькі таму ачунялі так хутка. У вас атручэнне невядомага паходжання. Мне трэба ведаць, што вы ўжывалі напярэдадні? Алкаголь? Можа, што з’елі?

— Я скажу вам праўду, — хворы Арцём Ліс правёў вольнай рукой па коратка стрыжанай галаве, — я вячэраў рыбінай фугу.

Ён думаў, што яна здзівіцца, пачне распытваць, але гэтага не адбылося.

— Дык вы аматар экстрыму? — спытала яна.

— Не, — ён спрабаваў жартаваць, — проста я вельмі люблю рыбу фугу. Пяшчотна і аддана.

Доктарка пацiснула плячыма, усміхнулася — больш з ветлівасці, моўчкі памерала яму ціск, загадала паказаць язык і горла. Потым устала з зэдліка і перасунула яго да іншага хворага за яго спінай.

На імгненне ён пакрыўдзіўся. Магла б спытаць больш падрабязна. Чаму і як. Ён бы расказаў. Усю праўду, і нават больш.

* * *

З аднакласнікам Ігарам Кушнерам мастак Арцём Ліс сутыкнуўся выпадкова. Кушнер быў стыльна, хоць і некалькі рызыкоўна прыкінуты, з залатым ланцугом на шыі, трымаўся ўпэўнена. Ён спытаў Арцёма Ліса, чым той займаецца, а пра сябе прама сказаў, што пайшоў у крымінал. «Дарэчы, — раптам прапанаваў ён, — чаму б табе не намаляваць да дня нараджэння партрэт маёй жонкі: у яе якраз круглая дата?» «Згода, — падумаўшы адказаў яму мастак Ліс. — Дамовімся ў дэталях пасля». «Вось і добра, — ажывіўся Кушнер. — Тады не пасля, а зараз у рэстарацыю, я частую. Там і пра ганарар пагаворым».

Мастак Арцём Ліс нерашуча прапанаваў кафэ паблізу, але Кушнер на гэта сказаў «не гані мутняк», спыніў таксі і павёз яго ў «Чорны ветразь» — самы прэстыжны рэстаран у сталіцы.

«Дарэчы, ты не супраць, каб «фугануцца»? — спытаў Кушнер, калі яны селі за столік. — Ты рыбу фугу калі-небудзь спрабаваў?» Ліс на тое адказаў, што не, нават не ўяўляе сабе, што гэта такое, але быццам нешта пра яе чуў. Японскі далікатэс.

«Фугу, апошні піск сталічнай гастранамічнай моды, можна заказаць толькі тут, у «Чорным ветразі», — патлумачыў Кушнер. — Справа ў тым, што фугу неверагодна атрутная. Тэтрадатаксін, які ўтрымлівае яе пячонка, ікра, вочы і скура, у дваццаць пяць разоў мацнейшы за курарэ. Проціяддзя не існуе. Але ўсе неатрутныя часткі рыбіны маюць неверагодную лячэбную сілу. Куды там акулавым плаўнікам ці рогу насарога, ха-ха... Вядома, у рыбіне застаецца нейкая колькасць атруты, якая выклікае «прыход», як ад наркотыка, урэшце, тут усё залежыць ад кухара: як ён валодае таямніцай дазіроўкі, атрымліваецца, ну, нешта накшталт рускай рулеткі. Але, калі не пашанцуе, можна, так бы мовіць, і «зажмурыцца». Дык што — замаўляем? — спытаў у канцы свайго тлумачэння Кушнер. — Ці слабо?»

* * *

Доктарка між тым агледзела апошняга хворага з іх палаты і пайшла да дзвярэй. Раптам яму стала вусцішна.

— Калі мяне выпішуць, Вера Антонаўна? — спытаў ён ёй у спіну.

— Вельмі хутка. Думаю, у вас ужо ўсё стабілізавалася.

— Не, — заспяшаўся ён, — мне ўсё яшчэ не па сабе. Я хачу пабыць тут. Тым больш, што мае родныя жывуць у іншым горадзе, а я адзін, і мяне ніхто не чакае.

— Дзіўнае жаданне, — доктарка Вера на секунду спынілася ў дзвярах. — Але ж у нас бальніца, дзе не падаюць рыбу фугу.

«Вось і прыхаваны кпін, — падумаў ён. — Калі б яна яшчэ ўведала, што порцыя той фугу каштуе дзвесце пяцьдзесят долараў — столькі, колькі, пэўна, яна атрымлівае тут за месяц, то магла б сказаць нешта іншае. Больш здзеклівае. А можа, яна ведае?»

Кропельніцу аднеслі, ён схадзіў разам з усімі ў сталовую і паснедаў, а потым стаў шпацыраваць па калідоры, спадзеючыся напаткаць доктарку Веру. Проста, каб пабачыць. Але яна не з’яўлялася. Зайсці ж у ардынатарскую без прычыны ён не рашыўся і таму зноў пайшоў у палату і лёг на ложак.

К абеду ў палату шумна ўваліўся Кушнер.

— Ну што, чудзіла? — спытаў ён, кідаючы на тумбачку пакет з апельсінамі і пачак соку ў папяровай упакоўцы. — Канчай парыцца тут, на шконцы. Трэба партрэт маляваць, а потым мы з табой яшчэ разок накацім у «Ветразь». Фуганёмся. У першы раз яно заўсёды не ў кайф. Мне дык перабор не страшны, а табе вось не ў масць пайшло. А мог бы і ласты склеіць. Ну нічога, не апух жа, ха-ха...

— Ды пайшоў ты... — сказаў Арцём Ліс.

— О-о, малаток, бачу, што ачуняў.

І Кушнер намерыўся быў сесці на зэдлік, але ў яго зазваніў мабільнік, і ён, перакінуўшыся з невядомым абанентам некалькімі фразамі з добрым дамешкам расейскай «фені», стаў адразу развітвацца. «Твой пеленг у мяне ёсць, — сказаў ён Лісу. — Так што хутка пабачымся».

— Дзякуй табе! — вырвалася ў таго.

— Гэта яшчэ за што? — ужо ў дзвярах здзівіўся Кушнер, але адказу чакаць не стаў і знік гэтак жа імкліва, як і з’явіўся.

«За тое, што менавіта тут, у бальніцы, я, каб не сурочыць, знайшоў сваю жанчыну», — падумаў мастак Арцём Ліс.

* * *

Але знайсці каханне — гэта не значыць адразу яго атрымаць у гатовым выглядзе. Доктарка Вера нічым не вылучала мастака Арцёма Ліса ад іншых хворых, нягледзячы на тое, што ён некалькі разоў на дзень трапляўся ёй на вочы і кожны раз імкнуўся з ёй загаварыць.

— Я заўтра вас выпісваю, — урэшце абвясціла яна яму. — Калі ж вы не задаволены нашым лячэннем, то, як чалавек заможны, здолееце працягнуць яго за плату. У іншым месцы.

— Я не заможны, — запярэчыў Арцём Ліс. — Я ўсяго толькі мастак. Не прызнаны нават афіцыйна.

— Але ж рыба фугу, якую вы так любіце, каштуе, як я даведалася, вялікіх грошай.

— Так, — сказаў ён. — Але ў «Чорным ветразі» я апынуўся выпадкова. А рыбу фугу я цяпер люблю яшчэ больш, бо дзякуючы ёй сустрэўся з вамі.

Яна не адрэагавала. Толькі зірнула неўразумела, павярнулася і знікла ў ардынатарскай.

Яго намаганні ў той апошні дзень усё-такі далі нейкі плён. Падпільнаваўшы яе ў канцы змены, ён убачыў, як доктарка Вера крочыць да выхаду, апранутая ўжо для вуліцы ў простую сукенку і строгі пінжак цёмна-зялёнага колеру. Цёмна-каштанавыя валасы вольна абрамлялі яе асіметрычна-птушыны твар. «Усё-такі, калі ў чалавеку ёсць парода, яе не выведзеш нічым і аніяк не схаваеш», — падумаў Арцём Ліс. Увачавідкі — гэта была яго жанчына, яго каханне.

Падкупленая кушнераўскімі апельсінамі санітарка Ніна, якую ўдалося разгаварыць, паведаміла яму, што доктарка Вера ў іх аддзяленні лепшы ўрач, што яна нядаўна замужам, і што муж у яе, па чутках, значна старэйшы па ўзросце, генерал-маёр, вось толькі генерал-маёр чаго — яна не ведае.

«А хоць бы і таго, — падумаў на гэта мастак Арцём Ліс, — я ад яе не адступлюся, нягледзячы ні на што».

«А жывуць яны, дакладней, яна, не сказаць каб шчаслівa, — падагульніла санітарка, — гэта адразу адчуваецца, і тут, у калектыве, паміж жанчын мала што схаваеш».

Апошняя заўвага прастадушнай Ніны адразу не толькі надала яму пэўнай надзеі, а і ўвагнала ледзь не ў эйфарыю. Да пятніцы яму заставалася двое сутак, і — якое шчасце — у доктаркі Веры па графіку, які ён даследаваў у калідоры на сцяне, якраз з чацвярга было начное дзяжурства.

* * *

У чацвер к вечару мастак Арцём Ліс ляжаў у палаце на сваім ложку, але не спаў, а чуйна прыслухоўваўся да гукаў у калідоры. Там было адносна ціха, і ён у думках пажадаў, каб тэрмінова не прывезлі якога хворага — тады б дзяжурная доктарка была занятая, лічы, усю ноч. За акном палаты, на вуліцы, аднастайна шумелі рухавікі машын. Адзін з яго суседзяў хроп, двое іншых нешта вяла абмяркоўвалі — ён не ўнікаў.

Урэшце ён узняўся з ложка і скіраваў у бок ардынатарскай. Доктарка Вера сядзела за сталом адна і нешта пісала. Мастак Арцём Ліс набраў у грудзі паветра і пачаў гаварыць. Ён сказаў, што закахаўся адразу, што не вар'ят, а рашэнне яго быць заўсёды побач з ёй непарушнае і адзінае, што ён просіць, — прыняць яго словы ўсур'ёз. Нават больш чым усур'ёз.

Ён убачыў, як доктарка Вера ўспыхнула і пачырванела.

— Але ж вы атакуеце мяне так, быццам інтэрпрэтуеце нейкі варыянт бунінскага «сонечнага ўдару», — сказала яна. — А вы ведаеце, што я замужам? І вы сур'ёзна разлічваеце на імгненную згоду? А што вы пра мяне падумаеце праз месяц, другі, калі я даверуся вам? Што я — экзальтаваная дурнічка? Дарэчы, муж добра адносіцца да мяне, я маю ўсё, што захачу.

— Гэта не зусім тое.

— А што — зусім?

— Каханне. На ўсё жыццё. Я ведаю пра такія пары. Яны існуюць.

— Вы адцягваеце мяне ад работы. Гвалтам.

— Але ж я вам спадабаўся хоць крыху? — задаў недарэчнае пытанне мастак Арцём Ліс.

Паўза цягнулася доўга, яму здалося, што бясконца.

— Так, — нечакана шчыра сказала яна. — Вы выклікалі ў мяне прыязнасць, як толькі я вас убачыла. Вы высокі, дужы, у вас адкрыты твар. Вы нагадалі мне бацьку, якога я запомніла з маленства. Ён памёр заўчасна. Але ўсё гэта нічога не зменіць, і я не ведаю таго нешта, якое магло б гэта змяніць.

«Затое я ведаю», — мільганула ў яго галаве.

Назаўтра была пятніца, і яго выпісалі.

* * *

К абеду мастак Арцём Ліс прыехаў дамоў, у сваю аднапакаёўку, прыняў душ і апрануўся адпаведна: цёмны касцюм, светлая кашуля і гальштук якраз знайшліся ў яго сціплым гардэробе. Забраў усю гатоўку, якую знайшоў.

У «Чорным ветразі» да вячэрняга наплыву заўсёднікаў яшчэ заставаўся час, і яму знайшлося месца. Ён заказаў суп і закуску з рыбы фугу, а таксама паўбутэлькі белага сухога віна.

— Фугу сёння абмежавана і толькі на заказ, — ветліва папярэдзіў яго афіцыянт.

— Плачу ўдвая, — ён выцягнуў з партаманета і паклаў на стол тры паперкі.

Афіцыянт кіўнуў і забраў грошы. Неўзабаве ён з'явіўся зноў, прынёс віно, папрасіў крыху пачакаць і ўрэшце выставіў на столік яго заказ.

Адчуванне наступіла праз нейкі час і зноў было пагрозліва здзіўляючым. Спачатку ў яго пайшлі па спіне мурашкі, потым адняліся ногі, усё было як раней, калі ён вячэраў тут з Кушнерам, потым ён перастаў адчуваць левую руку і тады правай таропка напісаў на сурвэтцы адрас бальніцы хуткай дапамогі і прозвішча ўрача. Сурвэтку ён сунуў у нагрудную кішэню пінжака, каб яе ўбачылі адразу.

Потым у яго аднялася і правая рука, затым сківіцы. Рухаліся толькі вочы. Ён ведаў, што ўсё павінна ажываць у зваротным парадку. Калі пашанцуе. А мажліва — і не. Лепш, каб было дзесьці пасярэдзіне.

# МІЛЬЯРД УДАРАЎ

*Пацучыха не адзін раз* вандравала на ліфтавым канаце з паверха на паверх, бо дом быў стары, і ў пошуках ежы ў яе было шмат канкурэнтаў. Ёй пераваліла за два гады і, як яна беспамылкова адчувала, жыць заставалася ўжо няшмат.

Цяпер яна ўчапілася кіпцюрамі за рэльефныя выпукласці тросікаў і застыла ў чаканні: днём, асабліва раніцай і ўвечары, ліфт рухаўся ўверх-уніз амаль беспярапынна, заміраючы хіба што толькі ноччу. Пацучыха крыху расслабілася, доўгі голы хвост яе звесіўся долу, толькі сэрца працавала аднолькава роўна — дзесьці шэсцьсот цыклаў у хвіліну.

Урэшце ў ліфт зайшлі. Чалавек, як яна машынальна вызначыла падсвядомасцю, быў адзін. Чалавек націснуў кнопку, у ліфце шчоўкнула, загудзела, і ён крануўся ўніз. Невялікі блок абмежавання хуткасці пачаў варочацца і закруціўся на поўную магутнасць: звыклая з'ява, каб не адзін быццам малазначны нюанс, які тычыўся самой пацучыхі і разам непрадказальна змяніў усю сітуацыю. Справа закранала ўзрост жывёлы, яе рэакцыю на небяспеку, сілу мышцаў, вастрыню слыху і зроку.

Раптам яе хвост зацягнула спачатку бокам, а потым імгненна ўсю і — пацучыху раздушыла. Трос аўтаматычна скінуўся.

Ліфт спыніўся.

* * *

Чалавек па прозвішчу Павел Дук спяшаўся. У пярэдняй, на выхадзе з кватэры палюбоўніцы ён мельгам зірнуў у люстэрка, крытычна ўсміхнуўся сам сабе і прыгладзіў валасы. Ён быў далёка не малады, яўна з лішняй вагой, але шыракаплечы і вузкі ў клубах, што скрадвала ягоныя не вельмі істотныя, як ён лічыў недахопы.

У люстэрку ў адказ на свой позірк ён пабачыў нічым не адметны твар лысеючага мужчыны з прамым носам, шэрымі вачыма і запалымі шчокамі.

Каханка — жанчына каля сарака год, мажная, але без прыкметных тлушчаадкладанняў на целе, цёмнавалосая, з пажадлівым ротам, апранаючы халат, выйшла праводзіць яго і зачыніць дзверы. Яе шырока расстаўленыя, аголеныя грудзі цяжарам звісалі з-пад крысаў халата. Яна была басанож, і галава яе, калі жанчына да яго прыхінулася, даставала яму амаль да падбародка. Мужчына раптам адчуў, як у ім зноў варухнулася жаданне, але заглушыў яго і таропка развітаўся праз пацалунак.

«Стэлефануемся», — сказаў ён і выйшаў вонкі. Гэта быў апошні, дзявяты паверх, і чалавек па прозвішчу Дук пасунуўся да ліфта. Ён націснуў кнопку выкліку, дзверы расчыніліся — ліфт аказаўся побач.

Ужо ў кабіне, адшукваючы пад слабым, мігатлівым святлом плафона патрэбную яму кнопку першага паверха, ён у думках зноў вярнуўся да тых дзвюх-трох гадзін, праведзеных у кватэры палюбоўніцы. Іх сувязь цягнулася ўжо некалькі год. Мужчына іншым разам задаваўся пытаннем: чаму яго праз пэўны час зноў і зноў цягне да гэтай жанчыны, хоць яго жонка нічым ёй не саступіць — і больш прыгожая, і з нашмат больш вытанчаным душэўным складам. Палюбоўніца ж была калі-нікалі нават вульгарная, нястрымная ў пяшчотах, іншым разам да краю юрлівая, але шчырая ў сваіх пачуццях, і не саромелася іх. Пракручваючы зараз у галаве хвіліны, праведзеныя з ёй у ложку, мужчына аблізаў раптам асмяглыя губы і зноў адчуў, як яго пакрысе апаноўвае жаданне, нават эрэкцыя з'явілася. «Хіба гэтая жанчына, калі б ён, напрыклад, на ёй ажаніўся, заставалася б штодня такой жа прыцягальнай? — думаў ён. — Цалкам верагодна, што ўсё магло быць наадварот: яна стала б для яго абыякавай, а цяперашняя жонка, сустрэнь яе на той час, ператварылася б у заўсёды жаданую палюбоўніцу».

Кабіна ліфта здрыганулася і кранулася ўніз. У сваіх хуткаплынных думках мужчына, між тым, вярнуўся да звычайнага: як ён з'явіцца дадому і патлумачыць жонцы сваю запозненасць, а потым згадаў работу — з раніцы трэба было ўзгадніць шэраг пытанняў з базавай фірмай. Чалавек па прозвішчу Павел Дук працаваў начальнікам аддзела па маркетынгу медпрэпаратаў вузкага профілю. Раптам у кабіне ў яго пад нагамі глуха шчоўкнула, і ліфт спыніўся. Мужчына пачаў устрывожана шукаць вачыма панель і націскаць кнопкі руху, але безвынікова. Яго неспадзявана кінула ў гарачыню. Слабая, пакуль яшчэ запозненая хваля страху, лёгкім дотыкам казытнула яго.

«Без панікі, — загадаў сабе чалавек па прозвішчу Павел Дук і агледзеў усе чатыры сценкі кабіны, а таксама столь і падлогу пад нагамі. — Урэшце, нічога не здарылася, ён пэўна завяз, але праз секунду-другую выкліча дзяжурнага дыспетчара ці яшчэ там каго, і яго вызваляць. Праўда, гэта здарылася з ім упершыню, але ж пра такія выпадкі ён ведаў, нават бачыў у нейкім камедыйным фільме ці чуў у гумарыстычных капусніках з удзелам знакамітых камічных акцёраў».

Але ўжо першы, не вельмі пільны агляд яго камеры часовага зняволення абудзіў у чалавека новую, непажаданую хвалю страху. Кнопка выкліку дзяжурнага дыспетчара была выдраная з усім сваім унутраным змесцівам, выдраная была і таблічка з нумарам аварыйных тэлефонаў.

Але мужчына звыкла нырнуў далонню ў кішэню, дзе заўсёды месціўся цёплы прамакутнік мабільніка, і — пахаладзеў. Твар яго пакрыўся потам.

Мабільніка не было. Ён абачліва і з намерам пакінуў яго дома, каб жонка не назаляла званкамі. Мала прыемнага, калі ў момант інтымных ласкаў «труба» раптам пачынае найграваць зазыўную мелодыю. Так, зараз трэба было, па-першае, не паддавацца паніцы, а, па-другое, спакойна адшукваць выйсце. Павінна ж быць у яго сітуацыі нейкае выйсце?

«Вентыляцыя, — падумаў ён. — Яму патрэбна свежае паветра, бо невядома колькі часу ён прасядзіць у гэтай скрыні, можа нават да раніцы».

Ён зноў жахнуўся: падлеткамі вентыляцыя была скрозь забітая і зацэментаваная жованкай, і мужчына адразу ўяўна адчуў, як яму не хапае кіслароду, і вось-вось наступіць прыпадак удушша. «Але ж гэта ўсяго толькі ўнушэнне, — пераконваў ён сябе, — паветра прасочваецца праз розныя непрыкметныя шчыліны, пад дзверы, а ён у кабіне адзін і яму будзе дастаткова кіслароду».

Чалавек па прозвішчу Дук набраў у грудзі як мага болей гэтага самага паветра і крыкнуў:

«А-а-а-а-а!»

І зноў:

«Дапамажыце!»

А потым загрукаў у сцены кабіны і ў дзверы нагамі:

«Ліфт спыніўся! Чуеце, хто-небудзь!?»

І зноў ужо на выдыху:

«Дапамажыце!»

Адказам было маўчанне. Мужчына сцішыўся і прыслухаўся. Цішыня. Страх з новай сілай накаціў на яго, і ён з адчаем зразумеў, што калі не возьме сябе ў рукі і не здолее супакоіцца — будзе горш. Тым больш, што ён ужо мае праблемы з сэрцам і гіпертэнзію, хоць і ў пачатковым стане, але ад таго не менш небяспечную.

Мужчына намацаў пульс і паднёс да вачэй гадзіннік. У цьмяным святле з аплаўленага запальнічкамі і недакуркамі плафона ён пачаў лічыць.

Ён налічыў амаль трыццаць цыклаў, пакуль секундная стрэлка гадзінніка прайшла чвэрць цыферблата.

«Амаль сто дваццаць, — у думках запанікаваў ён. — Тахікардыя на мяжы зрыву, і, да таго ж, у патыліцы сціскае. Ціск».

Але тут жа ён пачаў супакойваць сябе: напрыклад, у амерыканскіх астранаўтаў, калі яны спускаліся ў модулі на Месяц, а потым выходзілі на яго паверхню, іх пульс, як адзначылі ў Цэнтры палётаў, быў каля ста дваццаці цыклаў у мінуту. Дык тое ж адбывалася на Месяцы, а ён знаходзіцца на Зямлі, нават непадалёку ад свайго дому, усяго некалькі прыпынкаў. Ну а што загразнуў у ліфце, дык гэта такая дробязь, вартая хіба што смеху. У рэшце рэшт, ліфтам увесь час карыстаюцца, людзі выявяць, што кабіна не працуе, паведамяць каму трэба, і яго вызваляць.

Мужчына нават роблена ўсміхнуўся, і раптам успомніў пра таблеткі ад ціску, якія апошнім часам раз-пораз насіў з сабой у кішэнях. Ён абмацаў іх: адну, другую, трэцюю, але нічога такога, акрамя сцізорыка і партатыўнага калькулятара, які немаведама як у іх апынуўся, не выявіў. «Пэўна, таблеткі засталіся ў іншай вопратцы», — падвынікаваў ён, і зноў адчуў, як халадзеюць спіна і далоні.

Сэрца білася з ранейшай хуткасцю. Чалавек па прозвішчу Павел Дук неспадзявана нагадаў вядомыя яму факты, якія зараз чамусьці ўсплылі ў памяці. Праведзеныя разлікі па частаце сардэчных скарачэнняў для розных відаў жывёл супадаюць з фактычнымі велічынямі іх працягласці жыцця. Сэрцы жывёл за перыяд жыцця робяць прыкладна аднолькавы лік скарачэнняў — у межах аднаго мільярда.

Але ж і чалавек, як сцвярджае сучасная навука, — жывёла, хоць і ўчарашняя.

Мільярд удараў.

Каб заняць свае думкі і супакоіцца, а гэтага трэба было дабіцца любымі шляхамі, мужчына ўспомніў і выцягнуў калькулятар і пачаў падлічваць: у адной хвіліне — шэсцьдзесят секунд, што прыблізна адпавядае такой жа колькасці цыклаў сэрца, у гадзіне іх тры тысячы шэсцьсот, у сутках — восемдзесят шэсць тысяч чатырыста, у месяцы — два мільёны пяцьсот дзевяноста дзве тысячы, у адным годзе — трыццаць адзін мільён сто чатыры тысячы цыклаў, у шасцідзесяці гадах — ...атрымліва-

лася крыху больш мільярда, але ж працягласць жыцця сучаснага чалавека штучна павялічваюць гігіена і медыцына, а раней людзі ўвогуле не жылі больш як сорак год, — меркаваў ён.

Маніпуляцыі з лічбамі тым не менш не далі аніякага выніку. Страх з новай сілай працяў яго. Мужчына пачаў біць у сцены кабіны кулакамі, а потым і нагамі, пакуль сапраўдны прыпадак удушша не спыніў яго. Ён скінуў долу пінжак і рвануў кашулю на грудзях.

«Клаустрафобія?»

Ці сапраўды ён пакутуе на клаустрафобію? Чалавек па прозвішчу Павел Дук пачаў ліхаманкава перабіраць у думках мінулае — магчыма, з ім ужо здаралася нешта падобнае? На першы погляд, быццам нічога такога не выяўлялася. Але ж і сітуацыі, з якой сутыкнуўся зараз, ён таксама не мог нагадаць у сваім ранейшым жыцці. Праверыць гэта не было выпадку, хоць... хоць вось яно: неспадзявана ўспамін трыццацігадовай даўніны паслужліва ўсплыў з падсвядомасці. Так, гэта было даўно, у студэнцкія гады, калі ён жыў у інтэрнаце. Ён прывёў дзяўчыну, такую ж самую студэнтку, як і сам, нават з аднаго з ім факультэта, да сябе ў пакойчык, але акрамя яго там жылі яшчэ трое яго аднакурснікаў, і пакідаць яе на ноч не выпадала. «Каменданцкая якраз свабодная, — параілі яму, — сам камендант у адпачынку. Толькі вось замок там цяжка адмыкаецца, ледзь ключ падабралі». Урэшце, пра ўсё гэта ён ведаў і сам.

Яны выпілі з дзяўчынай віна, выпалілі па цыгарэце, і ён дапамог ёй распрануцца. Але тут яна раптам успомніла, што забыла ў яго пакойчыку «касметычку».

«Потым забяру, там усё роўна нічога такога няма», — сказала яна.

«Я прынясу», — паслужліва давёў ён, адчуўшы і патрэбу збегаць у туалет. Сказаць пра гэта пасаромеўся, балазе тут прычына знайшлася сама: схадзіць па «касметычку».

Але дзверы не адчыняліся. Ключ наглуха заблакіравала ў замку.

І тут жа ён адчуў страх. Ён нахлынуў быццам з ніадкуль: пакойчык, які хвіліну назад нагадваў яму ўтульнае сховішча, раптам імгненна ператварыўся ў небяспечную пастку. Ключ упарта не праварочваўся, рукі трэсліся, а рухі сталі мітуслівымі, як у вар'ята.

«Ды кінь ты, — параіла яму дзяўчына, — пасля адчынім, ідзі да мяне».

Перасільваючы сябе, ён вярнуўся ў ложак, распрануўся, але жаданне, якое хвіліны назад ледзь не спальвала яго — прапала. Замест яго з новай сілай наваліўся страх.

Тады ён ускочыў і, не звяртаючы ні на што ўвагі: ні на свае рукі, ні на з'едлівую ўсмешку дзяўчыны, ні на тое, што падымае залішні шум, пачаў выбіваць дзверы.

І як толькі яны расчыніліся, страх знік, быццам яго і не было.

Цяпер мужчына ўжо цьмяна памятаў, чым скончылася тая яго любоўная прыгода. Хутчэй за ўсё, а пэўна, так яно і было, дзяўчына адразу сышла, а ён пакрочыў да сябе, дзе паваліўся на ложак і заснуў цяжкім сном.

«Жах».

Чалавек па прозвішчу Павел Дук адчуў, як яму становіцца па-сапраўднаму блага. Рукі ў яго пахаладзелі, а ногі сталі няздольнымі трымаць вагу цела, і ён, спінай да сцяны, з'ехаў уніз, на падлогу ліфта.

«Небяспека».

Велічыню гэтай небяспекі ён прыгадаў толькі зараз. Так, ён ужо не малады, як і мноства людзей у яго ўзросце, пакутуе на розныя хваробы, некаторыя з якіх ужо ўвачавідкі праявілі сябе, а іншыя яшчэ толькі знаходзяцца ў зародкавым стане. Шмат мужчын у яго ўзросце раптоўна паміраюць, на здзіўленне тых, хто іх ведаў, і сваякоў. Памерці нескладана. Што такое існаванне чалавека? Як ён калісьці вычы-

таў, а зараз успомніў, тонкая чырвоная нітка, якая адразу рвецца, калі сіла жыцця пераважыць. А чырвоная таму, што жывая: чырвоны колер — колер крыві.

У рэшце рэшт, у яго становішчы гэта не што іншае, як рытарычныя, высакамоўныя меркаванні, — абарваў ён сябе. Калі дзверцы гэтай пасткі расчыняцца, то яго, цалкам магчыма, знойдуць на бруднай, пахнучай мачой, запляванай падлозе, у ванітах, з сінім, збрыджаным тварам, пад сценамі, ушпілянымі нават у сваёй межавай брыдкасці гнюснымі словамі — можна толькі ўявіць, якія псіхічныя адхіленні вадзілі рукой тых, хто на іх пісаў. Выклічуць «хуткую дапамогу», потым жонку, падключаць незадаволеных, затарможаных міліцыянтаў. Цікава, што падумае жонка, калі выявіць яго цела ў гэтым раёне, у незнаёмым ёй доме — месцы, ніколі дагэтуль ім не прыгадваемым? Дарослыя дзеці? Урэшце, тады яму будзе на ўсё гэта глыбока напляваць. Бадай, што так.

Новая хваля страху накаціла на яго.

«Дапамажыце!» — зноў закрычаў ён штосілы.

Маўчанне.

Урэшце, ён цяпер якраз у тым узросце, калі яго сэрца ўжо адпрацавала свой мільярд скарачэнняў, — думаў мужчына, — а гэта значыць, што трэба быць напагатове і сустрэць непазбежнае без залішніх хваляванняў і скаргаў на лёс. Хіба смерць, як ён аднойчы вычытаў у Кастанэды, заўсёды знаходзіцца з намі побач, за спінай з левага боку, на адлегласці метр-паўтара, — можа адчуць да каго цікавасць, спачуванне, літасць, яшчэ якія-небудзь пачуцці акрамя абыякавай варожасці? Вядома, не. Але ж чалавеку, калі ён прадбачлівы і не пазбаўлены інтуіцыі, варта не крыўдаваць на гэту спрадвечную варожасць, не баяцца, не варагаваць у адказ, а наадварот — паспрабаваць пасябраваць з ёй і паразумецца.

«Не баяцца?»

Мужчына быў гатовы прысягнуць, што яго цяперашнія пачуцці якраз не з'яўляюцца бояззю смерці. Тут нешта зусім іншае, малавытлумачальнае, магчыма, нейкая паталогія, што на працягу гадоў драмала ў ім, не маючы адпаведнага моманту, каб вызначыцца, — ліхаманкава меркаваў ён. Баяцца ж некаторыя людзі цемры, замкнёнай прасторы, ці наадварот, вялікай і адкрытай, маланак, павукоў, мышэй, шумных гукаў, выгляду крыві, глыбокай вады, паўзуноў, яшчэ шмат і шмат чаго. Мажліва, і ён з такіх? На фобіі пакутуюць амаль усе. Але ж не, тут не зусім дакладна, — спрабаваў ён аналізаваць і даказаць сам сабе. — Менавіта чаго ён баіцца? Замкнёнай прасторы? Ці толькі? Гэты фактар, вядома, прысутнічае, але наўрад ці ён мае істотнае значэнне, не — тут не тое. Тады што?

Адказ быў быццам просты. Ён баіцца загінуць вось так па-дурному, зусім недарэчна, і не выканаць сваёй мэты. У кожнага чалавека — свая мэта. Можна стаць вельмі багатым, удала ажаніцца, ці, як кажуць у простанароддзі, — высока ўзляцець, выхаваць і добра ўладкаваць дзяцей, але пры ўсім тым не быць шчаслівым у гэтым канфармісцкім свеце. Шчаслівым можна быць толькі тады, калі дасягнеш мэты. «А ён дасягнуў сваёй мэты? Увогуле, якая яна ў яго? — думаў чалавек па прозвішчу Павел Дук, перабіраючы ў галаве асобныя факты з жыцця, нейкія неістотныя намаганні, спробы, памкненні. — Ці задаволены ён сваім цяперашнім становішчам. І чаго канкрэтнага ён жадаў, адлічваючы ад свядомага ўзросту — прыкладна дваццаці год — да цяперашняга часу? Гэтыя пажаданні спраўдзіліся?»

Ці была ўвогуле ў яго мэта?

Мужчына прыгадаў хіба што асобныя фрагменты нечага аморфнага, бясформеннага. Спачатку яго мэтай было стаць студэнтам, потым скончыць інстытут, і ён гэтага дасягнуў, нягледзячы на галечу, голад, адзіноту. Потым, з цяжкасцю пераносячы ўціск сістэмы, ён вырашыў збегчы за мяжу, але ўцёкі ў выніку здрады тых, нешматлікіх, каму давяраў, не адбыліся. Яго наступнай мэтай стала каханне, але і

тут яго чакала звычайнае непаразуменне, а потым і здрада. Урэшце ён вырашыў, што яго мэта пасля шлюбу з жанчынай, якая даверылася яму, гэта дасягнуць пэўнага дабрабыту, выхаваць дзяцей, але вось дзеці выраслі, а ён павінен, як кажуць, сысці са сцэны, бо біялагічны бар'ер ужо пяройдзены, і прыродзе ён, адпрацаваўшы свой мільярд цыклаў сэрца, ужо не патрэбны.

Неспадзявана мужчына жахнуўся. У яго не было мэты. «Але я адплачваў дабром тым, хто мне давяраўся», — у думках апраўдваўся ён. «І само жыццё — хіба яно мае мэту?»

Раптам святло ў аплаўленым запальнічкамі і недакуркамі плафоне квола замігцела і згасла.

Мужчына апынуўся ў цемры. Тое, што святло патухла, значна пагоршыла яго стан, але змусіла настойліва шукаць шляхі да выйсця. «Калі мне ўжо зусім край, то і баяцца няма чаго», — пераконваў ён сябе. Самае небяспечнае, што зараз напрамую пагражае яму, быў высокі ціск і тахікардыя. Абедзве прычыны не ствараюць небяспекі для маладога арганізма, але для яго гэта можа скончыцца цяжкім сардэчным прыступам, і дапамогі яму чакаць зараз ніадкуль не выпадае. Калі яго ў рэшце рэшт знойдуць і вызваляць з гэтай задушлівай клеткі? Магчыма і такое, што ён змушаны будзе знаходзіцца ў ёй нашмат долей, чым разлічвае. Як і колькі часу будзе цягнуцца гэтае «долей»?

«Але ж, — меркаваў ён, — трэба адносіцца да ўсялякай бяды, а ў яго выпадку да маленькай разнастайнасці тэхнагеннай катастрофы, з халодным спакоем. Мы даўно жывём у свеце, дзе асабістая бяспека стала ілюзіяй. І свет гэты стаў настолькі складаны, што катастрофы, якія ён нараджае, немагчыма папярэдзіць толькі па адной прычыне: іх абсалютнай неверагоднасці».

Яму ўспомніліся падзеі зусім нядаўняга часу, пра якія паведамлялася ў прэсе. Прыкладам, у Стакгольме, калі там адбыўся пажар у тунелі, які нёс электрычны кабель, месцы, дзе існавалі электрасістэмы, аказаліся адразу адарванымі ад цывілізацыі. Перасталі працаваць водаправод і дротавая тэлефонная сетка, ад перагрузкі спынілася і сець сотавай сувязі, а на вуліцы з цемрай адразу выйшаў крымінал. Ці калі ад удару маланкі адбыўся буйнейшы збой у сістэме ўсёй сусветнай энергетыкі і больш за суткі такія мегаполісы, як Нью-Йорк, Атава, Дэтройт, Манрэаль і іншыя гарады, заставаліся без святла. Спыняліся цягнікі ў метро, ліфты хмарачосаў, гаснулі светлафоры, у краны не паступала вада.

Як адчувалі сябе тады асобныя людзі — яго браты па няшчасці? Заблакіраваныя, у вагонах падземкі, ліфтах, у абставінах цемры і страху?

Рукі яго па-ранейшаму трэсліся, калі ён зноў пачаў ліхаманкавана мацаць па кішэнях. Насоўка, грабянец, пачаты пачак з кантрацэптывамі, нататнік, шарыкавая ручка, сцізорык...

«Сцізорык?»

У цемры мужчына выцягнуў маленькі, амаль дэкаратыўны складанчык, які насіў на ўсялякі выпадак, як гэта робяць большасць людзей: ім можна завастрыць аловак, разрэзаць хлеб ці бутэрброд, адкаркаваць бутэльку, мала што яшчэ. Ён выцягнуў лязо з пазіка і паспрабаваў пальцам. Лязо было вострае, ён сам неяк у вольны час затачыў яго.

Сэрца, як і раней, калацілася ў грудзях.

Мільярд удараў. За ім ужо край...

На запясці левай рукі ён намацаў пульхны бугарок, з якога біўся пульс, прыціснуў да яго лязо і, сціснуўшы зубы, правёў ім па вене. З ранкі адразу пырснула і пацякла кроў. «Кровапусканне — самы просты і эфектыўны сродак ад высокага ціску і найлепшае папярэджанне апаплексічнага ўдару, калі няма больш ніякіх іншых метадаў, — успомніў мужчына. — Асноўны сродак, якім, дарэчы, карысталіся старажытныя лекары. Хіба яшчэ ўжывалі п'яўкі...»

Цёплай нябачнай крынічкай кроў струменіла з ранкі на руцэ. Можа, упершыню за апошні час, чалавек па прозвішчу Павел Дук адчуў, як да яго вяртаецца надзея. Колькі ён ужо тут сядзіць, у цемры і зубным скрыгаце? Гадзіну, дзве, пяць? Але цяпер ён здольны перахітрыць лёс, які абышоўся з ім так смехатворна і так пагрозліва.

У цемры ён не мог выкарыстаць гадзіннік, але беспамылкова вызначыў, як пульс паменшыўся, і яму стала крыху лепш. Праўда, падступілі нязвыклыя млявасць і слабасць, але ўпершыню пачаў змяншацца страх.

«Страх. Вось прычына. Вось з-за чаго смерць, якая заўсёды ў нас за спінай на адлегласці выцягнутай рукі, набліжаецца ўсутыч і па-сяброўску ляпае вас па плячы. Пара, — кажа яна. — Не трэба баяцца».

Мужчына хацеў устаць на ногі, але перадумаў: навошта дарэмна растрачваць сілы, калі іх і так няшмат. Раптам злосць выбухнула ў ім, але прайшла вельмі хутка. І сапраўды — на каго яму зараз злаваць? На састарэлыя тэхналогіі, на зношанасць тэхнікі, на людзей, якія не могуць даць яму гарантыю бяспекі нават на прымітыўным, побытавым узроўні, нават у гэтым падобным на труну ліфце, на іх абыякавасць, эгацэнтрызм?

«Але ж так было і будзе да сканчэння свету». Чалавек заўсёды застаецца адзінокім перад небяспечнымі сіламі жыцця, перад загадкавым Космасам. І што ён сам у рэшце рэшт здолее, на што варты, калі яму адсуджана ўсяго толькі які мільярд удараў сэрца?

Цёплым тонкім струменьчыкам кроў з вены сцякала па яго далоні на падлогу. Другой рукой мужчына выцягнуў насоўку і падрыхтаваў яе, каб неўзабаве пераціснуць ранку. Ён адчуваў, што супакойваецца. Лепш страціць крыху крыві, чым жыццё. Яму ўспомнілася, як ён аднойчы здаваў кроў на станцыі пералівання, і як пасля таго ў той жа дзень працаваў і нічога такога кепскага з ім не адбывалася ні ў той дзень, ні ўвечары, ні пасля.

Яму цяпер значна лепш, нават стала хіліць у сон, хутка яго знойдуць, ён вернецца дадому, і, цалкам магчыма, будзе ўспамінаць усё, што здарылася з ім, са смехам. Хіба калегам па працы раскажа ўсю праўду пра тое, што з ім адбылося, хоць больш усё-такі ніколі не стане карыстацца ліфтамі ў старых, недагледжаных дамах. Не, не стане.

Думкі мужчыны пачыналі блытацца. Яму раптам уявілася, што ён ідзе па лузе, пакрытым квітнеючымі раслінамі, нясцерпна даўкі пах якіх запаўняе ягоныя лёгкія. Луг гэты, зніжаючыся, вядзе да ракі. Ён ужо убачыў тую раку, спакойную — ніводнай хвалі, і ўдалечыні другі яе бераг, але на той бераг яму і не трэба, добра і тут, у прахалодзе, сярод кветак і ў цішыні.

Мужчына страпянуўся. «Небяспечна ўпадаць у сон, — падумаў ён. — Тым больш, што кроў, пэўна, яшчэ сцякае з ранкі, і ён дагэтуль не перавязаў яе насоўкай».

Ён паварушыўся і асцярожна закруціў тканкай запясце. Добра, што ў галаў яму прыйшоў урэшце такі неблагі намер, які ён так удала здзейсніў: лёгкае кровапусканне замяніла штучныя лекі, якія яшчэ невядома ці дапамаглі б яму. А так — усё выдатна, ціск паменшыўся, ён спакойны, вось-вось яго вызваляць з гэтай клеткі. І самае галоўнае — прайшоў страх.

Чалавек па прозвішчу Павел Дук зноў злёгку задрамаў. Але яму больш не прымроіўся рачны поплаў у кветках, а адразу чамусьці ўявілася дзяцінства, школьны клас, дзе ён сядзеў за партай, а побач з ім Крываножка — якую перавялі ў іх клас з іншай школы, і якая кульгала на адну нагу, за што імгненна атрымала адпаведную мянушку. Крываножка нахілілася да яго і шаптала на вуха, прасіла, каб ён не праганяў яе з яго парты, бо ёй гэта балюча і сорамна. Паміж імі ляжала раскрытая кніга, дзе быў адлюстраваны нейкі тэкст, ён пачаў чытаць, але ачуняў.

Мужчына раптам зразумеў: гэты сон з далёкага мінулага зусім не выпадковы. Ён тады перад усім класам уголас адмовіўся сядзець з Крываножкай за адной партай. Яна перасела на парту збоку, якая ў іх лічылася самай непрэстыжнай, ля дзвярэй, і сядзела адна. Усё б нічога, але праз нейкі час Крываножка наглыталася барбітуратаў, і яе не здолелі адкачаць.

Ён не адплаціў дабром таму, хто яму даверыўся. Мужчына ў думках пачаў пераконваць сябе: дзяўчына зрабіла такое зусім не таму, што ён прагнаў яе ад сябе. Але тады — чаму? А калі менавіта гэта сталася апошняй кропляй, і тонкая ніць не вытрымала націску сіл жыцця і парвалася?

Неспадзявана ён адчуў, што ліфт крануўся і паплыў уніз. «Ну вось і дачакаўся, — прамільгнула ў яго галаве. — Хвіліна, і ён будзе вольны».

І сапраўды, кабіна, якая так доўга была яму месцам зняволення, спускалася ўніз, пакуль урэшце не спынілася. Спрацавалі механізмы, і дзверы расчыніліся. У твар яму ўдарыў прамень святла. Ён пачаў падымацца з каленяў на ногі, яму было цяжка, ён адчуваў неймаверную слабасць, канечнасці трэсліся, але ён перасіліў сябе, і вось ён ужо на нагах і зрабіў крок вонкі. Мужчыну крыху здзівіла, што ніхто яго не сустракае, няма ніякіх ратавальнікаў, аварыйшчыкаў, ці яшчэ каго. Увогуле няма нікога, толькі святло наперадзе, і ён з палёгкай у душы пайшоў яму насустрач.

* * *

«Тут, бадай, усё празрыста, — сказаў судова-медыцынскі эксперт аператыўніку ў цывільным і яшчэ двум міліцыянтам у форме, якія выносілі цела і ўкладвалі яго ў цэлафан, — змешаная экзагенна-цыркуляторная падвострая гіпаксія. Рэдка, але здараецца, асабліва пры ішэмічнай хваробе, да таго ж боязь замкнёнай прасторы. Што цікава, у аналагічных выпадках назіраецца рознае: адны спакойна даседжваюць, пакуль іх не вызваляць — нават спяць, калі п’яныя, некаторыя, заўважце, нешта чытаюць, іншыя злуюць на ліфцёраў, але, як успамінаецца, адна жанчына за некалькі гадзін пасівела, а мужчына ў гадах звар’яцеў і яго адразу скіравалі ў «дурку». Незразумела адно: навошта ўспрымаць гэта так драматычна і пачынаць рэзаць сабе вены?»

На двары з раніцы было сыра і пахмурна. Ішоў дождж. Пырскі яго заляталі і пад казырок пад’езда, дзе стаялі некалькі людзей у чаканні спецмашыны, ці як звыкла яе называлі — «трупавозкі».



Анатоль Зэкаў нарадзіўся ў 1955 годзе ў вёсцы Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці. Пасля заканчэння Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (1977) працаваў у камсамольскіх арганізацыях, карэспандэнтам гомельскай раённай газеты «Маяк», у рэдакцыях газет «Чырвоная змена» і «Книга и мы». Рэдагаваў газету «Добры вечар», штотыднёвік «Сталіца» і «Беларускую лясную газету», быў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Вожык». Цяпер — у часопісе «Полымя». Выдаў кнігі паэзіі «Боль сумлення», «Аварыя сумлення», «Лісты да цябе», «Чарнобыльскі вецер», прозы «Вясельнае падарожжа ў Стамбул» і інш.

Анатоль ЗЭКАЎ

# РУДЫ КОТ

*Я не люблю катоў*, а больш за ўсё — рудых.

Учора ты забегла да мяне на працу і сказала:

— Мне прапануюць ката. Як думаеш, узяць?

Я не разумею, навошта ты пыталася, калі наперад ведала мой адказ.

— Вазьмі лепш мяне, — прапанаваў я.

— Калі прыйду з табой, муж, пэўна ж, не ўзрадуецца.

— А калі з катом?

— Таксама не дужа ўзрадуецца, але за дзверы не выставіць.

— Кот, значыць, лепш, чым я?

— Я гэтага не казала. Ад ката проста ніякай небяспекі. Для мужа.

...Напрыканцы працоўнага дня ты зноў завітала да мяне. На гэты раз не адна — з катом. Кот быў вялікі і... руды.

— Ты праводзіш нас дадому?

— Каго гэта «нас»?

— Мяне і ката.

Дзіўная рэч: калі я раней набіваўся табе ў праважатыя, то заўсёды натыкаўся на адмову: маўляў, няварта, казала ты, я — жанчына замужняя. А цяпер вось сама просіш аб гэтым. Ага, значыць, калі праводзіць адну — то нельга, а з катом — дык можна? Атрымліваецца, што я павінен праводзіць не цябе, а твайго рудога ката?

«А што, калі яна і ўзяла яго з гэтай мэтай?» — падумаў я і падміргнуў кату. Нашы позіркі сутыкнуліся, і я адчуў, што кот мне пачынае падабацца.

Мы ішлі па ціхіх, амаль бязлюдных вулачках вячэрняга горада. Пыска коціка спалохана тырчэла з тваёй сумкі, а сам ён усё круціўся, спрабуючы вылезці праз шчыліну, пакінутую для галавы.

— Паглядзі, які ён прыгожы! — бліснула ты сваім чароўным позіркам.

Я паглядзеў: кот як кот, адно што руды. А вось ты і насамрэч была прыгожая як ніколі — ідаць, ад шчасця. Зрэшты, каб ты хоць раз зірнула так на мяне, я б таксама пагадзіўся залезці ў сумку па самыя вушы і сядзець там столькі, колькі пажадаеш ты. Абы быць побач.

Я паклаў руку на твае плечы і прытуліў цябе да сябе. Трымаючы аберуч сумку з катом, ты не адхінулася. Тады я цмокнуў цябе ў шчаку — ты змоўчала і на гэты раз. Нават не сказала сваё звыклае: «Як усё банальна».

Цяпер я гатоў быў пацалаваць і ката. Але перш пацягнуўся да тваіх вуснаў. О Божа, няўжо мне сёння ўсё дазволена?! Шчаслівы, я цмокнуў у носік і ката.

— Ты яго таксама палюбіў? — узрадавана запытала ты.

— Таксама як каго? — пацікавіўся я.

— Не як каго, а як хто, — папраўіла мяне ты і дадала: — Таксама, як і я.

Па дарозе мы пасядзелі яшчэ на лавачцы пад прысадзістымі ліпамі, потым доўга не маглі развітацца ля твайго пад'езда. Кот, які напачатку так нерваваўся, раптам прыціх — нібыта не жадаў спалохаць нас.

— А шкада, што ты не можаш браць ката з сабой на працу, — сказаў я, калі мы развітваліся.

— Зрэдку магу рабіць і гэта, — адказала ты, пэўна, здагадваючыся, пра што я, а потым нечакана выпаліла: — А хочаш, я скажу мужу, што ты — былы гаспадар ката?

— Навошта? — не зразумеў я.

— Тады ты калі-нікалі зможаш прыходзіць да нас, каб праведаць некалі свайго, а цяпер нашага ката.

— А што муж?

— Ён паверыць.

Ты хвілінку памаўчала, а потым і зусім ашаламіла мяне:

— А яшчэ ты зможаш прыходзіць да нас нават тады, калі мужа не будзе дома. Гэта ж не да мяне, а да ката, ці не так?

Я яшчэ не асэнсоўваў усяго сказанага табой, аднак адно ўжо ведаў дакладна: як добра, што ты не паслухала мяне і ўзяла ката.

Я раптоўна адчуў, што так люблю гэтага надзвычай прыгожага рудога коціка. А калі прыйшоў дамоў і міжволі зірнуў у люстэрка, то нечакана заўважыў, што валасы мае таксама рудыя. Я пакуль што нічога не разумеў да канца, хіба толькі здагадваўся. І думаў: а можа, не адкладваючы, ужо заўтра і наведаць коціка? Як-ніяк, а нібыта былы гаспадар усё ж...



Зміцер Вішнёў нарадзіўся ў 1973 годзе ў Венгрыі. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ. Вучыўся на ВЛК (г. Масква). Працуе ў выдавецтве «Логвінаў». Аўтар зборнікаў «Штабкавы тамтам», «Тамбурны маскіт», «Трап для сусліка».

Зміцер Вішнёў

# МАЛЮЮ ВОСЕНЬСКІХ ЖЫРАФАЎ

* * *

я забраўся на гару
сярод дрэваў і вялікага сонца
я раздумваў
пра тых хто мае рацыю
а хто не
хто многа п’е
альбо той хто не
але тут важна
зразумець што сонца на дне

***Славенія, 2006***

## У ФАРБАХ НАРАДЖАЮЦЦА ЖЫРАФЫ

гляджу на аблокі і разліваю фарбы!
яны плёскаюцца і застыгаюць у танцах!
вецер!
рыпучы вецер!
восеньскі вецер!
ён замест майго пэндзля
а сонца — гэта маё вока
ад яго табе не схавацца
ягоныя прамяні абагрэюць
альбо будуць калоць голкамі
вецер!
рыпучы вецер!
восеньскі вецер!
з мяне ападае лісце
я — дрэва
я — пачатак
і я заканчэнне

часам замест сонца ідзе дождж
разліваю фарбы
малюю восеньскіх жырафаў

***Берлін, «Tacheles»,***
***4 верасня 2006***

* * *

мае пачуцці і боль
нашмат мацней за любую соль
мая вада — гэта спірт
маё каханне — гэта аблокі
і вусны мае ў крыві
скажуць самае злоснае
але сапраўднае
як начныя крыкі карабельных соснаў

***Берлін,***
***4 верасня 2006***

* * *

Мае вусны ў крыві
Іх абпалілі словы
Яны выходзяць
Як нараджаюцца дзеці
З пранізлівым крыкам
Ухутваю сваіх дзяцей
У светлыя і чорныя успаміны
Абкладаю марамі і жаданнямі
Раскладаю іх па паліцах
Яны нагадваюць жывыя скульптуры
Толькі пішчаць і выгінаюцца
Выгінаюцца ад болю
Крывяцца ад пакутаў
Ды я даю ім жыццё
Разам з крывёй і потам

***Берлін,«Tacheles»,***
***2006***

* * *

Ты кажаш — вечна п’яны паэт
Я думаю — пакуль жывы чалавек...
І б’ю па струнах і прызнаюся
ў сваіх пакутах
Якія б’юцца галубамі ў акно

У такія хвіліны размаўляць з сусветам
брыдка!
Бо на сэрцы сядзіць маленькая выдра!

***Берлін, 2006***

* * *

я хачу каб ты мяне зразумела
бо ў тваіх вачах я чытаю паэзію
я хачу цябе дрэсіраваць
я хачу цябе цалаваць
я хачу цябе палівацъ са шланга
каб ты смяялася ў танцах

***Славенія, 2006***

* * *

вымаўляю словы
выкрыкваю словы
шапчу словы
паўзу са словамі
і калі я ўвесь у брудзе
я выкладаю на стол сваю душу
за грукатам і чорным вінам
у кубку плёскаецца цішыня

***Славенія, 2006***

* * *

збіраю вершы
бы тыя пажоўклыя фота
з вандровак
і гэты гербарый трапляе ў альбом

пах восені

***Мінск, 2006***

* * *

схавацца ў панцыры ад вас
ляжаць там і слухаць
як цікаюць гадзіннікі
ляжаць ціха сярод кветак
параўноўваць вецер
з шыпеннем полымя
назіраць праз шчыліну
за пунсовым месяцам

адчуваць

***Васілінкі, 2006***

* * *

плоскія шкляныя твары
набягаюць нібыта прывіды
можа сасніў
а магчыма наяве

сэрца нібыта злосны павук
сядзіць у крыштальнай павуціне

абліваецца чырвоным сокам
стукае зрэдку па вялікім барабане

падаю

***2006***

* * *

лыжкай нібыта сонечнай адкруткай
нібыта люстэркавым спрутам
я запаўзаю ў трохлітровы слоік
ем варэнне з сочывам быццам частуюся
думкамі
па венах бяжыць электрычны сок

***2006***

* * *

выцягваю ромбападобную руку
закранаю верхавіны дрэваў недапалкам
па пазногцях бегае цёплы далёкі шлях
белым балонам коціцца кашаль па палях
пазіраю на чырвоны небастык
дзе на фоне неба ўздымаецца нешта
як вежа ці штык

***2006***

* * *

бачу на тваіх вейках кроплі расы
гэта — сыпле дождж
гэта — восеньскі вецер
якi абуджаны маім подыхам
лісце ападае быццам смех
збіраю жалуды ў калматы мех
перад вачыма не схема — хімера каметы

рэха

***2006***

* * *

клоп на балотах выклікае халодны пот
крот ашыляецца сярпом —
у яго сапсаваны рот
спорт паядаецца нібыта гэта салодкі торт
порт разбураецца бо вынайдзены
чарадзейны грот

***2006***

* * *

шкло ў каламутных плямках
праз яго бачу захад сонца
прамяні круцяцца ваўчком
цені ззаду паўзуць увышыню
можа гэта апошні вечар?
такі прыгожы і рамантычны
хочацца ўзяць яго і пакласці ў рамку —
карціна для ўспамінаў

мармуровы більярд

***2006***

Валянціна КОЎТУН-ЯСЕЛЬДА

# КРЫЖ ІГУМЕННІ

## *ДРАМАТЫЧНАЯ МІСТЭРЫЯ Ў ДЗВЮХ ЧАСТКАХ*

***...Як водгалас вякоў мінулых
і згукі шляху да Святасці
блажэннай і найпадобнейшай
Ігуменні з Полацка***



Валянціна Коўтун нарадзілася ў вёсцы Дземяхі Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Скончыла філфак БДУ. Працавала настаўніцай мовы і літаратуры, у часопісе «Полымя». Аўтар раманаў «Крыж міласэрнасці», «Пакліканыя» і шматлікіх зборнікаў паэзіі. Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова.

**Дзейныя асобы:**

**Прадслава —** князёўна полацкая, пазней Ігумення.
**Звеніслава —** князёўна полацкая, пазней чалядніца манастыра Еўпраксія.
**Міна —** епіскап полацкі.
**Святаслаў-Георгій і Сафія —** бацькі Прадславы.
**Барыслаў —** князь запалоцкі.
**Кажадуб —** лучнік, кат порубу.
**Лазар —** блазен, пазней Майстра Лазар Богша.
**Анёл срэбракрылы.**
**Пасланец д’ябла.**
**Вікула** — вяшчун.
**Валодша —** яго сын, шкаляр, пазней вяшчун.
**Дабраслаў —** шкаляр і княжыч смаленскі.
**Сава —** кмет порубу.
**Тазіт —** лекар.
**Веранія —** жонка Міхала.
**Вялішын —** баярын.
**Кірыла —** ігумен наддзвінскага манастыра.
**Міхал —** шкаляр, пазней ігумен Свята-Успенскага манастыра.
**Кірык —** шкаляр, сын жмудзіна **Кірыкея,** пазней купец.
**Кмет-распараднік.**
**Анёлы рэчытатыву.**
**Рамана —** заслаўская ігумення.
**Шыдзягей —** ханскі пасланнік.

А таксама іншыя асобы містычна-рэлігійнага і паганскага свету; князі і баяры; гольмгардская варта; смерды розных узростаў; скамарохі; вікінгі; служывыя.

**Агульны малюнак:** з правага боку — пушча, дзе ў акружэнні соснаў — паляна-бялявіна з вогнішчам, буданом вешчуна і драўляным паганскім боствам-ідалам. Злева царква, падобная да Полацкай Сафіі, манастыр з крыжам наверсе, таксама абрысы і еўрапейскага замка, і полацкіх харомаў з залаю. Па цэнтры — келля са сталом, на якім пергамін, гусінае пяро, падсвечнік са свечкамі. На сценах — абразы Выратавальніка і Маці Божай. Усё, што сімвалічна яднае мясціны будучых падзей.

## ЗАМЕСТ УСТУПУ*

К м е т - р а с п а р а д н і к *(ударае мячом па шчыце).* **Народзіны акрыленай.** Дабраслаўлёны Гасподзь, Бог Аўраамаў, Бог Ісаакаў, не мёртвых Бог, але жывых...**

А н ё л ы р э ч ы т а т ы в у *(акапэла).*

Збярыцеся ўсе, хто жыве спакон
як анёлы ў пустынях і горах.
Вотракі, яко алені, пераскочыўшы
прымараны сон
І старыя, адрынуўшы немачы порах.
Прыспяшайце на трапезу, што
І душу ўзвесяліць, і
сыпне дабрачыннасцю ў розум.
Адчыняйце малітваю вушы,
каб спеў ратавальны спажыць,
І ўзрасці на ворыве гожым Еўфрасінні ігуменні —
подзвігаў, працы душы, і жыцця,
і любові яе да Бога. Алілуя.

**Дзея першая**

## СКАРБЫ ГОЛЬМГАРДА

***(Вікінгі, вартаўнік цвінтара (Вартаўнік), Кірыкей, князь Барыслаў, Анёлы рэчытатыву.)***

### Біярмія. Прадранішні памарак

З атуманенай глыбіні далятаюць загады боцмана і рыпенне ўключын. З правага боку значацца слупы Гольмгардскага цвінтара, каля якога стаіць Вартаўнік. Злева — яшчэ ціхая таверна. На сталах глякі з віном. Урэшце чуюцца ўзрушаныя крыкі вікінгаў, што нібыта вырынаюць, плячыстыя і рослыя, з нябачнага мора і кіруюцца ўбок цвінтара.

П е р ш ы в і к і н г. Вітанне Гольмгарду — порту ў Біярміі праслаўнай!

Д р у г і в і к і н г. Блізка ўжо!

Т р э ц і в і к і н г. А якое віно было тут некалі!

В а р т а ў н і к *(выступаючы насустрач шумнай грамадзе).* Зарана прыйшлі!

П е р ш ы в і к і н г. Хіба таверна не працуе ноччу?

В а р т а ў н і к. А дзе вы бачыце таверну?

Д р у г і в і к і н г. Я ж добра памятаю, тут пілі! *(Падняўшы ліхтар вышэй, ніякавее пад вясёлы рогат сяброў: святло ліхтара ўжо выхапіла з глыбіні абрыс цвінтарнага боства.)*

П е р ш ы в і к і н г *(здзіўлена).* Ёмела цвінтарны! Няхай ушчыкне мяне марскі бог за... *(Паказвае рукою тое месца, за якое яго мае ўшчыкнуць марскі бог і паварочваецца да вартаўніка.)* А золата твайму Ёмеле сёлета многа насыпалі? *(Убачыўшы, што вартаўнік хапаецца за біту, весела рагоча.)* Ты што, стары!? *(Да спадарожнікаў.)* У таверну!

Т р э ц і в і к і н г. Пасля віна — адпачыць прыйдзем! Чакай, груган магільны!

В а р т а ў н і к. Там — таверна! *(Уздыхае.)* Ой-го. Калі хочаш, то пачакаю...

Вікінгі аддаляюцца, урываючыся ў таверну, і там адразу ж пачынаецца вясёлая гульба. Адначасна Вартаўнік заўважае, як з-за скалы да яго ўжо блізіцца новая ватага на чале з важаком, на грудзях у якога — вялікі металічны медаль-пячатка. Прышлыя з цікавасцю ўзіраюцца ў постаць Ёмелы, што адразу насцярожвае Вартаўніка. А ў таверне ўжо бегаюць разносчыкі віна і талерак з ежай, чуецца вясёлы рогат і крыкі захмялелых гасцей.

---

* Частка «Замест уступу» можа быць пастаўлена перад паказам містэрыі.

** У тэксце выкарыстаны звесткі, матывы, асобныя выказванні з «Новага Запавету» і «Аповесці жыцця і смерці святой, блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і найсвяцейшай Ягонай Маці, што ў Полацку».

П е р ш ы   в і к і н г *(падымаючы келіх).* Шанаванне праслаўным Карлу і Торэру!
Д р у г і   в і к і н г. Няхай доўжацца леты караля нашага Олафа!
Т р э ц і   в і к і н г. Налівай усім, гаспадар...

Узрушаныя галасы вікінгаў перакрываюць стук келіхаў аб сталешніцу. Але раптам — рэзкі свіст стралы і каля варотаў цвінтара, схапіўшыся за прабітыя грудзі, падае Вартаўнік. А прышлыя, выхопліваючы з-пад крыса плашчоў рыдлёўкі, пачынаюць таропка раскопваць магілы, ссыпаючы ў торбы залатыя ўпрыгожанні, пакінутыя для нябожчыкаў. Не вагаецца і важак. Падняўшы жалезны цэп, збівае на зямлю галаву Ёмелы. Таропка закідвае ў свой мяшок золата, залюбаваўшыся на вялікія бурштынавыя каралі. Прайшлі толькі імгненні, а перад гвалтаўнікамі нечакана ўзнікае здарожаны вершнік — жмудзінскі купец Кірыкей. Кідаецца на важака, але тут жа, убачыўшы ў таго на грудзях пячатку, спыняецца. У таверне якраз гучыць вясёлая песня, што пачынае тут жа слабець: схмялелыя вікінгі — на стале і лаўках — неяк дружна засынаюць.

### Перад цвінтарнымі варотамі. Адначасна

К і р ы к е й. Ці не князь малады з Запалоцця? Яшчэ ніколі палачане нябожчыкаў не рабавалі! Ганьба на галовы сівыя!

Б а р ы с л а ў. Усе князі крыўскія — і Давыд, і Рагвалод, і Святаслаў...

К і р ы к е й. Самага важнага ты назваць забыўся. Барыса!

Б а р ы с л а ў. Ніхто мяне за брата не прызнае! Хоць на ўсіх бацька Чарадзей!

К і р ы к е й. Бо з чалядніцай ты, Барыслаў, прыжыты!

Б а р ы с л а ў. Золата шукаю!

К і р ы к е й. Мяне Полацак у свет белы паслаў, каб гандаль распачаць. А ты магілы рабуеш! Дзякуй скажы, што пячатку ўбачыў.

Б а р ы с л а ў *(пакрыўджана).* Так золата патрэбна, Кірыкей. Болей, чым усяму Полацку! Пагарджаюць князем запалоцкім... Сынам пажады сапраўднай грэбуюць! Усё ім, братам маім, дадзена! З першага крыку. Толькі ж нічога... Паглядзім яшчэ, **хто** гаспадар у Полацку!

К і р ы к е й. Золата, кажаш, маладзён?.. І я — вязу. Царкву новую збудаваць.

Б а р ы с л а ў. Усе цяпер з гэтым Хрыстом бедным носяцца. Усе пра Яго гавораць! Рым! Германы! Новая вера...

К і р ы к е й. Бедным? Харомы там, дзе быў, *(скептычна)* высокія! Але, скажу, да бляску падкія толькі служкі і найміты веры.

Б а р ы с л а ў. А колькі золата за сваю любоў бяруць! І чым вышэйшы сан, тым большая аплата патрабуецца. *(Зласліва смяецца.)* Эх, мне б з таго бляску мяшок ухапіць. А потым... І ў манахі пайсці згодны! *(Схамянуўшыся.)* Пазней.

К і р ы к е й. Любоў дзяцей да Айца павінна быць дарункам сціплае душы.

Б а р ы с л а ў. Душы сціплае!? Усе вы хочаце пракокам упадобіцца! Вышэй за іншых стаць... Чытаў я! І пра Луку. І пра Мацвея. Думаеш, калі чалядніцай прыжыты, то не чытаў нічога? І што, запытаеш, уразумеў! Новая вера толькі ідзе, а чарнарызыя ўжо выгаду пачулі! Новую ўладу штукуюць! Хочуць людзей настаўляць! Судзіць хочуць! І баяраў. І смердаў! Каб вышэй стальца вялікакняжага! А, можа, і Бога вышэй?

К і р ы к е й. Страсць гордая асляпляе цябе, Барыслаў! Зямля разбэшчана, і ўсялякая плоць схібіла шлях свой на ёй.

Б а р ы с л а ў. Хрыстос на крыжы распнуты быў, каб грахі чалавечыя адкупіць. То, значыць, і цяпер за мяне — адкупіўся!

Кінуўся на Кірыкея, але той, выхапіўшы кайстру з каралямі, знік за варотамі, да якіх ужо ляцела гольмгардская варта. Убачыўшы знявечанага Ёмелу і раскапаныя магілы, з гнеўнымі крыкамі ўварвалася ў таверну. Падняла мячы над галовамі амаль бясцямных сонных вікінгаў.

З   в а р т ы. Смерць Карлу!.. Смерць Торэру!.. Смерць вікінгам!

П е р ш ы   в і к і н г *(са сну).* Няхай ушчыкне мяне бог марскі за... *(бліскае меч і вікінг замаўкае.)*

З в а р т ы. Смерць! За Ёмелу!

К і р ы к е й *(азіраючыся).* Колькі дарог праездзіў — нідзе няма спакою.

А н ё л ы р э ч ы т а т ы в у. «Благословен Господь Бог, праведници в веки живит, и от Господа мзда их, и строение их от Вышнего. Приимете семена многоспасенаго житья послушанием жены сея преподобныя... Святыя подвиги ея и труд, и любовь».

**Дзея другая**

## ВЯРТАННЕ КІРЫКЕЯ

***(Кірыкей, ігумен наддзвінскага манастыра Кірыла (далей —Кірыла.)***

З ранішняй смугі да варот манастыра блізіцца задыханы, ледзь жывы падарожнік у старых шатах. З высілкам дацягваецца рукою да вісячай жалезнай біты. Стукае ў вароты. Чакае. Нарэшце з-за варотаў вызірае ігумен Кірыла. Шырока расплюшчвае ад подзіву вочы.

К і р ы л а. Пяць гадоў спяшаўся, а спазніўся ты — на цэлае жыццё. Няма ўжо Чарадзея, князя твайго любімага. Занямог раптоўна.

К і р ы к е й *(сумна схіляе галаву)*. А я ж яшчэ ў паходзе на Наваград, сказаў: не бяры, княжанька Усяслаў, чужыя панікадзілы і званы!

К і р ы л а. Дык Сафію ж у тыя ж леты будавалі! Эх, бачу, зусім ты белы стаў.

К і р ы к е й *(задумаўся)*. І Барыслаў запалоцкі каля стальца круціцца?

К і р ы л а. Семнаццаць летаў толькі, а тры ладдзі дворных у Дзвіне ўтапіў. Уласнай воляю. *(Выпіў, каб суняць кашаль, з гарлача.)*

К і р ы к е й. Як жа Полацак, манах?

К і р ы л а. Вазмяташася быў Давыд, у хаўрусе з кіеўцамі, на Менск.

К і р ы к е й. Не падзеляць браты вотчыну!

К і р ы л а. Толькі Глеб перамог і дружыну сваю кінуў на Друцак, Копысь, Воршу... На Слуцак нават напаў.

К і р ы к е й. Кіеўская зямля то! *(Разарваў смажаную дзічыну моцнымі зубамі. Запіў віном, слухаючы ігумена.)*

К і р ы л а . І я кажу — Кіеўская. Манамах — на Менск з дружынамі пайдзе. Абгаліў бяшэ цэрквы ўсе.

К і р ы к е й. Як жа цяпер?

К і р ы л а. А як і заўжды, Кірыкей. Князі на стальцы мяняюцца, а Гасподзь і Яго работнікі пры дзеле сваім застаюцца. *(Незадаволена бліскае на кайстру з біярмійскім скарбам.)*

К і р ы к е й. Не касіся! Сам Барыс мяне ў Эльблонг пасылаў.

К і р ы л а. Пакарае няхай!

К і р ы к е й. Нахадзіўся я. І цяжэй за ўсё бачыць, кажу, як людзі ў душу атруту пускаюць — пыху, хцівасць, хлусню... А ты ўсё па бляску храмаў далёкіх сумуеш? У нас такіх мала.

К і р ы л а. Толькі на каго падае гэты бляск, жмудзін? Ці ж на крывавыя раны Хрыстовы? Ой-я. Не дзеля такога ішоў уладар нябесны на крыж свой.

К і р ы к е й. Гордых ды багатых мала хвалюе пакліканне Хрыстова, ад якога адышоў Юда.

К і р ы л а. Але Юдзе моляцца болей, чым Сыну Божаму!

К і р ы к е й. І трымаюць нагатове тыя цвікі, што беззаконнікі выцягнулі са святых ранаў.

К і р ы л а. Сам пашто далёка апынуўся?

К і р ы к е й. Князя Барыса дачку адвозіў. Звеніславу.

К і р ы л а. Не веру! Каб князь полацкі ды крывіну сваю ў лагво чужое аддаў?

К і р ы к е й. Начамі крыкам крычала. А там нейкія водарасці лекавыя. Ды і радня ў палачан паўсюль.

К і р ы л а. Загубіў князь крывінку!

К і р ы к е й. Не сіпі. Там пра купцоў каралеўскіх дачуўся. Ледзь за каралі гэтыя ды золата жывот не паклаў.

К і р ы л а. А што золата чужое Полацку прынясе — думаў?

К і р ы к е й. З багаццем князі няхай упраўляюцца.

К і р ы л а. Лепей дамоў спяшайся.Там сына жонка гадуе. Пяць летаў ужо.

К і р ы к е й. Кірыка?! *(Радасна падняў гляк з медавухай, але над манастыром нечакана так моцна грымнула, што рука апусцілася.)* Бушуе д’ябал!

К і р ы л а. Каторы дзень навальніца ў Полацку. Ярыцца іспра. *(Жагнаецца.)*

К і р ы к е й. Такая віхура і зіму падгоніць!

К і р ы л а. Страшнае знаменне ў Полацку было. Якраз перад тваім прыходам. Праз неба ўсё зараніца. І ўдзень палала, і ночаю. На маёй памяці такога яшчэ...

К і р ы к е й. Знак, скажу!

К і р ы л а. Можа, і знак. У князя Святаслава жонка, што з харомаў праслаўнага Яраслава кіеўскага ў Полацк узята, хутка дзіця народзіць.

К і р ы к е й. На сэрцы неяк трывожна. *(Пачаў прытарочваць да пояса скураную кайстру са скарбам, і ігумен здзіўлена падняў галаву.)*

К і р ы л а. Ці ж у ноч спяшаюцца, Кірыкей? Даносілі: Барыслаў тут з хеўрай.

К і р ы к е й. Пакуль князі старэйшыя — адзін проці аднаго, займеў, бачу, маладзён хіжы і дружыну баявую, і казну.

К і р ы л а. У нас цяпер страшней, чым у Гольмгардзе, Кірыкей. Эх, не слухаеш ты мяне...

## ЧАСТКА ПЕРШАЯ. БЛАЖЭННАЯ

### I

**Дзея трэцяя**

### ВАЛОДША

***(Жанчына — маці Валодшы, вяшчун Вікула, Кірыкей.)***

#### Пушча

Да завешанага шкурамі будана вешчуна Вікулы блізіцца маладзіца з дзіцем на руках.

Ж а н ч ы н а. Няма малака ў мяне... *(Хаваючыся за кустоўем, ледзь не плача.)* Няма! Вялікі ўжо ты. А ад бацькі-князя толькі пячатка ў дарунак, сынок мой бедны. *(Паклаўшы дзіця блізу каменнага,з пляскатым верхам, стала, хапае з талеры кавалак дзічыны і знікае за кустоўем.)*

К і р ы к е й *(выступаючы з другога боку).* Думаў, і не дацягну да раніцы. *(Прыслухваецца да дзяркатых крыкаў варання.)* Не адолееш мяне, іспра рагаты.

Блізіцца да будана, з праёму адчыненых дзвярэй якога з’явіўся яшчэ даволі малады даўгавалосы Вікула ў воўчай накідцы і з драўляным каўшом у руках: наліўшы ў яго малака з глечыка, ставіць коўш на стол. Падымае галаву да вужоў, што звешваюцца з бліжніх дрэў.

В і к у л а. Піце! *(Узяўшы з талеры кавалак дзічыны, разрывае яго рукамі).* А другі кавалак дзе? З’елі!? *(Грозна падступаецца да вужоў і раз’юшана збівае тых бізуном на зямлю.)* Службу забылі? Здыхайце! Заўтра снег, а вы яшчэ і не паснулі! *(Кідаецца на зніякавелага Кірыкея, што якраз падыходзіць да будана. Нечаканая бойка, аднак, тут жа аціхае.)* Пашто маю дзічыну забраў?

К і р ы к е й. Усё незнаёмае. Гляджу, не пазнаю. Старых дарог ані знаку.

В і к у л а. Паспяшаеш ты надта, баярын. Перуна не баішся. Нешта важкае вязеш?

К і р ы к е й. А табе што? Наказаў князь Чарадзеюшка: што, Кірыкей, у дарозе здабудзеш, палову — Полацку.

В і к у л а. Зіма з неба пазірае. Падсілкуйся хоць. Завея на плячах.

К і р ы к е й. І праўда.

В і к у л а. Памятаю, спыняўся некалі ў мяне. І цяпер многія з харомаў полацкіх таемна Перуну моляцца.

К і р ы к е й. Здаўна так: адны птушкі ў неба сягаюць, іншыя — шукаюць толькі падліну. Медавуха ёсць? *(Садзіцца на зямлю блізу стала і з усмешкай выпроствае ногі ў ботах.)*

В і к у л а. Ёсць, калі грыўну дасі.

К і р ы к е й. Няма!

В і к у л а *(касавурыцца недаверліва).* І за «няма» ёсць. Толькі настоеная на травах. *(Разлівае пітво ў два каўшы.)*

К і р ы к е й. Якая трава, смерд!? Хутка мы цябе выкурым адсюль. І з гадаўём. І з травою тваёй!

В і к у л а. Еж, пі, баярын. Паціху.

К і р ы к е й. Схаваўся, бач! *(Насцярожана пазірае на вешчуна, і той нетаропка п'е з каўша.)* З-пад хвастоў конскіх гной збіраць у мяне будзеш! Іншая цяпер вера ідзе! Хрысціянская.

В і к у л а. Можна і да коней, баярын. *(Назірае, як Кірыкей таксама п'е з каўша. І тут жа, акругліўшы вочы, падае з пенаю на вуснах.)*

К і р ы к е й. А як жа гэта? *(Хрыпіць здзіўлена.)* Яшчэ ж скарб не завёз. Не паспеў я. *(Б'е пена з горла.)* Сыну!

В і к у л а. Старая ў нас вера, баярын. Была і будзе. Свая... вера! *(Зазірае ўнутр кайстры. Здзіўлена смяецца. І тут жа чуе піск немаўляці.)* Ой-я! *(Зноў смяецца, быццам піск разбуджанага дзіцяці яго аніяк не хвалюе.)* Грыўну пашкадаваў Кірыкей, а ў самога кайстра набітая. І не думаў я труціць. *(З цяжкасцю здымае з Кірыкея боты і кідае іх убок.)* Да гэтых траваў гадзюшных толькі адзін я, Кірыкей, даўно звык. *(Перасыпае ў далонях манеты і з цікавасцю ўзіраецца ў бурштынавыя каралі.)* А вы нядобрыя. Гожыя. Ярылавы. А крыві прагнеце. *(Паварочваецца да нерухомага Кірыкея.)* Ты не думай. Мне б толькі жменю багацця якога. *(Бярэ немаўля на рукі.)* І нічога мне, акром ветру ды сонца не патрэбна. А вось табе, малеча, хлеба — паболей. Малака... *(Нахіляецца да нябожчыка.)* Палову сыну твайму, як папрасіў, занясу. Не сумнявайся. А Полацак... Ой-я. Пачакае! *(Няўмела поіць малаком немаўля.)* Удачлівы ты, падкіданец. Малако пасля вужоў засталося. Валодшам у мяне будзеш, пабрацімам вужыным. *(Здымае з шыі малога пячатку на вяровачцы.)* На смерць галодную не пакіну, калі што — заб'ю сам. *(Падымае пячатку ўверх.)* Барыславаў! *(Прыслухваецца да ўжо зімовага падвывання завеі і аддаленага царкоўнага звону.)* Бач ты! Звоняць. У жонкі Святаслававай дзіця нараджаецца.

*(Імгненне — і сліпучы ўзвіў снегападу як бы высвечвае абрыс полацкай Сафіі, блізу якой сабраліся князі, манахі і епіскап Міна.)*

А н ё л ы р э ч ы т а т ы в у.

> «…Яже предоидуще скажем, како родися и како възпитася, или како възрасте...
> І бысть князь в граде Полотсце Всеслав, і бяше у него меньший сын
> именем Георгий, от него же родися сии блаженная отроковица…»

**Дзея чацвёртая**

## НАРОДЗІНЫ

***(Епіскап Міна (далей — Міна), князі полацкія Барыс, Раман, Давыд, Барыслаў, Святаслаў-Георгій, Рагвалод, вялікі князь кіеўскі Мсціслаў, ганец, анёлы.)***

М і н а. Аддайцеся, князі, малітве. І ўзнясецеся на вяршыню, дзе толькі птушкі знаходзяць прытулак.

Б а р ы с л а ў. Кажаш, тады ні Новагарад, ні ханы пасягаць на нас не будуць?

М і н а. Усё ў руках Божых.

Б а р ы с л а ў. Гэта ў келлях вашых усё ў руках! *(Так напорыста ступіў да ігумена, што той адхітнуўся.)* Княжую ўладу паслабіць хочаш, чарнарызец хітрамудры.

М і н а. Доўга табе, маладзён, да ўлады! Можа, і ніколі.

Імгненна ўспыхнуўшы, Барыслаў гнеўна прытупнуў нагою, і адзін з маладзейшых манахаў выхапіў з-за шатаў баявы цэп, але Барыслаў ужо з рогатам знік за дрэвамі.

М і н а. Святатацец!

Б а р ы с *(да кіеўскага госця).* Просім пры Сафіі святой, князь. — Адступіся ад Полаччыны, дай дыхнуць! *(Насупіўшы бровы, усе насцярожана прыціхлі.)*

М с ц і с л а ў. Не мысліш шырока, князь Барыс! Без галавы памрэ Склавінія.

Д а в ы д. З другога канца нас таксама падціскаюць. Смаляне!

Р а м а н. Не дрэмлюць і межы заходнія.

С в я т а с л а ў - Г е о р г і й. Варта даносіць: неспакойна...

Р а г в а л о д. Усё ім, дарадцам каралеўскім, суседзям нашым, ведаць трэ.

М с ц і с л а ў. Хан Баняк чакае расколу. Не ў пальцах, князі, сіла, а ў кулаку. *(З-за храма да князя кідаецца ўстрывожаны ганец, і Манамах цягнецца да похваў.)* Мяча не баішся?

Г а н е ц. Сказаць дазвольце. *(Кранае рукою мыскі ботаў. Енчыць.)* Мсціслаў, госць вялікі, князь праслаўны Святаслаў. Дачка ваша Сафія, княгіня ваша Сафія... нарадзіла.

М с ц і с л а ў. Хвала Госпаду! Сына? *(Ганец яшчэ мацней енчыць, але яго перапыняе звон. І раптам ударыў гром, бліснулі маланкі.)*

П е р ш ы  м а н а х. Шукае! *(Занепакоена пацягнуўся да крыжа на грудзях.)*

М с ц і с л а ў. Громам шукае.

М і н а. Стрэламі вогненнымі... Толькі шукае рагаты чыстую душу.

Д р у г і  м а н а х. Зямлю разрывае. *(Перажагнаўся).* Каб забіць!

С в я т а с л а ў - Г е о р г і й. Каго забіць, брацie!?

М і н а. Тую, якая ў свет белы прадстала ў славе княскай.

С в я т а с л а ў - Г е о р г і й. Прадслаunion дачку назаву! *(Заплакала малая. І тут жа, аднекуль з няўведанай вышыні харомы пранізаў такі асляпляльны промень, так радасна зaбліскаў, адкідваючы водбліскі на латы кметаў і крыжы ў руках манахаў, што некаторыя пачалі жагнацца.)*

М і н а. Не заб'е д'ябал! *(Павярнуўся да манахаў.)* Не насцігне Прадславу. *(Бразнулі князі дружна мячамі ў шчыты, абступілі Святаслава.)*

М с ц і с л а ў. Ладзіць вялікі сталец Кіеўскі ў Смаленску царкву Святой Багародзіцы! *(Прыслухваецца: ажно заходзіцца ад плачу малая.)*

С в я т а с л а ў - Г е о р г і й. Радуйся, малеча! *(Смяецца.)* Радуйся!

## САКРАЛЬНАЕ

Да ўяўнай зыбкі сыходзяцца даўнія супраціўнікі: Анёл срэбракрылы і Пасланец д'ябла.

П а с л а н е ц  д' я б л а. Скажуць ёй, што гадую дзяцей толькі сытае плоці, як злыдзень.
Што на вернікаў вашых гадзюк разварушаны мех і агонь свой шпурляю...

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. ...ў тых, хто носіць Ісусавы раны. ...Ізыдзі!

П а с л а н е ц  д' я б л а. Я, хто посуд са скарбамі Боскімі трушчыць,

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. ...хто духмянасць спазнання Яго засмуроджвае серай і тхлом...

Па с л а н е ц. д' я б л а. Я кажу: ваша вольнасць — каб плоці сваёй дагаджаць!
А любоў — каб служылі — і горлы каб грызлі...

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. Ізыдзі!

П а с л а н е ц  д' я б л а. Каб з'ядалі адно аднаго і хлуснёю зайздроснай і здрадай.

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. Каб спакусамі нішчылі веру ў душы!

П а с л а н е ц  д' я б л а. Каб урэшце пусціў я па следзе людскому аслеплую рэўнасць...

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. І забудзецца ў тлуме высокіх вярыг пераззвон.

П а с л а н е ц  д' я б л а. Не любоў — а праклён.

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. Не сардэчная шчырасць ...Ізыдзі!
Ужо гадуецца тая, што ўзрасціць малітваю ў сэрцы раскрылены сад,
што наступіць на голаў тваю крыважэрную, гад!

П а с л а н е ц  д' я б л а. Будзе ў весях чума. Там разгорне крывавыя шаты.

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. І прыедуць тады— жаніхі. І народзяць чуме немаўляты.
П а с л а н е ц  д’я б л а. Даганю яе смерцю чумною...
А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. Ізыдзі, пракляты!

**Дзея пятая**

## ШКАЛЯРЫ

***(Кмет-распараднік, Прадслава, Дабраслаў, Валодша, Міхал, Кірык, Анёл срэбракрылы, Пасланец д’ябла, Каждуб, смерды на капішчы.)***

К м е т- р а с п а р а д н і к. І прамінула шаснаццаць летаў.

### Келля

У Полацку раніца. На невялікім стале ў келлі пергаміны. Святло свечкі адлівае серабрыстасцю аблічча маладзенькай перапісчыцы. Плечы яе, укрытыя накідкай, часам уздрыгваюць.

П р а д с л а в а. Галодна. Беразазол наступіў. *(Дзьме на азяблыя пальчыкі.)* А два гады таму, як прыйшла, каб пергаміны перапісваць, цяплей было. У Заслаўе бацька пасылае *(радасна)* у школу Данілаву. Не хацеў. А маці ўпрасіла.

### Пушчанскі бераг Свіслачы

Царква і манастыр з крыжам ярка асветлены сонцам. Злева ад іх пушча, што падступаецца да Дзвіны. На кручы з соснамі — шкаляры.

Д а б р а с л а ў. Прадслава-а! *(Азірнулася на княжыча са Смаленска, накрыла хустаю доўгія валасы. А ён, зірнуўшы ўніз, ажно адступіў.)* Круча высозная.
П р а д с л а в а. Хутка раз’едземся!
Д а б р а с л а ў *(падаў ёй руку)*. Не ідзі да ракі! Віры ажно кіпяць! Схопяць — не адпусцяць князёўну. *(Смяецца ў адказ. Усміхаецца і Дабраслаў.)* Вочкі гожыя заплюшчацца. Валасы доўгія з травою рачной саўюцца...
П р а д с л а в а. Настрашыў. *(Сумеўшыся, адвярнулася. І тут жа спалохана падалася назад. Валацужны лучнік у зрэб’і і старых бронях, што з дзікім рогатам выбег з-за соснаў, доўга не думаючы, падступіўся да яе ўпрытул.)*
К а ж а д у б. А лада ж мая салодкая! Ці не Прадслава полацкая? ...У школе Данілавай? *(Аброслы злямчанай барадою, ажно сіпеў.)* Калі дзядзька твой менскі, трасцу яму ў вочы і калок у бок, не пашкадаваў Кажадуба, то ты...
П р а д с л а в а. Прэч, смерд!
К а ж а д у б. А я ж яму ўсе ханскія пасланні расчытваў, лада. Маляваў! *(Нечакана груба шарганула рукою Прадславу па грудзях, аднак смалянін рашуча кінуўся гвалтаўніку наперарэз, і праз імгненне нахаба ўжо выў ад ярасці.)* А трасцу табе ў бок!

Нечакана пачуліся крыкі — ад манастыра спяшалі Данілавы навучэнцы. Ад жмудзіна Кірыка не адставалі сын баярына з Бельчыцаў Міхал і Валодша.

К а ж а д у б. Яшчэ ўспомніш Кажадуба, юніца. *(Кінуўшыся за дрэвы, знікае.)*
Д а б р а с л а ў. Валацуга! Уратаваў я ладу. *(Зноў працягнуў руку.)* Вось толькі школу Данілаву кончым... *(Смяецца юніца.)* Я, княжыч смаленскі, у тым клянуся.
М і х а л. Я, Міхал з Бельчыцаў, сын баярына, клянуся!
К і р ы к. Я, Кірык, сын Кірыкея, купца жмудзінскага, клянуся: прыеду!

З важкім бердышам у руках да кручы спяшаўся яшчэ адзін, светлавалосы і рослы, шкаляр.

В а л о д ш а. Я, Валодша, сын Вікулы, вешчуна, клянуся!
Р а з а м. Клянемся! *(Прытупнуўшы ботамі.)* Не пакідаць адно аднаго.
М і х а л. Ні ў агні...
К і р ы к. Ні ў вадзе...
В а л о д ш а. Ні ў пушчы густой...

К і р ы к. Ні ў кубле змяіным...
Д а б р а с л а ў. Ні ў зграі ваўчынай...
В а л о д ш а. Ні ў порубе...
П р а д с л а в а. Я, Прадслава, дачка князя Святаслава...
Д а б р а с л а ў. У чым клянешся?
П р а д с л а в а. Не пакідаць вас, другі.

**Дзея шостая**

**КНЯЗЬ БАРЫСЛАЎ**

***(Князь Барыслаў, Прадслава, Еўлампія, дзівы капішчанскія, моладзь.)***

Капішча Перуна. На акружанай соснамі паляне каля вогнішча — моладзь, у гурце якіх бачны Валодша, Міхал і Кірык. Сыходзячыся, усе распачынаюць танец і песню жарсці.

Д з і в ы  к а п і ш ч а н с к і я *(акапэла).*
«У тваіх валасах, нібы ў пушчы, вавёрыцы лешацца.
Да аерын павекаў злятаюцца зоркі з нябёс
І далоні, аблітыя поўняй, цябе абдымаючы, цешацца,
На крыле густапёрым любоў тваю вецер на грудзі прынёс.
Ў ачаротах павекаў і сноў пошчак птаства і зыкі дзяркатыя.
Як стагну я, рака, у каленях тваіх, нібы ў кручах, да слёз.
Колькі сомаў, платвіц, колькі словаў і любасці спратнае
У нутро тваё, лада, прыліў маёй прагі прынёс...»

Але сама Прадслава сцішылася, назіраючы за людскім шалам: над палянаю ўзвышаўся асветлены агнём Пярун. І раптам нехта груба тузануў яе за рукаво. Міжволі ўскрыкнула: незнаёмы вылучаўся з гурту шоламам з брамніцаю, з-пад якой сівела барада.

Б а р ы с л а ў. Ох, якая ж гожая! *(Зноў схапіў за расшытую золатам накідку.)* То чыя будзеш?
П р а д с л а в а. Пашто чужынцу? *(Горда падняла галаву.)*
Б а р ы с л а ў. Ці не з Полацка? *(Раздратаваны яе спробамі вырвацца.)* Ведзьма!? *(Роспачна азіралася.)* Такая красуня! *(Шахнуў яе па грудзях.)* Думаеш, ад Барыслава ўцячэш!?

Танец адразу ж прыпыніўся, а з-за соснаў вылецела ўстрывожаная нянька Еўлампія.

Е ў л а м п і я *(рашуча наблізілася да Прадславы).* Шукаем цябе, князёўна.
Б а р ы с л а ў *(азіраецца ўслед Прадславе, але тая ў суправаджэнні Валодшы, Міхала і Кірыка знікае за дымнай мярэжай прычахлага вогнішча.)* Маёй усё роўна будзеш, красуня! Заступнікаў адшукала? І з імі на дарозе вузкай не размінемся! *(Задумваецца.)* Але пашто на згоне гадоў сустрэча такая? Быццам бліскавіцаю па сэрцы ўдарыла. *(Стогне, павярнуўшыся да Перуна.)* Ці не твае жарты гэта, вогненны? Ці не праз мяне нацешыцца плоццю чыстаю хочаш? Адпусці на гэты раз!? Хіба мала юніц ужо згвалціў? Ці мала сыноў ужо табе нарадзіў я сярод рабыняў дворных?! Пашто не злітуешся?! Забыць! *(Закрывае вушы далонямі, ужо не ў стане чуць зладжаны хор пушчанскіх дзіваў.)* Забыць дачку Святаслававу трэба!

**Дзея сёмая**

**ЗВЕНІСЛАВА**

***(Звеніслава (яна ж — Юніца), лекар Тазіт, манашкі.)***

**Лекавае памяшканне ў замку Эльблонг.**

Праз залу прабягаюць манашкі. Уводзяць юніцу гадоў семнаццаці: вызваліўшы з зеленаватых лекавых шатаў, ускладаюць на яе чорную хламіду. Уваходзіць лекар Тазіт.

Т а з і т. Ты памятаеш, Тэрэза, адкуль прыехала сюды? І чыя дачка?
Ю н і ц а. Я — Звеніслава з Полацка. Прывезена баярынам Кірыкеем на лячэнне.
Т а з і т. Забудзь пра Кірыкея. Забудзь пра Звеніславу. Бо то быў сон.

Ю н і ц а. І бацька мой — князь вялікі Барыс.

Прыйшоў чалавек у блішчастай хламідзе з крапідлам у руцэ, і манахі пачалі спяваць.

Т а з і т. Цяпер ты па-сапраўднаму Тэрэза, а не Звеніслава. Людзьмі, думкамі, мроямі іх авалодвай. Сэрцы слабыя крышы, падавай бліскаўкі марных надзеяў... У клетку характва свайго розных птахаў лаві. Не выпускай, пакуль усяго не аддадуць! І — авалодаеш Полацкам.

З в е н і с л а в а. Але я — Звеніслава...

Т а з і т. Вялікая місія ўскладзена на цябе, Тэрэза. *(Спалохана падняла вочы.)* Будзь заўжды лепшай, разумнейшай, хітрэйшай, багацейшай за іншых!

З в е н і с л а в а. Але ж напісана...

Т а з і т. Не прыходзь да Госпада ў зрэб'і. Заўсёды свайго дамагайся! Зрабі з характва ланцугі для спакушаных.

З в е н і с л а в а. Але ж напісана, доктар...

Т а з і т. Сэрца шчырасцю ні перад кім не адчыняй. Няхай сыходзцца на цялесны корм твой усялякія звяры. Прынадзіўшы, не выпускай нікога, хто карысным быць можа.

З в е н і с л а в а. Але ж...

Т а з і т. Не прадставай прад вачмі Госпада ані прыніжанай, ані гордай, каб ведаў, што, славу зямную здабыўшы, да Яго усё набытае нясеш.

З в е н і с л а в а. Хіба развітваемся, доктар?

Т а з і т. Недзе там, на Полаччыне, — золата гольмгардскае. І каралі. Паедзеш — прыслухоўвайся.

З в е н і с л а в а. Не маё гэта.

Т а з і т. Знойдзеш — пасланцам маім перадасі. Усё аддай ім. Храм новы у Гольмгардзе збудуем...

З в е н і с л а в а *(амаль бясцямна)*. ...лепшай, разумнейшай, хітрэйшай, багацейшай...

Т а з і т. Нічым не грэбуй. Ні перад чым не спыняйся!

З в е н і с л а в а. Але ж...

Т а з і т. Не схіляй галаў перад неразумнымі, бо хлусні цяпер болей праўды вераць. Чалавека зваюй, і Светам авалодаеш, Тэрэза!

**Дзея восьмая**

## СУСТРЭЧА

***(Князь Барыслаў, Звеніслава, Анёлы рэчытатыву, соцкі Рымша.)***

А н ё л ы р э ч ы т а т ы в у *(акапэла пазасцэнава*)*.

Кідае на мяне град свой каханне. Шпурляе кавалкамі. Перад марозам яго хто выстаіць? О, любове! Пашле слова сваё на зямлю, — заранкамі хутка цячэ так слова агністае. Вочы любові сустракаюць ранішнюю варту, глыбляцца ў Слова Гаподняе. О, любове! Апрамень рабыню тваю святлом аблічча свайго... О, любове, ты маё покрыва і шчыт мой, на слова твае спадзяюся. Падтрымай мяне, любове, — і ўратуюся нават у прорве пякельнай.

## Дарога ў Полацк

Імчыць уздоўж пушчы запалоцкая варта. Насустрач — карэта вялікага князя Барыса, з якой вызірнула маладзенькая Звеніслава.Успыхнула, убачыўшы, як бровы валадара Запалоцця ў здзіўленні папаўзлі ўверх. Заірдзелася, зірнуўшы ў тыя пякельна-чорныя вочы...

Б а р ы с л а ў. Адкуль такая?

З в е н і с л а в а. З Эльблонгу!

Б а р ы с л а ў. У манастыр Бельчыцкі?

З в е н і с л а в а. Бацька-князь пасылае...

Б а р ы с л а ў. Чуў ад аднаго смаляніна: чорная смерць у суседзяў.

* Выкананне неабавязковае.

З в е н і с л а в а. Так блізка.

Б а р ы с л а ў. Манастыры — не ўберагуць.

З в е н і с л а в а *(у жаху).* А дзе схавацца?

Б а р ы с л а ў. Толькі ў Запалоцці. Мы ад усяго вадой абаронены. *(Смяецца Звеніслава. Весела. Паклічна. Адно кметы, змеціўшы ўтрапенне гаспадара, незадаволена зіркаюць.)*

Р ы м ш а. Не рабі гэтага, валадар. Князь Барыс — не месціч нейкі.

*(Маўчыць Барыслаў, загледзеўшыся.)* Не спусціць!

**Дзея дзевятая**

## КАХАННЕ ЗВЕНІСЛАВЫ

***(Звеніслава, князь Барыслаў, Анёл срэбракрылы, Пасланец д'ябла.)***

### Запалоцце

У апачывальнай зале запалоцкіх харомаў на ложы князь Барыслаў са Звеніславаю. Па абодва бакі ложа стаяць, адзін супроць другога, — Анёл срэбракрылы і Пасланец д'ябла.

П а с л а н е ц д' я б л а. Валадар Запалоцкі пачаў цалаваць Звеніславу адразу ж, як толькі сустрэў на дарозе. Потым падхапіў і панёс у дзверы...

З г л ы б і н і я в ы. І паклаў на шырокае ложа.

З в е н і с л а в а. Толькі, князь, убачыла цябе, яшчэ ў карэце едучы...

Б а р ы с л а ў. Узяў, адбіў у варты! *(Нечакана закрывае твар далонямі і задумваецца.)* Ах, які сон цяжкі. *(Утрапёна.)* Прадслава!

З в е н і с л а в а. Пашто сястру маю стрыечную ўспомніў?

Б а р ы с л а ў. Не зважай. Жарты гэта. *(Зноў засынае.)* Прадслава! *(Падхапілася Звеніслава. Распатланая, з шалёна расплюшчанымі ад рэўнасці вачамі. Прыслухалася. Зноў пачула Барыславава патаемнае.)* Прадслава! *(Ужо задыхаўся ад наплыву шалёнай жарсці.)*

З в е н і с л а в а. Заб'ю я цябе, сястра! Не вытрымаю. *(Заплакала, і ўвесь потны, быццам самлелы князь адразу ж ракінуўся.)*

Б а р ы с л а ў. Я нічога не казаў? Нічога, Звеніслава?

З в е н і с л а в а. Нічога. Ні слова, княжанька! Ах, які любы ты мне.

Б а р ы с л а ў. Ніколі такой і ў мяне не было.

З в е н і с л а в а. Якой?..

Б а р ы с л а ў. Такой, што не наталяюся.

З в е н і с л а в а. І я. Ах, Барыслаў, не выплыву. Утапілася. А ты спі. Адпачывай.

**Дзея дзесятая**

## ГРЭХ

***(Звеніслава, Анёл срэбракрылы, Пасланец д'ябла, князь Барыслаў.)***

Тая ж княжая апачывальня. Звеніслава, не заўважаючы гасцей, чуе толькі іх галасы.

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Цэлае лета мінула. А ты, Звеніслава, усё ў Запалоцці. Нельга піць адначасна чару Гасподнюю і чару дэманскую.

З в е н і с л а в а. Не здолела працівіцца.

П а с л а н е ц д' я б л а *(з рогатам)*. Табе казалі — гэта — ідалаахвярнае, а ты — ела!

З в е н і с л а в а. Яны прыходзілі ў святліцу, штовечара. І кметы. І пакаёўкі.

П а с л а н е ц д' я б л а. І абвівалі цябе чорнымі валасамі! І працiналі сэрца позіркамі такіх жа чорных вачэй.

З в е н і с л а в а. І па-княжаму слову так прагна пачыналі цалаваць.

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Яшчэ такую неразумнічую князёўну.

П а с л а н е ц д’ я б л а. А ўсе іншыя з чэлядзі збягаліся, стоячы навокал. Пазіралі і таксама стагналі.

З в е н і с л а в а. У канцы вечара... смеючыся, нарэшце вёў мяне, амаль бясцямную ад слодычы, у свой пакой і раскладваў на ложы.

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Вось толькі дзень расплаты настаў хутка. Калі данеслі вялікаму князю.

П а с л а н е ц д’ я б л а. Даляцела і ў Запалоцце вестка пра страшны гнеў яго.

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Ужо дамагаўся ад веча суда.

Б а р ы с л а ў *(прахапіўшыся, саскоквае з ложа. Косіцца на Звеніславу).* Не знойдзе сведкаў бацька твой. Нікога не знойдзе. Усіх — спалю!

П а с л а н е ц д’ я б л а. Ты бачыла — у свіронак сагналі ўсю чэлядзь. Затрашчалі косці чалавечыя.

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Хлынулі з-пад дзвярэй крывавыя ручаіны.

Б а р ы с л а ў. Не будзе сведкаў!

З в е н і с л а в а. Пашто невінаватых?

Б а р ы с л а ў. Няма тут невінаватых. Усё галовамі ківалі!

З в е н і с л а в а. Душу ратуй, князь. Пойдзем разам да бацькі. У ногі ўпадзем.

Б а р ы с л а ў. Хочаш, каб веча мне смерць пракрычала? *(Зарагатаў, як вар’ят.)*

**Дзея адзінаццатая**

## КРЫЛЫ

***(Прадслава, Анёл срэбракрылы, Пасланец д’ябла, Анёлы рэчытатыву.)***

### Полацкая Сафія, келля-галубец

На стале пергаміны. Прадслава набліжае пальцы да запаленых свечак. Зноў не бачыць гасцей: за спіною спрадвечныя антыподы: Анёл срэбракрылы і Пасланец д’ябла.

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Хочуць бацькі адпрэчыць цябе.

П р а д с л а в а *(быццам адказваючы ўласным думкам). Б*о ўсе юніцы маюць выйсці за мужа. Чаму мне іначай?

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. З’едзеш — і пергамінаў тады не будзе.

П р а д с л а в а. Не веру! *(Зябка пацепваючы плячмі, узіраецца ў абраз Багародзіцы на сцяне.)*

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Кніжак не будзе там. Адно толькі зыбкі дзіцячыя. Але як будзеш гушкаць іх крыламі?

П р а д с л а в а. Рукі маю. Упраўлюся.

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Крылы не заўжды бачныя. Бо растуць не з цела, а з душы. І не ведае часам чалавек — ці гэта рукі яшчэ, ці — крылы.

П р а д с л а в а. Пашто трывожыш? Хто ты?

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Бо хоць маеш розум не дзеўчаняці, баюся, — крылы свае ў рукі перарасціш.

П р а д с л а в а. Чаго варты чалавек, які крылы страціў?

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Запытала ў мяне так, юніца, і — супакоіла.

П р а д с л а в а *(азіраючыся спалохана, бачыць Анёла, апускаецца каля стала на ўслончык. Але праз хвілю зноў азіраецца).* Пашто бацька не чуе мяне?

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Іншы пачуе. Той, хто ўсіх чуе.

А н ё л ы р э ч ы т а т ы в у:

«І дзяўчына была здольная да навукі кніжнай,
Не дасягнуўшы нават паўналецця дзівавіжнага.
З зоркамі перамаўлялася самавіта.
І было гэта плёнам посту і шчырых малітваў...»

...Як успышка ў вачах.Узлом бліскавіцы. Шырока раскрыленыя, «ко-урлы», белыя птушкі паплылі праз россып зорак так блізка, што па шчоках заструменілі ўзмахі крылаў.

Здумак Прадславы. «Як даўно ўжо лячу я там, дзе «ко-урлы», адкуль прывольна бачыцца зверху ўся Полаччына».

...Нябесная тканка разатнулася і Прадслава адразу ж адчула, як паветра балюча б'е ў расхінутыя, як крылы, рукі. Наўкол закружылі віры асляпляльных зорак. Тады закрычала. Вяртаючыся ў келлю, змеціла блізка белае, ажно серабрыстае, але заплямленае крывёю, пер'е.

Анёл срэбракрылы *(з глыбіні келлі паблісквае крыламі).* Калі нябёсы болей не трымаюць чалавека, ён зноў нараджаецца.

Прадслава. Я памірала?

Анёл срэбракрылы. Былі жанчыны... Адсеклі, уславуленыя, ад сябе грахі і слодычы зямныя. І імёны іх напісаны на нябёсах.

Прадслава. Але ж так баюся.

Анёл срэбракрылы. Не жалезным мячом адсеклі, а моцным духам!

Прадслава. Ручкі слабыя. І — спаць хачу.

Анёл срэбракрылы. У закон Божы стань, і будзеш, як дрэва, над плынямі водаў пасаджанае, ліст якога не жухне.

Прадслава. Ледзь пяро трымаю...

Анёл срэбракрылы. Толькі бязбожнікі — як пыл, ветрам падняты!

Прадслава. Хто стаіць побач з табою?

Анёл срэбракрылы. Не бойся. Гэта любоў твая. *(Бліснуў крыламі.)*

**Дзея дванаццатая**

## ВЕРАНІЯ

***(Князь Барыслаў, Шыдзягей.)***

З-за пушчанскіх дрэў даносяцца роспачныя крыкі паланянак і дзіцячы плач. А князь Барыслаў ужо ідзе насустрач ханскаму намесніку Шыдзягею.

Барыслаў. Зноў на рынак турэцкі звозіш красуняў?

Шыдзягей. Хібы не ты князь, пражадаў, каб мы жонку жмудзіна Кірыка з двара звялі? А Алма яго — дыямент! *(Рагоча.)* Можа, і сабе такую пакіну.

Барыслаў. А купец? Кірыка — забілі!?

Шыдзягей. Баяліся стралой яго жонку-красуню зачапіць. Іншую аплату прасі.

Барыслаў. Няхай торкі з праважатым, соцкім маім Рымшаю да брата яго старэйшага зазірнуць. Жонка ў Міхала — Веранія. Таксама гожая. Сюды прывязіце!

Шыдзягей *(смеючыся).* Дзіўныя вы ў Склавініі. Любіце братоў сваіх! То жонку выкрадзеце, то ўсю маёмасць забярэце! То стралу ў спіну братаву пусціце.

Барыслаў. Ты пра каго?

Шыдзягей *(зноў смеючыся).* Прывязу красу тваю, не злуйся. Толькі шмат золата можна за рабыню гожую ўзяць!

Барыслаў. Такая, хан, як Веранія, і мне патрэбна.

Шыдзягей. У нас, калі госць захоча...

Барыслаў. Табе, хан, дворных дзевак яшчэ дам. А Веранія — мая.

Шыдзягей. Ці толькі красу яе ўпадабаў, князь?

Барыслаў. У Міхала, мужа яе, пячонку вырву! Калі са мною, як з рабом чорным, няхай другі яе адкажуць!

Шыдзягей. Пра каго думаеш так?

Барыслаў. Пра тую, што сэрца маё атруціла.

Шыдзягей. Чуў пра дачку брата твайго старэйшага! Прадславу…

Барыслаў *(недаверліва скасіўшыся).* На гэтую не глядзі!

Ш ы д з я г е й. Гожая вельмі, кажуць. Недаступная.
Б а р ы с л а ў. Мушу зламаць ганарлівіцу.
Ш ы д з я г е й. Семнаццаць летаў паміж вамі, зроднікі! *(Рагоча.)*

**Дзея трынаццатая**

## КІРЫК

***(Князь Барыслаў, Кірык, Веранія, грыдні.)***

### Запалоцце. Зала

У гасцёўні запалоцкіх харомаў за сталом — двое. Князь Барыслаў у шоўкам расшытай керэі і малады жмудзінскі купец Кірык. У глыбіні — павольны танец амаль распранутых дворных дзяўчат. На стале — жалезныя каўшы з медавухай, спод з вялікай копчанай дрофай. Але жмудзін нават не пазіраў на стол. Каля сцен стаялі, цікуючы за госцем, — грыдні з сякірамі ў руках. Гожая чарнавокая маладзіца прынесла і паставіла на стол гляк з віном.

Б а р ы с л а ў. Ты не хочаш памагчы мне? *(Спыніў на начным суразмоўцы пагрозлівы позірк.)*

К і р ы к. Не казаў такое князю.

Б а р ы с л а ў. Казаць — не казаў, Кірык. А думаеш па-свойму. *(Расчырванелы ад выпітага, гучна кашлянуў, нібы змушаючы госця падняць галаву.)* Усё, што ты прывёз, я ханскім прыслужнікам перадам. Заўтра ж прывядуць красуню тваю з ляснога схарону. Толькі і мне службу саслужы.

К і р ы к. Я сабраў усё, што хан хацеў! Усе трыста вавёрыц белых! Мяшок футра! Скажы ханскім слугам, няхай адпускаюць Алму!

Б а р ы с л а ў. Ці ж я не скажу!? Але чаму медавухі маёй не п’еш? *(Дадае здзекліва.)* Ой, не ўмееш ты. Не ўмееееш! Ні піва піць, ні... *(Адпіўшы з бліскучага, падобнага на чалавечы чэрап, каўша, усміхнуўся.)* Хіба не ведаеш — пітво такое саладзейшае за жонку! А гожая маладзіца на рынку ўдвая даражэй.

К і р ы к *(імкліва сарваўшыся з лавы)*. На якім рынку!? *(Мажныя грыдні, што стаялі каля сцяны, адразу ж ткнулі яму коп’ямі пад лапаткі.)*

Б а р ы с л а ў. Не сумнявайся. *(Падсунуўшы госцю шкляніцу піва, крыва ўсміхаўся.)* Вернуць табе тваю Алму. Толькі і ты мне ласку зрабі.

К і р ы к. Не магу, князь. Яшчэ столькі ж вавёрыц прывязу... *(Шахнуўшы па барадзе пяцярнёй, рашуча адсунуў ад сябе пергамін.)* Казаў ужо соцкаму: не паверыць мне Прадслава.

Б а р ы с л а ў. У саборы Сафійскім, у келлі хараство сваё схавала. Толькі не ад мяне! *(Так моцна ўдарыў па сталешніцы, што Кірык ажно адхітнуўся.)*

К і р ы к. Не ладзілі мы ў Заслаўі, князь. Гордая Прадслава. Дзікая, хоць і з роду княжага.

Б а р ы с л а ў. Гэта нічога. *(Сарваў з галавы атарочаную вавёрчыным футрам шапку.)* Лятункі маладыя доўга вочы засцяць! Пішы, калі хочаш жонку ўбачыць! І не бойся, не аспіды мы нявхрышчаныя, як тваё племя вужына! Перамовімся... і адразу ж адпусцім... служку Божую.

Чарнавалосая пакаёўка, што якраз несла гляк з віном, зачапілася за вугал стала і хітнулася; віно пад незадаволеныя крыкі разлілося па падлозе сярод патрушчаных чарапкоў. Кірык, падняўшы вочы, сустрэў ледзяны позірк князя.

Б а р ы с л а ў. Пішы лепей, жмудзін.

К і р ы к.Тады прывязі Алму да Сафіі. Дзе Прадслава будзе.

Б а р ы с л а ў. Прывязу, жмудзін! Прывязу. Весяліся... *(Знік у глыбіні залы, адкуль адразу ж данёсся разбэшчаны смех.)*

Маладая пакаёўка, наліваючы Кірыку ў коўш, нечакана нахілілася.

В е р а н і я. Ды вывезлі ўжо тваю Алму. Так ціха, што нават лось сахаты не бачыў.

К і р ы к. Заб’ю!

В е р а н і я. Варта паўсюль...

К і р ы к. Вярнуся.

В е р а н і я. Не выдавай мяне. *(Імкліва сарваўшы з пальца пярсцёнак, працягнула яму.)* Міхалу з Бельчыцаў занясі. Скажы, каб не чакаў.

К і р ы к. Чым аддзячу табе?

В е р а н і я. Хоць сам выжыві, жмудзін.

К і р ы к. Таці Барыслава кроў, бы квас, разліваюць...

В е р а н і я. ...а віна ўся на цябе, жмудзін, падае. *(Заплакала.)*

К і р ы к. Дачакаюцца яшчэ!

В е р а н і я. Няма мне адсюль дарогі. У тым баку... *(Паказала накірунак.)* Пад арабінкамі ў сцяне лаз ёсць.

К і р ы к. Як жа цябе завуць?

В е р а н і я. Раней — Веранія. А цяпер забыла. І ты мяне забудзь.

К і р ы к. Вярнуся!

В е р а н і я. Толькі Міхалу персцянёк аддай.

К і р ы к. З дымам усё пушчу!

В е р а н і я. Кажуць, Вістачка наша слабая.

**Дзея чатырнаццатая**

## ВЫРАТАВАННЕ

***(Прадслава, Кірык, Еўлампія.)***

Ноч. Падворак. Царква лагодна засвяцілася тонкім абрысам, і Прадслава падняла позірк у вышыню. З-за невялічкай аблачыны нарэшце вызірнула вялікая сіняя зорка. Гэта быў доўгачаканы знак. Тады наблізілася да пацягнутага мохам старога валуна.

П р а д с л а в а. Старажуй, ахоўвай княства Полацкае! *(Ласкава правяла рукою па камені.)* І сказана: «Тады ўратуе ён, камень, пагарджаны намі, будаўнікамі, бо ён зрабіўся галавою вугла, і няма ні ў кім іншым ратунку». *(Насцярожана азірнулася і прыціснула да грудзей пергамінны скрутак.)* Азваўся Кірык. Ніколі не пісаў... Пашто ж кліча? Пашто — сярэдначы?!

К і р ы к. Прадслава! *(Начную цемру нечакана распаролі агні ліхтароў.)* Асцерагайся! *(З цемры даносіўся бразгат зброі.)* Бяжы адсюль!

Хаця і чакала знаку ад Кірыка, ад нечаканасці спалохана азірнулася. Крыкі імкліва набліжаліся, але яна ўжо кінулася да Сафіі. Следам ледзь паспяваў Кірык. Дзверы тут жа гулка, зачыніліся.

П р а д с л а в а *(ужо ўнутры царквы).* Я чула іх, нянька...

Е ў л а м п і я. Не плач!

П р а д с л а в а. Усе мы — вучні Данілавы. І я, і Міхал з Бельчыцаў, і Дабраслаў смаленскі. Ці забыў — клятву давалі!? Пашто ж ты, Кірык?!

Е ў л а м п і я. Маліся — і ўведаеш.

К і р ы к. Папярэдзіў цябе. Змусіў мяне князь запалоцкі напісаць тое...

П р а д с л а в а. Быццам звер люты, за кожным з другаў маіх сочыць.

К і р ы к. Бачыў у запалоцкіх харомах Веранію — жонку Міхалаву. Баюся, у порубе. Бо мне памагла. Ратуй гаротную. Толькі ты зможаш.

П р а д с л а в а. У поруб?

Е ў л а м п і я. Маліся — і дзверы любыя адчыняцца.

К і р ы к. Ці забыла, што з роду князя вялікага Манамаха! Ігумен дапаможа.

**Дзея пятнаццатая**

## УВЯЗНЕНАЯ

***(Кірыла, Прадслава, Кажадуб, Веранія, малады вартаўнік Сава, Анёлы рэчытатыву.)***

Зала княжых харомаў ужо затоплена цмяным святлом ад ушчэмленых у сцены лучын і нагадвае поруб. Праз дошкі клетак працэджваюцца космы бародаў і ледзь бачныя рукі, якія цягнуцца да князёўны і ігумена Кірылы.

З клеткі. Іспра! *(У чарнавалосай жанчыне, што выкрыквала клёны, цяжка пазнаць Веранію. Старэйшы вартаўнік нешта таропка зашаптаў на вуха ігумену Кірылу і князёўна адразу ж пазнала: перад святаром стаяў Кажадуб. Але колішні лучнік быў цяпер не ў старых латах, а ў багатым чорным кафтане. Жанчына ў клетцы, усё яшчэ тузаючыся ў цёмным куце, не сунімалася.)* Іспра!

Кірыла. І сказаў ёй цар сірыйскі Венедат: «Чаго табе, жанчына? *(Стаяў блізу клеткі з нізка апушчанымі плячмі.)* І пачуў: «Зварылі мы сына майго…»

Веранія. Не варылі! Іспра сам!

Кірыла *(не зважаючы на енкі)*. «...і зварылі мы сына майго, і з’елі яго…»

Кажадуб. Чуеш, Веранія?

Веранія. Іспра!.. Усё — іспра! *(Ужо плакала.*) Уклаў спярша сына ў маё чэрава, а цяпер — з’еў!..

Кажадуб. То колькі ж ратоў у твайго іспры было, Веранія? Не бойся, ідзі сюды. Раскажы Кажадубу. *(Падступіўся да жанчыны, і тая, спалохаўшыся, пачала ўскідваць перад сабою руку.)* Адзін… другі… трэці! *Падаў знак, і другі з вартаўнікоў пры ўваходзе прыўзняў смаляк.)* Тут і нарадзіла…

Прадслава. За што тут?

Кажадуб. Выпусціла таця прышлага.

Прадслава. Ці не Кірыка?!

Кажадуб. Блудніца. *(Запабеглів пацісну плячмі.)*

Прадслава. Але як трапілі сюды згубцы? Вароцечкі ж моцныя. Чаму не крычала?

Кажадуб. Таго не ведаю. Ноччу з'ядалі.

Прадслава. Але пасылаў бацька цэлы воз мукі і рэпы! Якраз два дні таму.

Кажадуб *(няўпэўнена.)* Скралі, можа? І чаму павінен слухацца?

Прадслава. Дачцы княжай, у імя міласэрнасці Госпада, адказвай!

Кажадуб. Не ведаю твайго Бога.

Прадслава. Ці не сам скраў? Ты *(да Веранії)* пойдзеш са мною! *(Увязненая тут жа папаўзла да выхаду — малодшы вартаўнік якраз прачыняў вароцечкі перад ігуменам. Следам выходзіла і Прадслава, але, рашуча грымнуўшы ў пазы вароцечак жардзіну, пакінула ў клетцы Кажадуба.)* Будзеш *(павярнулася да маладога вартаўніка)* старэйшым замест таця хлуслівага. Патрымай, пакуль праўды не скажа і не пакаецца.*(Кажадуб роспачна закрычаў, але Прадслава зноў павярнулася да малодшага.)* Як называць цябе, служывы?

Малады вартаўнік. Кмет Сава, князёўна.

Прадслава. Старажуй таця.

Сава. Ненадоўга ён тут.

Прадслава. Пакуль не пакаецца — не выпускаць!

Сава. Князь Барыслаў па-свойму зробіць.

Анёлы рэчытатыву. І закоўвала любоў яе ў ланцугі жалезныя. І меч двухсечны — у руцэ любові. І зацiскала, пяшчотнае, у кайданы сэрца яе...

**Дзея шаснаццатая**

## САКРАЛЬНАЕ

***(Анёл срэбракрылы, Пасланец д’ябла.)***

Сыходзячыся ў порубе, адзін супроць другога пасталі два адвечныя супраціўнікі.

Пасланец д’ябла. І прастора нябёсаў, і чорная цвердзь
Знаюць: кожны ваш грэх —

Анёл срэбракрылы. ...як маленькая смерць.
Пасланец д'ябла. Знаюць: кожная слабасць
Анёл срэбракрылы. ...як грэх ваш раптоўны.
Пасланец д'ябла. Даганяць буду смерцю юніцу-князёўну!
Анёл срэбракрылы. Чорны раб! Ты развеяў па весях чуму.
Пасланец д'ябла. Зноў нянавісць і зайздрасць...
Анёл срэбракрылы. ...у смердаў суму напіхаеш...
Пасланец д'ябла *(з сіпенннем)*. Ды вер мне: пагібель — не тая, Што па рэчцы плыве ці паслана чумой!
Смерць змяёю у сэрца, ў душу, запаўзае.
Анёл срэбракрылы. То пашто распускаеш па весях ману пра Мсціслава з палянамі? Быццам агню хочуць весі памежжаў крывіцкіх аддаць?!
Пасланец д'ябла. Запытай лепей хана. Спяшаецца таць!
Анёл срэбракрылы. *(узіраючыся ў далягляд).* Бачу лёт бліскавічны.
Пасланец д'ябла *(з сіпенннем)*. Звіняць ятаганы...
Анёл срэбракрылы. Налятаюць атрады хлуслівага хана на памежжы, па стойбішчах віхрам ляцяць...
Пасланец д'ябла. Рассяваюць пажары, знішчаюць адрыны.
Анёл срэбракрылы. Спешна новыя князь набірае дружыны.
Пасланец д'ябла. Кузні з раніцы ў неба шугаюць агнём.
Анёл срэбракрылы. І мячы, і суліцы куюцца для весяў.
Пасланец д'ябла. Ці не бачыш? — дымяць ужо вашы ўзлессі
Па сцяжынах вужыных і па бальшаках.
Анёл срэбракрылы. Новы ў край гэты цягнецца, з пушчаў і стойбішчаў, жах.
Пасланец д'ябла. Пачакай, паўнаводныя рэкі назад пацякуць. Будзе смерць ім збавеннем.
Анёл срэбракрылы. Ізыдзі!
Пасланец д'ябла. На жмудзь!

Звініць вогненная страла. А князь запалоцкі, пераступіўшы праз пошум ветру, лёгка пераадольвае ўяўную сцяну-мярэжу, апынуўшыся ў хораме князя Святаслава. У невялікай, як келля, дзявочай святліцы.

**Дзея семнаццатая**

## ЖАРСЦЯ БАРЫСЛАВА

***(Прадслава, князь Барыслаў, князь Святаслаў.)***

### Святліца ў харомах князя Святаслава

На стале — фаліянты, паглыбіўшыся ў якія, князёўна нават не заўважыла чужынца. Нарэшце спалохана падхапілася на ногі. Чэпкія абдоймы сціскалі так моцна, што Прадслава ажно застагнала. У адчаі сілілася вызваліцца, але Барыслаў ужо груба кінуў яе на ложа. З усяе сілы выкручвалася з грубых рук. А вырваўшыся, нарэшце адбегла ўбок.

Барыслаў. Такая воля наша, каб выехала ты, князёўна, у Запалоцце. Ад чумы! *(Вочы палалі.)* Пашто ні сябе, ні мяне не шкадуеш? Прыйдзе смерць чорная — не адмолішся! Ні любові, ні ласкі чалавечае не спазнаеш. *(Глуха закашляўся.)* Яшчэ не позна! *(Ужо роспачна крычаў.)* Са мной — жыць застанешся. Любіць будзеш! Усе шукаюць куток бяспечны...
Прадслава. Гнеў адолей, княжа! І праўда *(падняла Евангелле)* пойдзе перад табою. Паклічаш — і Гасподзь пачуе.
Барыслаў. Але чаму сама не чуеш?! Не бачыш хіба, — крывёю кашляю без ласкі твае? *(Нечакана дапраўды рэзка закашляўся.)* Крыж ад кашчавай не заслоніць! *(Па-змоўніцку схіліўся да самага вуха.)* З-за цябе тут застаўся.

П р а д с л а в а. Голас на слабасілую падымаеш. Гаворыш абра́зы мне. А хочаш, і душа загоіцца. *(Выхапіўшы, падняў меч, але Прадслава адно схіліла галаву.)* Дазволь і мне памаліцца за цябе, княжа.

Б а р ы с л а ў. Ведзьма чарнарызая! *(Злосна бразнуў мячом аб латы.)* Куфры ўсе перад табою адчыню! Скажы толькі! *(У святліцу нечакана ўварваўся бацькаў крык.)*

К н я з ь  С в я т а с л а ў. Прадслава!

Б а р ы с л а ў *(апамятаўшыся, імгненна пабег да дзвярэй, злосна азірнуўся).* Калі не маёю... Лепей — чуме!

**Дзея восемнаццатая**

## СХАРОНЫ ЧАЛЯДНІЦЫ

***(Князёўна Прадслава, Чалядніца Сафійскага сабора.)***

Полацкая Сафія. Каля сцяны — гурма падлеткаў у рызманах. Насупраць чалядніцы сабора — Прадслава.

Ч а л я д н і ц а. Не магу, князёўна. *(Спалохана азірнулася і затрэсла рукамі.)*

П р а д с л а в а. Але ёсць жа запасы ў схаронах храмавых. Столькі дзяцей да сабора прыйшло. Усе галодныя. Пакормім вотракаў — чуму зможам.

Ч а л я д н і ц а. ...без павялення вялікага князя...

П р а д с л а в а. Калі гэтыя вотракі паўміраюць, матухна ігумення... *(Нават не выцірала слёз.)* То не будзе каго ў дружыну браць. А малітвы хто праспявае?! Ці ж чужакі гэта, ігумення? *(З асуджэннем у голасе.)* «Калі скажаш, што вуха ці вока не належаць да цела, няўжо яны не належаць яму?»

Ч а л я д н і ц а. Самі для сябе схароны не чапаем. А смердам неразумная?..

П р а д с л а в а. Усе мы адным Духам хрысціліся, ігумення.

Ч а л я д н і ц а. Зямяне адны! Грэшнікі.

П р а д с л а в а. Слухай наказ тады, слухай мяне: я, князёўна Прадслава з роду Ізяслававічаў, іменем дзеда майго праслаўнага князя Усяслава, і бацькі майго Святаслава-Ягоргія, і зроднікаў князёў вялікіх полацкіх Барыса і Рагвалода, загадваю табе, ігумення храму Сафійскага, выдаць траціну запасаў харчовых дзеля ратавання роду крывіцкага і мацавання веры хрысціянскай на зямлі Полацкай у імя Айца і Сына і Духа Святага. *(Ужо не бачыла, як немаладая чалядніца схапілася за грудзі.)* І прызначаю цябе першай навучальніцай дзяцей нашых. Ад таго ўсю віну за ўчыненае прымаю на сябе адну. У чым і прысягаю, укленчыўшы перад абразам найсвяцейшай Маці Багародзіцы.

Ч а л я д н і ц а. Якая ж з мяне вучэльніца, князёўна?!

П р а д с л а в а. І якая б немарач не ўпала на Полаччыну, а ці будзе адзін вотрак, а ці два, а ці болей — навучаць будзем! Разам і кожнага. Цяпер і пасля.

**Дзея дзевятнаццатая**

## ВАЛОДША

***(Вяшчун Вікула, яго сын Валодша, блазен Лазар, Анёл срэбракрылы, Анёлы рэчытатыву, смерды.)***

Капішча-паляна ў пушчы занята смердамі. Цягнуць хмары гарлавы спеў Валодшы, які, стаіць ўпоплечкі з блазнам Лазарам і бацькам.

А н ё л ы  р э ч ы т а т ы в у *(акапэла)*.

Чулі пра Любові любоў у Эфраме.
На палях Ярыма яе абрасілі...
Ад сёння, і вечна! І з Ім, і з намі.
Праз Любові любоў — прыход Еўфрасінні.

Праз Любові любоў — шляхам спарудным,
Праз Любові любоў — Госпадавымі пракосам...

Пахваліце ж любоў яе голасам трубным.
Пахваліце кімваламі гучнагалосымі... Алілуя.

Валодша. Яна не такая, як усе, бацька! *(Ужо да бляску затлушчыў дубовага перуна. На ўзмежку бялявіны якраз разгаралася хаўтурная яміна-кама.)*

Вікула. Моліцца, кажаш? Чаму ж чуманька не адступае? *(Уздыхнуў.)* Веру дзеда, як сукню змяіную, твая Прадслава з сябе злузала!

Лазар. Столькі людзей цяпер на капішчы. Усе, Вікула, толькі цябе слухаюць. Пашто ж на юніцу гневаешся? *(Звініць трашчоткамі.)* Ты цяпер — князь над князямі!

Вікула. Бо чумы белая костка баіцца.

Валодша. Не чапай Прадславу, бацька.

Вікула. Пашто крыжоў наставіла?

Лазар. Іхні Гасподзь укрыжаваны быў за грахі людскія.

Вікула. І яна — апантаная. Страшнейшая за іншых. Слухаюць яе! *(Грозна.)* Пашто цікуюць за мною!? Бо веру праўдзівую, тутэйшую, аберагаю. Сам згару, сыне, а веры — не аддам! *(Не зважаючы на маўчанне субяседніка, яшчэ болей распаляўся.)* Ты думаеш, калі маўчаць смерды, то са ўсім згаджаюцца? Чакай... Усе іх званы раструшчым... Косці па гонях раскідаем!

Згодна ківаюць галовамі смерды. Бліскаюць злоснымі, з-пад насупленых броваў, вачмі.

Валодша. Не чапай яе!

Анёл срэбракрылы *(набліжаючыся да вогнішча)*. Усе маеце паўнату ў Госпадзе. І калі нехта быў пахаваны з Ім у хрышчэнні, у Ім і ўваскрэсне з вераю.

Вікула *(засмучана)*. Чаму ж усё болей смерды хварэюць?

**Дзея дваццатая**

## СВАТАННЕ

***(Бацькі Прадславы — князь Святаслаў і княгіня Сафія, смалянін Дабраслаў, Прадслава, князь Барыслаў, баярын Вялішын, Еўлампія, грыдні дружыны, Анёлы рэчытатыву.)***

Анёлы рэчытатыву.

«І па ўсіх гарадах разышлася пра мудрасць яе пагалоска,
Пра вучонасць, красу ды агонь летуценны ў вачах,
Дзе сплывалі грахі і пажады аблудлівым воскам
І дзе Духу Святога агонь у дзявочай душы не ачах,
Дзе красою нябеснаю, гожым абліччам дзівіла,
бо была яна надта набожнай і Духам Святым
напаўняліся розум яе і цялесная сіла...»

Бацька. Прадслава!

Голас князя ляціць ужо з залы, дзе побач з ім у крэсле з разьбянай спінкай сядзіць маці — княгіня Сафія. Тут жа — княжыч Дабраслаў са Смаленска і нянька Еўлампія. А Прадслава, гнуткая і лёгенькая, ужо імкліва ўлятае ў залу. Азіраецца: на кіліме з мядзведжага футра застылі грыдні з пікамі, упрыгожанымі расфарбаванымі воўчымі хвастамі. Баяры, схіленыя ў паклоне, здзіўлена зашумелі. Тады рэзка, прытупнуўшы боцікам, спынілася. Маці незадаволена ўздыхнула. А дачка, гарэзліва азірнуўшыся, адразу зніякавела. Смалянін Дабраслаў быў у золатам расшытай сарочцы. Валасы і барада жаніха таксама адлівалі золатам. Ужо не мог адвесці ад яе вачэй. Бацька хітнуў высокай, атарочанай серабрыстым футрам, шапкаю.

Прадслава *(да бацькі)*. Кніжкі ад імператара прыслалі.

Князь Святаслаў. Не надакучыла табе чытанне тое, дачка?

Прадслава. А хіба сонца можа надакучыць чалавеку?

Еўлампія. Забава пустая. З дванаццаці гадоў слепішся.

Прадслава. Кніжкі... Сонейка ўдзень. Месяц — уначы...

К н я з ь   С в я т а с л а ў. Мудрасць кніжная для князёўны гожай — залішняя!

П р а д с л а в а. Кніжкі — гэта Гасподзь, які ёсць — Слова.

Е ў л а м п і я. Казалі ў манастыры, што ўся наша пагібель ад мудрасці гэткай.

П р а д с л а в а. Мяняць усё ў манастыры трэба! *(Змеціўшы, як Еўлампія спалохана перажагналася, падняла позірк на бацьку.)*

К н я з ь   С в я т а с л а ў. Нягожа дачцэ нашай, падобна шэрым перапісчыкам, сляпіцца!

П р а д с л а в а. Сляпцы тыя — хто кніг не бярэ ў рукі.

К н я з ь   С в я т а с л а ў. Досыць бегаць па келлях! *(Гнеўна ссунуў бровы, але Прадслава ўжо горда выпрастала плечы, не згаджаючыся з бацькам, што ўсё яшчэ не супакойваўся.)* Час пра іншае памысліць, князёўна!

П р а д с л а в а. Пра тое мыслю, што з роду я Усяслава вялікага... і прадзеда Яраслава, мудрым за кніжнасць і розум назвалі.

С в я т а с л а ў. Дачка наша... *(Да княжыча.)*

П р а д с л а в а *(ахопленая роспаччу, успыхнула).* …і зажадаў святы Пётра памаліцца, узышоў на дах і ўбачыў адчыненае неба і вялікае палатно, спусканае на зямлю...

В я л і ш ы н *(якраз выходзячы з бакавых дзвярэй).* ...і былі ў ім усялякія чатырногі зямныя, звяры, плазуны, птушкі нябесныя... *(прыпыніўся.)* І быў голас тады яму... *(паволі абвёў насмешлівым позіркам баяр... і з гурту, падрымаўшы баярына, нечакана грымнула: Устань, Пётра, закалі і еж!)*

Рогатам выбухнула, услед за князем, зала, праз якую ўжо беглі слугі са жбанамі ў руках. Падняўся і здзіўлены Дабраслаў. З дзядзінца неслася конскае іржанне.

П р а д с л а в а *(рашуча ступіўшы наперад, падняла галаў).* Ці не хочаш праз мяне, бацька, узвысіцца?

З   г у р т у   б а я р а ў *(угнявана).* Розум юніца страціла.

В я л і ш ы н *(з хітрынкай і подзівам).* А можа ў галаве — праяснела?

П р а д с л а в а *(прыціскаючы Евангелле да грудзей).* Аддаючы дачку моцнаму суседу, — не пра дзіця сваё, бацька, не пра мяне думаеш...

В я л і ш ы н. ...а пра вялікі сталец Полацкі!

П р а д с л а в а *(кінуўшыся да дзвярэй, азірнулася на апрыціхлых ад здзіўлення баяраў).* Хіба вечна жылі роды нашы!? Слава іх зямная згінула, як прах. *(Бачыла, як хітнулася пашарэлая маці, як засіпеў, хапаючы са стала княжую булаву, бацька.)*

Д а б р а с л а ў. Пашто ганьбіш, князёўна?! *(Таксама сарваўся з месца.)* Ці ж не абяцаў я прыехаць? *(Голас яго панізіўся да глухога балючага шэпту.)*

П р а д с л а в а. Хочаш узяць, чаго не клаў, і пажаць, чаго не сеяў?

Д а б р а с л а ў. Як страла, у маім сэрцы любасць да цябе! Ці, можа, болей да мыслі валадар запалоцкі? *(Змеціўшы ў яе на твары непрыхаваную агіду, сумеўся.)* Багаты князь...

П р а д с л а в а. Жыццё — хуткацечнае, а багацце горай павуціны ліпкай.

Д а б р а с л а ў. Хіба не ведала, што запалоцкі таксама сватаецца?

П р а д с л а в а. Для мяне ўжо Іншы ёсць. І я — для Іншага.

С м а л я н і н. Не чуеш мяне зусім. Хочаш, каб кроў пралілася?

П р а д с л а в а *(сумеўшыся).* Кажаш пра што?

Д а б р а с л а ў. Згадзіся — і цэлае лета мячы ды коп'і крыві не ўзлакнуць! Пашкадуй землі нашы, Прадслава. Хоць на лета. *(Змеціў, як замыслілася.)* А там змовіны, калі захочаш, прыпынім. Ідзем да дружыны, што на беразе Дзвіны сабралася. Там, дзе Лада! Ідзем, Прадслава!

П р а д с л а в а. Іншы Гасподзь у нас.

Д а б р а с л а ў. Але яшчэ многія не прынялі яго на Полаччыне. Пяруну і Ладзе болей вераць.

З   г у р т у *(на пушчанскім беразе Дзвіны).* Слава! Відбеску! І Смаленску! І Полацку! Слава!

Узяўшы Прадславу за руку, Смалянін ужо выходзіў да соснаў на берагавой кручы з драўляным ідалам на ўскрайку, і дружына сустрэла маладых такім радасным гікам, што Прадслава ажно прыплюшчыла вочы. ...І тут жа замерла. Бо яшчэ ніхто, ні баярын Вялішын, ні грыдні, што паўкругам пасталі поблізу... Яшчэ ніхто не бачыў Яе… Гэтую чырванадзюбую стралу, што раптам вылецела з-за спін чэлядзі. Тады міжволі ўскрыкнула. Уверсе, гучна шахаючы чорнымі крыламі, над княжычам з прабітымі стралою, скрываўленымі грудзьмі, праляцела вялікая птушка.

Д а б р а с л а ў. Прадслава... *(Рэзка павярнуўшыся, пачаў падаць. А яна, амаль непрытомная, разгледзела ў гурце князя Барыслава. Зліваючыся з нябеснай псалмой, паплыла ў недасяжнае «коурлы...»)* Прадслава...

В я л і ш ы н *(да князя Святаслава)*. Бяда, князь. Як толькі дачуюцца смаляне пра смерць княжыча, з агнём пойдуць, рынуць на нас!

С в я т а с л а ў. Але ж дружына полацкая — на памежжах.

В я л і ш ы н. У Барыслава затое — раць! Аддай дачку за Барыслава, князь. Полацк уратуеш.

П р а д с л а в а *(гнеўна падняўшы галаў)*. Не будзе таго.

В я л і ш ы н. Стальцу вялікаму працівішся? *(Падвышаючы тон.)* Зямлі полацкай, весям родным памагчы не хочаш?

П р а д с л а в а. Вера моцная, — сілы патройвае!

С в я т а с л а ў *(паказвае на Евангелле ў яе руках)*. Бацькава воля — закон. Хіба не так у тваіх святых кнігах сказана? А воля мая такая...

Да Прадславы, не хаваючы нядобрай ухмылкі, ужо набліжаўся Барыслаў, але праз імгненне над усім гуртам баяраў і княжай дружыны нечакана ўзнёсся агульны ўздых подзіву: князёўна стаяла на самым аброжку кручы. Данесліся асобныя выкрыкі — круча была сапраўды высокая.

З  г у р т у. ...Адыдзі, князь! ...Не чапай князёўну.

Барыслава, аднак, ужо нічога не спыняла: сціху падымаў руку з доўгай вяроўкай-пугаю, збіраючыся затрымаць ёю Прадславу. Узмахнуўшы, памкнуўся абкруціць пугай князёўну, але дастаў толькі да драўлянага ідала, які тут жа зваліўся на зямлю. Людзі на кручы адхітнуліся.

З  г у р т у. Прадслава!?

Але на кручы ўжо нікога... не было. Уніз, ратуючы князёўну, рынулі грыдні. Князь Святаслаў схапіўся рукамі за галаву, збіўшы на бровы сваю высокую шапку.

З  г у р т у. Загінула!? *(Са шкадаваннем.)* Юніца зусім.

В я л і ш ы н *(да князя Святаслава)*. На тым баку Дзвіны веся лекавая. Супроць чумы. Калі з Дзвіны выплыве, то ўсё роўна дахаты не вернецца дачка твая... неразумная.

А н ё л ы  р э ч ы т а т ы в у *(акапэла)*.

І ў смерці яна, і ў дыханні тваім...
І ў раніцы светлай, і ў ношчы.
Без любові — як хваля ліхая ты,
У якой д’ябал капыцці свае палошча.
Без любові спакушаны ты грахом
І расцяты страсцю-пажадаю,
І ў небе высокім — Любоў — нагбом,
І ў пекле — Любоў... — праклятым...
Зараніцы крыло вазьмі,
На край неба Любоў пераселіцца;
Гэта будучыня твая гарыць,
І цяперашняе — вяселіцца. Прад ...слава!

Удар бліскавіцы распароў усю прастору ад зямлі да неба, і ў святле яе не відно ні баяр з князямі, ні дружыны. Адно толькі жабрачка ў доўгім сарафане з вялікай хустаю на галаве, што глыбока насунута на твар, ляжыць, трымаючы ў руках Евангелле, на пушчанскай паляне.

## II

### Дзея дваццаць першая

***(Жабрачка, Соцкі Рымша, Звеніслава, князь Барыслаў.)***

## ПУШЧАНСКАЯ ПАЛЯНА

Паляна з вогнішчам глыбокай яміны-камы і пастаўленым на месца ідалам ужо нагадвае лекавую весю. На жардзінах агароджы вісіць некалькі тонкіх палатняных ручнікоў і істужак, што прыдатныя для перавязак. Збоку — бочка для вады. Вёся перапоўнена баярчукамі і смердамі, якія тут суседзяць мірна. Адно страшная старая з сухімі галінамі ў руках сядзіць каля крушні камянёў. Убачыўшы Жабрачку на зямлі, бярэ камень і пагрозліва падкідвае яго ўверх.

Ж а б р а ч к а *(падымаючыся).* Так галава баліць. Быццам цвікі нехта ўбіў. Як некалі ў далоні і ногі Госпадавы... Але хто я? Не памятаю. Толькі сны нейкія. То зала княжая, вялікая. То княжыч гожы з валасамі да плячэй *(стогне.)* Ды яшчэ малітвы розныя прылятаюць: «І жывы ў ласцы Усявышняга, такі міласэрны і бязгрэшны, Заступнік мой і Ахова, Бог мой, прыйдзі, Збаўца ад сетак лоўчых і словаў паганых. *(Адхітваецца ад нечаканага пагрозлівага свісту.)* На руках узнясуць цябе, і не торкнешся нагой аб камень, на аспіда і васіліска не наступіш, але пасароміш ільва і змія». *(Раптоўны ўспамін мяняе выраз яе твару.)* Дабраслаў! І я — у сарафане багатым... Толькі пашто згадваць колішняе, калі ў весі лекавай усе роўныя?

Кіруецца з паляны, набліжаючыся да княжых харомаў, але тут жа спыняецца перад запалоцкай вартаю, ачоленай соцкім Рымшаю.

Р ы м ш а. Не набліжайся! Усім, хто з боку чумнога, няма ў Запалоцце дарогі. Такі загад гаспадара нашага і князёўны Звеніславы.

Ж а б р а ч к а. Скажыце князю: няхай вынесе дзічыны для весі хворай. Іначай і дзіды вашы не памогуць. Падымуцца хворыя — самі возьмуць. Голад — сляпы і страху не ведае.

Р ы м ш а *(знікае за дзвярыма і тут жа з'яўляецца).* Сказана князем — два чаны дзічыны дамо! Толькі адступіся. З Міхалам бельчыцкім прышлем. Згадзіўся, дурань.

Ж а б р а ч к а. Абраннікаў часта неразумнымі лічаць.

Р ы м ш а. Сам у пекла лезе. *(Зноў з рогатам знікае за дзвярыма. Ужо не бачыць Барыслава, які насцярожана пазірае ўслед Жабрачцы.)*

З в е н і с л а в а *(падыходзячы да дзвярэй, цалуе князя).* Ах, які любы ты мне, Барыслаў.

Б а р ы с л а ў *(горача абдымаючы яе).* Ніколі такой і ў мяне не было.

З в е н і с л а в а. Якой?..

Б а р ы с л а ў. Такой, што ў суседстве з чумой яшчэ болей распаляе... *(Апускаецца са Звеніславаю на ганак.)*

З в е н і с л а в а. І я. Ах, Барыслаў, не выплыву. Утапілася.

Б а р ы с л а ў *(заплюшчыўшы вочы).* Прадсла... ва.

З в е н і с л а в а *(у роспачы*). Я заб'ю цябе, сястра! *(Да Барыслава.)* Няма яе. Няма Прадславы. Знікла. У Дзісне ўтапілася. Згарэла!

Б а р ы с л а ў *(амаль бясцямна).* Прадсла... ва. *(Павярнуўшыся да Звеніславы, якая нечакана закашлялася.)* Ідзі ад мяне, чумой заражаная. Прэч з Запалоцця!

З в е н і с л а в а. А казаў — у сэрцы тваім, як стрэмка — я!

### Дзея дваццаць другая

## ВЕСЯ ЛЕКАВАЯ

***(Вяшчун Вікула, яго сын Валодша, Прадслава, Звеніслава (яна ж — незнаёмая), Міхал, прымара чумы (старая), скамарохі, Кірык, блазен Лазар, хворыя — смерды, баярчукі, дзяцюк Галей; Дзесяцкі варты, скамарохі.)***

### Пушча

Тое ж, абгароджанае з усіх бакоў, лекавае стойбішча. Пасярэдзіне хворыя. Вешчуны Вікула і Валодша стаяць блізу хаўтурнай камы, адкуль б'е агонь. На твары старога адбіваецца агонь, з-пад хламіды з ваўчыных шкур бачацца простыя нагавіцы, ногі ў вялізных хадачках. Зблытаўшыся з валасамі, з плячэй вешчуна звісаюць, водзячы наўкруг галовамі, амаль белыя ад старасці гадзюкі. Смерды ў світках нядобра бліскаюць вачмі на баяр-

чукоў у жупанах. Трымаюць у руках трохзубыя драўляныя вілы. Паблізу стаіць ярка расквечаная скамарошая фура. Блазен Лазар рагоча і калоціць званочкам.

Міхал *(у манаскай хламідзе).* Загад першы. *(Разгортваючы пергамін.)*

«Кожнага, хто захварэў, не зважаючы — ці князь гэта, ці баярын, ці служывы, ці смерд просты, — дзеля ўратавання Полацку ад чорнай смерці і па павяленні галоўнага лекара баярына Вялішына належыць размясціць у лекавым стойбішчы. Ухіленне ад выканання загаду смерцю караецца...» *(Здзіўлена зірнуў на ашалелых ад рогату баярчукоў у расшытых золатам кафтанах.)* Загад другі. «І псоў дзікіх, і пацукоў, што на людскі харч нападаюць, пакідаючы люд полацкі на галодную смерць, — паўсюль вылоўліваць і па загаду суддзі полацкага жывата пазбаўляць праз павешанне».

Блізу чана з варывам стаіць жабрачка ў насунутай на твар хустаю. Побач — кмет варты з дзідаю. Да чана, штурхаючыся, падыходзяць, каб атрымаць па кавалку дзічыны, хворыя. Збоку ад усіх — аброслы барадою волат, у якім няпроста пазнаць жмудзінскага купца Кірыка.

Дзесяцкі варты *(падымаючы за хвост вялікага пацука).* І судом полацкім асуджаны таць за ўкрадзены харч — да павешання! *(Узяўшы пацука за хвост, імкнецца павесіць яго на вяроўцы, прымацаванай за галіну бліжэйшага дрэва.)* Хвост даўжэйшым будзе. Нешта не атрымліваецца. Лепей у агонь кіну.*(Зазірае ў каму. Адхітваецца.)* Глыбокая... *(Пацук нечакана выслізгвае з ягоных рук і, апынуўшыся на зямлі, уцякае.)* Нічога. Заўтра — за людзей возьмемся. З тымі лягчэй.

Жабрачка. Не яны. Чумны голад крадзе.

Дзесяцкі варты *(сурова).* Чума чумой. А парадак мусіць быці! *(Насцярожана сочыць за Лазарам, які спыняецца перад Жабрачкай, і тая дае блазну кавалак мяса.)* А гэтаму пашто дагаджаць? Розумам хворы нікому не патрэбны. Дай час. Вылавім — усіх пазабіваем!

Жабрачка *(па-ранейшаму не падымаючы галавы).* Хрыстос любіць усіх.

Лазар *(засмяяўшыся, зайграў трашчоткамі. З фуры тут жа вылецела некалькі скамарохаў — пачалі рэй, куляючыся і дыбаючы на высозных тонкіх хадулях).* Весяліся — жыць застанешся! За пачастунак дзякую! А вось яны... яны ўсе гатовы разарваць цябе, дабрадайку. *(Зашархацеў надзьмутымі бычынымі, з сухім гарохам унутры, шлункамі.)* Такія людзі!

Жабрачка. Палюбі галоднага — накорміш.

Лазар. Смерд толькі сілы баіцца.

Жабрачка. Палюбі хворага — ацаліш...

Лазар. Для іх дзясяцкі страшней за чуму.

Жабрачка *(нахіліўшыся).* Адна засталася...

Лазар. Адкуль малітвы, як вучоная, ведаеш? Ты хто?

Жабрачка. Не памятаю імені свайго.

Лазар *(рагоча, як блазен).* Давай пакахаемся! Я — самы гожы кот у Полацку!

З гурту смердаў *(да Жабрачкі).* Кажуць, свой Бог у цябе. Хрыстос.

Лазар *(зноў рагоча).* Знаеш, як дзевак даўбаю. Пакахаемся!..

З гурту смердаў *(да Жабрачкі).* Кажуць, моцны вельмі Бог... Калі праўда — адмалі!

Першы баярчук. Розныя тут, што ад чумы ўцякаюць.

Другі баярчук. Памаліся!

Лазар *(рагоча, як блазен).* З чумой улакаткі хочаш?

Жабрачка. І па веры — міласэрны Гасподзь да ўсіх.

Лазар *(рагоча).* Давай пакахаемся!

З гурту. Маліся... Полацкія! ...Смаляне мы! Навагародскія... З Кіева...

Жабрачка *(азірнуўшыся).* Госпадзі, пачуй надзеі на жыццё вечнае. *(Рэзка павярнулася: проста перад ёй стаяў раз'юшаны вяшчун.)*

Вікула. І сказана ў кнізе тваёй хрысціянскай*(ваяўніча ткнуў пальцам у Евангелле.)* «Ужо сякера ля кораня дрэў ляжыць: кожнае дрэва, якое не дае плоду, ссякаюць і кідаюць у агонь». А край гэты — няплодны. І агню будзе аддадзены. Ці войнам-пажарам, ці князямуладыкам, што люд увесь свой узненавідзяць.

Ж а б р а ч к а. Міласэрны Гасподзь наш.

Л а з а р *(цягнучы яе да скамамарохаў).* Пакахаемся! *(Не бачыць баярчукоў, што таксама пагрозліва набліжаюцца да Жабрачкі.)* Не? То станцуем!

Ж а б р а ч к а *(рэзка павярнуўшыся да Вікулы).* Нехта блудзіць плоццю, а ты — словам! Прэч — іменем Госпада, які стварыў гэтую зямлю і даў жыццё, і судзіць нас Ён адзін будзе. Але хворым цяпер патрэбна толькі малітва і ласка Духа Святога. Бо сказана: не збірайце сабе скарбаў на зямлі, дзе моль і іржа атрутная. *(Зноў не ўбачыла, як смерды ваяўніча падымаюць вілы.)*

В і к у л а *(нечакана здзекліва ткнуўшы ў яе бок пальцам).* Чаму ад веры дзедавай адцуралася? Ідзе суд на вас. Усіх паб'е! Адступнікаў, адваротнікаў. У світах, у чорных клабуках, у жупанах баярскіх.

Ж а б р а ч к а. Адзін толькі Гасподзь у нас! Шчыт наш і ахова. Хрыстос!

Гурт, наступаючы, нечакана зацягнуў жаласлівы і, адначасна, пагрозлівы спеў. «Ой, не гневайся, чуманька! Ой, не сварыся, чорна цётанька! Ой, не чапай жа ды нас ручкай касцявенькай, не цалуй жа ды нас цэпікам ласкавенькім. Даруем ды табе ахвяру-дзявіцу. Ой, дзявіцу-заранічку».

Л а з а р. Не чапайце. Нарачоная то мая.

В і к у л а. Ідзі лепей. Крыжыкі з гліны ляпі.

Л а з а р. ...Многа-многа. Каб усім хапіла.

Між людзьмі, што нядаўна прасілі ў жабрачкі малітвы, палыхала такая рашучасць, што Вікула пераможна выпрастаўся. Але перад ім адразу ж вырас Міхал. Падняўся, прыцягнуўшы да сябе ўвагу Дзесяцкага варты, і Кірык. Устрывожана, выбег з-за дрэў Валодша.

В і к у л а *(не зважаючы на пярэчанні Валодшы).* На калы кроў хрысціянскую.

Вострыя рагаціны блізіліся, і жабрачка падняла Евангелле. Вяшчун шпурнуў у яе грозных гадаў, пацэліўшы, аднак, у Кірыка. Вось толькі так блізка ступіў да краю вогнішча, так рэзка махнуў рукамі, што сам не ўтрымаўся і, спалохаўшы ўсіх крыкам, знік у яміне, над якой адразу ж шуганулі іскры. Вяся ўзарвалася агульным крыкам і раптам — вясёлы пераздвон: бялявіну запаўнялі скамарохі.

З г у р т у с к а м а р о х а ў. Памірай — весяліся!

**Сакральнае**

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Любоў сваю слухай, сястра.

Ж а б р а ч к а. Слухаю сэрцам цябе.

А н ё л с р э б р а к р ы л ы. Хай ніхто не асуджае вас за ежу, пітво, ці за якое-небудзь свята, і ў справе маладога месяца: гэта ёсць цень будучыні, а цела — у Хрысце.

**Тая ж лекавая паляна**

Каля агароджы цэлая гуртоўня дзяцей. Праз ранішнюю цішыню праляцеў царкоўны звон, і да дзяцей адразу ж скіравалася Жабрачка.

Ж а б р а ч к а *(падыходзячы да маладзёна, што ні на імгненне не выпускаў з рук палову вялікай кнігі).* Як завуць цябе?

Д з я ц ю к. Галей.

Ж а б р а ч к а. Чаму гэта нясеш, Галей? *(Паказала на кнігу.)*

Г а л е й. Бацька сказаў: «Ідзі ў Полацак, знайдзі князёўну. Чытаць навучышся». *(Засмяяўся.)* Потым узяў ды і прадаў нас з сястрою прышламу.

Л а з а р *(скрывіўшыся да Жабрачкі).* А мы ж ужо кахаліся! *(Непрыстойна рухаецца.)*

Ж а б р а ч к а. Сам адкуль, Галей?

Г а л е й. З Навагорада. Усіх малых прадалі прышламу. А той збег. Пайшлі ў Полацак. Кніжкам навучацца. Да князёўны гожай Прадславы. Толькі знайсці такую не можам.

Ж а б р а ч к а. І я не ведаю. *(Спынілася каля старой, што ляжала, ашчаперыўшы рукамі калені. Але ў апошняе імгненне нечакана падхапілася на ногі і ўсміхнулася страшным бяззуба-насмешлівым ашчэрам.)*

М і х а л. Вось яна... Чума! *(Адступіў, але Жабрачка ўжо кінулася насустрач страшнай прымары і абедзвюх адразу ж ахапіў густы туман...)*

Варта імгненна апынулася за агароджаю.

1-ы б а я р ч у к. Чаму мне паміраць?*(Закашляўся.)* Чаму не табе, жабрачка!?

Ж а б р а ч к а *(змеціўшы юніцу ў багата расшытам сарафане).* Раны твае хачу перавязаць. Усё ў руцэ Божай. Як завуць цябе?

Н е з н а ё м а я. (Звеніслава). З Полацка.

Назіраючы за жабрачкаю, падцягваліся іншыя. І раптам выхапіўшы з сумы мяшэчак з грыўнамі, маладзён кінуў машну жабрацы. Бухнуўся на калені. ...Зазвінела — адусюль ужо ляцелі, рассыпаючыся па зямлі, грошы, і жабрачка ў жаху затуліла вушы далонямі..

2-г і б а я р ч у к. Усё забірае няхай Бог твой. Плачу. Жыць хачу! Багаты я...

К і р ы к *(насцярожана косячыся на варту).* І ўсе паверылі запалоцкаму! А я ж — не забіваў. Не рабаваў! Толькі адпомсціў таму, хто Алму скраў! Асудзілі!

Ж а б р а ч к а *(падступаючыся да Кірыка).* Пашто хаваешся?

К і р ы к. Знаёмы позірк мне твой. Усё, чаму Даніла навучаў, хлусня. Міласэрнасць... Літасць. ...Падстаў шчаку другую. *(Скрывіўся.)* Хлусня! Хоць ты за мяне, чорная, памаліся! Скажу — так, як ты молішся, толькі адна Прадслава, князёўна полацкая, магла.

Ж а б р а ч к а. І кожнаму будзе дадзена па веры яго, дзіўны чалавек. Чула ўжо... Пра Данілу — чула ўжо недзе.

Л а з а р. Чаму не патанцуеш з Лазарам?

2-г і б а я р ч у к. Ідзі, дурнік! На зямлі крэслі... Гліну мясі!

Л а з а р *(крэслячы дубчыкам нешта на зямлі, падымае галаву*). Гэта крыжыкі. Усім хопіць! *(Рагоча.)*

Тая ж старая бліснула прагнымі вачмі аднекуль з прадоння, з чорнай полацкай раны.

С т а р а я *(падышла да Жабрачкі і нечакана спрытна схапіла тую за рукі сваімі).* Думаеш, калі самая маладая, ад чумы ўцячэш?

1-ы б а я р ч у к. Плацім!

Ж а б р а ч к а *(адышоўшы ад старой).* Прайдзіце праз голкавае вушка, баяры! *(Зазвінела золата, але варта, хаваючыся за агароджу, нават не варухнулася.)*

Ж а б р а ч к а *(азірнулася на варту).* Вады прывязі, дзесяцкі!

Д з е с я ц к і в а р т ы. Ты каму гэта загады аддаеш? *(Грозна павярнуўся да Жабрачкі, але адчуўшы агульны настрой асуджэння, адступіў.)* Прынясу.

2-г і б а я р ч у к. Плацім! *(Грыўны ўжо ляцелі ёй у твар, білі па руках, якімі імкнулася захінуцца.)* Плацім! Жыць!

Ж а б р а ч к а. О, Найміласэрны Божа: Войча, Сыне і Духу Святы, у непадзельнай Тройцы адзіны, годны хвалы й славы. *(Паднялася ў поўны рост, і вакол яе тут жа сышлася ўся гуртоўня.)* Не гневайся на дзяцей слабых. Глянь у гадзіну ліхую з ласкі Свае на слуг тваіх...

З г у р т у *(амаль у адзін голас).* Радаслава... Яраполка... Вячку...

Л а з а р *(з сумным рогатам*). Мне... Лазару! Толькі я слуга без грошай...

С т а р а я. А хто тут слугі?! Хто плаціць, той не слуга. І ўсе цуды — нашы!

Ж а б р а ч к а. Прайдзі праз голкавае вушка! *(Старая кінула ў яе збоку вялізным каменем. Пацэліла ў галаву. Хітнулася тая. Не адступіла.)* Маліцеся. І па веры ў Хрыста дадзена будзе кожнаму.

1-ы б а я р ч у к. Я слуга!.. Я — слуга твой! *(Апусціў галаву.)* Толькі імя хоць сваё назаві.

Л а з а р. А можа — Прадслава!? Дачка княжая.

2-г і б а я р ч у к *(здзіўлена.)* Чужы сарафан на сябе не ўсцягвай, чорная. Няма дачкі княжай Прадславы. У рацэ на дне засталася.

З в е н і с л а в а *(пагрозлівым шэптам).* Тая, што з князем мяне разводзіць? *(Выняўшы са складак вопраткі нож, пазірае на яго.)*

Ж а б р а ч к а. Госпада мы ўсе слугі. Маліцеся.

3-ц і б а я р ч у к *(укленчыўшы).* Вызвалі ад хваробы страшнай слугу Твайго... Міласэрны, слугу твайго Яраполка.

2-г і  б а я р ч у к. Вярні мне здароўе і сілы. Я болей за ўсіх заплаціў. Пашто кланяцца мушу!?

Л а з а р *(то смеючыся, то выціраючы слёзы).* Абдары здароўем люд свой, Госпадзі! Злітуйся, Маці Багародзіца... *(Змеціў, як Звеніслава хавае свой нож.)*

Старая вар'ятка шчэрылася са свайго пякельнага прадоння. І тут жа адступіла перад сліпучым бляскам анёльскіх крылаў.

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. Ізыдзі! *(Белы туман ахутвае і старую вар'ятку, і ўсю лекавую весю.)* Яшчэ высілак малы — і зможаце...

Ж а б р а ч к а. Да Кірылы пара. Малітву тварыць.

К і р ы к  і  М і х а л *(разам).* І мы з табой. *(Пазіраюць на Валодшу, які таксама не адстае.)*

Ж а б р а ч к а. Калі не разміне́мся па дарозе, дзіўныя людзі.

**Дзея дваццаць трэцяя**

## З ГІСТОРЫІ ГОЛЬМГАРДСКАГА СКАРБУ

***(Ігумен Кірыла (далей — Кірыла), Дзесяцкі гольмгардскай варты, Жабрачка, Тазіт, блазен Лазар, Кірык.)***

Наддзвінскі манастыр.

Т а з і т *(да ігумена).* Ах, якая доўгая дарога за плячмі.

К і р ы л а. То які клопат у госця?

Т а з і т *(пазіраючы толькі на ігумена).* І скажу: тыя землі, якія ўжо бачыў, такія непадобныя... *(быў з квадратным, добра паголеным падбародкам і кружком валасоў на вялізнай галаве.)* Такі адрозны гэты край ад мае радзімы, якую сонца абрала месцам свайго адпачынку.

Ж а б р а ч к а *(здзівіўшы ігумена).* Але калі з гэтага канца зямлі яно пачынае свой шлях, то, значыць, шлях ягоны мудра размеркаваны. У вас яно адпачывае, у нас, — уздыхнула, — найболей працуе. І ўсе мы яму роўна патрэбны.

К і р ы л а *(коса).* Нягожа даўгаваласай умешвацца ў размовы нашы.

Т а з і т. «Ettollerucem suam cotide et se quatum me…»

Ж а б р а ч к а *(зноў невыказна здзівіўшы ігумена).* Улада прыроды і свяціла яго — вось мерка моцы Боскае. А той... *(Ціха пераклаўшы пачутае, прадоўжыла.)* «Той, хто хоча ісці за Мной, няхай адлучыць сябе ад іншага, возьме свой крыж і кожны дзень ідзе…»

Т а з і т. Калі Пан мой дзве лепты ўдавы не адхіліў, то хіба не возьме ад нас золата пакаяння.

Ж а б р а ч к а. А хіба змерана вышыня нябесная зямным золатам? Хіба выпрабавана, госць дарагі, адно пажадамі людскімі глыбіня апраметнай?

Л а з а р. Давай! Давай пакахаемся.

Т а з і т. Хто ты? На жабрачку — непадобная.

І раптам — рэзкі ўдар у дзверы — і ўсе ад нечаканасці азірнуліся. У манастыр нечаканым віхрам уляцела Гольмгардская варта.

Д з е с я ц к і  в а р т ы *(прыставіўшы да горла ігумена вастрыё доўгага нажа).* Данеслі ў Гольмгард, што хаваў твой манастыр яшчэ дванаццаць летаў таму, таця, які скарбы Ёмелы скраў. Доўга віжы нашы шукалі. Пацеркі бурштынавыя — абярог наш!

Л а з а р. Нейкія зоркі ў вачах скачуць.

К і р ы л а. Жыватом клянуся. У іншым месцы шукайце абярог свой.

Д з е с я ц к і  в а р т ы. Не будзе чым клясціся табе хутка, ігумен ілжывы!

К і р ы л а. У нас чарняцы і юніца-жабрачка, служка манастырская. Блазен Лазар яшчэ. І госць...

Д з е с я ц к і  в а р т ы. Хлусіш! *(Паварочваецца да Тазіта і гучна рагоча.)* І ты тут!? То — вернік вялікі... А то — шукальнік скарбаў чужых.

Тазіт знікае. Але ўжо асоўваецца на зямлю ад кулака дзесяцкага ігумен Кірыла ўжо ляціць на пергаміны запалены смаляк і Жабрачка, кінуўшыся да стала, спрабуе, нават не затуляючыся ад агню, ратаваць пергаміны. Закрычаўшы, млее. Адно толькі Кірык з Міхалам, патушыўшы пажар, падымаюць ачуняўшую Жабрачку на ногі, падштурхоўваюць да выхаду.

Ж а б р а ч к а. Успомніла. Прадслава я. Дачка князева. Успомніла...

К і р ы л а *(падыходзячы да Жабрачкі, у пostраху адхітваецца).* Як жа агонь цябе пацалаваў! Айцец нябесны! Пашто так выпрабоўваеш дзяцей сваіх?

Л а з а р *(прытанцоўваючы).* Пацешылася... Белай скураю намілавалася. Гожая, кажуць, была. *(Дзіка рагоча.)* А ты — не бойся. Гасподзь, калі каго любіць, — плёткамі ды розгамі вогненнымі пабівае. Каб на зямлі ў пекле адпакутавалі. *(Рагоча зласліва.)* А потым у рай свой вядзе. А дзе ж скура гладкая? Усё хараство, красуня, ад яго. *(Рагоча, але тут жа баязліва азіраецца і шэпча.)* Ад гаспадара рагаценькага... Ад яго краса! Яго ты ў абіцель прывяла! *(Смяецца, як блюзнер.)* То як завуць абранніцу!?

Ж а б р а ч к а. Успомніла. Прадслава я. Дачка княжая.

Смяецца блазен. А ігумен Кірыла зірнуўшы ў аблічча юніцы, адхітваецца і падае ёй шаты з каптуром.

К і р ы л а. У манаскім пабудзь, гаротная. У люстэрка толькі не пазірай.

З г о л ь м г а р д с к а й в а р т ы. Ці не з-за ракі? Чума там! *(Імгненне, і ўсе ў жаху знікаюць.)* Аддай скарбы нашы, Склавінія!

К і р ы л а *(ледзь падымаючыся з каленяў).* Не маем чужога. Адзін у нас скарб. Тое, што Любоўю народжана. І абіцель...

З г л ы б і н і я в ы. У Гольмгард!

Л а з а р *(прытанцоўваючы).* Чуў — сам епіскап дачку Святаслававу шукае. Ці не цябе!?

П р а д с л а в а. Можа, і мяне. Не танцуй так. Кажы: «Войча наш...» *(Падыходзячы, кладзе руку на галаву блазна і той з крыкам падае на зямлю.)*

Л а з а р *(праз хвілю падымаючыся).* Так баліць.. Але ж яснее ў вачах.

*(Узяўшы Жабрачку за руку, вядзе за сабой.)* Сам епіскап. Пойдзем... Далёкая дарога... Сам епіскап...

### Дзея дваццаць чацвёртая

## ПОСТРЫГ

***(Ігуменя Рамана (далей — Рамана), Епіскап, Прадслава, баярчукі, Анёл срэбракрылы, князь Барыслаў, Валодша, Княгіня Сафія, Кірык, Міхал, Анёлы рэчытатыву, чарніцы, скамарохі, служывыя.)***

Царква перапоўнена. Каля Прадславы ў старой жабрачай вопратцы ігуменя Рамана і Епіскап. Тут жа і княгіня Сафія. На падворку, нягледзячы на лютаўскі мароз, гурма людзей. Стаіць нават скамарошая фура. Княжая варта абараняе дзверы ў царкву ад запалоцкай дружыны, ачоленай князем Барыславам. Паблізу капліцы таксама гурма народу. Усё залівае святло, у якім адчуваецца таямнічая радасць вышыні.

А н ё л ы р э ч ы т а т ы в у.

**«От Святаго Духа наплъняшеся мысль ея, и рече: «…поидоша вслед Христа, Жениха своего, предаша телеса своя на раны, и духовным мечем отсекоша от себе плотскыя сласти…»**

Ігуменя з княгіняю Сафіяй у багатай альпадзе ступаюць у капліцу. Насустрач ім спяшаецца Епіскап. Над дзвярыма гарыць лучына. Жабрачка, усё яшчэ з насунутым на твар каптуром, стаіць блізу ігуменні, ловячы на сабе зацікаўленыя позіркі. І раптам з усіх бакоў зашапацела так моцна, што жабрачка адхітнулася і ледзь стрымалася, каб не закрычаць.

Р а м а н а *(да княгіні Сафіі).* Праз усе месяцы гарачка юніцу паліла. Кажа — Прадслава яна. Толькі не глядзі на твар яе, княгіня. Нават мне не дазваляе. І нікому. Усё пад каптуром.

Е п і с к а п. Бачылі князя Святаслава з кіеўскім Мсціславам. Рабуюць зроднікі Менск. Рэкі крыві плывуць да Свіслачы.

Р а м а н а. Не пашкадуе юніцу князь Глеб.

К н я г і н я С а ф і я. Хоць і дзядзька родны... не пашкадуе.

Р а м а н а. Толькі сцены манастыра абароняць.

К н я г і н я  С а ф і я. Яраполкава раць на межах! Так патрэбна Полацку яе замужжа, ігуменне!

Р а м а н а. Як толькі возьмуць князёўну адсюль, рушаць дружыны...

К н я г і н я  С а ф і я. Святаслаў вернецца, а ў гневе страшны ён, ігуменне. Царква заўжды рупілася пра справы дзяржаўныя!

Р а м а н а. Што можа быць страшней гневу Госпада?

Е п і с к а п. Аб тым цяпер пытай у Таго, Чые рукі трымаюць нітку яе жыцця. *(Падышоў да юніцы зусім блізка.)* Ты гатова?

...Зазвінела ласкава-поклічнае «коур-лы» — і каплічны купал нечакана здрыгануўся, пайшоў хвалямі ў захмар'е. Падняла вочы на абраз Божай Маці. Кволае цела ў імгненне — расшчапілася, адкрытае ўсяму зямному і нябеснаму: угару шуганулі, ударылі ўверх тры агромністыя вогненныя слупы.

### *Першы ўсплеск (з-пад сэрца юніцы)*

З  г у р т у *(услед за епіскапам).* Святы Божа, Святы Моцны...

К н я г і н я  С а ф і я. Святы бессмяротны...

П р а д с л а в а. Ужо гатова сэрца маё, Ойча! *(Анёл, чые крылы паблісквалі блізка, чакаў. Ступіла да яго, і пёрыйкі ў крылах ціха зашамацелі.)*

Б а р ы с л а ў *(з падворку).* Забыла Карфагенскі сабор, ігуменне? Малалетка Прадслава! Нельга ў манашкі.

Р а м а н а. А для цябе, князь, — не малалетка!?

Выплескі іскраў шугалі з-пад самага сэрца: карагодам закружыліся зоркі: хлынулі з нябеснага каўша ў яе нутро. Сёстры задзьмухалі на далоні. Запальвалі і ставілі свечкі перад абразамі Збавіцеля і святога Панцеляймона. Епіскап не адрываў позірку ад схіленай паставы юніцы. Кіўнуў ігуменні і з гатоўнасцю адкрыў Евангелле.

### *Другі ўсплеск (з-пад анямелага горла)*

Е п і с к а п. І прымае пострыг сястра Еўфрасіння!*(Слыху крануўся пяшчотны водгалас звону.)*

П р а д с л а в а. Да Цябе прыцякаю ад жывата маці маёй. *(Ішла, ужо не прыпыняючыся, за Анёлам.)* Я спяшаюся, Ойча! *(Прыступкі нябеснай лесвіцы мігцелі ад горняга святла.)* Ты — Бог мой, што пажадаеш, тое і спраўдзіш са мной, рабой Тваёю.

Варта на падворку ледзь стрымлівала напор запалоцкіх кметаў.

Р а м а н а. Не пралівай крыві, Барыслаў! *(Бачыць: ідзе Прадслава па нябеснай лесвіцы. Прасцірае рукі ў серабрыстае ззянне паднеб'я.)*

...Не спыняецца і аснежаны туман пачынае ціха скочвацца па празрыстай лесвіцы.

Е п і с к а п. І прымае пострыг князёўна Полацкая.

Б а р ы с л а ў *(з падворку).* Нам Прадслава абяцана!

### *Трэці ўсплеск (з угнутай спіны)*

Бомы скамарохаў зліліся з ударамі грому, і ўсе здзіўлена паднялі позіркі, але на небе не было ні хмурынкі. А яна, адолеўшы нябесныя прыступкі, нарэшце спынілася, зразумеўшы, перад Чыім Прастолам апынулася. Тонкая Мацерына рука з крыжам кранулася балючых ранаў.

Б а р ы с л а ў *(з падворку).* Мая князёўна! *(Гахае ў дзверы бервяном.)*

З  г у р т у  м а н а ш а к. У імя Айца і Сына... І Святога Духа.

Е п і с к а п. І прымае прычасце сястра, названая Еўфрасінняю!

П р а д с л а в а. Як прабіць шчыт чорны, калі душы людскія не бялей?

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. Не адступайся — і пойдзеш.

П р а д с л а в а. Браты ненавідзяць братоў.

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. Не згінай духу — і знойдзеш.

П р а д с л а в а. Бацькі — проці бацькоў.

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. Не адхіляйся — і зможаш. *(Уладна.)* Ідзі ў Сяльцо і збудуй дом Уладара нашага. І зрабі прытулак для абранніц Яго! І будзь ім сэрцам і розумам. І ўціхамірвай люд свой, і не дай кроплям крыві ракою стаць. *(Змагае мелодыяй псалмы пагрозлівае сіпенне.)* І наступі на галаву злога раба, і працістой дзёрзкасці яго акаяннай!

Свечка міргае, высвеціўшы цёмныя вусны, што прымаюць прычасце. Палова твару — з пачварнаю чырвонай плямінаю апёку. Збялелая маці-княгіня, стоячы каля ігуменні, у роспачы апусціла голаў. Князь Барыслаў, што ўсё ж нарэшце трапіў у капліцу, міжволі адступае.

Г о л а с  г о р н і. Раны твае пякельныя гоім. Такую глыбокую ў сэрцы, такую торгаючую на горле, такую даўкую са спіны. Такую пякучую — на твары!

Ззянне ўжо адбірае вочы: праз хвалю святла пазначыўся цярновы, са скрываўленымі шыпулямі, вянец. Голас запоўніў капліцу.

**«І на рабоў Маіх і рабыняў у тыя дні выллю ад Духа Майго, і будуць прарочыць і ацаляць, упакорлівыя, як толькі прасцірацьмуць руку на гаенне і на тварэнне імем Духа Святога».**

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы *(бліснуўшы блізка згорнутымі крыламі, чакаў. Тады ступіла ў яго бок, і перыйкі ў серабрыстых крылах ціха зашалясцелі)*. І будзі ігуменняю ўсёй зямлі крыўскай. Навучай люд просты веры хрысціянскай. Суцішвай разлады! Не дай кроплям крыві ракой стацца...

П р а д с л а в а. Але як абіцель узводзіць? Як навучаць!?

Дзверы з грукатам адчыняюцца, і ў капліцу ўбягаюць устрывожаныя Міхал з Валодшам.

В а л о д ш а. Бяда!

М і х а л. Вясна Дзвіне берагі паразвязвала — паводка пачалася.

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. І будзь у краі крыўскім заступніцай, Еўфрасіння.

П р а д с л а в а. Якая ж заступніца, калі леты мае маладыя.

А н ё л  с р э б р а к р ы л ы. Малітваю розум свой узмацні. Гасподзь — шчыт перад усімі і слава, і падымае голаў. Любоўю сваёй адорыць цябе!

Е п і с к а п *(да прысутных)*. Пытаю пры ўсіх, баяры, чаму не думаеце пра душы людскія? *(Скрушна ўздыхнуў.)* Адкупляюцца смерды ад вірнікаў, зборшчыкаў подаці вашых, не толькі вавёрыцамі, але і… *(голас уладыкі ўжо звінеў)* ...наготамі сваімі!? Насцігаеце весі ізгояў і, яка псы д'яблавы, жоны і дзеці іх паімаша!

Б а р ы с л а ў. Дзікі край перад намі прасціраецца.

Е п і с к а п. Ці, можа, забылі, брацїе? *(Пасуровеў.)* ...кніжныя славесе падобны да рэкаў, якімі наталяецца ўвесь свет. Ці часта плывём па тых рэках да берагоў, дзе нас так чакаюць?! Аднак жа прысніўся нам у ноч з суботы на нядзелю Анёл... *(Не зважаючы на здзіўленыя позіркі, нечакана падышоў да той, што ўсё яшчэ не скінула з сябе простай вопраткі. Змеціла, ледзь прытомная, як усю яе ахінулі серабрыстыя крылы.)* Дух Святы, усюды прысутны, які ўсё накіроўвае, скарбніца радасці, дабра і ласкі, прыйдзі і жыві між нас, каб стаў дом наш Тваёй святыняю і шлях наш — Тваім шляхам.

Як праз мярэжу, бачыла, што, падняўшы руку, епіскап ужо ўскладвае свой крыж на яе галаву.

Е п і с к а п. Тое і перадаю ўсім, пачутае ад Анёла: каб была яна ў Сяльцы і збудавала манастыр! *(Па капліцы шуганула хваля агульнага недаўмення. Аднак праз хвілю замерлі нават самыя незадаволеныя.)* Памілуй нас, Госпадзі, адвярні і Ты, Літасцівая, аблічча Сваё ад грахоў нашых, адвядзі пошасці варожыя ад Полаччыны, і захавай край наш на вякі вечныя. Каб гоні былі плодныя, крыніцы гаючыя, рэкі чыстыя…

Б а р ы с л а ў. А што з тацямі яна хаўрусуе, — то як?

Е п і с к а п. Божа Усемагутны, блаславі Абранніцу і ахіні яе моцаю і ласкаю. Перадаем з жэзлам ігуменскім Еўфрасінні ва ўладанне вечнае метахію Святой Сафіі з царквою Святога Спаса ў Сяльцы. *(Нават не зважаў на незадаволеныя выкрыкі.)* І пасля смерці мае ніхто ды не судзіцеся за мой дар гэты! *(Адступілі баяры.)* Як бласлаўёная міра, хай узыдзе малітва Еўфрасінні да Госпада за ўсю зямлю крывіцкую. І няхай жыццё твае, агніца, прасія

прад анёламі і, як вянец на галаве царскай, няхай спачывае Дух Святы на табе, ігумення Еўфрасіння*.

І г у м е н н я *(усё яшчэ не зняўшы з твару каптур, нечакана рашуча ступае да епіскапа).* І першае слова маё да вас, баяры імянітыя. *(Недаўменны шэпт праляцеў праз капліцу.)* У Любові прэбывайце! Вызваліце ад ганенняў жмудзіна Кірыка з яго людзьмі, на чыю галаву паклёпы ліюцца. У імя Госпада, чые раны адкупілі грахі нашыя.

Е п і с к а п. Аб чым просіш, неразумная?! Сэрцу многа волі даеш! А табе, паклІканая на служэнне, слабіна стакроць не дазволена.

І г у м е н н я. Ці смерд, ці князь. Усе перад Госпадам роўныя. Да любові клічу, да міласэрнасці! *(Загулі баяры.)*

Е п і с к а п *(пазірае перад сабою перапоўненымі скрухай вачмі).* І прасі, як загадвай, Ігумення, але ўшчувай без страху і няверы, іначай раб чорны знойдзе нават маленькую шчыліну. *(Уздыхнуў.)* Не ўсю праўду казаць сабе дазваляй! Каб не абылгалі. *(Сумна звёў бровы.)* Вялікі князь кіеўскі Уладзімір Манамах памірае! *(Падвысіў тоны голасу.)* Яшчэ колькі часу — і адмовіцца Барыс ад стальца на карысць Давыда, чацвёртага з Усяславічаў. *(Са стогнам выпрастаў плечы.)* Толькі вялікая смута ідзе супроць Давыда. Моцна Барыса ўсе шануюць. Цяпер за сына ягонага Рагвалода могуць голас падаць. Чакаць трэба, ігумення, разлому крывавага паміж зроднікамі: дзядзькам і братам тваім стрыечным. Аднак скажу: воля Божая — вышэй княжай! Слухай, чаго народ хоча.

І г у м е н н я. Калі так, паўтару: не ганіце Кірыка невінаватага, акі таця.

Е п і с к а п. Калі за якога чалавека просіш, ігумення маладая, то за грахі ягоныя заступаешся.

І г у м е н н я. І за ўсіх заступаюся. І — за кожнага.

Е п і с к а п. На кожным, як горб, і зламыснасць, і хцівасць. Бог няхай благаславіць цябе, і падасць табе цярпенне і сілы на ўсіх ворагаў відочных і невідочных... Падымі позірк, князёўна. Будзі ігуменняй. Скідвай рызманы.

І г у м е н н я. Буду жабрачкаю ад гэтага дня. І міластыню прасіць у кожнага з вас. Прасіць Любові... Веры... Малітвы... І — аддаваць. Веру і Малітву. *(Знікае аслона з твару. Зноў гожага — з вялікімі цёмнымі вачыма.)*

П у л ь с а р п а з а с ц э н а в ы. «Рада иду, яко Бог повелит ми, тако и будет; воля Господня да будет о мне...»

Б а р ы с л а ў. Ведзьма зіркатая!

З г у р т о ў н і п р а в а г а б о к у. Красуня!

З г у р т о ў н і л е в а г а б о к у. Што сталася з князёўнаю нашай !? Не тая...

Б а р ы с л а ў. Якая ж ты!? Жабрачка чорная, ці зноў — гожая! Вар'яцею...

Л а з а р. Блажэнная.

З г у р т у б а я р ч у к о ў. Лекарка.

З г у р т у с м е р д а ў. Абпякунка...

І г у м е н н я *(ступае наперад).* Толькі не кладзіце камень у руку маю...

П у л ь с а р п а з а с ц э н а в ы. І стала Еўфрасіння з Полацка першай ігуменняй вялікай. І з цаглін малітваў сваіх узнесла манастыр і царкву Спаса Святога ў Полацку. І пусціла ў свет белыя галубы думак сваіх пра навуку і веру, пра міралюбнасць і любоў... Амінь.

***Працяг будзе.***

---

* Далей у тэксце — Ігумення.

*Студэнцкі праспект*

# «ПАДАРЫ ЧАСЦІНКУ ДАБРЫНІ...»

***На гэтым часопісным бальшаку, што імкне ў новы 2007 год, мяркуем, сустрэнецца моладзь з розных куточкаў Беларусі. Усе тыя, у чыіх біяграфічных абсягах яшчэ так мала пражытых гадоў, але так многа сардэчных парыванняў, сонечных лятункаў і фантастычных мрояў, што абавязкова збудуцца!***

***Адна з такіх запаветных надзей — надрукавацца ў часопісе «Маладосць» у коле сяброў і аднадумцаў — ужо здзяйсняецца. Спадзяёмся, што якраз сустрэўшыся ў нашай паэтычнай рубрыцы, маладыя літаратары змогуць абмяняцца думкамі і пачуццямі, паразважаць пра самае важнае ў дні ўчарашнім і сённяшнім, паспрачацца пра Будучае і, вядома, — пра таямніцы Творчасці. Адным словам, у добры шлях, «Студэнцкі праспект»!***

**Ад рэдакцыі**

**Ірына ЧАРНЯЎСКАЯ,**
*студэнтка факультэта беларускай філалогіі і культуры Мінскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка*

## ЗВАРОТ

Сонца, адагрэй людскія сэрцы,
У цяпло, бы ў коўдру, загарні.
У наш час нялёгка ім сагрэцца,
Не хапае сэрцам цеплыні.

Захіні ад жорсткасці і болю,
І ад крыўды — чуеш? — захіні.
Адагрэй пяшчотай і любоўю,
Не хапае сэрцам цеплыні.

Усміхніся шчыра і прыветна,
Падары часцінку дабрыні.
Ім хапае бур, хапае ветру,
Не хапае толькі цеплыні.

Сонца, пашкадуй людскія сэрцы!
У цяпло, бы ў коўдру, загарні,
Каб змаглі, нарэшце, адагрэцца,
Каб хапіла сэрцам цеплыні!

## КНЯЗЁЎНА

Хочаш, буду тваёй князёўнай
Ці Канстанцыяй, ці Паўлінкай,
Ці Джульетаю — усё роўна!
Буду частачкай, палавінкай.

Хочаш, буду тваёй Рагнедай
Без падману і без прымусу,
На прасторах зямлі і неба
Саладзейшай за ўсе спакусы.

Калі ж стану тваёй князёўнай,
Ці чаканай табой Мальвінай,
Ці мне будзе ужо ўсё роўна,
Што раней я была Ірынай.

**Марыя ЦІТАРЧУК,**
*студэнтка філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы*

## БЭЗАВЫЯ ДРЭВЫ

Вясновы воблік — бэзавыя дрэвы,
Як напамін пра тых, каму не быць,
А мы жывём — з патрэбай, без патрэбы, —
Каб адцвісці, стаміцца і не жыць,

Каб немаўляці даць жыццё ў пакутах,
Каб закахацца ў васемнаццаць год.
Каб страціць шлях у прыказках і путах,
Каб распачаць сумненняў карагод.

Дзявоцтва вобраз — бэзавыя дрэвы
Зламаў віхор нахрапісты жыцця.
Усе жывём заўсёднаю патрэбай
Адпрэчыць золь ва ўлонне забыцця.

## ВЯЧЭРНІ ПРЫВІД

Над бяскрайнім гродзенскім абшарам
Ўспыхнуць зоркі хутка, як знічы.
Адплылі у небе сінім хмары,
Я маўчу, і ты, прашу, маўчы.
Дакранешся вусцішна далонню
Да маіх зняволеных плячэй...
Дакрануся да тваіх гарачых скроняў,
Сэрцы адзавуцца нам грамчэй;
Палыновы водар горка-смачны,
Водар вуснаў — хмельна-трапяткіх...
І расою травы шчодра плачуць,
Зоркі ззяюць сёння — на дваіх.
Гэты вечар ціха і трывожна
Нас абдыме, правядзе дамоў.
Толькі вось не ведаю, ці можна
Калі-небудзь нам сустрэцца зноў.

* * *

*Няма дарогі назад,*
*бо спалены масты...*
Ад аўтара

Мой шлях — адзіны і трывожны,
На сцежцы зараслі сляды...
І абярэ яго не кожны —
Да узвышэння з нематы.
Маўчаць — вар'яцкая прымуса
Пра велічнасць пражытых слоў...
Якая дзіўная спакуса —
Свабода, Роўнасць і Любоў!
Мой шлях — праз Нёмна згукі-хвалі
Ў святле палацаў і храмін...
Праз гул сярэднявечных баляў,
Праз дым адвечных дамавін.
Мой шлях — праз паркі адзіноты
Да адраджэння з небыцця,
Да першабытных пушчаў цноты,
Да праўды першаадкрыцця.
Мой шлях — край лірнікаў і цемры,
Мой шлях — і з долаў, і з нябёс...
Мой шлях — радкамі на паперы
Ў далёкі і нязнаны лёс.

**Сяргей МАКАРЭВІЧ,**
*студэнт факультэта*
*журналістыкі БДУ*

## З НАРОДНАГА

Плача дзяўчына ў хаце,
слёз не можа стрымаць.
— Чуеш, сяброўка Настасся,
замуж — хочуць аддаць.
Хочуць аддаць без любові.
Проста каб разам жылі...
Гамоняць кабеты ў полі.
Заручыны ўжо былі.
— Што ж тады так самоцішся?
Гэта зусім не бяда.
Навошта гэтак маркоцішся?
Злюбіш, стрываеш, як я.
Што табе з той любові?
Людская мана, як рака.
— Дык шчасця ж не будзе ніколі...
калі не любіць мужыка.
Смех... А з блакітных вочак
Слёзы ў дол пацяклі.
Смех... А ў калысцы — сыночак,
народжаны без любві...

## ДЗЯДЫ

*Памяці дзядулі Часлава*

Восеньскі дзень. Адчыняю ўсе дзверы.
На стол засцілаю абрус белы.
Выношу ўсе стравы, якія любіў некалі дзед.
Выходжу на двор. У руках — свечкі.
Апрануўшыся цёпла, іду на «сустрэчу».

Падыходжу да могілак і бачу здалёк
Яго фотаздымак...
Бы хто знарок
Мне ўказвае на тое месца,
Якое горка наведваць з маленства.

Набліжаюся — а вакол цішыня.
Маўчаць магілы — нямая зямля.

А ён ўсё глядзіць з фотакарткі, жывы,
Нібы кажа:
— Ну што, унук? Ты хоць жыві!
І нейкая сіла штурхае наўцёк.
Але застаюся. Сядаю. Маўчу...

Вечар. Пачынае цямнець.
Адыходжу паціху дадому.
А душы ўсё жыццё — балець...
І ўспамінаць дзядоў
мне, жывому.

* * *

Паэтаў шмат у наш час,
Шмат таксама празаікаў.
І драматургаў запал не згас.
Адно не стае — класікаў...

**Віктар ЫВАНОЎ,**
*студэнт*
*філалагічнага факультэта БДУ*

* * *

Будзь маёю музай! У адліжным
Сэрцы — гулка, пульс як аўтамат,
Бо, даруй, так прагну дзівавіжна
Скінуць паэтычны маскарад.
Электрычны пыл, сухі як порах,
У маім пакоі, у акне —
Чорная халодная прастора.
Воленька, не пакідай мяне!

Я цябе кахаю, Воля...
Воля...
Ты ж не скажаш развітальна «не».
Я пішу табе салодкай соллю
І прашу: не пакідай мяне...

* * *

Ранняя вясна — я праветрыў вочы.
Сонейка прыйшло, як глыток паветра,
Чацвяргі і пятніцы напаіла
Пахам чарэшні...

Сонейка былое — па-за шчылінай
Паміж аканіцаў маіх павекаў.
Ведаеш, глядзець на сваю былую музу
Так балюча...

**Таццяна НІЛАВА,**
*студэнтка*
*філалагічнага факультэта БДУ*

* * *

Асадкай
высаджу сэрца
і буду пісаць на паперы,
а ты не дасі мне веры.

Асадкай
выведу слова
і буду шаптаць прызнанні,
ды быццам бы не ў каханні.

Асадкай
...скончыўся стрыжань,
а я — як на здзек! — не паспела
свой вытрываць подпіс самлелы.

* * *

У чэпкіх абдымках думаеш:
навошта тут сабекошт;
навошта тут цэлы свет
падзяляецца на панацэю
пэцкацца ў салодкім,
коўзацца па салёным лёдзе
і карыстацца
    электроннай поштай?

Пастаўлю ў пашпарце штамп.
Адкрыю шэнгенскую візу.
Уначы буду слухаць Шапэна.
І буду самай шчаслівай,
у чэпкіх абдымках...

* * *

Ля акна адлягло: пайду.
Бальшаком пачынаўся вечар.
І ніхто мяне не гукнуў,
І было, як ніколі, дарэчы.

Я пайшла: на дарозе — лёд,
Ледаколы, на жаль, далёка.
І, здаецца, мінулы год —
Гэтаксама і з гэтака боку...

У акне згасае святло.
Ўсё засне праз якую хвіліну.
Я шчаслівая тым, што было.
Я цяпер цябе не пакіну.

**ALTE**

Альт запаволіўся
    ў рухах сваіх.
У маладога паэта —
    старая памяць,
    быццам бы цэдзіць
    Традыцыю...
Голас заальтавана
    стогне...
...на ўзроўні паліфаніі
з палёгкай пра вечнае —
    Alte

**Сняжана МЯЖЭННАЯ,**
*студэнтка*
*факультэта міліцыі Акадэміі МУС*

* * *

Ты пакліч мяне, я пайду
За табою ў прасцяг далёкі.
Будзе цяжка — крылы знайду,
Але побач з табою толькі.
Ты паслухай, што вецер пяе,
Паглядзі, што зоркі малююць —
Гэта мары, любы, мае,
Гэта я без цябе сумую.
Сны твае, можа, нас не прысняць,
Можа быць, ты мяне не ўбачыш.
Толькі вер — не стамлюся кахаць.
Буду жыць з надзеяй на шчасце.

**Іна КАЛЯДА,**
*студэнтка факультэта*
*народнай культуры*
*Мінскага дзяржаўнага педагагічнага*
*універсітэта імя Максіма Танка*

* * *

Я Вам не саступаю месца,
чытаю кнігі на шпалерах.
Я Вам не саступаю месца,
пішу нататкі на падлозе.
І перакуляцца нарэшце
нябёсы з марна-шэрым Вамі,
Вы апынецеся тут, побач,
я Вам не саступаю месца.
Пішу лісты на століі Вам:
я Вас убачу там, здалёк,
я Вас не заўважаю блізка.
Я Вам не саступаю месца:
Вы не пачуеце мяне.

* * *

Руку растварыла ў небе,
рука мая — быццам крыло.
Пабегла кудысьці — неяк,
знайшла чамусьці — каго.
І згублена, быццам птушка
Ў накрэсленай сіньцы дзён.
Не паляцела — падслухала,
схаваная за крылом.
Біла, як рыба, ў сценку:
цэмент — не хвалюйся, пройдзе.
Калісьці знойдзецца нешта
ў парваным халаце сосен.
І пахне Калядамі елка,
усміхаецца па-дзіцячы.
Намаляваная фальшу,
забегне ў мароз на дачы.
Не знойдзе — наткнецца выпадкам,
не зразумее — пройдзе...

**Алена КАМІСАРАВА,**
*студэнтка завочнага факультэта*
*Магілёўскага дзяржаўнага*
*універсітэта харчавання*

**ЗДАБЫТАК**

Ці аніўто, ці усё адразу,
Няма чаго — адны абразы,
І толькі позірк палымяны,
Заганы ўпотай прыхаваны.
Вось так і кроч, так і гары,
Цягні свой крыжык да гары.

І будзе дзень тваім здабыткам,
І будзе ноч бясконцым днём.

На жаль, стаў час занадта шыбкім —
Ён не паспее за жыццём.

Ды не здарма ў жыцці ёсць смерць;
І як жа нам тады ўзмацнець,
Калі баімся быць жывымі,
Быць існымі перад усімі
І шчыра на сябе глядзець,
Усё стрымаць і — пасталець!

Каб поўдзень стаў для нас здабыткам
І стала б ноч бясконцым днём,
Мы паміраем надта шыбка
У вечнай гонцы за жыццём.

**БАСАНОЖ**

Праз рэшткі сённяшніх надзей
Паўстануць новыя намеры.
Як перайсці натоўп людзей?
Што расказаць ім аб даверы?

Усё імкнуся да нябёсаў,
Хоць трэба на зямлі стаяць.
У свеце столькі розных лёсаў —
Адзін з іх буду я трываць.

І вось па снезе, як — па гальцы
Зноў басанож — да Сонца — ўгон!
Іду ў бясконцасць! Ныюць пальцы...
Спяшаюся ў свой зорны сон.





*Георгій Марчук нарадзіўся ў 1947 г. у Давыд-Гарадку. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут і Вышэйшыя сцэнарна-рэжысёрскія курсы ў Маскве. Працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм», у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Аўтар шматлікіх кніг прозы, драматычных твораў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.*

Георгій МАРЧУК

# ДАВЫД-ГАРАДОЦКІЯ КАНОНЫ

*Канон (ад грэчаскага «норма») —*
*адна з форм песнапення,*
*што з'яўляецца дыялогам*
*паміж чытальнікам і хорам*

Давыд-Гарадок —
мястэчка ў глыбіні
Палесся, радзіма аўтара

## КАНОН БОГУ

*У ягонюю прысутнасць* вераць і старыя, і малыя. Без Божага блаславення і крыжа не выбіраюцца ў далёкую дарогу, не пачынаюць ніякую справу, не сядаюць да стала. Гэтая еднасць Бога, людзей, хат, вуліц адчуваецца штодня, перадаючыся ад аднаго да другога.

— Уратуй, Госпадзі.

— Бог у помач.

— Дай Божа, каб Гасподзь захаваў.

— Дапамажы Божа.

У святочныя дні людзі дабрэюць. І не толькі таму, што баяцца рабіць у святы, бо гэта ганьба, грэх. У такія дні прысутнасць Бога поўная… усе як бы трымаюць у такія святочныя дні адказ перад Ім за паводзіны ў хаце і на людзях, за дробныя грахі. Мякчэюць сэрцам і сваю крыўду, а часам і злосць за свае часовыя няўдачы не паказваюць.

— Ты до царквы, Оля? То пачакай, пойдзем разам.

Звыклыя да цяжкасцей на сваіх плячах, звыклыя не прасіць і не плакаццa, самастойна змагацца з нялёгкай доляй, людзі ў такія дні хочуць адчуць плячо суседа, сябра, аднакласніка. Хочуць быць бліжэй да Бога. Не давядзецца пачуць, каб клялі Бога. Крыўдаваць… о, гэта можна.

— А дзе той Бог? Усё няроўна дзеліць. Добры, чэсны памірае, а паразіт жыве.

Нават калі хто з самых надта ж занятых заробкам грошай забудзецца перахрысціцца, дык велічны, няхай і па-местачковаму сціплы, бомаў звон падштурхне яго да гэтага.

— Даруй, Госпадзі. Свято ж сёння.

Жанкі сварацца:

— Няма на цябе Бога.

Дзяцей вучаць перад кантрольнай, экзаменам:

— Не забудзь папрасіць у Бога: «Дай, Божа, каб добрэ було. Памажы».

Застаючыся адны ў хатах па вясне, калі маладзейшыя едуць гандляваць насеннем кветак у свет, старыя бабулі і дзяды ўмеюць раіцца толькі з Богам і вядуць бяседы, замкнуўшы дзверы на тры зашчапкі і два замкі.

У адзін час усе гарадчукі ўзнімаюць вочы на неба, калі праплывае чорная навальнічная хмара:

— О, сіла нябесная ідзе! Спасі Госпадзі, уратуй нас.

Ад дзіцячага, яшчэ наіўнага жаху перад Усявышнім — «слухайся, а то Боженька пакарае» з гадамі ўсе пераходзяць да пакоры і нават набожнасці. Калі памірае чалавек, кажуць: «Бог прыбраў. Так трэба Богу. Дзякуй Богу, пажыў сваё». Мужчыны не любяць ставіць свечкі ў царкве хоць за здароўе, хоць за памін душы. Калі маці палохае Богам дзіця, яно яшчэ не зусім верыць, калі ж яе падтрымае і бацька — то ўжо запомніць на ўсё жыццё чатыры-пяць з сямі грахоў. Да жыцця, аднак, не адносяцца, як да Божага дару, не ўмеюць сябе шкадаваць. Толькі ў старасці больш згадваюць пра пекла, а так яго і не ўспамінаюць, дазваляючы сабе дробныя грашкі, але раніцою, калі адзін, каб не ўслых, каюцца, б'юць кулаком у грудзі:

— Богам клянуся, больш не буду. Усэ. Капцы.

У свае апошнія дні і гадзіны на зямлі просяць:

— Божа, не пакінь дзяцей і ўнукаў адных без сваёй ласкі і апекі, не пакінь.

А тых, хто не верыць у Бога, а замяняе веру ва Усемагутнага верай у сілы прыроды, шкадуюць — не прынята спрачацца пра існасць Бога. Самы прыемны і ўзнёслы камплімент: «Вочкі, як на іконе. Тварык, як у анёла. Анёльскае дзіцятко». Анёл успрымаецца як пяшчота, чысціня, бязгрэшнасць, як памочнік Бога. Нацельны крыжык і іконка — самыя дарагія святыні, якія ахоўваюць і цела, і душу. Тут не знойдзеш хаты, у якой не было б на покуці іконы. Усе дзеці прыгожыя, але яны найпрыгажэйшыя з кветкамі ў руках на царкоўным цвінтары. Невымоўная лучнасць Боская напаўняе духоўнай энергіяй і веліччу. У хрысціянскія святы ля царквы больш абазнаныя мужчыны на свой лад пераказваюць старонкі Евангелля. Бог давыдгарадчукам не надае сілы, але яны цвёрда вераць, што з ім жыць лягчэй і надзейней. Асабліва бачаць Боскую руку ў квецені садоў, якімі так багаты гарадок. Дзіўна, але прыказак, прымавак, якія б тычыліся чорта, не пачуеш. Не любяць тут жартаваць з нячыстым і яго атачэннем. Прытрымліваюцца правіла: лепш быць далёкім, але ўсё ж сваяком Бога, чым найбліжэйшым суседам чорта. Прычым з гэтым няпісаным правілам згодны і спагадлівыя, і неміласэрныя. Усюдыіснае тэлебачанне — нават і яно не пахіснула тысячагадовай хрысціянскай свядомасці, не разбурыла рытуалаў жыцця, не зацьміла галовы, штодня нараджаючы новых «куміраў». Не ўсе адпавядаюць Боскаму пачатку, але ўсе ведаюць аб ім, шануюць лад жыцця і перадаюць ад пакалення пакаленню. Хітра прымружыўшы натруджанае вока, гарадчук пра замагільнае жыццё скажа:

— Нешчо там усё ж е. Мо недзе далёка. Не можа быць, коб Бог ды не прыдумаў шчо.

Не вераць навукоўцам, якія кажуць, што праз пяць мільярдаў гадоў Зямлю спаліць Сонца.

— Таж усё ўстроіў Гасподзь ды знішчыць? Не.

Самае жахлівае і непрыемнае праклянцце: «Коб цябе Бог пакараў» і самае прыемнае пажаданне: «Коб цябе Бог любіў».

Бог успрымаецца не як байка, а як добры чалавек, які пастаянна сочыць за кожным. Сляза цячэ з радасцю, калі немаўлятка апускаюць у чан са святой вадою, як хрысцяць. Гэта мо адзіны выпадак, калі плач дзіцяці ўспрымаецца спакойна і лагодна. Таямніца народзін і смерці… Ніхто нічога не ведае, не помніць. Адзін знойдзецца, які скажа, што помніць і папа, і крыж, і свечкі, калі яго ў тры месяцы хрысцілі. Яму не вераць, але паважаюць за словы «Бог мяне сюды прывёў, тут жыць і буду. Нікуды не з'еду. Людзі некаторыя паехалі і хутка паўміралі». Знаходзячыся чацвёртую частку свайго жыцця ў дарозе, у чужых краях, гарадчукі вельмі ж адданыя свайму мястэчку. Здараецца, і часта, што едуць за тысячу кіламетраў, каб адсвяткаваць з усімі Вялікдзень.

Няма такога чалавека на зямлі, якому Бог яшчэ не дапамог. З тым у душы і жывуць.

## КАНОН ГАРЫНІ

Рака не чалавек, яна злой не бывае. Шуміць, бяжыць вада Гарыні, і куды яна нясе нашыя гады? Так, відаць, думае рыбак, які сядзіць у носе лодкі з вудаю ў руках і кідае суровы пагляд на гурбу падлеткаў, якія, як жарабяты, выкідваючы ўперад ногі, з галёканнем скачуць у ваду. А можа, гэта нам хочацца, каб ён думаў пра хуткаплыннасць жыцця, а ён разважае пра звычайнае, простае і больш нервуецца, што непаслухмяныя хлопцы распужаюць усю

рыбу. А вас не цікавіла, аб чым думае рыбак, седзячы на беразе ракі? Не хочацца верыць, што толькі пра рыбу. Вада, як і агонь, сваёй зменлівасцю падштурхоўвае да разваг. Дрэва статычнае. Атрымаў асалоду ад прыгажосці, ідзеш далей, ад вады ж вачэй не адарваць. Ракой не грэбуюць і не абагаўляюць, як дзе-небудзь, проста ставяцца да яе паважна, як да старэйшай сястры. Яе някідкую прыгажосць ацэньваюць у сталым узросце, добра паванд-раваўшы па свеце, і пабачыўшы шмат. Спачуваюць гаспадару дома, які стаіць над ракой.

— От, неспакой. Жыві і заўсёды думай, коб вада не знесла. Знай, мерай бераг: ці з’ела яго вада?

У векавой барацьбе вады і сушы найчасцей перамагае вада. Але аб гэтым не думаеш, здаецца, усё нязменна… нізенькі беражок, якому дапамагае ярка-зялёная трава ўтрымліваць плынь ракі які дзесятак гадоў. А бяссільны пясок у адну ноч змывае: глядзіш, о дзіва, пасярод ракі вырасла сакавіта-жоўтая пясчаная каса. Рыбак сям’ю не пракорміць, от, забаўкі дзеля, аднак гарадчукі здзекаў з рыбакоў не дазваляюць сабе. Няма такой сям’і, у якой не любілі б ці не ўмелі варыць юшку. Яна, рака, першай і выхоўвае, загартоўвае характар чалавека, дорачы не толькі штодня сотню-другую верхаводак, але і ўмацоўваючы слабыя ад недаядання мяса мышцы — летам у купанні, а зімою на каньках. Не кожны з падлеткаў ды з дарослых дасць нырца з парэнчаў высокага моста ў ваду. Рака мае свой нораў, паказухі, дурноты не даруе. Тапельцаў, здараецца, знаходзяць за тры—пяць кіламетраў ад месца трагедыі.

— Не ходзі, дзіцятко, адзін на бераг, коб не ўпасці.

І ўсё ж яна добрая. На Макавея, у дзень свята кветак, жанчыны кідаюць з моста адну-дзве кветкі з букеціка, які толькі што асвяцілі ў царкве. Плывуць гладыёлусы, бархоткі, бяссмертнікі, астры. Ціха прымае дары рака. Далёка плывуць кветкі, не тонуць… нібыта Млечны Шлях на шырокай сінявата-зеленаватай роўнядзі. Вербы, лозы, таполі, гледзячыся ў ваду, робяць яе зялёнай. Жанчыны з незвычайнымі, прасветленымі тварамі доўга з налё-там суму глядзяць, як знікаюць удалечыні кветкі… сплываюць мары і надзеі, няспраўджа-нае шчасце… Ніхто з людзей не помніць, не засталося сведак, а рака памятае, як з яе лёду на Хрышчэнне выпілоўвалі вялікія крыжы, у якія ўстаўлялі свечкі. Таямнічы месяц у небе не так прыцягваў да сябе позіркі, як гэтыя крыжы, што свяціліся на лёдзе.

Памёр дзевяностагадовы майстар, які адзін умеў рабіць давыд-гарадоцкія дубы-лодкі. Ніхто яго смерці не заўважыў, як звычайна не заўважаюць яе ў вельмі старых людзей. Рака заўважыла. Яна без лодкі, як гарод без кветак. Такое адчуванне, што маторныя лодкі яе раз-дражняюць, а вясло яна сама лашчыць. Бяжыць вада, цячэ рака, куды яна нясе мары? Так соладка ляжаць на цёплым пяску і спадзявацца, што наперадзе толькі добрае. І гэта сапраў-ды так. Проста на рацэ гэтая благадаць жыцця больш адчувальная. Чарпануў прыгаршчамі рыбак ваду, амыў ёю твар. Спякотна. Толькі ў гарадку і ўмеюць вудзіць рыбу жанкі.

— Олена поставіла на газ бульбу, побегла да ракі, навудзіла рыбы, вярнулася, дык яшчэ і бульба ў гаршку не зварылася. О, спрытная! — не вераць аж, апавядаюць адзін аднаму пра такі «фінт» гарадчукі.

Вада цёплая. Рыбак акунае ўсю кепку ў ваду і надзявае яе, мокрую, на галаву, папя-рэдне выкруціўшы, каб не цякло на патыліцу. Смехата. Ваду з ракі для піцця і на чай не бяруць: багата ілу, калісь, калі ўсюды і ўсё было больш чыстым, бралі. У туманныя дні з моста моладзь з заміраннем сэрца кідае ў ваду камяні. Усе чакаюць з таямнічай усмешкай, калі камень булькне. Хто не пачуе гук свайго каменя, жаданні ў гэтым годзе не будуць здзяйсняцца. Усіх, чые хаты стаяць на набярэжнай, клічуць рыбакамі. Не крыўдуюць. Дзяцей адных іграць у лодкі не пускаюць, крый Божа. Тыя любяць спусціць босыя ногі ў ваду і боўтаць. Сварацца на дзяцей за самавольства і б’юць трохі нават папругай. Увечары закаханыя блізка да вады не падыходзяць… ідуць на Царкоўную гару, адтуль відаць, як у вадзе адлюстроўваюцца зоркі. Так ціхая гаспадыня гарадка і жыве: як сімвал вечнага жыцця, як памочніца, як таямніца, як райская асалода, як доктар, які лечыць бясплатна, здымае нервовы стрэс, і як гонар: «А ў вас такой прыгожай ракі няма, як у нас». Ніхто на яе не крыўдуе, што яна перажыла дзевяцьсот пяцьдзесят тысяч жыццяў гарадчукоў ад дня існавання і невядома колькі яшчэ гэтых тысяч перажыве.

Садзіцца за таполямі сонца. Вялікае чырвонае сіта. І заўтра будзе светлы, цёплы дзень. Дай, Божа, яго ўсім сустрэць. Рыбак не ідзе дахаты, хоць ты заманьвай яго, не заманьвай.

Не дае спакою думка, які год не дае: аб чым можа думаць прыгорблены ўжо трохі, трохі ссівелы, але яшчэ ў сіле рыбак, які лянiва месіць пальцамі левай рукі мякіш белага хлеба.

Бяжыць рака, шуміць вада, нешта пяе па-свайму, не прасі яе, не пачакае, забярэ і знясе і твае гады. Гарынь мая, Гарынь.

## КАНОН ХАЦЕ

Гарадчук нараджаецца з мараю разбагацець, пабудаваць новую хату, паставіць на ногі — вывучыць дзяцей і збудаваць ім новую хату. Гарадчук задаволены, калі работа ладзіцца, калі дзеці не хварэюць і калі грошы «ідуць». О Божа, як гэта нямнога і як цяжка гэта даецца. І каб абавязкова хата была, як у людзей. З вялікімі вокнамі, з ганкам і верандаю, на чатыры-пяць пакояў, каб у адных вокнах сонца ўзыходзіла, а ў другіх — садзілася, «коб» залай на вуліцу і «коб» у хаце былі шафы, дываны, іконы, дарожкі, вазоны, модны імпартны цюль, люстра як мінімум на тры лямпачкі, умывальнік і «коб» падлога не рыпела, бо гэта, кажуць, чэрці па ёй ходзяць так. Калі вы пераступіце парог, вас абавязкова павядуць у залу, пасадзяць у мяккае крэсла альбо на тапчан… знімуць фартух, вытруць рукі і сціпла сядуць побач, каб выслухаць, з чым завітала сваячка ці сусед. Чужых і цыганоў у залу не прыводзяць — сустракаюць на ганку, а калі не паспяваюць, дык на парозе, а лепш каля форткі.

Хата… тут кожная рэч чакае, каб да яе дакрануліся. У ёй жывуць, пакуль не разбураць вятры дах і не прасочыцца святло між бярвенняў. Здараецца, і падлога праваліласяся, і печ не грэе, і грубка копціць, і цвіль на дзвярах і вокнах, і клямка злізалася, і стаяк не трымае скабу пад зашчапку, згнiў увесь, і дах дзіравы, а людзі трываюць, бо будаўніцтва новай хаты ў гародзе ідзе марудна. Моды няма, каб святкаваць улазіны, калі сталярку не паставілі і падлога не паўсціланая. Асірацела хата без агню ў печы… вынеслі газавыя пліты напрыканцы дваццатага стагоддзя ў летнія кухні. «Му печ не топім да зімы», — кажа адна суседка другой. Вось з вёсак нанеслі чарніц. Хочаш смачных пірагоў, затапі печ. Хату даглядаюць, як нявесту. Каб з вуліцы была як лялечка: абмаляваная, пафарбаваная… Хіба п’яны ці зусім нядбайны гаспадар пойдзе ў чобатах у пярэднюю. Барані божа. Затаўчэ жонка ў плечы, аблае, пакрыўдзіцца на тыдзень. Улетку ўсе сілы і час забірае агарод, а ўзімку затое і рукамі, і спінаю, і пятамі ля грубкі можна адагрэцца на цэлы год і нагаварыцца ўдосталь. Вочы зліпаюцца ад жадання сну, а ўсё слухаў бы і слухаў бы пра тое, «шчо було, шчо будзэ». Не прамінуць прыгадаць і славутую прыказку:

— Не жыві уныло, не жалей, шчо было, погадав, шчо будзэ, беражы шчо е.

Печ і грубка не адпускаюць, не хочацца ўзімку ехаць у вялікі свет, ды «нужда гоніць». Адна за адной жанчыны ходзяць паглядзець, шчо новага купілі ў хату? Усе хваляць. Няма моды хаяць густ гаспадыні. І як высокую ацэнку дадаюць:

— Трэбо і мне таке ўзяць.

На бягу ў хаце не п’юць і не ядуць. Толькі за сталом і толькі, калі ўсе селі. Здаецца, і невялікая хата, а вяселле на сто гасцей памесціцца, праўда танцаваць выходзяць на вуліцу. Прапіваюць маладую. Няхай ідзе на свой хлеб, а да бацькоў ходзіць на булкі. У хаце свае дзівосы: нават ад гульні ценяў, якія кідае, дзякуючы ветру, лямпачка пад абажурам на слупе, што ўкапаны перад вокнамі на вуліцы. Час ад часу недзе пад падлогаю ці на вышках шкрабаюць спадарожнікі жыцця — мышы, а на вуліцы мяўкае кошка, просіцца ў хату. Усе пад цёплымі коўдрамі спяць. Ідзе адчыняць дзверы, каб упусціць кошку, хіба бабуля. Госцю ўставаць не прынята. І боязна. Здаецца, што ў вокны глядзяць нябожчыкі, прыглядаюцца, і што гэта за чалавек спіць на іх ложку. А ў сонечны дзень — жывая казка. Церам-церамок. У кожнай хаце багата люстэркаў. О, раздолле сонцу! Хочацца танцаваць. І маладыя напрапалую ўключаюць магнітафоны. Хоць і хацела б адпачыць ад бяссоннай ночы бабуля, не даюць, ідзе ў гарод палоць грады. Маладыя, прытанцоўваючы, ідуць ад аднаго люстэрка да другога, з аднаго пакоя ў другі. А раптам з якога-небудзь акна ўгледзіш таго, каго, здаецца, кахаеш. Кажуць:

— Твой хлопец. Твая дзеўка.

Хата і ратуе.

— Люба, а дзе чоловек? Пойдзем з ім па чарцы вып'ем.

А яна яго ўвапхнула ў хату і загадала сядзець і не рыпацца, бо трэба яшчэ паехаць на поле, прывезці бацвіння, морквы, буракоў, маладой бульбы. І той ціхенька сядзіць, не падыходзіць да вокнаў.

— Няма яго з работы.

Ліпаю ў печы не паляць. Душа ліпы ў агні плача. У хаду вольха, бярэзіна, сасна, лаза ці брыкет — гэта ў тых, хто першы пабудаваў катэдж з катлом ацяплення.

У жалобныя дні даюць нябожчыку пераначаваць, лежачы ў труне, у зале. Пасля пахавання ў вялікай журбе, няхай часам і сварыліся часта, прыходзяць да жонкі памерлага сваякі, суседзі, збіраюцца ў зале, дзе стаяла труна і гамоняць, гамоняць… Нехта з самых блізкіх сваякоў застаецца і на ноч, і не на адну. На сцены партрэты памерлых не прынята вешаць. Фатаграфіі нябожчыка ў труне, каля царквы і на могілках хаваюць ад дзяцей у шафах пад бялізнаю. Там, дзе засталася ў хаце ўдава ці ўдавец, ружаў пад вокнамі, што на вуліцу, не садзяць. Па хаце, якая згарэла (рэдка ад маланкі) плачуць, як па чалавеку. На папялішчы амаль не ставяць новую, бяруць другі пляц, якіх так у мястэчку не хапае. Тады, як закон, будуюць не з сасны, а цагляную. Здаралася, што хаты, зрубленыя старымі майстрамі, паводка зносіла ў Гарынь, дык яны не рассыпаліся, не паддаваліся вадзе і лёду. Кожная хата мае характэрны пах, але ў кожнай пахне хлебам, зёлкамі, сушанымі грыбамі. Ад сушаных на бляхах альбо запечаных у печы антонавак прыемна казыча ў носе.

О хата, любая хата, маленькі ноеў каўчэг, калыска. Кажуць, калі памрэ гаспадар, то комін пакосіцца налева, а калі гаспадыня — на правы бок. Стол стаіць абавязкова пасярэдзіне залы і абавязкова пад ажурнаю цыратаю. На ім люстэрка, крыштальная ваза без кветак і гадзіннік, які моцна цікае. Хата не любіць цішыні. І муха, бывае, б'ецца ў шкло, і матыль, а то і аса заляціць, і малярыйны камар столю таўчэ, і конік, які праз адчыненае акно ўскочыў, заблудзіўся, цвыркоча. Яблыні і вішні пільнуюць вокны. Тады нават і вялікі дождж у хаце не бачны. Яго чуюць па гуках на даху. Усе ўпэўнены, што ў хату, у якой на покуці абразы Хрыста, Божай маці, Міколы-ўгодніка, маланка не ўдарыць. Яно на тое і падобна. Б'е ў стагі, дрэвы і толькі раз на дзесяць—дваццаць гадоў у хату. О, тут, кажуць, «вельмі награшылі». Навальніца разрывае неба, недзе побач бухае, як у пекле, а гаспадары сядзяць ціха, за кожным разам паўтараючы: «Святы Божа, Святы крэпкі, спасі нас». Не крыўдуюць, калі седзячы ўвечары на беразе ракі з півам і гарэлкаю, нехта адзін скажа:

— З вамі, хлопцы, добра, але пайду дахаты.

У ёй — карані, пачатак культуры, гаспадарлівасці, густу, чысціні, чалавечага цяпла, якое толькі хата ўмее акумуліраваць і нікому дарэшты не аддаваць, хоць перабывае ў ёй за век яе тысяча людзей. Не, не ў раддоме рэжуць пупавіну, пупавіну рэжуць у Хаце. Нішто так не калечыць хату, як смерць гаспадароў.

Радуйся, калі засталася бацькоўская хата, і ёсць куды вяртацца. Стократ радуйся, калі ёсць куды і ёсць да каго.

Радуйся.

## КАНОН ВУЛІЦЫ

У стуку па шыбе ёсць свая музыка: «Тук, тук, тук...»

— Жэнік, выходзь на вуліцу!

Узімку ці ўлетку, увосень альбо ранняй вясною — заўсёды чуецца ўслед:

— Куды ляціш? Цяплей апраніся.

Хапаеш блінец, ясі на хаду і гэць на вуліцу. Дзве сястры-блізняты, якія ідуць да ютрані, шарахаюцца ўбок, далей ад хорткі, з якой вылятае мяч, а за ім і сам футбаліст. Тут глядзі, каб не разбіць у гарачцы каму-небудзь акно. І свае папругай наб'юць, і пацярпелы, калі дагоніць, дасць капняка. Лепей карты каля лодкі, перавернутай уверх дном і яшчэ не абсмаленай смалою. Настаўнікі па гэтай незаасфальтаванай вуліцы не ходзяць, нават па ваду, ведаючы, што у гэтым калодзежы самая смачная, чыстая, светлая вада. На вуліцы

ўпершыню бачыш зоры на небе і, гледзячы на іх, уяўляеш упершыню зямлю як планету. Надакучаюць карты, а падлеткам хутка ўсё прыядаецца, можна ў цуркі, у маянку альбо проста пасядзець на калодах ды пагуляць у пляўкі: хто далей плюне. Але нешта ўсіх томіць, гняце душу, якая толькі-толькі нараджаецца. Такое пачуццё, што ўсе ведаюць нейкую таямніцу, але не дагаворваюць. А вось і яны... Тры сяброўкі. Не ідуць — плывуць у каляровых сукнях да каленяў, усміхаюцца, ідуць міма, як бы грэбуючы хлопцамі. У тых жа шыі, як на аўтапілоце, паварочваюцца ўслед за дзяўчатамі. Далоні пацеюць, і нешта кожны, хто пачне гаварыць, заікаецца. Доўга цягнецца паўза. Аж пакуль не звернуць увагу на маці, якая б’е свайго сямігадовага сына:

— Навошта забіў жабу? Га? Не забівай. А коб цябе так мучылі, га? О, горэ...

Усе і ўсіх, і пра ўсіх ведаюць. У каго што дзе ляжыць, якога колеру шпалеры, колькі яблынь у садзе і ранніх груш.

— Суседзе, ты не сварыся на іх. Кралі да нас, мы кралі, і яны крадуць. Шкода табе слоіка вішняў? — супакойваюць суседзі адзін аднаго.

Свая вуліца — самая свая, самая родная. На сваёй вуліцы сваіх аднагодкаў не б’юць і не крыўдзяць. На іншых вуліцах ці каля клуба — там і пабіцца можна, а тут братэрства.

Да дзевак са сваёй вуліцы хадзіць не даюць.

— Танцаваць можаш, а праводзіць дахаты не дамо! — папярэджваюць, крывячы губы.

Пакуль дзяўчына не прыйдзе на выручку:

— Ідзі адсюль, а то мацеры скажу, шчо лезеш да мяне. Адбівае, як агнём, апякунства. Злосць і крыўда доўга не праходзяць. Вулічныя мянушкі ніякімі ганаровымі званнямі і высокімі пасадамі не вытравіць:

— Да Мацёнкі дачка прыехала...

— А Баценько ўчора гуркі ў Мінск вазіў...

Гудзе ўся вуліца двойчы: калі на ёй вяселле і калі провады ў войска. Вынесуць на вуліцу з хаты і ежу, і сто грамаў нальюць.

— Колі твойму ў армію?

— Яшчэ два гады.

— Ой, коб войны не было.

Зніклі размовы ля калодзежа, у якім кожны, хто чэрпаў вядро вады, бачыў сваё: і месяц, і сонца, і старую ігральную карту, і пробку ад шампанскага. Цяпер амаль у кожным двары свой калодзеж, з якога электраматор гоніць у хату ваду. Суседкі на лаўках пад плотам збіраюцца надвячоркам, калі «ўсэ поробілі». Бывае, вецер ад ракі нечакана прынясе прахалоду, а разыходзіцца надта ж не хочацца. Самы разгар бяседы. Тады адна хутка ідзе ў хату, выносіць сведор, кофту, целагрэйку, жакет... раздае субяседніцам. Няма сілы, каб магла прыпыніць задушэўныя размовы:

— А твой ето...

— А твой як завёўся...

Каровы падоены. Мужчыны глядзяць па тэлевізары футбол. Вішня адцвітае. Бэз цвіцекрасуе. Так не хочацца развітвацца з пражытым днём. Нікому не хочацца. Невымоўна шанцуе той вуліцы, па якой не ездзяць машыны. Ужо багата якія вуліцы ў паслячарнобыльскі час пазалівалі асфальтам. Мужчыны выносяць з хаты гладкія, як іх лысыя галовы, самаробныя сасновыя табурэткі. На лаўцы ім сядзець нязручна і мулка. Рэжуцца ў карты. Як толькі хто ўключыць адзіную лямпачку на слупе, разыходзяцца, расціраючы рукамі замлелыя мышцы спіны. У яшчэ не густой цемры чуецца:

— Жэнік, Жэнік, ідзі дахаты.

Дарма. Усіх цягне да клуба. Там музыка, па-моднаму — дыскатэка, там танцы і там тыя тры прыгажуні і зноў, як на злосць, у кароценькіх спадніцах. Таму гукай, маці, не гукай, а пакуль не закончацца танцы — не чакай. Добра, калі яшчэ адразу пасля танцаў стомлены прыцягнецца дахаты. Бывае, без кубка малака і лусты батона кладуцца спаць, каб заўтра зноў на вуліцу. Дома трэба рабіць, а на вуліцы — воля.

Рэдка выпадае, калі суседзі сварацца на векі вечныя, хоць дробныя сваркі здараюцца часцяком, ды ўсё на п’яную галаву. Тое, што за плотам, на вуліцы, тое — нічыё. Доўга,

ляніва і неахвотна прывыкаюць да таго, што на нічыёй тэрыторыі. Гарэзлівыя падлеткі ганяюць на роварах па чужых вуліцах, разганяючы курэй, а па сваёй едуць без «фраерства», павольна, паважна. Толькі на тваёй вуліцы жыве адзіны на ўвесь гарадок мастак. Таму, здараецца, пахне фарбамі і аліфай. Але яго не цэняць, не ўмеюць ганарыцца яго талентам. Шасцідзесяцігадовыя з нейкім шчымлівым смуткам згадваюць недалёкае мінулае, калі ў сакавіцкія дні паводкі «плаваў» увесь гарадок. У лодках-дубах дабіраліся на базар, да школы, на спатканне, у госці, у адведкі. І быў зорны час краўцоў. Па дзве-тры пары ботаў заказвалі на сям'ю. Вада залівала вуліцы і агароды надоўга, ажно да першага шлюбнага жабінага крумкання. Мясцовы філосаф не ўнікаў магчымасці ацаніць прыгажосць паводкі:

— Аліўкавыя сады, трапічныя пальмы, кактусы ў пустэчы прайграюць нашай вярбе, што зразу расцвіла ў вадзе. Скажу вам, заражаешся любоўю да прыроды, да жыцця на цэлыя гады.

Доўгі, доўгі дзень, як тычка пад бобам у гародзе. Адзін-другі закурылі, каб бацькі не бачылі. Хочацца, цягне падысці пад акно хаты адной з трох прыгажунь: а раптам пашанцуе, падгледзіш, убачыш тое, ад чаго кроў кіпіць. Іхнія грудзі так наліліся за апошні год, як салодкія грушы. Аднак усе саромеюцца прызнацца адно аднаму ў гэтым патаемным жаданні, і таму ніхто нікуды не ідзе. Вось перад арміяй можна будзе ўсё. Гэт-а-а дакла-а-адна-а...

Павольна вяртаюцца ад царквы з вячэрні дзве сястры-блізняты. Яны ў строгіх сініх сукнях, на якіх белыя ажурныя каўнерыкі. Калі сочыш за іх штодзённым рытуалам — яны вельмі набожныя і ходзяць да царквы амаль кожны дзень, — дык здаецца, час плыве павольна, марудна, а маладым...

— Божа, як мала быў на вуліцы! Які кароткі дзень! Родны кут у кожнага свой, для гарадчукоў ён — родная вуліца. У войска праводзяць усёй вуліцай. Прыйдуць сваякі: Ганна, Олена, Надзя, Наталка, Люба, Одарка, Марыя. Прыйдуць суседзі: Іван, Грыцко, Якаў, Валодзька, Васё і Коля. Плачуць толькі мама і бабуля.

— Жэнічак, Жэнічак, ты ж напішы адразу, як прывязуць на месца. Сыночак, родненькі. Як мы без цябе, як вуліца?

Прыйшлі і тры прыгажуні, каб праводзіць. Ідуць усе пад гукі марша «Развітанне славянкі», які хвацка іграе на баяне музыкант з клуба. А потым усе разам спяваюць тую песню, якую любіць слухаць альбо спяваць навабранец. Тры прыгажуні пяюць таксама. Але адна спявае праз сумныя вочы. Апошні ветэран апошняй вялікай вайны раптам зацягне і сваю «Кацюшу». Тут ужо спяваюць усе. Яшчэ памятаюць словы. Усе спачуваюць навабранцу, не таму, што ідзе ў войска, ідуць, здараецца, і з радасцю — хоць прафесію там дадуць, — а таму: ці дачакаецца яго адна з трох прыгажунь, на плечы якой ён пяшчотна накінуў свой пінжак. Ягоны сябар старанна вучыцца іграць на школьным баяне. Маці яго робіць у школе тэхнічкай. А яе бацькі заможныя. Ён не хоча адчуваць, што ён ёй не пара. Бедны. Вучыцца іграць. Свеціцца адным акном школа. Рыпіць хлопец на баяне. Нешта ўжо атрымліваецца. Ён вучыць песню, якая падабаецца ёй. Яму хочацца перамагчы, быць першым. Яму хочацца быць каханым, кахаць, а можа, ён ужо так кахае. Страціць цікавасць да сваёй вуліцы, калі хутка таксама пакіне яе, падасца ў свет. Да той пары, пакуль яго не вырвуць з горада тэлеграмай на пахаванне стогадовага дзеда, пра якога ён, прызнацца, і забыўся. Але гэта будзе пасля, а пакуль ён з захапленнем спявае пад гукі баяна, які трошкі шыпіць, бо трэснулі мяхі. Ён даможацца яе ўвагі, абавязаны дамагчыся. Пойдзе з ёй па ландышы. Запішацца ў той самы школьны гурток самадзейнасці, у які запісалася яна. Толькі б хадзіла яго вуліцай, не абыходзіла яго хаты. Ён даможацца яе, бо не ў характары гарадчука адступаць ад свайго. І Жэнік піша здалёк свой першы ліст не бацькам, не сябрам з вуліцы, а ёй.

Плыве ўсё пад тую ж знаёмую мелодыю «Развітанне славянкі» вяселле. Жаніх сочыць за кожным рухам, крокам нявесты, моцна трымае яе за руку. Усё ж галалёд. На ўсім шляху, ад царквы, дзе абвянчаліся, і ад клуба, дзе падпісалі грамадзянскі акт, шчаслiва-насцярожаная нявеста адорвае тых, хто трапляецца насустрач, а больш суправаджае працэсію з сарака — васьмідзесяці чалавек, якія ідуць за маладымі парамі, цукеркамі. Яна дастае іх з абшытай блішчынкамі і каралінамі сумачкі і кідае на адзін бок, на другі. Яна хоча, каб жыццё яе было салодкім. Стары звычай, і ніхто не грэбуе гэтым свяшчэнным рытуалам.

Нагнецца, падыме цукерку, калі не зловіць на ляту. Ад царквы да хорткі роднай хаты нявесты суправаджаюць маладых падлеткі і дзеці, намагаючыся назбіраць цукерак як мага больш, напіхваючы іх у кішэні. Шакаладныя прыносяць дахаты, а карамель ядуць на хаду. Божа праведны, як весела, як смачна. Пашанцуе таму, хто спрытна зловіць найбольш шакаладных. Імі ён пачастуе ў хаце маці, бацьку, дзеда, бабу. Усе адведаюць, і ўсе прыгадаюць і сваю маладосць, і сваё вяселле. Да вокнаў шчаслівай хаты ідуць жанкі з іншых вуліц, каб «поглядзець на васелле». Будзьце пэўныя, ацэняць усё: і прыгажосць маладых, і багаты вэлюм, і колькасць бутэлек і страў на сталах. Заўважаць, хто з гасцей прыйшоў у новай, а хто ў старой вопратцы. Таму ўсе, каб не было сорамна, намагаюцца прыйсці ў новым. Сыпле снег, змяркаецца, і на душы ва ўсіх узнёсла і светла. Даруйце штодня адно аднаму дробныя грахі, каб яны не перараслі ў вялікія, недаравальныя. Недзе зусім побач чуюцца гукі акардэона: юны навучэнец музычнай школы штудзіруе яшчэ адзін вальс. Хударлявая жонка мастака нясе на базар два пейзажы, намаляваныя на бярозавых кавалках. Ёй надта патрэбныя грошы: апошнім часам муж цяжка хварэе. Праз шчыліны ў плоце паўзе на вуліцу да сонца, не баючыся пылу, настурцыя. Патыхае сасной. На вуліцы будуюць новую хату... Не, не памрэ вуліца — родны сэрцу кут.

## КАНОН АГАРОДУ

Адгарадзіся ад жывёлы, людзей плотам вакол хаты, дык і будзе агарод. Праца ў ім чорная, цяжкая, брудная, але агарод гарадчукоў корміць. Калі ідзе купля-продаж, менш звяртаюць увагі на хату, а больш на агарод. Ці вялікі, ці не ў нізіне, ці не топіцца вадой падчас паводкі, бо менавіта ў агародзе закапаны капіталы гарадчукоў. Агарод не толькі пад кантролем гаспадароў, але і пад законам уладаў. Асцярожныя гарадчукі, якія перажылі за свой век мноства формаў улады, кажуць: «Не чапай уладу, пакуль улада не зачапіла цябе».

Дзіву даешся: шэрыя, непаглядныя пасля зімы грады вакол хаты, якіх-небудзь дзесяць сотак, гатовыя забраць і сцежку да хорткі, калі б не была выкладзена цэглай, вясной непазнавальна мяняюцца пад капаніцаю гаспадароў, набываюць выгляд геаметрычных фігур, мініяцюрных пірамід, якія праз тры тыдні ўпрыгожацца кветкамі ўсіх краін і ўсіх сартоў. Яны так заварожваюць цябе, што ты адчуваеш сябе калі не ў батанічным садзе, дык у індыйскім фільме, а мо нават у казцы.

— Пайду накрыю грады цэлафанам, бо па тэлевізары казалі, маразы будуць.

— Пайду палівацъ гарод, бо і заўтра суша, казалі па радыё.

— Шчо рабіць? Нешчо роза не прынялася. Аж з Рыгі везла.

— Ой, Ганно, адпачні, а то і памрэш на градах, — чуецца ля магазіна ў чарзе па хлеб.

Чаму ў чарзе? Таму што акуратныя гарадчукі і гарадчанкі прыходзяць якраз у тую мінуту, калі прывозяць з пякарні хлеб. Чаго прыходзіць раней, губляць час. Трэба ў агародзе палоць грады. І вось тысяча жанчын у адзін дзень і адзін час пад спякотным сонцам у тры пагібелі твораць з агарода дасканалыя палотны, нібы ткуць з жывых кветак дываны.

Сем колераў у вясёлкі, дык памножце яшчэ на сем, і то, відаць, не будзе хапаць, каб уявіць усю гаму фарбаў Тут баішся пахваліць якуюсь кветачку, каб, не дай Бог, не пакрыўдзіць іншую. Кветкі рэдка зразаюць у вазы, хіба на дарогу якому паважанаму госцю альбо школьніку на першага верасня. А ўжо ўмеюць выхваляцца новымі сартамі і відамі адна перад адною, нібы энцыклапедыю чытаюць. У агарод ходзяць штодня, пакуль носяць ногі і слухаюцца рукі. Зеллю, якое надакучае ўсё жыццё, знаходзяць месца:

— Кінь кралям. Альбо вымасці ямку на вуліцы, вымасці.

Увечары, калі сонца яшчэ не закацілася за раку, стомлена сядзе жанчына на ганак і не мае сілы разагнуць спіну... можа, упершыню за дзень і звярнула ўвагу на хараство свайго агарода. Аж сляза пабегла па загарэлай шчацэ... можа, успомніла, што й маці і бабуля, як і яна, у тры пагібелі гнуліся на агародзе. А пах, дзівосны пах трохі ўзнімае настрой, кружыць галаву, абуджае ўспаміны... але чамусьці ўсё горкія. Такая прыгажосць, а на сэрцы вечны неспакой: чалавек недзе затрымліваецца, дзеці далёка ў горадзе, нешта не звоняць, ужо ж і тэлефон паставілі, от каб дзяды дажылі да гэтага цуду! Бярэш у рукі трубку, ідзеш у ага-

род, на вуліцу, на раку... і звоніш куды хочаш, хоць касманаўтам. Трэба разагрэць боршч. Неахвота. Пасля, калі прыйдзе гаспадар. Як багата дзён у годзе, а ўсё трэба жыць у імя агарода, на агародзе, для агарода. О, Бог паслаў і час, і месца, і лёс. А каб перайначыць усё... нанова пачаць жыць... не... і жадання няма, і грэх... як-ніяк усё ж заробак ёсць. Насенне красак — у пакецікі, пакецікі на рынкі краіны, і зноў жыві надзеямі на агарод.

— О, точка выпаўзла. А няхай жыве... усіх не паўбіваеш.

«Трэба такога цвета, як гэна роза, дачушцы сукенку купіць. Дзе на ўсэ грошай набрацца?» Старыя, паміраючы, казалі: «Даглядай чоловека, дзяцей і хату з гародам». Але ж божачкі, божачкі, пальцы ведаць не ведаюць гэтага гарадскога манікюру і лаку. Агарод — доля жанчын, іх крыж і радасць. Жанкі ўстаюць першыя і кладуцца спаць апошнія, просячы на ноч ціхі дождж, каб усім соладка спалася. Узімку ўсім хочацца адпачыць ад агарода... і сумуюць без кветак. На градах адзін попел ды косці ад рыбы. Ну, не верыцца: няўжо зноў зямелька наводзіць прыгажосць? На агародзе працу вытрымліваюць тыя, хто не баіцца адзіноты. Хто яе баіцца, ідзе працаваць у магазін, у школу. З краскамі не размаўляюць, але вельмі часта дакранаюцца да іх, гладзяць. Яны таксама, як чалавек, жывуць нядоўга. Глядзіш на кветкі, і абавязкова прыгадваюцца дзеці, вяселле і пацалункі. З агарода красак нябожчыку на труну не рвуць. А нашчо? Калі ён іх сам даглядаў, паліваў. Няхай растуць. І ў раддом не носяць. Няхай дзіцятко з маленства да жывых кветак прывыкае. Як нельга ўявіць неба без воблакаў, так і гарадок без агародаў уявіць нельга. Гарадчук не танцуе гожа, калі адзежа непрыгожа. Пры кветках не будзеш хадзіць абы-як. У горад — да царквы, да універмага, па хлеб, да клуба, да бібліятэкі, да чайной-рэстарана — гарадчук не выйдзе ў будзённай адзежы, хоць ты яму вырві залаты зуб. Вакса і шчоткі ддя абутку заўсёды на ганку, пад рукою і на віду. Нават кветку, якую пабіў град, падвязваюць, даюць яшчэ пажыць.

— Не тапчы мне краскі! — сварыцца маці, высунуўшыся ў акно, — бяры ровар ды хлеба прывязі.

Усе дзеці ў гэтых адносінах вельмі акуратныя, дапытлівыя і разборлівыя: якія кветкі аднолетнія, а якія шматлетнія. Павязі падлетка на абласную выставу, спытай, якія кветкі растуць на Палессі, і ён на адным дыханні выдасць: астры, гваздзікі, ружы, лілії, настурцыя, півоні, рамонкі, флёксы, бархоткі, гладыёлусы, пахучы гарошак, цынія, мацыёла, бальзамін, ляўконія, ільвіны зеў, мальва, павоі, вяргіні, рута-мята, медуніца, эшольцыя, аксаміткі, касачы, наготкі, калы, дельфініум, незабудкі, ландышы, хрызантэмы, маргарыткі, петунія, бяссмертнікі... Не верыцца, што на дзесяці сотках, дзе трэба і цяпліцы мець, можа такі батанічны міні-сад размясціцца. Догляд за імі надакучвае да хваробы, а паспрабуй забяры ад гарадчанкі граду кветак — і біцца будзе, і судзіцца пацягне. Нельга ўявіць гарадчанку без яе прыязні да прасяной кашы, галубцоў, кампоту з вішняў, наліснікаў, халоднага, дранікаў, бульбы са смажаным у цыбулі салам, да пірагоў з вішнямі, чарніцамі, макам, карыцай. Цяжкавата ўявіць яе без залатых завушніц, каляровых хустак, паліто з каракулевым каўняром. І зусім цяжка ўявіць яе без любові да кветак. Калі гандлюе гарадчанка на рынку насеннем кветак, яна непрыступная, як бэз, які расце перад вокнамі міліцыі. Вось чаму перад сном пасля рытуальных слоў малітвы «Святы Божа, Святы крэпкі, Святы бессмяротны, памілуй нас» яна дадае: «Пашлі, Госпадзі, дожджык, коб у гародзе кветкі не згарэлі».

## КАНОН ШКОЛЕ

Як нялёгка першы раз адчыняць за масіўную ручку цяжкія дзверы школы першакласніку, і як лёгка адчыняць у апошнім класе гэтыя дзверы нагой — дзеля форсу, разумеючы, што гэта некультурна. Ратуючыся ад голаду, з Усходу прыехала ў школу маладая пара настаўнікаў. З адным чамаданам, вазонам фікусам, без мэблі і посуду. Усё іх здзівіла: і адносна ладныя хаты, і звычаі, і норавы людзей. А дзеці? Дзеці ўсюды аднолькавыя: цікаўныя, гарэзлівыя, непаслухмяныя і добрыя. Цікаўнасць пераходзіць у веды, рухавасць — у самадысцыпліну, непаслухмянасць — у годнасць. Яны, гэтыя чужыя настаўнікі, слухаючы гаманлівых смуглявых жанчын і рана палыселых мужчын, не разумелі іх гаворкі: «Отакешаньке. Муло. Абу шчо». На «вялікім і магутным» даводзілі дзецям сваё:

— Этнос. Стержень порядочности. Самообразование. Толерантность. Гармония. Духовность.

Адны пераходзілі з класа ў клас у чаканні новага адкрыцця свету, іншыя — у чаканні першага пацалунка. Але каб не на людзях. Барані Божа. З заплюшчанымі вачыма. У напалову цёмным калідоры, бо ў цёмны клас яна баіцца зрабіць крок. Каб класны кіраўнік 8 «А» не прыкмеціў, каб класная кіраўніца 8 «Б», яго жонка, не заўважыла. Вуліца выяўляе таленты, школа садзейнічае іх развіццю. На вуліцы воля была ўсёабдымнай: хочаш, гуляй у хованкі, у вайну альбо ідзі гнуць на першым лёдзе «рагожу», каб аж сэрца заходзілася ад рызыкі — ці трэсне лёд пад нагамі, ці правалішся, ці паспееш збегчы з палонкі. У школе ўсё іншае: свабода падпарадкоўваецца дысцыпліне і абавязкам. Хадзіць па веды яшчэ не ходзяць, не разумеюць, што веды палягчаюць жыццё, бо, як вучаць бацькі, — грашыма палягчаюць жыццё і толькі імі. Ідуць, каб атрымаць адзнаку па прадмеце, каб быць усім разам у класе, на танцах, на ўборцы бульбы, буракоў, кукурузы альбо на святочнай дэманстрацыі, на канцэрце. Бацькам спакайней, калі дзеці ў школе. Першая работа, хоць і грошай не плацяць.

Класныя не стамляюцца паўтараць:

— Навучыцеся бачыць прыгажосць і цаніць яе. Любіце Радзіму, упрыгожвайце яе сваімі талентамі.

У царкве што — натхняюць тых, хто ўпаў духам, настаўляюць на шлях дабрадзейнасці. Гарадчукі не наіўныя, але сентыментальныя. Што ёсць, то ёсць. У школе, неўпрыкмет сталеючы, увесь час круцішся вакол прывычкі да працы і вакол стрыжня прыстойнасці. Паміж сабой царква і школа тут не спрачаюцца. Усе дзеці хрышчоныя, дома ўсе вераць у Бога, а ў школе робяць выгляд, што згодны з гісторыкам-атэістам.

— Только благодаря атеизму человечество приблизило прогресс.

Прастора замкнутая... але душы не ўтрымаць — яна недзе высока і вольна лунае па-за межамі класа. Над вухам, як надакучлівая муха, лётаюць словы пра геаметрычныя фігуры і матэматычныя формулы (каб яны былі праклятыя), а перад акном расцвіў бэз... з радыё, якое вісіць на слупе «хіміі» машынна-трактарнай станцыі, далятае сюды неўміручая мелодыя «Бесаме муча». Нудзіцца душа. Разамлела цела. Цягне невядома куды, але ж упарта цягне. Хутчэй бы гэты апошні званок. Неўпрыкмет прыходзяць новыя незнаёмыя словы, якія прымушаюць задаваць пытанні, цікавіцца іх сутнасцю. На вуліцы былі свае «байструк, транзістар, курва, салага, засранец», а тут «этнас, пухавік на сінтэпоне, атамны рэактар, лазер, камп'ютэр», а на падыходзе яшчэ ж новыя: «чорныя дзіркі, байкер, дэфолт, тэрарыст, кланіраванне». Ніхто за вушы ў выдатнікі не цягне. Здольныя ад прыроды да навукі ў пяцёрачнікі выб'юцца самі. Калі ж падчас канікулаў інтарэсамі завалодвае Дом піянераў — там більярд і танцы ў паўзмроку, — школа з цёмнымі вокнамі выгляд мае непрыкметны, аж жахліва. Нічога так яе не зневажае, як адсутнасць званкоў і дзіцячых галасоў.

У маладой прыгожай пары класных кіраўнікоў нарадзілася другая дачушка. Ехалі часова, каб перакантавацца год-другі, ехалі без цёплага споднягa і зімовай шапкі. У вайсковым галіфэ і фрэнчы ён хадзіў на ўрокі аж восем гадоў. Неўпрыкмет перабраліся з цеснай камуналкі ў сваю хату. Купілі ровар, лодачны матор «Вихрь» і тэлевізар. Патроху звыкліся з мясцовым людам, які не разумелі і не ўсё прымалі. Цяпер жа на «конікі» самі настаўнікі апранаюць маскі Чорта, Дзеда, Бабы, Казы, Мядзведзя, Коніка, улазяць у старыя лахманы, мяняюць галасы і ходзяць у марозную ноч калядаваць, спяваючы «Шчодры вечор». Ідуць у хату да бацькоў сваіх дзяцей. Ніхто і не здагадваецца, адкуль «конікі», з якіх кварталаў: з Аселіцы, Мельнікаў, Гары, Вугоня, Наваселля, Радзічаў? А гэта ўсходнікі — нязломныя атэісты. Смеху варта. Фізік Ёшка любіў апранацца ў цыганку. Для сугрэву ды каб весялей было возьме сто грамаў белай. Трыццаць — пяцьдзесят хат пакуль з віншаваннем абыдзеш, збіраючы харчы і грошы, натомішся, як трактарыст на ворыве.

— Так. Стоп. Дзяўчаты направа, хлопцы налева. А ты куды, Ёшка? За дзеўкамі? Забыўся, кім нарадзіўся? Аёй, аёй...

Рогат на ўсю вуліцу. У мяцеліцу хадзіць яшчэ казачней і для тых, хто «конікаў» водзіць, і для тых, хто чакае. Больш веры ў цуд, у спраўджванне мараў.

Вясна, паколькі яе найбольш чакаеш — надакучае за пяць месяцаў зіма, хоць і не сту-

дзёная, але снежная, — пралятае, як камета. Вось і ластаўка пад страхой вывела птушанят. Кажуць, Бог асабліва беражэ тую школу, у паддашшы якой гняздуюцца ластаўкі. Заўтра апошні званок. Дык які сэнс жыцця, пытаецца вулічны філосаф — мясных спраў майстра? А Бог яго ведае.

— То паслухай, скажу. Расце дрэва. А навошта? На зіму спілавалі, нарэзалі дроў, дровы далі дым, дым пайшоў у неба і там з іншымі дымамі ўтварыў хмару. Праліўся дождж. З зямлі з зярнятка вырастае новае дрэва, падобнае на тое, што спілавалі. І яго спілуюць, і яно дасць дым. І так бясконца. Дрэва расце, каб яго спілавалі.

Апошні званок — урачыстасць не толькі школы, усяго гарадка. Прыйшлі Олена, Валодзя, Іван, Надзя, Грыцко, Люба, Паўло, Наталка, Якаў, Лісавета, Яўхім, Марыя і Васіль. Ад званка да выпускнога адзін крок, усе спакойныя, бо не было такога выпадку, каб на экзаменах камусьці паставілі двойку. Нервуюцца больш бацькі, бо дзеці добры год ужо ходзяць парамі. Нехта больш смелы марыць увосень падаць заяву на шлюб. Сустракаюцца ўсе выпускнікі на Царкоўнай гары, каб сустрэць усход сонца. Больш заможны прыходзіць з відэакамерай. Божа, колькі разоў сустракалі ўсход з бацькамі на рыбе, на сенажаці... Чаму ж сёння, чаму такі ён шчымлівы? Чаму пасля гучнага «ўра-а!» раптам усе замаўчалі? Чаму выцер крадком слязу класны кіраўнік 11 «А» і чаму класная кіраўніца 11 «Б» адвярнула галаву ўбок? Заўтра воля. Не, сёння воля! Вось яно і прыйшло, першае выпрабаванне адзінотай. У каго душа яшчэ не зусім прачнулася, таму лягчэй. Бывай, школа. Чаго плакаць? Заўтра будзе інстытут, тэхнікум, а хоць бы і вучылішча, але не будзе больш ніколі таго, хто сёння побач, разам, не будзе роднага класа, які прывучыў аддаваць дабро іншаму. Школа навучыла трохі ўсіх быць людзьмі, бо навучыць адразу на ўсё жыццё немажліва. Не шукайце сабе новых сяброў, лепшых за школьных, іх усё адно не будзе. Прыйдуць дахаты класныя кіраўнікі. Кветкі ў вазах, кветкі ў слоіках, на стале, на табурэтках. Стаміліся, перахваляваліся ад светла-сумнай радасці, а спаць не хочацца.

— Віншую цябе, любая, вось і яшчэ адзін год.

— Ага. А дзесяць не хочаш?

— Няўжо дзесяць? Не верыцца.

Даўно не ўспамінаюць пра пераезд у вобласць ці, на крайні выпадак, у раён. Школа стала сваёй. У новым навучальным годзе класная пойдзе на павышэнне: завучам. Абяцалі дырэктарства і класнаму, скроні якога, нягледзячы на яшчэ маладыя гады, кранула сівізна. Куды ехаць? І гарадок зрабіўся сваім. Трэба тут дзяцей ставіць на ногі.

— Спі, любая. Заўтра трэба будзе наведацца ў школу. Наша XX стагоддзе, а ім аддамо XXI.

Жонка ўжо не чуе апошніх слоў, яна соладка спіць, прыціснуўшы да грудзей малодшую дачушку. Не пабудзіць іх і птушка івалга, якая залівaецца ў садзе. Пачынаецца новы дзень салодкай катаргі, якую называюць жыццём. Спявай, івалга, загойвай нашы душэўныя раны.

## КАНОН ВЕТРУ

Слабы чалавек, слабы. Паслухаем лепш музыку ветру. У дзяцінстве ў маім родным мястэчку ён ахоўваў і прыносіў тайны прыроды, таямніцы навакольнага свету — найбольш неба, у якім, так думалася, ён і нараджаецца. Упершыню ён западае ў памяць узімку, сярод ночы. Наўкола цемра. Месяца на небе не відаць. Вочы адпачываюць. Ляжыш у халоднай пасцелі напружаны, да ўсяго прыслухоўваешся. Пачынаецца з ледзь чутнага посвісту, потым нешта нябачнае (нібыта кінулі жменю проса ў акно) кранае шыбу... і зноў свіст — ужо ля другога акна, у кухні. Мінае хвіліна, другая, а шум не знікае. Пачынаеш здагадвацца, што гэта запрацаваў на ўсю моц самалёцік на жэрдцы ў двары суседа. Разнастайныя гукі адольваюць твой сон. Манатонны, з інтэрвалам у паўмінутыляскат перарывае шум драўлянага самалёціка. Аніяк не ўцяміш адразу, адкуль гэты ляск. Здагадваешся: гэта рве старую, ухопленую ржою бляху на даху ў суседа, які жыве насупраць. Яшчэ хвіліна — і свіст гасцюе перад усімі вокнамі. Нябачная рука кідае ў іх ці то снег, ці то град, вецер шукае шчыліну, каб прарвацца ў хату. Устае баба, засоўвае ў грубцы люшку, каб не так дзьмула,

не настудзіла хату. Але позна. Твар, валасы, руку, якая ляжыць пад шчакою, ахутвае нешта халоднае, непрыемнае. Ляскае клямка: дзверы ў сенях рассохліся, зачыняюцца няшчыльна, вось іх і тузае туды-сюды. У хуткім часе мноства гукаў — ляск, посвіст, шыпенне — як бы адыходзіць на другі план; загаманіла печ ці той, хто жыве ў печы, а мо дух, які прысутнічае ў хаце. Пачынаецца з коміна, на адной аднастайнай ноце, потым гук спускаецца павольна да прыпечка, рэзка так вуркоча, страшыць густымі пералівамі і нарэшце пачынае выць, чамусьці доўга не знікаючы, не зменьваючы рытму. Робіцца страшна. Накрываешся цёплым вэрхнікам амаль з галавою — толькі адзін нос і тырчыць. Успамінаюцца паданні ды аповеды дзеда і бабы пра даўніну. Прывіды чарцей ды іншай нячыстай сілы блукаюць па хаце. Нешта ўпарта прымушае слухаць толькі гэтыя гукі, што ў печы.

«І што гэта на нас так нябожчыкі крыўдуюць?» — кажа баба дзеду. «Мо ўжо па мяне прыйшлі?» — адказвае ціхім голасам дзед. Пры слове «нябожчыкі» зусім робіцца жахліва. Такое пачуццё, што яны стаяць пад вокнамі і падпяваюць ветру: «гу-у-у-у». Ірве аканіцы. Скрыпіць бляшаны абажурчык ад лямпачкі, якая вісіць на слупе перад хатаю. Лямпачка то загараецца, то тухне. Святло ад яе не даходзіць да акон. Мора гукаў уладарыць над хатаю, такое пачуццё, што і сама хата рыпіць, ходзіць хадуном. Гоніць паветра праз дзіркі ў падлозе. «Застагнала» старая груша, і яе пабудзілі. Нейкі час наогул няма ў гукаў перапынку. Пануе дзівосная сімфонія: завывання, свісту, ляску, шуму, грукатання, вуркатання, піску ды енку. Паступпова вецер заціхае, свіст аддаляецца, слабне, але яшчэ не хоча супакоіцца там, у коміне. Паціху, слаба, але ж завывае. Пад гэтае выццё нарэшце супакойваешся і засынаеш. Сняцца белыя коні з густымі грывамі, якія бягуць па вуліцы. Ранкам у хаце халодна-халодна. Нікому першаму не хочацца пакідаць цёплы ложак. Анучы ля парога белыя ад снегу, снег на вокнах, на падушцы.

«Дзякаваць Богу, перазімавалі. Хутка Стрэчанне, — кажа баба і злёгку штубае дзеда. — Уставай, прынясі дроў!»

На Стрэчанне ўпершыню не хаваешся ад ветру, ідзеш у школу, смела падстаўляючы яму свой бледны, сумны твар. Ляціць побач варона. Трымае яе нябачная хваля і без рухаў крыла. Холаду, колкасці ў ветры значна менш. У другой палове дня ўсё пераменіцца зноў на зіму, але ўжо не так страшна, нябачная сіла павярнула вецер, і цяпер ён дзьме ў спіну. Моцна так, аж штурхае, так і хочацца развесці ў бакі рукі, каб і цябе ён панёс на хвалі, як варону. Прабірае халадок, праз майку залазіць да спіны. Шукаеш закутак, дрэва, каб хоць трошкі схавацца. Здараецца, у такія моманты дзякуючы ветру прытуліцца да цябе і дзяўчына-аднакласніца, якая табе даўно падабаецца. Гоніць яшчэ па-зімоваму злы вецер першы дробны дождж ык, але дарма... Ужо не напалохаць — побач першае каханне, і кроплі дажджу на тварах толькі ў радасць. Ды і самому ветру доўга буяніць не хапае сілы. Непрыемныя хіба што скразнякі, яго «дзеці», якія гуляюць ля дома каханай дзяўчыны, але і яны не перашкаджаюць каханню. Вымаўленае з асаблівым хваляваннем «да заўтра» добра чутна і лёгка нясецца ветрам да твару каханай, якая стаіць на ганку хаты і глядзіць табе ўслед. На Вялікі дзень вецер не толькі адчуваеш, але і бачыш. Увесну ён яшчэ не шуміць у лістоце дрэў, а гуляе, забаўляецца з маладым лісцем, дапамагае яму расці. Люляе. Ранняй вясною ён амаль ніколі не бывае моцным. Асцярожна так пералятае з дрэва на дрэва, гайдае павольна галлё, распрамляе лісточкі, дапамагае ім дыхаць, набіраць сілы. Хораша ехаць у сонечны, цёплы дзень у кузаве на адкрытай машыне з канцэртам у далёкую вёсачку. Усе падстаўляюць твары сонцу, не баючыся стрэчнага ветру. А ён, гарэза, варушыць косы, зрывае з галоў шапкі, хустачкі... Яшчэ і думак няма аб смерці, як няма думак і аб тым, што твая каханая дзяўчына здрадзіць табе, выйдзе замуж за другога... Ёсць толькі вецер, які «раскручвае» тваю прагу кахання, весялосці, жыцця. Свісту няма, імклівы вецер бязгучны. Ён добры і цёплы. Так хочацца, каб і тваю кашулю ён напоўніў і ператварыў яе ў ветразь. Як хораша ён распушвае яе цёмна-жоўтыя косы, як прыемна яны кранаюць твой твар. Такое ўражанне, што адсюль вецер нясе адно толькі слова: «кахай, кахай, кахай». У дні летняй спякоты ён — ратаванне, дапамога.

Ты пасля хваробы, яшчэ кволы, не выходзіш на вуліцу, слабы, адзінокі... Знікла каханне. Свет адвярнуўся ад цябе. Няма каму адчыніць фортачку. Душна. Як хочацца глытка свежага паветра. Злёгку задрыжала фортачка, і — о, дзіва, — раптам адчынілася сама. І вось уляцеў

ён, вецер! У гэтую пару заўсёды халодны, гаючы. Не адзін. Прынёс пах язміну, акацыі. Гоіць, гоіць тваю расцвеленую адчаем і няўдачамі душу. Выцягвае цюль праз балконную шчыліну на вуліцу. Прыемным халадком абдае твар, грудзі. О, вястун волі, якія ж прыемныя, гаючыя твае хвалі! Якая асалода твая музыка! Як ненадакучліва, спакусна ты запрашаеш, загадваеш пакінуць панельную камяніцу і вырвацца на волю, на прастор, да вады, да лесу. «Твая жанчына так любіць лес!» — нібыта падказвае ён. І ўжо суправаджае цябе ўсю дарогу. Лашчыць рукі, твар, губы... Руплівец, паплечнік усялякага руху, ён не дазваляе, каб нам што-небудзь надакучыла, ён усё па-свойму змяняе, змяняе свет вакол нас. Ганяе па асфальце газету, пустую бутэльку, носіць у небе «кітайскага дракона», нясе прыемны пах вогнішчаў на бульбяным полі, падхоплівае жоўта-шэрае лісце, круціць яго па дарозе. Адцвіло ўсё, адвесялілася, абсыпалася. У гэтую пару нізкага шэрага неба і частых дажджоў сум ахутвае тваю душу, і тужлівыя думкі аб непазбежнасці смерці не даюць спакою. Вецер не радуе, раздражняе. Ён усю пяшчоту, цяпло аддаў лету. Нібыта адчуваючы сваю вінаватасць, ён хаваецца на берагах рэк, у вербах, у чароце, на адхонах у пажоўклай траве. Гукі яго прыцішаныя, сціплыя, але ж па-ранейшаму таямніча-прывабныя. Асабліва асцярожна, велічна нясе ён па восені ад невялічкай царквы гукі звону. Здараецца, зіма надыходзіць і без яго дапамогі. Стаяць марозныя, ціхія, сонечныя дні. Рэха няма. Усё сцішылася. Але ж не можа быць, каб таго, хто нараджае рух, той самы рух не нарадзіў. Вецер толькі прытаіўся на хвіліну, ён назапашвае новыя гукі для новых мелодый. Дастаткова табе (а калі ўжо не стае сіл, твайму ўнуку) сесці ў сані, стаць на лыжы ды пакаціцца з гары, і ён, вятрыска, тут як тут. Падхопіць цябе на свае нябачныя крылы, прапяе нешта хутка над вухам, і вы зноў разам. Прыслухайся да яго музыкі, якая абавязкова абудзіць у тваёй душы не толькі ўспаміны, але і надзею на тое, што не ўсё найлепшае ў мінулым, што і ты жывеш недарма.

## КАНОН БАЗАРУ

Не, не і яшчэ раз не: у гарадку базар не шумлівы, не крыклівы, ніхто там вас за рукаў не скубе, не патрабуе саступіць дарогу. Так, жыць без людзей кепска, з людзьмі нудна, а на базары ўсім добра. Будзённых базараў тут не бывае, усе святочныя. Ён для ўсіх такі знаёмы, які паўтараецца сто, тысячу разоў, заўсёды асаблівы, новы і з сюрпрызам. Бадзёра крочаць у цэнтр мястэчка і старыя, і маладыя. Старыя, яны ўжо разжыліся, трохі нажыліся, ідуць, каб падтрымаць завядзёнку-традыцыю. Мястэчка гандляроў, купцоў, дробных купчыкаў, рамеснікаў жыве чаканнем базару і базарам. Нават у гербе — на лодцы торбы з таварам. Не ходзяць на базар толькі хворыя. На ім няма героя, усе героі: і тыя, што ненастырна прапаноўваюць свой тавар, і тыя, што з важным выглядам прыцэньваюцца. Няпісаны закон такі: прыйшоў — хоць на пяць капеек, а купі, інакш які ты гарадчук. Заспаныя падлеткі ідуць за бацькамі ківаючыся, цяжкавата, бо базар пачынаецца ад шостай гадзіны раніцы. Ідуць, бо ведаюць: выклянчаць грошай на новую спадніцу, джынсы, світэр.

— Коб свойму дзіцяці ды не купіці. Такого не бувае.

Сірата, рабая дзяўчына гадоў шаснаццаці, трымаецца ўбаку, ля ганка кінатэатра. Цікаўнымі вялікімі васільковымі вачыма зыркае на ўсе бакі, глядзіць, што выставілі на капоты ды багажнікі гандляры ў машынах, што стаіць на сталах, што ляжыць на бардзюры ці на асфальце. Яна з цікавасцю, без зайздрасці сочыць за чырванашчокімі дзядзькамі і гострымі на язык жанчынамі ў каляровых хустках. Бабуля сіраты, якая гадоў дзесяць ужо ходзіць з кавенькаю, вынесла на продаж першыя яблыкі. Расклала некалькі штук на сурвэтку, а астатнія прыкрыла хустачкай у пакунку. Пах ад іх на ўсю плошчу. У дзяўчынкі яшчэ не было ў роце і макавай расінкі, ёй так хочацца яблычак, але нельга: тое, што прынеслі на продаж, недатыкальнае. У кожнага свой сад, але ж чужыя — смачнейшыя. А то здараецца, прынясе жвавы муж, ідучы ўпэўненым крокам дахаты, клін сыру, а жонка з парога ў гнеў:

— А шчо ты, сляпы крот, купіў сыр? Хіба ж не бачыш, шчо мой под гнётам ляжыць? Шчо ты мяне перад людзьмі ганьбіш?

Ён маўчыць, ён любіць налеснікі з сырам. Купіў, каб больш напякла. Маўчыць, адчуваючы сябе вінаватым.

На базары не прадаюць хіба што толькі... павукоў. Калі не знойдзеш неабходнай табе рэчы — закажы, і назаўтра купец ранічкай прынясе яе табе дахаты. Таго, хто разлічваецца далярамі, больш паважаюць. Ды гарадчук хітры: на чорта свяціць усім, што маеш даляры. Гарадчук на ўласным вопыце ведае, што народ жыве цяжка тады, калі на капейку ці на рубель нічога нельга купіць. Адзін перад адным, аднак, не наракаюць на цяжкае жыццё.

— Ой, Настачка, прыехала дачка і пацягнула на базар. І пахварэць няма калі. Кажа, купі сведор тут, бо ў іх даражэйшыя. Ходзім, усё не можам выбраці. Ютрань звоняць, а не купілі.

— Ідзі да чайной. Там украінцы стаяць. О, красоцце, а сведор, як у кіно.

Няма такой моды — хадзіць па базары і курыць. Калі выбераш мяса, адсякуць і абавязкова дадуць даважку.

Вясковыя людзі — яны сярод начы выбраліся ў мястэчка, прывезлі парасяты, куры, качкі, гусі, козы — ставяць свае падводы ўздоўж вуліцы, якая ўпіраецца ў плошчу. Да іх ідуць да апошніх.

— Дзядзько, купі ў нас парася. Дзёшава аддамо, а то дахаты ехаць трэбо.

Нейкім незразумелым пачуццём прадавец ведае, што сёння ягоны тавар купяць. Сонца ўсё вышэй і вышэй. Ужо залівае святлом вітражы ў царкве. Але разыходзіцца яшчэ не хочацца. Дзве гадзіны ідзе гандаль, а праляцела ўсё, як пяць хвілін. Яшчэ ўсіх не пабачылі. Трэба ж нагаварыцца пра дзяцей, пра сон, пра гарод, пра серыялы і пра блізкае вяселле, пахваліцца імпартнай машынаю, якую купіў сын, ды пажаліцца на цэны на газ, дровы, электрычнасць. Заціхае памалу і свінячы віскат, ад’язджаюць вяскоўцы. Здымаюць свае палаткі, складаюць у багажнікі тавар задаволеныя альшанцы... Трохі ўтаргавалі. Прадалі каўбасы і ўкраінцы. Каму няма куды спяшацца, асабліва ўдаўцам, старым халасцякам — ні дахаты, ні ў лазню, ні ў царкву, — яшчэ па інерцыі ходзяць па кругу альбо таўкуцца на ганку чайной, чакаюць, калі адкрыюць, каб дзербануць кухаль піва, а пакуль слухаюць былога настаўніка гісторыі:

— Капіталізм — гэта набыццё капіталу, утрыманне капіталу, прымнажэнне капіталу.

— Чорт з ім, з капіталізмам. Ты пенсію атрымаў? Частуй півам.

Апошнім базар пакідае стары каваль, які восем месяцаў ходзіць у валёнках. У кузні яго даўно не гарыць агонь, дзверы забітыя, інструмент ляжыць у хаце, няма каму перадаць: сын на Поўначы, не паспеў яго навучыць кавальскай справе. Ён прадаваў старыя-старыя, як ён сам, цвікі, якія прыхапіла ржа. Ніхто сёння не купіў аніводнага цвіка. Каваль не сярдуе, ён пабыў на базары. Дасць Бог сілы — пойдзе і на нядзельны, яшчэ больш людны. Усяго толькі два грудочкі яблыкаў прадала бабуля з сіратою. Баба незадаволена бурчыць, больш сама сабе пад нос. Праўда, на хлеб утаргавала. Ёй па старасці плацяць пенсію вельмі малую. Але яна штодня дзякуе Богу і за гэта. Рабая дзяўчынка ўсміхаецца. Можа, успамінае, што на яе вельмі па-асабліваму паглядзеў адзін хлопец. Адзін яблык яна з зайздросным апетытам есць, а другі моцна трымае ў руцэ. Яны кіруюцца дахаты павольна, разважліва, нібыта развіталіся з вялікім пярэстым каляровым светам шчаслівых твараў, бо ваўкаватых на гарадоцкім базары не бывае. Сонца ўжо добра прыпякае ў плечы. Горкі і салодкі, шчаслівы і нешчаслівы, але дзівосны час базару мінуў. Магчыма, заўтра ім ды іншым пашанцуе больш. Сірата з нейкім сумам азіраецца назад: такое адчуванне, што ёй хочацца вярнуцца. А там нарэшце атрымаў свабоду бяздомны і заўсёды галодны сабака з нагамі, як спіцы. Ён таксама чакаў свайго часу: разлёгся пасярод плошчы, выцягнуўся, падстаўляючы свой палінялы цёмна-жоўты жывот сонцу. Хораша на базары, хораша.

## КАНОН ЧАСУ

Хто і куды хавае ад нас Час, хавае надоўга, калі не назаўсёды? Не толькі ў гарадку старыя любяць казаць: «Не лезь поперэд бацькі ў пекла. Прыйдзе час, і ты сам уцяміш, шчо ты любіш і шчо не любіш».

Я ЛЮБЛЮ: вецер, флёксы, малых дзяцей, купалы царквы ў сонечных промнях, мокрыя дрэвы, сароку, варону, дзятла, яблыневы сад, рачулку, што цячэ з лесу, хросны ход, шлях да мястэчка, дзе жыў у дзяцінстве, сцірты саломы на полі, дождж уначы, пах хлеба,

тэлефонныя размовы гасцей, акардэон, народную музыку, вакзалы, вярбу, казкі, адзінокую грушу ў квецені, егіпецкія піраміды, карыкатуры, школьныя сшыткі, чорную туш, тэленавіны, кусты бэзу, язміну, сасновы бор, маленькіх ягнят, качак, дакументальныя фільмы пра джунглі, вазоны, марскую форму; яшчэ люблю: разглядаць свае і чужыя фотаальбомы, гартаць кнігі, вожыка, плысці ў лодцы, мазырскі тэатр, крытыкаваць і філасофстваваць, збіраць маліны, слухаць успаміны старых людзей, рабіць падарункі, атрымліваць лісты, слухаць арыі з опер і аперэт, калядную ёлку, італьянскую мову, кішэнны гадзіннік, лузаць струкі, кіслую капусту, піва, ехаць на ровары ўздоўж жытняга поля, туман, занесеныя снегам вясковыя хаты, рэкі Прыпяць, Нёман, Гарынь, возера, стральбу з лука, цырк, вузкакалейку, актавую залу ў школе, насіць у кішэні каштаны, фарбаваць плот, вокны, ехаць у санках, лічбы пяць, два, чатыры, рускае мастацтва дзевятнаццатага стагоддзя, мастакоў Адраджэння, люстэрка, правінцыйныя гасцініцы, поплаў, сустрэчы з чытачамі, фільмы Феліні, драматургію Астроўскага, кліпы, старадаўнія кнігі, кажух, хадзіць босым па беразе ракі, прасяную кашу, кампот з вішняў, вальсы, духавыя аркестры, словы: каханне, дым, трава, грэх, неба; а яшчэ — чырвонае сухое віно, сабак, зялёны і жоўты колеры, маленькія іконы, след на небе ад рэактыўнага самалёта, глядзець на агонь, згадваць дзяцінства, маці, садзіць бульбу, смажыць яе, галасы ўсіх птушак, белыя аблокі, пакаянне.

Я НЕ ЛЮБЛЮ: ноч, крык чайкі, змяю на тэлеэкране, ісці і ехаць праз мост, незнаёмага ў пад’ездзе, глядзець, як спілоўваюць дрэва, ехаць у ліфце, спаць на зямлі, стаяць у чарзе, хадзіць на лыжах, навальніцу, абгарэлы лес, візіты да стаматолага, пазычаць, штучныя кветкі, рамантаваць машыну, дэтэктывы, фантастыку, паэмы, тэлекаментатараў, жанчынкультурыстак, тэлеграмы, вастрыць нажы, гуляць у карты, гаварыць з цыганкай, слухаць пропаведзь, рэкламу, сядзець у прыёмных чыноўнікаў, ляцець у самалёце, арэлі, стаклетачныя шашкі, алюмініевы посуд, купацца ў незнаёмай рацэ, падганяць каня, канцэрты на стадыёнах, танцы ў рэстаранах, спаборніцтвы інвалідаў, шаблю, чытаць карэктуру, цалаваць руку святару, насценныя календары, паціскаць руку старшыням калгасаў, сцежку да калодзежа міма хлява, спаць на печцы, будзіць дзіця, карыду, красворды, цень, чытаць тоўстыя часопісы, амерыканскія фільмы, віншаваць са святам па тэлефоне, пярсцёнкі, рок-н-рол на базары, абуваць чужыя тапачкі ў гасцях, начаваць у цягніку, есці ў адзіноце, гарэлку, голас з мегафона, парадак на пісьмовым стале, адключаны тэлефон, зашторaныя вокны.

Вось, відаць, большая частка з таго, што любае сэрцу і з-за чаго яно супраціўляецца. Мажліва, не ўсё, бо як, скажыце, не любіць усход сонца ці лістапад? Добра, нават лёгка адказваць на такое пытанне, калі дзень пражыты ў адпаведнасці з жаданнямі і святочна. Аднак жа заўтра непрадказальна новы дзень, якому без дазволу наканаванаператрэсці ўсё дарагое табе і тое, што не цэніш. Не выключана, што з прычыны абавязацельстваў і выбару давядзецца рабіць і нешта нямілае сэрцу, а як зробіш, дык будзеш яшчэ больш цаніць тое, чым поўніцца душа і з чаго складаецца кароткае імгненне штодзённага шчасця. Усё добра... Першы блакіт нябёсаў, свята сустрэчы вясны і зімы — Стрэчанне. І з кожным новым надыходам лютага ажывае даўні цяжкі ўспамін — у лютым памерла мая прабабка Таццяна.

Сакавік, — як кажуць, сонца ўжо блізка, хоць аблокі яшчэ нізка. У гэтым месяцы так хочацца прыспешыць надыход цяпла, без якога сумуеш... першы дождж... і ў гэтым месяцы зноў прыгнечанасць — напрыканцы сакавіка памёр дзядзька Якаў, што прыехаў у афіцэрскім шынялі. Ён звычайна наведваў нас, калі ішоў дождж, бо ў пагодлівыя дні толькі і ведаў, што з раніцы да цемры рабіў у полі, на падворку, на сенажаці. Цяпер дажджом да нас ніхто не прыходзіць.

Красавік — нарэшце чыстае блакітнае неба, першая трава, першая зеляніна на дрэвах і кустах. Вербная нядзеля, прабіваюцца да сонца півоні. Ах, як любіла гэтыя півоні мая цётка Зося, што вярнулася з Польшчы праз трыццаць гадоў дажываць век у родным Давыд-Гарадку. Ах, як любіла! Што ж ты, красавік, не даў ёй нарадавацца, забраў яе ад нас?

Май — кожны дзень цуд, кожны дзень свята, кожны дзень здзіўленне, захапленне, мноства фарбаў, гукаў, птушыных спеваў... У першы дзень мая мой найлепшы сябар Ванька, з якім душа ў душу жыў са школьных гадоў, упаў ад інсульту на вуліцы каля бэзавага куста. Хочацца выкрасліць першы дзень мая, каб у астатнія дні бесклапотна цешыцца жыццём, ды каторы год ніяк не выкрэсліваецца гэты першы дзень.

Лістапад... халодны вецер, надакучлівыя дажджы, кароткі светлавы дзень. Старыя кажуць, што такой тужлівай парой і хочацца, і лёгка паміраць. Жаданні жаданнямі, а да месяца глухая непрыхільнасць: адабраў ён ад мяне любую бабу Насцю, асіраціў дарэшты.

У залатым, прыгожым кастрычніку на чужыне заўчасна, як падае з дрэва знешне прывабны, але нясмачны яблык, памёр мой бацька Васіль.

Заўсёды наганяе тужлівыя думкі, скруху пачатак восені — верасень. Не адкупіцца яму сваёй шчодрасцю і багаццем... не змагу яму даравацъ смерці майго няўрымслівага жыццялюба дзеда Змітрака.

У чэрвені ў царкве стаўлю дзве свечкі за спачын. Холадна на душы ў цёплым чэрвені. Тады памерлі мая цётка Олена і стрыечны брат Аляксандр.

У зеніце лета — ліпені на душы гаркаваты асадак. Прадзеда Міхайлу ніколі ў жыцці не бачыў. Не захаваўся і ягоны фотаздымак. Аднекуль ці то ад кагосьці ведаю, што памёр у ліпені. Няма да месяца схільнасці.

Больш за ўсё баюся жніўня. Гэта на яго долю выпала маё самае страшнае пракляцце. Ён адабраў маю маладую маці, маё ласкавае, пяшчотнае, добрае сэрца. На яе магільнай пліце хачу напісаць толькі такія словы: «Мама, не было дня, каб я не ўспамінаў пра цябе». Чорны жнівень, чорны...

Снежань, студзень — вось і ўсё, што засталося. Няўжо з іх трэба выбіраць і мне, каб і маё дзіця з часам смуткавала ў адзін з гэтых месяцаў? Няўжо? Не хочацца даваць веры. «Трэба. І ў цябе ёсць магчымасць выбару», — нібыта чую за спінай чыйсьці голас. «Так добра ж усё размеркавана. Выбірай!» — падказвае голас кагосьці нябачнага. І я, падымаючы галаву да неба, моўчкі згаджаюся, прымушаючы сябе злёгку ўсміхнуцца: «Усё ж добра...»

«Усё добра», — кажуць мне, уратоўваючы мяне ад адчаю, Змітро, Грыцко, Якаў, Іван, Сашко, Янак, Нікола, Васіль, Олена, Ганна, Надзя, Наталка, Насця, Люба і Марыя.

## КАНОН МАЦІ

Я ад цябе далёка, у іншым горадзе. Ты нават не ведаеш, калі б прыйшла на некалькі хвілін у свой дзень анёла адтуль, адкуль яшчэ ніхто не вяртаўся, якімі б словамі я цябе сустрэў. Я здагадваюся, чым пацікавілася б ты, угледзеўшы мае трохі азызлыя шчокі і глыбокія маршчыны на лбе: «Ці не хварэеш, сынок?» Папрасіла б паказаць праўнучку, якую назвалі тваім імем, пацікавілася б: «Дзе ўсе нашыя, як хата?»

Нашых і не паменшала, і не пабольшала. На месца тых, хто пайшоў за табой, прыйшлі, дзякаваць Богу, новыя сваякі. Нешта вельмі даўно ніхто не дасылае лістоў і пасылак з яблыкамі ды салам. Сяброўкі-аднагодкі твае ўсе паўміралі, а мае аднакласніцы ўсе пайшлі на пенсію. Хаты няма. На нашым пляцы чужыя людзі збудавалі камяніцу. Царкву, у якой ты вянчалася і ў якой цябе адпявалі, адрадзілі, адрамантавалі наноў. Адсвяткавалі дзевяцісотгоддзе гарадка. Які ж прыгожы, велічны помнік паставілі заснавальніку князю Давыду. Шкада, што стаіць ён горда адзін, без людзей, якія з ім прыехалі. Нашы продкі. Людзі зноў баяцца голаду, як і калісь, і меней нараджаюць дзяцей. Па-ранейшаму ўсе гандлююць насеннем і гуркамі. Гоняць кароў на пашу ды моляцца, каб быў ураджайны на бульбу год. Ты сварылася: «Не прыдумляй, сынок, кажы праўду, біць не буду». А я прыдумляў і стаў пісьменнікам. У творах малюю твой партрэт і пішу твой характар, даруй. Як ты і ўсе гарадчукі, люблю кіслае малако, топленае і бабку на патэльні. Старэйшыя за мяне сын тваёй сястры Коля і яе дачка Маня. За мной ідуць дзеці тваіх братоў Таня, Маруся, Лена. Мы ўсё бліжэй і бліжэй да вахты, да якой ты не дажыла, бо пайшла вельмі маладой. Я ахвотна пішу і пра гарадчукоў, часцяком іх прыхарошваючы, бо людзі, як і пры табе, сустракаюцца розныя: і злыя, і нядобрыя, і зайздросныя. Як успомню, што й яны ўсе памруць, то й не хачу іх ганьбіць. Не асуджаю. Словы «так» і «не» належаць Богу, і чалавек мусіць выкарыстоўваць іх вельмі асцярожна. Ты прывяла мяне на Божы свет, узяла за руку, паказала вуліцы, царкву, вадзіла на навагоднюю ёлку і да прычасця, прывяла ў школу, на старым-старым цвінтары паказала магілы продкаў. Я іх не запомніў, каюся. Грэшны. Мала часу — цябе ўжо анёлы прыспешваюць. Трэба казаць тое, з чаго пачынаў. Дык вось, я цябе сустрэў бы словамі: «Мамо, не було і дня, коб я не ўспамінаў цябе».

Хачу... каб палажылі ў роднай зямельцы на старэнькіх могілках, якія маўкліва ахоўваюць продкі: жвавы дзед, сціплая бабуля, ласкавая маці, працавітыя дзядзькі ды ўвішныя цёткі. Калі ж не знойдзецца месца, хачу, каб паклалі ля царквы, каб хоць духам, ценем, а ўсё быць бліжэй да Гарыні хуткаплыннай, Царкоўнай гары, роднай вуліцы. Як гэта прыемна — быць сярод таго, што ўтварыла характар, паўплывала на пачуцці і замацавала адметнае.

Хачу... каб побач спяшаліся дзеткі ў школу, каб прыселі на лаўку старыя дзяды, нетаропка пагаманілі. Хачу, каб грукацеў воз па бруку, і каб у святы, асабліва на Вялікдзень, дзеці бегалі вакол царквы, кідалі ўгару запаленыя шышкі... можа, адна з іх упадзе з неба і на мяне. Хачу чуць лёгкі пошум ясеняў, ліпаў закасцельных, звон бомаў над галавой. Сонца асабліва прыгожа, асвятляючы купалы, пасылае ад іх промні на вокны і дахі хат. У прастольныя святы, на Казанскую прыедуць з суседніх мястэчак і вёсак па міласціну жабракі, сляпыя музыкі. О, колькі радасці будзе ад сціплых гукаў гармоніка. Хачу, каб лашчыў, лятаў нада мною даўка-прыемны пах чаромхі і густы пах бэзу. Хачу... чуць, як радуецца жыццю на званіцы ластаўка, як спявае шпак і сварацца вароны. Уначы ляжаць не боязна. Будуць вяртацца з вяселляў, улазінаў, адведак, будзе гаспадар, выпіўшы, спяваць, а жонка таўчы яго ў плечы. Хачу чуць іх песні, лаянку, плач дзіцяці, якога, як калісь мяне, прынясуць у храм хрысціць. На Радаўніцу, Пакровы нехта абавязкова прыйдзе, пакладзе на магілку чырвоныя яйкі, пасху, чарачку, свечачку, кветачку. Распусціцца акацыя. Дзіця, седзячы на плячах у бацькі, пацягнецца да бялюткіх ландрынак дрэва. У суботу ды нядзелю, калі моладзь збярэцца ў клуб на танцы, будзе пранізваць марозную прастору, несціся аж да зорнага неба шчымліва-журботная мелодыя танга, гарэзлівая полька.

Хачу... каб роснай раніцаю ў першым жнівеньскім тумане гналі побач па вуліцы на пашу каровак, авечак, каб ляніва брахаў сабака, падганяючы іх. Толькі тут, у родным мястэчку, ціша будзе не палохаць, а лашчыць раўнавагай і спакоем. Як хораша! Усё побач. Усё тваё. Роднае. Вечна зменлівае і пастаяннае ў нязменнасці.

Яшчэ хач... у...

Не хачу... не хачу... паміраць не хачу!

Мне падалося, што пасля гэтых слоў ты, як заўсёды, падтрымаеш мяне і ўмацуеш мае жыццёвыя сілы: «Так, сынок, не памірай. На зямлі столькі добрага, прыгожага, столькі любові разліта, што не паспяваеш наталіць душу і напалову. Прызнавайся ўсяму жывому ў каханні, бо ў старасці на гэта не хопіць часу».

У царкве Казанскай Божай Маці спяваў невялікі хор мясцовых пеўчых. Спявалі, як заўсёды, хораша і ўзнёсла. У паўсілы пеўчыя не спяваюць. Я стаяў як зачараваны ля царкоўнай брамы і слухаў, слухаў, слухаў... Сцішылася прырода. Аж да нябёсаў неслася: «Господи, да исправится молитва моя...»

Ала РАЛЬКЕВІЧ

# «ДЫ ТОЛЬКІ ПЕСНЯ НЕ ЗНІКАЕ...»



*Ала Ралькевіч нарадзілася ў 1950 годзе ў Пухавіцкім раёне. Па адукацыі —педагог. Працавала настаўніцай англійскай мовы, дырэктарам Пухавіцкай СШ. З 2002 года — дырэктар Мар'інагорскай гімназіі № 5. У 2000 годзе была абрана членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 2-га склікання і ў 2004 — 3-га склікання. З'яўляецца дэпутатам Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. На сённяшні дзень — намеснік старшыні Камісіі па дэмаграфічнай бяспецы і сацыяльным развіцці. З вершамі ў «Маладосці» выступае ўпершыню.*

## НАТХНЕННЕ

Якое гэта хараство —
Пабачыць фарбы тыя,
Што раптам зімняе святло
Заменіць на другія...

Якая гэта прыгажосць —
Адчуць адно імгненне,
Вярнуцца зноў у маладосць
Вясны пераўтварэнне.

***Сакавік 2004***

* * *

Я па вуліцы іду...
Восень крапае на плечы...
Мо, падорыць позірк нечы —
Маю раннюю вясну.

Раскрываю парасон...
Не чапай мяне ты, вецер.
Абляцеў ты ўсё на свеце
І абдаў халодным сном.

Не спыняюся, іду.
Сілы прыйдуць, толькі б верыць
Мне яшчэ ў сваю вясну,
У жыццё, што час адмерыць.

***Кастрычнік 2003***

## ПЕСНЯ МАЦІ

Калісьці маці калыхала
Свайго сыночка і спявала
Адной вядомую ёй песню
Аб прыгажосці на Палессі.

І песня тая далятала
Да кожнай хаты і да гаю,
Да васількоў у полі чыстым,
Да водару крыніц празрыстых.

Ляцела песня, услаўляла
Жыццё і працу таго краю.
Мелодыя яе гуляла,
Напеўна ў госці запрашала.

Даўно ўжо маці той не стала…
Крыніца ціха зарастае…
Ды толькі песня не знікае,
У сэрцы сына ажывае.

***Люты 2002***

**ЛІПЕНЬ**

Ліпень просіцца — у сонца,
Выспявае збажыной.
Пах духмяных кветак звонкіх
Напаўняе мой пакой.

Раніцою млосцю млее
Кожны кусцік і лісток.
Цеплынёй цябе абвее,
Толькі выйдзеш за парог.

Каляровыя сукенкі
Поўняць лета хараством.
Вішанькі, нібы паненкі,
Чырванеюць пад акном.

Наліваецца красою
Родны сад і агарод.
Рэчка стомленай дугою
Абвівае муражок.

А за ім ажно смяецца
Ад птушыных галасоў
Лес ягодны, так і рвецца,
Маніць сцежкамі грыбоў.

***Чэрвень 2004***

* * *

Я не спела гэту песню,
Я не скончыла любоў,
І з душы яна ірвецца,
Ажывае зноў і зноў.

Я любоўю падзялюся,
Прыгажосцю абдыму,
Дзе матуляй азавуся,
Дзе надзеяй агарну.

Светлыні мо не хапае?
Можа, шчасце не прыйшло?
Кожны верыць і чакае:
Ад жанчын ідзе яно,

Толькі трэба азірнуцца,
Сэрцам чуць і разумець…
На той покліч адгукнуцца
Можна часам не паспець...

***Кастрычнік 2004***

* * *

Не чапай мяне ты, восень,
Не заскоквай напярод.
Сіл яшчэ змагацца хопіць
Не на дзень і не на год.

Я яшчэ не ўсё сказала.
Песняй поўніцца душа.
А табе ўсё ж не прыстала
Гаварыць: «Пара, пара…»

Ты не кідайся пад ногі
Ветрам рэзкім і глухім.
А лагодна пасцяліся
Лёгкім лісцем залатым.

Мы з табою пасябруем
Ў пэўны дзень, у добры час
І тады ўжо абмяркуем,
Што яшчэ хвалюе нас.

Ну, а зараз адступіся,
Толькі мудрасці пашлі

Ты жанчыне, мне, матулі.
Каб святлела на зямлі.

***Кастрычнік 2005***

* * *

Зямля маіх бацькоў,
Табе я прысягаю,
Тут кожны каласок
З любоўю абдымаю.

Мне родныя мясціны
У снах прыходзяць светлых,
Раскошныя яліны,
Рамонкі ў фарбах летніх.

Грыбных мясцін не злічыш:
На кожнага хапае.
Дабра каму пазычыш,
То тое ж атрымаеш...

***Студзень 2004***

## ЧЭРВЕНЬ

Летні ранак за акном
Кружыць і смяецца,
Часам сонейкам мільгне,
Дожджыкам пральецца.

Чэрвень — поўны гаспадар
Пах свой рассыпае,
Запрашае пагуляць,
Ні аб чым не дбае.

***Чэрвень 2004***

* * *

*«**Няма таго,**
**што раньш было...»***
Максім БАГДАНОВІЧ

Як толькі верасень прыйшоў,
Усё кудысьці адышло:
Не грэе рук тваіх цяпло.
Няма таго, што раньш было.
Няма духмяных кветак паху,
Не той стаў гоман на лугах.
Крылатыя імкнуць дахаты,
А не ляцяць на ветразях.
Клін жураўліны ўжо за слотай,
Не пахне мёдам у садах.
І пакрывае пазалотай
Прырода ўсё навокал нас...

***Студзень 1993***




# СТУДЗЕНЬ

**1**
*— 75 гадоў з дня нараджэння (1932) Каршукова Яўгена Іванавіча, беларускага празаіка.*

**1**
*— 70 гадоў з дня нараджэння Сушко Пятра (Пятра Паўлавіча; 1937—1996), беларускага паэта, перакладчыка.*

**1**
*— 60 гадоў з дня нараджэння (1947) Баркоўскага Віталя Міхайлавіча, беларускага рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі.*

**1**
*— 60 гадоў з дня нараджэння Кудраўцава Анатоля Іванавіча (1947—2002), беларускага драматурга, празаіка.*

**1**
*— 60 гадоў з дня нараджэння (1947) Марчука Георгія Васільевіча, беларускага празаіка, драматурга.*

**1**
*— 60 гадоў з дня нараджэння Філіповіч Марыі Канстанцінаўны (1947—2003), беларускага празаіка.*

**1**
*— 60 гадоў з дня нараджэння (1947) Хвалея Яўгена Іванавіча, беларускага паэта, крытыка, публіцыста.*

**3**
*— 60 гадоў з дня нараджэння (1947) Гігевіча Васіля Сямёнавіча, беларускага празаіка.*

**5**
*— 100 гадоў з дня нараджэння Губарэвіча Кастуся (Канстанціна Лявонавіча; 1907—1987), беларускага драматурга, тэатральнага крытыка, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі.*

**5**
*— 60 гадоў з дня нараджэння (1947) Клімянкова Івана Пракопавіча, беларускага празаіка.*

**8**
*— 105 гадоў з дня нараджэння Карабана Сцяпана Ігнатавіча (1902—1974), беларускага літаратуразнаўца.*

**9**
*— 110 гадоў з дня нараджэння Шашалевіча Васіля Антонавіча (1897—1941), беларускага драматурга.*

**9**
*— 70 гадоў з дня нараджэння Рашкоўскага Леаніда Сямёнавіча (1937—1994), беларускага паэта. Пісаў на рускай і беларускай мовах.*

**12**
*— 90 гадоў з дня нараджэння Калачынскага Міхася (Міхаіла Іванавіча; 1917—1990), беларускага паэта, перакладчыка, кінасцэнарыста, заслужанага работніка культуры.*

**15**
*— 80 гадоў з дня нараджэння (1927) Васілеўскай Галіны Ануфрыеўны, беларускага празаіка.*

**20**
*— 115 гадоў з дня нараджэння Тарашкевіча Браніслава Адамавіча (1892—1938), беларускага грамадска-палітычнага дзеяча, мовазнаўца, публіцыста, перакладчыка, літаратуразнаўца.*

**20**
*— 115 гадоў з дня нараджэння Шырмы Рыгора Раманавіча (1892—1978), беларускага харавога дырыжора, фалькларыста, музычнага і грамадскага дзеяча, публіцыста, народнага артыста Беларусі і СССР.*

**31**
*— 115 гадоў з дня нараджэння Гурло Алеся (Аляксандра Кандратавіча; 1892—1938), беларускага паэта, празаіка, перакладчыка.*

Аксана БЯЗЛЕПКІНА



# СУЧАСНЫ ЧАЛАВЕК АДАМА ГЛОБУСА

**Наш парадаксальны час** кшталтуе новых людзей. Мы нібыта распускаемся ў прасторы, і вось ужо нас можна адшукаць не толькі дома і на працы, але таксама праз сотавую сувязь ці Інтэрнет. Мы адкрытыя ўсяму свету? Няпраўда ж... Мы засланяемся і ад свету, і ад сучаснікаў зычлівымі, на ўсялякі выпадак, усмешкамі альбо пахмурнымі позіркамі ў якасці прэвентыўнай абароны. Дазволіўшы сабе шчырасць, мы нярэдка шкадуем пра гэта. У кантактах з людзьмі так лёгка параніцца. Падобнай пазіцыі прытрымліваецца і лірычны герой Адама Глобуса, які **сумняваецца ў плённасці камунікацыі** і свядома адмаўляецца ад шчырасці ва ўзаемінах, зрэшты, не пазбягаючы людзей.

*Ты прыходзіш у цёмна-зялёныя дні.*
*Ты прыходзіш у цёмна-зялёныя ночы.*
*Ты прыходзіш, і мы застаемся адны.*
*У халодным пакоі ратуемся моўчкі.*

*Ты сыходзіш у цемру чырвоных агнёў.*
*Забіраеш адно безнадзейную стому.*
(«Ты»)

Маўчанне здаецца надзейнай і неабходнай, хаця і ўяўнай мяжой між суразмоўцамі. Лірычны герой дэманструе нечаканую веру ў магутнасць слова (*А наша слова не згарыць // Паміж руінамі старога*. «Чаканне»), а таксама ў яго разбуральную сілу (*Адно што добра — шчыра не гаворым. // Наш пацалунак запаўняе свет.* «На пероне»). Лірычнаму герою прасцей перажыць любыя эмоцыі, любыя страсці ў сабе, у думках, віртуальна. Ён **самадастатковы** ў сваёй самоце:

*Хоць і паблытаны словы вятрамі,*
*Хоць і, забыўшыся на паратунак,*
*Пані Маркота кратае струны*
*Стомленай арфы ў колішнім храме.*
<…>
*Абавязкова горыч самоты*
*мы да сустрэчы ператрываем.*
(«Ліст да каханай»)

Але потым:

*Чым сустрэча бліжэй,*
*Тым жаданне пабачыцца меней.*
*На каханне находзіць зацменне…*
*Хто яго зберажэ?*

Трэба адзначыць, што і фантазіі ў лірычнага героя атрымліваюцца дасканалейшымі за рэальнасць, бо зазнаюць літаратурныя ўплывы і распускаюць водар шляхетнасці і ўзаемнай павагі:

*Вы на мяне, а я на Вас*
*глядзім, глядзім, вачэй ня зводзім…*
*Як жа ня хочацца сыходзіць*
*у безнадзейна позні час…*

Лірычны герой Адама Глобуса верыць у немагчымасць камунікацыі, але пад уціскам соцыуму сумленна спрабуе наладзіць кантакт з іншымі людзьмі. І калі не атрымліваецца, то прыходзіць дзіўнае адчуванне... задаволенасці і прыгажосці моманту:

*Не хапіла слоў, хапае слёз,*
*На матыў адвечнай песні песняў.*
*Што казаць, такі ўжо выпаў лёс —*
*Развітацца ў ядлаўцовым лесе.*
(«Дым»)

Любоўныя пакуты — гэта яшчэ адна нагода для самааналізу, для заглыблення ў свае адчуванні і, вядома ж, для творчасці:

*На вострых кант барвовых дахаў,*
*Паміж прутоў антэн, на лёд*
*Упала сонца — збітым птахам.*



*Адам Глобус з «партрэтам» Якуба Коласа, напісаным у 1978 годзе падчас вучобы ў тэатральна-мастацкім інстытуце.*

*<...>*
*На чорным небе звар'яцелым*
*Накрэслю крэйдай месяц белы.*
(«Эпітафія каханню»)

Герой задаволены заканчэннем адносін. Чаму? Таму што прагне пэўнасці. А чалавечыя стасункі такія нетрывалыя. Некалі вычарпаецца сяброўства, каханне выдзьмецца часам, ад любові ж да нянавісці адзін крок... А пэўнасць толькі ў тым, што камунікаванне раней ці пазней будзе завершана. Лірычны герой Адама Глобуса ўсё трымае пад кантролем: ён сам робіць апошні крок да нянавісці-пэўнасці альбо адцягвае гэты момант, зрэшты, застаючыся перакананым у ягонай непазбежнасці:

*Давай не будзем гаварыць*
*Ні добрага і ні благога,*
*Каб не пазбавіцца святога,*
*Давай маўчаць і доўга жыць.*
(«Чаканне»)

Ён зноўку пазбягае слоў: яны дэсакралізуюць усё, да чаго «дакранаюцца», словы разбураюць. А маўчанне, як вядома, золата...

Зразумела ж, спачатку ўсё-ткі Слова. Але што яно зменіць у вуснах чалавека, не Бога?

*Ты не ў гуморы, я не ў гуморы.*
*Сядай за стол, мы пагаворым.*
*Нас аб'яднае агульны вораг.*
*Мы пагаворым пра наша гора.*
*<...>*
*Не знікнуць горы. Не згаснуць зоры.*
*Дык што мы творым? Нашто гаворым?*
(«Размова»)

Лірычны герой Адама Глобуса выбірае для сябе **сітуацыйнае сяброўства**: калі сябар — гэта не столькі родная душа, колькі своеасаблівая пасада, на якую ён прызначае людзей. Прызначае таго, хто побач, але такі адрозны, такі іншы, што выглядае супрацьлегласцю і быць сябрам насамрэч проста не можа:

*Ты п'еш за жонку, я п'ю за дзяцей.*
*Ты за каханне уздымаеш чарку.*
*а я — стары і п'ю за гаспадарку.*
*Мне так прасцей.*
*Так, сапраўды, прасцей.*
(«Вечаровае»)

І нават алкаголь, спрадвечны медыятар мужчынскіх размоў, не ўратоўвае сітуацыю. Ад слова «гаспадарка» павявае грунтоўнасцю, вартай моцнага, заможнага гаспадара, для якога матэрыяльнае мае ці не большую вагу, чым духоўнае. Прынамсі, матэрыяльнаму дакладна можна давяраць. А сябрам?

*Мароз у Вільні. Дзень цудоўны.*
*Мой сябра беларускамоўны*
*п'е брэндзі. Я гарбату п'ю.*
*У рэстарацыі шыкоўнай*
*гаворым ціха і тактоўна*
*пра Вільню, кожны пра сваю.*

*Ён любіць вежы і касцёлы,*
*шынкі — дзе дух заўжды вясёлы,*
*архіў і універсітэт.*
*А я люблю ў царкве анёлаў,*
*кірмаш, вакзал і грукат колаў,*
*калі ў кішэні ёсць білет.*

*Мароз і сонца. Дзень сапраўдны.*
*Мы п'ем: я — брэндзі, сябра — каву.*
*Дап'ем і пойдзем спакваля.*
*У Вільні нас чакаюць справы.*
*Яму налева, мне направа,*
*бо Вільня ў кожнага свая.*

Верш «У нашай Вільні» — сапраўднае прызнанне: лірычны герой абірае для сябе любімымі месцамі вакзал і кірмаш, дзе так шмат людзей, дзе ўсе нібыта разам, а

насамрэч паасобку. Лірычны герой дэманстратыўна саступае перад патрабаваннямі грамадства, якое ўсіх робіць вымушанымі экстравертамі, маўляў, калі вы так настойліва патрабуеце камунікацыі, магу вам прапанаваць чарговы спектакль, ілюзіён, імітацыю. Але лірычны герой Глобуса насамрэч застаецца **адзін у натоўпе**. Вакзал — не шынок, там ніхто не будзе вярэдзіць душу нестэрыльнымі словамі.

А **слова** ўсведамляецца лірычным героем як **наймацнейшая зброя**, не столькі нават з прычыны яго вялікай сілы, колькі з прычыны дасяжнасці любому чалавеку: яго ўжыванне іншымі немагчыма кантраляваць. Іншых людзей наогул немагчыма падпарадкаваць, калі яны самі не аддаюцца ў тваю ўладу, спавітыя любоўю: і лірычны герой Адама Глобуса, які так скептычна ставіцца да самой магчымасці шчырага камунікавання з іншымі людзьмі, раптам выяўляе самаахвярнасць і чуласць, калі ідзе гаворка пра крэўных — брата, дзяцей.

*Божа, Божа, што тут гаварыць?*
*А каму на гэтым свеце лёгка?*
*Дык няхай душа мая гарыць,*
*Брату выплаўляючы палёгку.*
(«Металургія»)

Лірычны герой ведае родных ад нараджэння — іхняга ці свайго, гэта тыя людзі, якія заўсёды побач. Гэта пэўнае. Гэтаксама як пэўнымі і гарантаванымі застаюцца «**вечныя радасці**», вядомыя з маленства:

*Збіраць грыбы?..*
*Што можа быць працей,*
*калі з дзяцінства*
*ведаеш пра месца,*
*дзе пад імхом*
*хаваюцца лісічкі...*
*Ідзеш — і набіраеш поўны*
*кош.*
(«Лісічкі»)

Ёсць асалода незваротнасці ў тым, што будзе заход сонца, што будуць лісічкі ў лесе, а потым будзе зіма. Няспынная хада прагрэсу не закранае гэтую тэрыторыю стабільнасці. Лірычны герой Адама Глобуса не любіць сюрпрызаў, ён намагаецца абмінуць, выключыць са свайго жыцця гэты небяспечны чалавечы фактар. Яму лашчыць вока і душу парадак ды геаметрычная дакладнасць:

*Ёсць рэчы: патрэбныя і непатрэбныя,*
*чужыя, свае, залатыя і срэбныя...*

*Навесці парадак — такая задача —*
*пачысціць, прыбраць і зрабіць справаздачу.*

*Наводзіш парадак, выкідваеш смецце;*
*свабодна і вольна жывецца на свеце.*
(«Парадак»)

Альбо:

*Мне падабаецца: мікрараён —*
*Жалезны дух у канструктыўным целе.*
(«Сталіца»)

Дасканалай здаецца і прырода, калі да яе не дакрануліся людзі, якім рэдка ўдаецца супрацоўніцтва з нерукатворным у дэкаратарскім майстэрстве:

*Збяруся і паеду ў зімні лес,*
*Дзе існуюць гармонія дый згода,*
*Спакойна спіць знямелая прырода,*
*У белай форме — самы чысты змест.*
(«Зімовы лес»)

Дзіўным чынам **нежаданне асобаснай камунікацыі стасуецца з неверагоднай патрэбай** лірычнага героя Адама Глобуса **дзяліцца сваімі назіраннямі**, сваім жыццёвым досведам. Але гэта тлумачыцца найперш тым, што навучаюць, адукоўваюць пераважна **з пазіцыі настаўніка**, якая апрыёры знаходзіцца вышэй за пазіцыю вучня. І лірычны герой Адама Глобуса не гатовы



*Адам Глобус у мястэчку Койданава (Дзяржынску), каля дома, дзе прайшлі лепшыя гады ягонага жыцця. 2005 год.*



*Адам Глобус у Вене, каля помніка Іагану Штраусу. 1999 год.*

чакаць, пакуль яго разгадаюць. Ён наўпрост гаворыць пра свае эстэтычныя ўпадабанні, таму ў вершах манументальныя апісанні часта аздабляюцца катэгарычнымі па сваёй інтэнцыі пазнакамі «мне даспадобы», «мне да душы», «мне падабаецца», «люблю»:

*Мне да душы ісці па рыштаваннях*
*На самы найвышэйшы дах. Люблю*
*Убачыць на дарожным скрыжаванні*
*Рассыпаную з кузава зямлю.*
(«Сталіца»)

Альбо:

*Танчыць чорная котка*
*На кухонным стале.*
*Аксамітныя танцы*
*Падабаюцца мне.*
(«Аксамітныя танцы»)

Але гэта часовы стан, бо потым лірычны герой у шматлікіх хоку, дзе ён знаходзіцца часцей па-за тэкстам, аддае перавагу дакладнай канстатацыі дзеяння ці апісанню малюнка.

*Шэра-жоўты снег*
*плямамі ў полі ляжыць,*
*вецер гоніць пыл.*

Лірычны герой выступае тут як дакументаліст. Ён фіксуе навакольнае нават не як фатограф, які можа «спыніць імгненне» прыгожа альбо няўдала, зарэтушаваць, «адфоташопіць», пагуляцца з ценем і святлом, урэшце зрабіць калаж. Нават свае асабістыя адчуванні і пачуцці лірычны герой хоку перажывае адстаронена, нібыта доктар, які ставіць дыягназ (зрэшты, нястрашны), але лічыць бессэнсоўным ці немэтазгодным лячэнне ці нейкае іншае ўмяшальніцтва.

Лірычны герой канстатуе пэўную сітуацыю, не спрабуючы прадказаць, як адгукнецца яго слова. Гэта нават неістотна, ён жа не верыць у магчымасць шчырай эмацыянальнай повязі між людзьмі. Цікава іншае, лірычны герой Адама Глобуса, не могучы намацаць агульнасць з суразмоўцамі ў выглядзе эмоцый ці эстэтычных густаў, выбірае дасканалую і, дарэчы, вельмі сучасную звязку — **інфармацыю**:

*З кнігаю ў руцэ*
*наведваю кавярню,*
*накрапвае дождж.*

**Проста факты, нават без каментарыяў, ствараюць агульнае поле** паміж лірычным героем Адама Глобуса і людзьмі, што яго атачаюць. Ён дазваляе іншым дадаваць свае інтэрпрэтацыі. Насамрэч, ён, вядома ж, вымушаны гэта рабіць, не маючы сілы забараніць іншым людзям думаць і гаварыць, але ён прымае такую сітуацыю, прыстасоўваецца да яе і задаволены ёю дзеля адзінага: ён для гэтых чужых людзей з'яўляецца той самай крыніцай інфармацыі, фактаў, якія будуць нязменным складнікам магчымых размоў. Тут ён зноў абірае для сябе пазіцыю настаўніка. Гэтая роля, магчыма, не з'яўляецца ягоным пакліканнем, але менавіта так ён адчувае сябе камфортна, бо не церпіць над сабой кантралёраў.

У прынятай светабудове немагчыма пазбегнуць увагі Бога, які любіць і кантралюе адначасова. Можна прадбачыць, што паспяховая камунікацыя з Богам у лірычнага героя Адама Глобуса будзе адбывацца без

пасрэдніцтва святароў, але праз пасрэдніцтва «сябе самога ідэальнага». Калі лірычны герой знаходзіцца ў сітуацыі, у якой не адчувае Боскай любові, ён дазваляе сабе канстатаваць яе адсутнасць:

*Адчыніце ўсе дзверы,*
*Паламіце замкі,*
*Адпусціце ўсе душы*
*На чатыры бакі.*
*Паляцелі ўсе душы*
*На чатыры бакі,*
*Зачыніліся дзверы*
*І ржавеюць замкі.*
*Я стаю на крыжы*
*беларускіх дарог*
*і не бачу дзвярэй,*
*за якімі ёсць Бог.*
(«Скрыжаванне»)

У іншых варунках малітва, размова з Богам, вядзецца лірычным героем іначай, нават праз класічныя рэлігійныя формулы самапрыніжэння «*я слабы, з атручанай душой*»:

*Божа, забяры маё жыццё,*
*Выратуй знямелую Айчыну,*
*Выратуй ахвяру і злачынцаў...*
*Божа, забяры маё жыццё.*

*Ты адзіны вольны і вялікі,*
*Ганарлівым адпусці грахі.*
*Веру — да цябе вядуць шляхі.*
*Ты адзіны вольны і вялікі.*

*Я слабы, з атручанай душой,*
*Брудны гад, скалечаны, нікчэмны...*
*Веру ў розум светлы і надземны.*
*Я слабы, з атручанай душой.*

Насамрэч гэта верш-ахвярапрынашэнне:

*Божа, забяры маё жыццё,*
*Іншага не маю, каб аддзячыць.*
*Ну хіба што гэтым ціхім плачам.*
*Божа, забяры маё жыццё.*
(«Спроба малітвы»)

Лірычны герой са сваёй (!) ініцыятывы прапаноўвае на выбар сваё жыццё альбо верш-малітву з таемным спадзевам, што Богам, *вольным і вялікім*, будзе зроблены правільны выбар на карысць літаратуры. А гэта ўжо выглядае своеасаблівай адтэрміноўкай, прывіднай гарантыяй, так неабходнай лірычнаму герою, які, нават адчуваючы цяжкасці жыцця, бязмежна цэніць кожную яго хвіліну (*Душа — жаданне жыць, // ігнараванне смерці.* «Мая душа»).

Хаця ў іншых тэкстах лірычны герой Адама Глобуса сапраўды стварае краявіды без сябе (напрыклад, у вершы «Парк»: *На зіму маскараднае золата скінулі клёны. // На зіму зачыніліся атракцыёны.*) і апісвае відавочныя рэчы, што існуюць нават па-за ягонай свядомасцю, а значыць, нібыта не патрабуюць яго прысутнасці (верш «Нацюрморт»: *Вісіць вяндліны цяжкі кош. // Там мыш дзярэцца на куфэрак. // Сцяна, тырчыць зламаны нож*), клопат пра радзіму, пра людзей сапраўды прысутнічае ў шырокім спектры клопатаў лірычнага героя Адама Глобуса, але ў паслядоўнасці такой, якая пазначана на канвертах: спачатку і перадусім **дом**, потым вуліца, горад, etc.

Лірычнаму герою Адама Глобуса мулка ў агрэсіўна-патрыятычнай стылістыцы. Ён падобны да героя кітайскай паказкі, які, седзячы на гары, назірае, як унізе грызуцца тыгры (вось яна, шчырая камунікацыя!), а потым спускаецца да знясіленага пераможцы і яго забітага суперніка ды здабывае абедзве шкуры. **Лірычны герой Глобуса найперш назіральнік**, які пад уплывам хвіліннай слабасці можа дазволіць сабе прымроіць сябе іншага. Зрэшты, ненадоўга і не настолькі, каб змяніць утульную звыкласць сваіх паводзін. Але наша паэтычная традыцыя па-ранейшаму вымагае пэўнай ваяўнічасці і паліткарэктнага альтруізму. Добра, ён згодны, што

*Мы — беларускі рух!*
*З намі крывіцкі дух.*
*Покі сумленне ёсць,*
*Мы — беларускі лёс!*
(«Беларускі рух»)

Ён згодны, і не прасіце большага: ён ужо не маладзенькі хлопчык, бо ёсць жа гаспадарка, сям'я і самае галоўнае — ён сам са сваімі назіраннямі і жаданнем перадаваць свой досвед. Насамрэч, усё, вядома ж, глыбей: кожнае пакаленне беларусаў перажывала столькі гістарычных зменаў, што **адточваўся да дасканаласці і неадольнасці адно што інстынкт самазахавання**.

*Пойдзеш на захад*
*і прыйдзеш на ўсход.*
*<...>*
*Кола замкнёнае.*
*Ясная поўня*
*зманліва кліча*
*ў бясконцы паход.*
(«Кола»)

Так што дзякуй за запрашэнне. Але ты, дарагі паплечнік,

*Змагайся, каб святое не звялось,*
*Ідзі на бой, ідзі самаахвярна*!
(«Паплечніку»)

Лірычны герой Адама Глобуса сам не можа быць іншым, але ён можа падтрымаць патрыятычны дух свайго вучня, свайго духоўнага сына, можа скіраваць яго юначую ваяўнічасць і прагу актыўных дзеянняў у сацыяльна карыснае рэчышча:

*З магчымасцяў — гнісці або гарэць —*
*ты, безумоўна, абярэш другую.*
*Хай не сябе, дык іншага ўратуеш*
*і недарэмна будзеш палымнець.*
*<...>*
*Ты пойдзеш біць маланкай залатой*
*тых, хто гніе ў засмечаным балоце.*
*Тых, хто скавыча ў гнойнай бруднай слоце,*
*ты пераможаш, мілы вучань мой.*
(«Наступніку»)

Выправіўшы наступніка за дзверы, нарэшце можна засяродзіцца на грунтоўных высновах, народжаных падзеямі з жыцця і падмацаваных думкамі шматгадовай вытрымкі:

*Не патрэбна сустрэча з анёлам,*
*тым болей, прарокам.*
*Не патрэбна падтрымка ад моцных,*
*тым болей, вялікіх.*
*На сябе спадзяюся*
*і веру пясчаным дарогам.*
*Спадзяюся на сябра,*
*якога няможна паклікаць.*
*<...>*
*Ёсць дарога, няма ў той дарогі канца*
*і пачатку;*
*Можа, ёсць, толькі я іх ніколі не ведаў,*
*не бачыў.*
*Я іду, каб дарога прасцейшай*
*здавалася брату.*
*Над пуцінаю рогат крыжуецца*
*з енкам і плачам.*

*Неразумна ісці і не бачыць*
*хоць нейкае мэты;*
*А ці варта ісці да святла не свайго,*
*а чужога?*
*Можа, каменем лепей ляжаць*
*на зямлі запаветнай?*
*Пэўна, лепей, ды не адпускае*
*цяжкая дарога.*
(«Развагі»)

Кожны сказ як слуп, вакол якога можна вадзіць філалагічныя карагоды, а цалкам верш выглядае як квінтэсенцыя жыццёвай стратэгіі лірычнага героя Адама Глобуса. Зрэшты, магу памыляцца. Рэканструкцыя вобраза лірычнага героя — справа няўдзячная: даследчык сумленна шукае да аўтара ключ, але толькі на той звязцы, якая ёсць у ягонай кішэні. І таму лірычны герой атрымліваецца трошкі падобным да аўтара і трошкі падобным да даследчыка як плён супольнай фантазіі.

Ірына КЛІМКОВІЧ

# У МАЛАДЫХ СВОЙ ШЭКСПІР, АБО ДЫЯЛОГІ Ў ТЭАТРАЛЬНАЙ ГАСЦЁЎНІ


Валянціна Еранькова.

*1 лістапада 2006 года на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага адбылася прэм'ера драматычнага твора ў жанры мюзікла «Утаймаванне свавольніцы», створанага рэжысёрам Валянцінай ЕРАНЬКОВАЙ і кампазітарам Аляксеем ЕРАНЬКОВЫМ па аднайменнай камедыі Уільяма Шэкспіра. Побач з заслужанымі майстрамі сцэны ў спектаклі задзейнічаны і выпускнікі Акадэміі мастацтваў.*

*Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага, вядомы ў сталіцы пад назвай «Рускі», пачаў сваю дзейнасць у 1932 г. У 1955 г. тэатру нададзена імя Максіма Горкага, у 1994 г. тэатр атрымаў ганаровую назву – Акадэмічны, у 1999 – Нацыянальны. Шлях тэатра пачынаўся ад вандруючай трупы, якая іграла п'есы Шэкспіра і Горкага ў пажарным дэпо. Паступова калектыў набывае міжнародную вядомасць, яго запрашаюць на лепшыя сцэны Расіі, Швецыі, Германіі, Польшчы. Яго рэпертуар складаецца з класічных твораў сусветнай, беларускай і рускай драматургіі. У наш час поспех калектыву звязаны з дзейнасцю мастацкага кіраўніка тэатра, народнага артыста Беларусі Барыса Луцэнкі. У трупе тэатра – зоркі беларускага тэатральнага мастацтва: народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі, народныя артысты Беларусі Бэла Масумян, Вольга Клебановіч, Аляксандр Ткачонак, заслужаныя артысты Беларусі Андрэй Душачкін, Уладзімір Шэлестаў, Эдуард Гарачы, заслужаныя артысты Расіі Аляксандр Брухацкі, Алег Корчыкаў і інш.*

*Рускі тэатр сёння – гэта жывы арганізм. Каб жыць і развівацца надалей, яму трэба час ад часу атрымліваць свежае дыханне. Ужо каторы год тэатр набірае ў свае шэрагі маладыя таленты – выпускнікоў Акадэміі мастацтваў. Сёлета ў п'есе «Утаймаванне свавольніцы» бяруць удзел выпускнікі Фамы Сельвестравіча Варанецкага выпуску 2006 г. А патрапілі яны ў Рускі тэатр, дзякуючы Валянціне Еранькоўай, якая пазнаёмілася з імі на дыпломным спектаклі «Сільвія» па п'есе А. Герні. Знаёмства было ўдалым, таму рэжысёр вырашыла працягнуць працу з маладымі акцёрамі ў спектаклі «Утаймаванне свавольніцы». Дзякуючы новаму погляду на рэжысуру, вясёлая і павучальная гісторыя пра наравістую Катарыну, напісаная У. Шэкспірам у жанры камедыі, цяпер існуе на сцэне Рускага тэатра ў жанры мюзікла. Як заўважыў кампазітар А.Еранькоў: «У нашым мюзікле на першым месцы стаіць драматургія, а вербальныя матывы непасрэдна пераходзяць у музычныя». Што тычыцца рэжысуры, героі п'есы, выпісаныя англійскім драматургам у кантэксце XVII ст., з'яўляюцца перад гледачом у незвычайным выглядзе. Мы бачым сучасныя элементы адзення. На шляхціцы з Вероны, Петручыо, і яго нявесце Катарыне – маладзёжная вопратка і кеды XX ст. Магчыма, аматарам класічнай пастаноўкі гэта не спадабаецца, але маладому гледачу... У спектаклі выкарыстаны санеты У. Шэкспіра. Зроблены своеасаблівы «вінегрэт»: тут вам і рэп, і поп, і рок, і дыска, і тэхна, а на іх фоне гучаць радкі з розных санетаў.*

*А пакуль маладыя акцёры стараюцца паказаць майстэрства. Давайце ж з імі пазнаёмімся.*

КУЛЬТУРА



Адну з галоўных роляў у спектаклі іграе **Вераніка ПЛЯШКЕВІЧ.** Жвавая дзяўчына з дзяцінства зразумела, што будзе актрысай, бо яшчэ са школы брала ўдзел у конкурсах самадзейнасці. Пасля выпускнога балю ў яе не ўзнікла пытання — кім быць? Скончыўшы тэатральны факультэт, яна патрапіла ў Рускі тэатр. Сустрэлі яе ветліва. А тут яе любімы рэжысёр, Валянціна Еранькова, прапанавала галоўную ролю — сыграць адзін з самых цікавых жаночых вобразаў — наравістую і ўпартую Катарыну. У запаветных марах Веранікі ёсць і іншы вобраз: Настасся Філіпаўна з Дастаеўскага; а падчас вучобы ў акадэміі ставілі купалаўскае «Раскіданае гняздо», дзе Вераніцы прапанавалі ролю Зоські. Дарэчы, гэтая п’еса ідзе ў Рускім тэатры на мове арыгінала.

**— Вераніка, у чым, па-вашаму, сакрэт Катарыны?**

— У жаночай мудрасці. Петручыо і Катарына — гэта адно цэлае, яны вельмі падобныя: абое ўпартыя і свавольныя. І ўсё ж такі Петручыо па сваім мужчынскім разуменні не можа саступіць жанчыне і пачынае ўтаймоўваць будучую жонку. Як ён сам кажа: «Мне выпаў лёс цябе з шалёнай рысі // Зрабіць рахманай кошачкаю, Кэт, — // Звычайнаю, дамашняй мілай кошкай...» Катарына пачынае разумець, што ўпартасцю яна не дасягне гармоніі ў сямейным жыцці, таму і саступае свайму Петручыо, яна ўтаймовае свой нораў. У фінале п’есы гучаць словы: «Мой муж — мой гаспадар і абаронца, // Мой дабрабыт, апека, светач мой...» Я цытую Шэкспіра ў перакладзе Я. Семяжона.

**— Цудоўна. А ці не перашкаджае прафесія ў асабістым жыцці?**

— Не мне судзіць. Аднак сустракаюцца і такія экземпляры, якія ўсё жыццё носяць маскі. Дома яны адны, з сябрамі іншыя. Сама я не такая. Але часам акцёрскі досвед прыдаецца і ў жыцці, калі трэба схавацца ад непрыемнага чалавека. Гэта псіхалагічная абарона. Але так не павінна быць, чалавек жа пад Богам ходзіць.



У процілегласць свавольнай Катарыне, яе спагадлівую і пакорлівую сястру Б’янку іграе маладая актрыса **Юлія КАДУШКЕВІЧ**. Нягледзячы на тое, што маці Юліі была ў свой час і актрысай, і рэжысёрам на БТ, дачку ад такога лёсу адгаворвала. Але аднойчы дзяўчына патрапіла ў Купалаўскі тэатр на прэм’еру спектакля «К’ёджаўскія перабрэхі» і вырашыла стаць актрысай. На другі год навучання ў акадэміі яе запрасілі на выпускны курс Міхаіла Пташука сыграць у дыпломнай працы Яўгенія Сыцько — кароткаметражнай стужцы па аповесці В. Быкава «Пайсці і не вярнуцца». Роля Юліі спадабалася, і яна з задавальненнем працавала на здымках.

**— Юля, як вы ўспрымаеце сваю ролю ў спектаклі «Утаймаванне свавольніцы»?**

— Мне здаецца, што Шэкспір хацеў паказаць характар жанчын, якія пад маскаю спагадлівасці і паслухмянасці хаваюць вераломства і хітрасць. Падобныя асобы толькі і чакаюць часу, каб праявіць сябе. Пасля замужжа з Б’янкі злятае маска пяшчотнай і паслухмянай дзяўчынкі, яна робіцца свавольнай і дзёрзкай, як яе сястрыца. А такім чынам гармоніі і шчасця з каханым не дасягнеш. Я думаю, так прыкладна і разумелі ў часы Шэкспіра праблемы сямейнага жыцця.

**— Што, па-вашаму, галоўнае для артыста?**

— Трэба любіць сваю прафесію. Не спыняцца да дасягнутым, заўсёды сумнявацца ў сабе, але верыць у свой талент. Артыст павінен быць чалавекам вялікай душы і самадастатковай асобай. Кожная роля патрабуе цвярозага асэнсавання, а не бяздумнага яе ўвасаблення. Увесь час трэба ставіць перад сабою мэты і імкнуцца дасягаць іх. Неабходна праводзіць пераацэнку каштоўнасцей, ацэньваць сябе адэкватна, каб ведаць, на якой стадыі ты знаходзішся, зноў ставіць мэты — і так бясконца.



Ролю ўдавы, жанчыны-двайніка Б'янкі, увасобіла на сцэне **Іна САВЯНКОВА.** Дзяўчына выйшла з сям'і вайскоўцаў, з дзяцінства вырашыла прысвяціць сваё жыццё тэатральнаму мастацтву. Ужо, іграючы ў школьных спектаклях, яна мэтанакіравана ішла да прафесіі. Яна верыла ў свае сілы і прымусіла паверыць у іх выкладчыкаў акадэміі. Нядаўна ёй прапанавалі галоўную ролю ў спектаклі «Злоўлены сеткаю» па п'есе Рэя Куні.

**— Іна, а ці не перабольшванне ўводзіць у п'есу два аднолькавыя вобразы: Б'янка і ўдава? Што хацеў, па-вашаму, сказаць гэтым У. Шэкспір?**

— Вобраз удавы разам з вобразам Б'янкі толькі падкрэслівае распаўсюджаны тыпаж жанчын, якія да часу прыкідваюцца добрымі і пакладзістымі, а пасля замужжа патрабуюць ад мужоў, каб тыя выконвалі ўсе іх прыхамаці. Цяпер такіх жанчын называюць эмансіпіраванымі. Дарэчы, у гэтым і геніяльнасць Шэкспіра, ён прадугледзеў цяперашняе жыццё, заўважыў і ўвекавечыў такія вобразы, якія будуць існаваць столькі, колькі існуе наша цывілізацыя.

**— Калі вы ўпершыню зразумелі, што вы актрыса?**

— У 8-м класе, калі інсцэніравалі казку «Як яйка курыцу вучыць». Я іграла яйка і курыцу адначасова. З гэтай казкай мы выступалі па ўсім горадзе. Мяне хвалілі, казалі — дзяўчынка таленавітая. Гэта быў мой зорны час.



Але не толькі жаночыя вобразы несмяротнай п'есы ўвасобілі выпускнікі акадэміі 2006 г. Валянціна Еранькова прапанавала ім і мужчынскія. Да прыкладу, аднаго з галоўных герояў п'есы — Траніо, слугу Лючэнцыо, іграе **Віталь КРАЎЧАНКА.** Віталь, які нарадзіўся у г. Лоеве Гомельскай вобл., пасля школы хацеў стаць настаўнікам пачатковых класаў, таму падаўся ў педвучылішча. Там яму давялося іграць у самадзейных спектаклях, што, безумоўна, паўплывала на змену прыярытэтаў. На жаль, першая спроба паступіць у акадэмію была няўдалай. Але яму прапанавалі працу рэжысёра народнага тэатра ў раённым Доме культуры. Працуючы рэжысёрам, Віталь праз год зноў едзе ў Мінск, паступаць на тэатральны факультэт. На гэты раз мары яго збываюцца, і ён трапляе на курс Ф. С. Варанецкага. Тое, што ён пасля вучобы будзе накіраваны ў Рускі тэатр, было для яго нечаканасцю. Купалаўскі тэатр па творчай атмасферы заўсёды быў яму бліжэй. А калі ён апынуўся ў творчым калектыве Рускага тэатра, то адразу адчуў цеплыню і клапатлівыя адносіны калегаў. Сёння ён мае ўжо дзве ролі. Апроч Траніо ў п'есе «Утаймаванне свавольніцы» Валянціна Еранькова прапанавала яму ролю Гэйвіна ў «Злоўленым сеткай». Яго амплуа ўжо вызначылася — камедыйныя ролі. В. Краўчанка марыць увасобіць на сцэне нароўні з камедыйнымі і драматычныя ролі: Раскольнікава, горкаўскага Саціна і чэхаўскага дзядзьку Ваню. Яго хвалююць і беларускія класічныя творы. Гэта мужчынскія вобразы з «Дзікага палявання», «Раскіданага гнязда» і «Тутэйшых».

**— Віталь, што для вас азначае роля Траніо, усё ж, ён слуга і не можа па-сапраўднаму ўплываць на лёс герояў?**

— Ідэя, закладзеная Шэкспірам, — дасягненне гармоніі паміж мужчынам і жанчынай. І не важна, у выніку чаго яна ўсталёўваецца, хто гэтыя мужчыны і жанчыны — прасталюдзіны або шляхта. Шэкспіраўскія творы былі папулярнымі, як сярод першых, так і сярод другіх. Вобраз Траніо і быў уведзены Шэкспірам у п'есу «Утаймаванне свавольніцы», каб зрабіць гэты твор больш народным і даступным. Ініцыятыва па авалоданні сэрцам каханай Б'янкі сыходзіць не ад яе жаніха — Лючэнцыо, а ад Траніо. Па яго парадзе гаспадар пераапранаецца ў простага чалавека і ідзе ў дом сваёй Б'янкі ў якасці настаўніка.

**— Праца ў народным тэатры як-небудзь паўплывала на вас? Ад каго найперш залежыць поспех спектакля: ад рэжысёра ці акцёраў?**

— Праца рэжысёра, безумоўна, дала свае вынікі. Там я набыў неацэнны досвед самадысцыпліны і арганізатарскія здольнасці. Але, калі прыходзіш працаваць у тэатр, свой асабісты шлях пачынаеш выбудоўваць па-новаму. Немалаважную ролю адыгрываюць і адносіны з рэжысёрам. Ад рэжысёра шмат што залежыць, і ў першую чаргу поспех спектакля. Але і ад мяне залежыць шмат. Што б ні казаў рэжысёр, ролю выконваць даводзіцца мне. Гэта і мой голас, і мае інтанацыі, і мая пластыка. Здараецца, што мы не разумеем адзін аднаго, гэта творчы працэс. У выніку мы дасягаем адзінства, якое задавальняе і рэжысёра, і нас, акцёраў. А калі задаволіць і гледачоў — гэта ўжо поспех, я лічу.



У п’есе Шэкспіра шмат персанажаў з народа. Слугі часам праяўляюць большую кемлівасць і жвавасць, чым іх гаспадары. Гэта Груміо, Натаніэль, Філіп, Іосіф і Біяндэло. Апошняга іграе **Аляксей СЯНЧЫЛА.** Кожныя два гады Аляксей мяняў школу, а гэта вымагала пастаянна наладжваць кантакты з новымі сябрамі. Таму ён навучыўся знаходзіць агульную мову з абсалютна рознымі людзьмі. Такія кантакты і дапамаглі яму стаць артыстам. Хлопец паехаў паступаць у Вышэйшае тэатральнае вучылішча імя Шчэпкіна ў Маскву. Паступіў. Адвучыўся два гады і… па сямейных абставінах вярнуўся ў Мінск, працягваў вучыцца ўжо ў беларускай Акадэміі мастацтваў. Тое, што цяпер працуе ў Рускім тэатры, лічыць вялікай удачай.

**— Аляксей, чым адрозніваецца ваш герой Біяндэло ад Траніо?**

— Біяндэло блізкі мне па духу персанаж. Сам я добры і мяккі чалавек, як і мой герой. Увасобіцца ў вобраз было няцяжка. А Траніо па п’есе хітры і трошкі каварны чалавек, ён нават разам са сваім гаспадаром насміхаецца над бедным Біяндэло. Хаця гэты цельпукаваты хлопец усё робіць для таго, каб дапамагчы гаспадару Лючэнцыо. Мне здаецца, што Шэкспір увёў яго, каб паказаць, што дасягнуць мэты можна рознымі шляхамі: хітрасцю і вераломствам, дабрынёй і спагадай.

***Мы пазнаёміліі вас толькі з некаторымі маладымі акцёрамі, якія ўпэўнена ўзялі старт на сцэне Рускага тэатра. Цікава будзе паглядзець на іх гадоў праз дзесяць. Ці здзейсняцца іх мары?***

# ВАЖКІ НАБЫТАК



**К**алі б сабраць творы беларускіх пісьменнікаў, у якіх згадваюцца назвы іх родных мясцін, атрымаўся б не адзін цудоўны том. Але ў гэтых тамах мы не знайшлі б назваў шмат якіх вёсак і гарадоў, дзе нарадзіўся той ці іншы творца. Затое згадкі пра некаторыя мясціны мы сустракалі б неаднойчы.

Несумненна, не раз мы сустрэлі б у гэтых тамах Давыд-Гарадок. У тым ліку, і дзякуючы знанаму беларускаму пісьменніку **Георгію МАРЧУКУ.** Некалі вядомы амерыканскі празаік Шэрвуд Андэрсан сказаў свайму маладзейшаму калегу Уільяму Фолкнеру: «Вы, Фолкнер, вясковы хлопец. Усё, што вы ведаеце, — гэта маленькі кавалачак зямлі там, у Місісіпі, адкуль вы выйшлі. Зрэшты, гэтага таксама дастаткова». Пройдзе час, і Фолкнер, ужо вядомы пісьменнік, сам заявіць: «Мая ўласная паштовая марка роднай зямлі вартая таго, каб пісаць пра яе, што майго жыцця не хопіць, каб вычарпаць гэтую тэму». Чамусьці не сумняваюся, што і сярод рэальных прататыпаў галоўных герояў твораў Георгія Марчука ёсць нямала давыд-гарадоцкіх жыхароў — і не толькі ў яго ў многім аўтабіяграфічным рамане «Кветкі правінцыі». Гэтая ўпэўненасць перадаецца разам з любоўю да яго родных мясцін, якім прысвечаны многія старонкі тых жа «Кветак правінцыі». Любоў да кутка маленства — гэта яе пастаянная прысутнасць у табе, нават калі ты ад яго далёка. Прысутнасць вулак, людзей, урэшце, таго непаўторнага роднага водару, які хмеліць і праз гады. Адным словам, усяго таго, што фарміруе асобу і пісьменніцкае светабачанне.

Зрэшты, пісьменнікам Георгій Марчук мог і не стаць, на што ўказваюць некаторыя факты яго біяграфіі. Так, пасля заканчэння ў 1965 годзе сярэдняй школы ён працуе кіраўніком драматычнага гуртка Давыд-гарадоцкага дома культуры, затым пераязджае ў Столін, дзе два гады — таксама ў раённым ДК — займае пасаду адміністратара, пасля чаго становіцца мастацкім кіраўніком ансамбля пры гарадскім парку культуры і адпачынку. І хоць неўзабаве ў столінскай раёнцы пачынаюць з'яўляцца яго гумарэскі і замалёўкі, іх аўтар, па ўсім відаць, усё яшчэ больш думае пра сцэну, чым пра літаратуру ці хоць бы журналістыку. Таму і паступае ён не на філфак ці, у крайнім выпадку, на журфак, як большасць яго аднагодкаў-пісьменнікаў, ужо не кажучы пра іх папярэднікаў, а завочна заканчвае аддзяленне тэатразнаўства Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, а пасля і Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве. Пераехаўшы на сталае жыхарства ў Мінск, ён працуе асістэнтам кінарэжысёра кінастудыі «Беларусьфільм», потым і сам становіцца кінарэжысёрам «Беларусьфільма».

Аднак сцэна і кіно, на самай справе, толькі падштурхнулі яго да актыўнай працы ў літаратуры, у якую ён упэўне-



Марыя Марчук — маці пісьменніка.

багацце» і многія іншыя. Адны былі адрасаваныя дарослым, іншыя дзецям, але спектаклі па іх з аднолькавым поспехам ішлі ў розных, як самадзейных, так і прафесійных тэатрах краіны, інсцэніраваліся на рэспубліканскім рыдыё.

Здавалася б, драматург знайшоў сваю нішу, сваю сцежку ў літаратуры, ідэальную для ўласнага творчага самавыражэння, і цяпер з гэтага шляху ён нікуды не зверне. Але ў 1983 годзе выходзіць яго першы раман «Крык на хутары». Увогуле, многія драматургі спрабавалі сябе ў прозе (альбо паэзіі), прычым, нярэдка такія спробы былі досыць удалымі, ды далёка не ўсе знаходзілі і знаходзяць у сабе сілы быць аднолькава актыўнымі (а галоўнае, далёка не ўсім удаецца быць аднолькава запатрабаванымі) у такіх розных літаратурных жанрах. Георгій Марчук — у гэтым сэнсе, даволі рэдкае выключэнне. Пасля «Крыку на хутары» паралельна з п’есамі ён піша раманы «Кветкі правінцыі», «Прызнанне ў забойстве», «Вочы і сон», «Сава Дым і яго палюбоўніцы», «Без ангелаў», «Год дэманаў», якія маюць шырокі чытацкі розгалас. Паводле «Кветак правінцыі» ў 1994 годзе здымаецца аднайменны фільм, стваральнікі якога, у тым ліку і аўтар-сцэнарыст Георгій Марчук, атрымліваюць Дзяржаўную прэмію Беларусі. Свой багаты драматургічны вопыт

на, лёгка пераадолеўшы пару вучнёўства, увайшоў праз п’есы. Прычым, ужо самая першая з іх «Выкраданне Алены», напісаная ў 1971 годзе, была адзначана прэміяй на рэспубліканскім конкурсе драматургіі. Пасля з’явіліся «Люцікі-кветачкі», «Чаканне сабакі Тэафіла», «Новыя прыгоды Несцеркі», «Загадка каралевы Аварыі», «Магіла Чынгізхана», «Дыскатэка», «Цвярозы дзень Сцяпана Крываручкі», «Вясёлыя, бедныя, багатыя», «Альдона, Анета, Анфіса», «Калі заспявае певень», «Варвара і яе блудны муж», «Чужое



З жонкай Наталляй на Гарыні.



*«Ах, кіно, маё кіно!» Г. В. Марчук на здымках сваёй дыпломнай працы. 1978 г.*

Георгій Марчук напоўніцу выкарыстаў і ў прозе. Яго раманы насычаны дзеяннем, у аснову асноў пакладзены востры канфлікт, а пры вымалёўванні вобразаў герояў шукаюцца найбольш адметныя і яркія фарбы. Гэтым самым пісьменнік прадаўжае лепшыя традыцыі беларускай прозы, традыцыі, на якія заўсёды звярталі вялікую ўвагу яго славутыя папярэднікі-настаўнікі Іван Мележ і Іван Шамякін.

У сваіх творах аўтар па-філасофску ўглядаецца ў сучаснасць, уздымае надзённыя маральна-этычныя праблемы, якія ўплываюць не толькі на наша сённяшняе жыццё, але і на будучыню. Ён любіць гумар, і шчодра выкарыстоўвае яго як у прозе, так і ў драматургіі. Апроч твораў буйных памераў, на творчым рахунку Георгія Марчука і кніга навел «Хаос», ён піша афарызмы, якія ўвайшлі ў яго томік выбранага «Кветкі правінцыі», выдадзены «Мастацкай літаратурай» у 2004 годзе ў серыі «Беларуская проза ХХ стагоддзя». Ёсць там і «Давыд-гарадоцкія каноны», рэч жанрава даволі арыгінальная і цікавая. А яшчэ пісьменнік стараецца не забываць пра юнага чытача, якому адрасаваў сваю кнігу казак «Жылі-былі дзед Васільчык і баба Кацярына». Увогуле, ён піша шмат, і яго прысутнасць у сучасным літаратурным працэсе вельмі адчувальная.

Для кожнага творчага чалавека ўласны юбілей (тым больш, такі важкі як шасцідзесяцігоддзе, якое Георгій Васільевіч адзначыў 1 студзеня), гэта магчымасць азірнуцца назад, падсумаваць зробленае раней. Несумненна, пісьменніку тут ёсць чым ганарыцца, а значыць, ёсць стымул ісці далей, не збаўляючы хады. І, маючы няўрымслівы характар, знаходзячыся ў пастаянным творчым пошуку, сваім шматлікім чытачам ён не пакідае сумнення: будуць новыя раманы, п’есы, апавяданні Георгія Марчука. Будуць новыя кнігі. Будуць новыя спектаклі (а можа, і кінафільмы?), пастаўленыя па яго творах. Будуць таму, што іх чакаюць. А што можа быць больш важным для пісьменніка, чым ведаць пра гэта, апынаючыся сам-насам з чыстым аркушам паперы.

***Алесь БАДАК***

# АРШАНСКІ МЕРЫДЫЯН

Як ёсць свае Нестары ў Полацка ці, прыкладам, у Давыд-Гарадка альбо іншага знакамітага паселішча нашай краіны, так ёсць летапісцы і ў Оршы, якая ўпершыню згадваецца пад датай 10 ліпеня 1067 года ў «Аповесці мінулых гадоў»… Дарэчы, разглядаючы паштоўкі з канца XIX — пачатку XX стагоддзя, знаходзячы сімпатычнымі і цікавымі тыя альбо іншыя віды, уважліва пастаўцеся да наступнага крыніцазнаўчага міні-агляду. 1890 год: у Магілёве-на-Дняпры выдаецца «Устав Оршанского общественного собрания», зацверджаны тым жа годам 19 мая. У 1891 г. у аршанскай друкарні Я. Падземскага пабачыла свет кніжачка Л. Ржавускага «Краткий исторический очерк Оршанского Кутеинского женского монастыря». У 1900 годзе ў Віцебску выходзіць з друку «Оршанский гербовник». А ў Оршы тады ж друкуецца «Устав Оршанской городской библиотеки с кабинетом для чтения им. А. С. Пушкина». У 1913 — работа М. Назарына «О пасхальном образовании в Оршанском уезде Могилевской губернии за 1912 г.». І гэта — толькі пачатак… Хаця пачатак выразны, той, для якога і глеба адпаведная была. Чытаем ў гісторыка-дакументальнай хронiцы Оршы і Аршанскага раёна «Памяць»: «Вялікае культурнае значэнне мела адкрыццё ў 1890-х дзвюх аршанскіх друкарняў — Падземскага і Іёсялевіча, якія распачалі выданне кніг рознага характару і зместу: гістарычных, рэлігійных, гаспадарчых, нават мастацкіх.

Плёнам грамадскіх намаганняў стала стварэнне першай гарадской бібліятэкі. Сродкі на яе збіраліся па падпісцы. Ля вытоку гэтай ініцыятывы стаяў чыноўнік гарадской управы, а потым гарадскі галава Іван Андрэевіч Стратановіч. Бібліятэка адкрылася 6 чэрвеня 1899 г., да 100-годдзя з дня нараджэння вялікага рускага паэта А. С. Пушкіна і была названа яго імем. Фонд бібліятэкі налічваў тады 3—4 тыс. тамоў, у ёй працаваў адзін бібліятэкар, колькасць чытачоў не перавышала 150 чалавек, карыстанне кнігамі было платнае.

Да таго моманту існавалі таксама 3 бібліятэкі-чытальні пры навучальных установах. А ў «Отчете могилевского попечительства о народной трезвости за 1899 год» (Магілёў, 1900) прыгадваюцца кніжныя сховішчы для народа ў Аршанскім павеце.

Прыкладна ў той жа час свае кніжныя зборы ствараюць узнікаючыя палітычныя арганізацыі. У красавіку — верасні 1900 г. ў Оршы існаваў сацыял-дэмакратычны гурток, які меў бібліятэку нелегальнай літаратуры, а Аршанская рабочая арганізацыя (1889—1900 гг.) мела падпісную бібліятэку з прыкладна 80 выданняў РСДРП, Бунда, беластоцкай «Групы рабочых




*Пецярбургская вуліца. Пачатак XX ст.*

рэвалюцыянераў» і інш. Адзначаецца існаванне ў Оршы прыватных бібліятэк Кагана, Шулькоўскага, Брайніна, Зархі, кнігарняў Левіна, Вольфна, Азаліна, Рыўкіна.

Статыстычныя дадзеныя за 1904 г. сведчаць аб наяўнасці ў горадзе 3 бібліятэк і 2 чытальняў, 2 друкарняў, 3 фотамайстэрняў пры адсутнасці тэатраў, музеяў і газет…»




*Духоўнае вучылішча і мост праз раку Аршыцу. Пачатак XX ст.*

У які аршанскі год вам хацелася б патрапіць першнаперш?.. Мо, прыкладам, у 1877?.. Наш з вамі сучаснік, старанны і ўважлівы да гісторыі краязнаўца Святаслаў Асіноўскі (нараджэннем з блізкіх да Оршы Смалян) параўнальна нядаўна выпісаў цэлае кніжнае падарожжа ў горад на Дняпры. А дакладней — падрыхтаваў ілюстраваны храналагічны даведнік «Орша: Залатыя стрэлы на блакітным полі». І там расказаў пра падзеі, што адбываліся ў Оршы, на Аршаншчыне ці не кожны год. Такога падрабязнага летапісу, мусіць, не мае ніводзін з беларускіх гарадоў. Дык вось, следам за Святаславам Асіноўскім мы падарожнічаем па Аршаншчыне 1877 года. А якраз тады віды гарадскіх ваколіц, сядзібы ў Берасценаве, Юрцаве, магілу Тамаша Зана ў Смалянах замалёўваў славуты Напалеон Орда…

Але што мы будзем хадзіць слядамі адкрытымі і вядомымі… Давайце ўгледземся ў старыя паштоўкі і самі пашукаем інтрыгуючыя памяткі даўніны… Выявы настолькі выразныя, што не застаюцца па-за ўвагай многія і многія дэталі побыту, ды і паводзін тагачасных аршанцаў таксама. Што ўжо казаць пра помнікі архтэктуры?!.

У самага знакамітага ўраджэнца Оршы Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча ёсць выдатны нарыс «Рша Камен…» Не, нават не нарыс, не эсэ нават!.. А хутчэй — верш у прозе. Напісаны твор да 900-годдзя роднага горада. Першая публікацыя — у газеце «Літаратура і мастацтва» за 4 ліпеня 1967 года.

«Дзевяцьсот…

Усе гэтыя гады ляжыць ён на вышынях Беларуска-літоўскага ўзвышша, на ўвалах, над Дняпром і ягонымі парогамі. Пойдзеш некуды за Чарталле, сядзеш над празрыстымі водамі, паглядзіш на зарэчныя камяніцы і сады і адчуеш — радзіма. Хай сабе і не жылі тут твае продкі, а — радзіма.

Тое самае, відаць, адчуваў Купала, бо нездарма ж ён пасяліўся менавіта ў гэтых мясцінах.

Усе мы пілі гэтую ваду. Карычневую, як чай, — з Аршыцы, мяккую і празрыстую — з Дняпра, вуглякісла-жалезістую — з Любавіцкіх крыніц.

І ўсе мы, з часоў Усяслава-Чарадзея, асядалі на гэтых стасажэнных гарбах, на Кабыліцкім вапняковым кліне, здабывалі тарпу і секлі лясы, палявалі на бабровых гонях, ішлі на звера і дзічыну, здабывалі балотную жалезную руду, каменнае масла (нафта дагэтуль точыцца ў ваду з берагоў) і непараўнальны наш вапняк.

«Аршанцы-вапеннікі, на вапне любяцца, на вапне родзяцца і ў вапну кладуцца».

Мы заўсёды былі народ прадпрымальны. Дзегцяры, цагельні, смаляры. Наваколле нашага горада заўсёды славілася садамі і пародным быдлам. Першыя на Беларусі плугі з'явіліся ў сялян — тут. І яшчэ — вытворчасць дроту, цвікоў, шкур. І ўсё гэта — на крутых і звілістых берагах, на шматлікіх «бітых дарогах», дужа старажытных (князь Расціслаў ішоў праз Оршу на Друцк — някепскай дарогай — яшчэ ў 1127 годзе). Пазней сталі мы параходным краем (пала параходства, а шкада!), а яшчэ пасля — краем чыгуначным.

Любілі мураваць, калі паўсюль панавала дрэва. Звалі наш горад:

«Рша Камен…»

Яшчэ ў глыбокай старажытнасці.




*Жаночы манастыр. Пачатак XX ст.*

сярэднімі вякамі ( у Куцейне была адна з першых друкарань) — дае роднаму краю, з сябе і навакольных вёсак, пісьменнікаў і паэтаў.

Горад-працаўнік, горад-паэт, горад-воін, горад-вучоны…»

Хіба скажаш лепей?!

…У пярэдадзень Караткевічавага юбілею — здаецца, у 2000-м, улетку — разам з журналістамі «Звязды» Яўгенам Пясецкім і Алёнай Ляўковіч вандруем па караткевічаўскіх мясцінах. Была такая задумка — знайсці крыніцы яго творчасці ў Оршы, Рагачове, Гародні, пахадзіць і ім выхаджанымі сцежкамі, пашукаць і ім заўважаныя адрасы агульнай гістарычнай памяці. Не ўсё з задуманага і не заўсёды атрымлівалася. Але першыя крокі былі зроблены. І ў Оршы прыйшлі на бацькоўскую сядзібу пісьменніка. Пасядзелі ў тым садзе, дзе некалі шмат хто і яблыкі спытаў, і самога Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча слухаў. Пляменніца пісьменніка Раіса Валер’еўна Барабаш прызвычаілася да такіх нечаканак. З намі яшчэ — мясцовая музейшчыца. Неяк лёгка адразу клеіцца размова, а яблыкі, якімі частуе Раіса Валер’еўна, здаюцца самымі смачнымі ў свеце, нагадваюць нейкія незвычайныя сімвалы беларускай талерантнасці і спагады. Смак садавіны, пах з агародных градак, чысцюткае (паблізу ж — рака, якая неаднойчы апета Караткевічам!) паветра — усё разам стварае атмасферу прыязнага лекавання беларускасцю. Не штучна-кніжнай, не мемарыялізаванай, а сапраўднай, здольнай і духу твайму трываласці надаць.

Пра гэтую хату — наступныя вершаваныя радкі Уладзіміра Караткевіча:

У горадзе без тралейбусаў,
Над імклівай нямоўчнай ракой,
На вуліцы Касманаўтаў —
хата маці маёй.
На вуліцы Касманаўтаў, дзе
ўлетку бубняць чмялі,
На самай мне любай вуліцы,
з усіх, што ёсць на зямлі…

Цяпер вуліца носіць імя Уладзіміра Караткевіча.

І такія ж каменныя засталіся мы цяпер. Толькі ўжо не смалу і шкіпінар дае Орша, а швейныя машыны, ільняныя тканіны, катлы і процьму ўсяго іншага, аб чым у кароткім слове не раскажаш.

Усе, хто еў вэнджаную рыбу са славутай аршанскай «курніцы», гуляў у «піва» на валах «замка Боны» ці на разбураных мурах езуіцкага калегіума, — усе тыя згодзяцца, што адзначае нас, карэнных аршанцаў, асобая аршанская рошчына. Яна ў незалежнасці, працавітасці, своеасобнасці меркаванняў.

Падтрымлівалі мы крамольнага князя Усяслава (быў гэта 1067 год, год першага ўпамінання аб горадзе). Прыйшоў на гэтую зямлю з рабункамі Васіль Трэці — і яму здолелі даць па шыі аршанскія людзі. Спатрэбілася віцяблянам забіць ката Кунцэвіча — яны паклікалі на дапамогу нас, бо ведалі мужнасць нашу і вернасць.

Ніколі не любілі аршанцы тыранаў. Не хапала сілы — замыкаліся ў сабе. Хапала — давалі свету тых мужыкоў, што пабілі напалеонаўскі ар’ергард.

У грамадзянскую вайну немцы не ўвайшлі ў Оршу. А ў пачатку Вялікай Айчыннай па іхніх нашчадках ударыў тут першы залп «кацюш».

Слаўны мужнасцю яшчэ васемсот гадоў таму назад, горад мой у мінулую вайну пасылае на вялікую бітву Заслонава і насыпае пасля Курган неўміручасці над сваімі сынамі.

Мураваны стагоддзямі, росціць ён сёння, як грыбы, рады новых будынкаў.

Пісьменны і абазнаны ў культуры яшчэ




*Пошта. Пачатак XX ст.*

Яшчэ ў 1984 годзе ў Оршы ў СШ № 3 быў заснаваны музей Караткевіча. Пазней адкрыецца і агульнагарадскі, дзяржаўны… Але колькі слоў — пра тую грамадскую скарбніцу. Зусім не выпадкова музей заснаваны менавіта ў трэцяй школе. Тут Валодзя Караткевіч вучыўся. Ініцыятарам стварэння музея, яго душой і сэрцам сталася настаўніца рускай мовы і літаратуры Лілія Дзмітрыеўна Радомская. Калі адкрывалася экспазіцыя, прысвечаная пісьменніку, выступіла аднакласніца Уладзіміра Караткевіча Нэля Галубовіч-Казак. І вось што яна сказала: «Валодзя выдзяляўся сярод нас энцыклапедычнасцю ведаў. Гэта быў не сасуд, напоўнены ведамі, а палаючы факел… Чытаў нам шмат вершаў, суладных яго настрою. Чытаў артыстычна… Слухалі мы і яго ўласныя вершы… асабліва захапляліся жартоўнымі пра школьнае жыццё. Цудоўна пісаў і бурымэ — вершы, што складаліся на зададзеныя рыфмы. Яму мы давалі самыя неверагодныя злучэнні слоў. А праз хуткі час пачынаючы паэт выдаваў гатовы верш. Акрамя таго, у Валодзі былі добрае пачуццё гумару і дар мастака-карыкатурыста… Кацярына Іванаўна Грынкевіч, настаўніца рускай мовы, задала нам дадому напісаць п’есу, каб яе можна было паставіць на школьнай сцэне. Лепшую п’есу напісаў Караткевіч…»

Многія памяткі ў Оршы Караткевіча прадаўжаюць ўзнікаць і зараз. Кожны юбілей вялікага сына зямлі беларускай — нагода для прыезду ў горад на Дняпры вядомых пісьменнікаў, мастакоў, для наладжвання выстаў і пленэраў. Тым больш, што ў Оршы працуе цэлы музейны комплекс — музей гісторыі і культуры горада, музей Канстанціна Заслонава, этнаграфічны музей «Млыны», музей драўлянай скульптуры народнага майстра С. Шаўрова, згаданы ўжо музей Караткевіча… Мо з часам з’явіцца і такі — «Аршанцы ў свеце»? А чаму б і не? Хіба ж не праз лёсы землякоў свет адкрывае гісторыю кожнага з паселішчаў? Згадаем імёны хаця б некаторых слаўных сыноў і дачок. З недалёкай ад Оршы Копысі — военачальнік, літаратар, ваенны тапограф, падарожнік і перакладчык твораў Міцкевіча на рускую мову Міхаіл Урончанка. У рабочым пасёлку Барань нарадзіўся байкапісец Уладзімір Корбан. З вёскі Зубрэвічы — паэт і празаік, а таксама выдатны нарысіст, перакладчык Янка Сіпакоў. Аб сваіх земляках, руплівых радавых працаўніках — яго нарыс «Даверлівая зямля». Рэдка зараз згадваецца імя маскоўскай пісьменніцы Фрыды Вігдаравай, якая нарадзілася ў Оршы. А між тым менавіта з яе сумленнасцю як літаратара і як па-грамадзянску актыўнага чалавека звязаны многія падзеі ў рускай літаратуры 1950—1960-х гадоў. Аляксандр Міронаў — пісьменнік, чые кнігі пабачылі свет у Мінску, Маскве, Архангельску, Іркуцку, матрос легендарнага «Чалюскіна»… Ды і шмат каго яшчэ можна было б назваць. Вучоныя, пісьменнікі, мастакі. Яны множылі і множаць славу Оршы, Аршанскага краю. Але ж і ўзлёт такі, гэтулькі яркіх імёнаў — такое магчыма толькі ў багатай на гістарычныя падзеі старонцы. Так што, спяшайцеся выправіцца ў вандроўку да Оршы, да яе ваколіц.

***Мікола МІРШЧЫНА***




# СКРЫЖАЛІ МРОЯЎ ЗАЛАТЫХ...

**У**сё выказана і вымаўлена ў гэтым сусвеце — за столькі стагоддзяў, за столькі боляў, за столькі лёсаў… Але хто так моцна патрабуе і кліча зрабіць гэта? Слова? Пачуццё? Праўда? Але чаму такая безліч аркушаў паперы бялее і прыцягвае так многіх з нас? І чаму выдаюцца новыя кнігі, вабна пахнучы друкарскаю фарбаю, бо нарадзіліся толькі што?.. Чаму гэтыя кнігі стаюцца матэрыялізаваным сімваламі ці знакам душы — абстрактнай, нябачнай, чужой... і такой роднай і блізкай — да краю, да болю?.. Ды якім жа тады болем, новым і неадступным, пішуцца — дыхаюць — гэтыя кнігі, што бяруць у свой горка-высокі і шчаслівы палон?..

Стаць каханай і не стаць паэтам… Не стаць каханай і стаць паэтам… Чый гэта выбар, зроблены за нас, у дзень нашага з'яўлення? Ці, можа, нават да нашага дня? І ўсё ж — стаць каханай ці стаць паэтам? Не аспрэчвайце, не карэкціруйце! Ніколі паміж гэтымі двума фатальнымі вызначэннямі не пастаўлю я не тое што знак роўнасці, але нават злучнік. Не бывае, каб крыху таго і таго. Не дадзена. А калі камусьці і дадзена, то толькі — не паэтам… Каханнем не пішуцца вершы… Каханнем пішуцца вершы — нязбытным, балючым, далёкім — як нябесная зорка ўначы…

Сышліся у адно: любоў і смерць.
Тугі вузёл маёй нялёгкай долі.
Даўно ўжо не знаходжу я спатолі
у тым, у чым магла б спатолю мець…

— напіша паэтка.

«Пакутаю напоўнена душа»… Уся кніга Хрысціны Лялько «На далонях любові» (Мн., «Канфіда», 2006) выбудавана на гэтай няўтольнай глыбіні, уся кніга народжана гэтай пакутай… І ўсё ж так многа ў сабе змяшчае душа: і светлыя хвіліны нядзельнай імшы, і немагчымасць адрачэння «ад Беларусі гэтай беднай», і маміны вочы, што падаліся «страчанымі пралескамі маленства сярод настылай яшчэ зямлі»… І тут жа — немагчымасць самаадрачэння, пакутлівы сон вачэй. Пакута, адцененая святлом душы паэткі. Пакута, пераможаная мужнасцю душы паэткі. Як, напрыклад, у вершы «Формула».

Даследчыкі творчасці Х. Лялько адзначаюць яе раннюю мудрасць і разважлівасць. Так, Галіна Тычка ў артыкуле «Непарушны закон існасці. Штрыхі да партрэта Хрысціны Лялько» («Роднае слова», 2006, № 3) піша: «Засяроджаная, разважлівая і мудрая, высвятляецца, была яна ўжо і тады — у маладосці». Сапраўды, у шаснаццаць гадоў адчуць, што «гарчыць рабінавае ранне», і не толькі адчуць, а асэнсаваць, усвядоміць і асацыіраваць яго з чыімсьці блізкім расстаннем… У гэтым юным узросце можна было б і не заўважыць гэтае рабінавае ранне... Аднак жа, як піша сама паэтка, «...і тчэцца павуцінкай кволай мая туга над полем голым». Помню сонечны вясновы дзень — у скверыку каля Чырвонаармейскай, непадалёку ад філалагічнага факультэта БДУ... Мы — чародка дзяўчат чацвёртакурсніц... Хрысціна на лістку ў шырокую лінейку са свайго нататніка запісвае верш тры страфы — і працягвае яго (верш-ліст) — мне. З тлумачэннем свайго дзеяння: пакольк і я таксама пішу вершы. Той лісток я захоўвала да нядаўняга часу. Гадоў пяць-шэсць назад, калі якраз працавала ў музеі Максіма Багдановіча, аддала яго ў фонды. Дакладна помню трэцюю страфу верша:

Ноч фіраніць тваё акно.
Гулкія ночы крокі.
Чуеш, каханне ад нас пайшло...
Не чуеш. Сон твой глыбокі...

(Знакі прыпынку
пастаўлены адвольна — ***А. Н.***)

Той далёкі студэнцкі верш здзіўляе сваёй глыбінёй і стрыманасцю, уменнем скупымі мастацкімі сродкамі перадаць глыбіню імгнення-пачуцця. Але ўжо ў ім акрэслены тыя галоўныя асаблівасці, што будуць уласцівы ўсёй паэзіі Х. Лялько. Менавіта глыбіня і драматызм, стрыманасць мастацкіх вобразаў, падчас нават на мяжы з іх адсутнасцю, вызначаюць вершы кнігі «На далонях любові».

Вобразнасць у іх хутчэй не знешняя, а схаваная — унутраная, што вядзе ўглыб свядомасці і сумлення:

О, немата забітае глушы…
Якая сіла верне нас да веры,
каб уваскрос не толькі на паперы
радзінны сад знявечанай душы?

*(«Паўстане сад...»)*

У паэта слова — як выратаванне... Ад непамернасці болю, ад няспраўджанасці лёсу... Разуменне таго, што «Мне словам не абняць тугі, якая поўніць сэрца болем...» прыходзіць намнога пазней... «Так блізка нашы берагі, — ды не сысціся ім ніколі...» — якая бездапаможнасць слова перад непазбежнасцю самоты! Самоты, што не мае межаў у імкненні да сваёй бясконцасці. Самоты, якая вырастае ў цэлую планету («Душы мае самотная планета...»), а пасля становіцца сусветам...

Праз дрэвы праглядвае неба,
ракою плывуць аблокі...
як мала для шчасця трэба —
не быць на зямлі адзінокім...

— пакутны чалавечы роздум... Вечны, як і сам чалавек. «Як многа для шчасця трэба...» — і далей толькі шматкроп'е. Паэтка выбірае маўчанне. Непадуладнасць слову гэтага загадкава-прыцягальнага і так неабходнага чалавеку стану... Незалежнага ад самога чалавека... І такога імгненнага... «Шчасце — гэта імгненне...» — хіба можна абвергнуць Івана Тургенева? Але ўласны — прыватны — боль для лірычнай гераіні паэзіі Х. Лялько не самая вяршыня.

Было цяпло, а выпаліў мароз:
У маі светлым — рэдкая праява.
Не трэба суму і не трэба слёз,
На слёзы сёння я не маю права.
Не маю права. Мой прыватны боль,
што значыць ён, калі баліць Айчына?

— напіша паэтка ў вершы «Просьба». Боль Айчыны засланяе прыватны боль. Боль Айчыны перамагае прыватны боль. Боль Айчыны больш вечны — vita brevis, patria eterna, чым боль аднаго — нават уласнага — жыцця.

…Еду дадому — два дні таму маме споўнілася восемдзесят, і, як асабістую радасць, вязу з сабой Хрысціціну кнігу. І ўсё ж сваёй маме спачатку чытаю вершы пра прыватны боль... Раптам спыняюся...

— Мама, гэта табе падабаецца?

— Падабаецца.

— А баліць?

— Баліць.

— Тады ўсё добра...

Трэба, каб балела. Боль адной душы, судакранаючыся з болем другой, дае святло. Дае радасць і высокую асэнсаванасць чалавечага жыцця. Паэтавага жыцця... Ад імя таленту. Не прошанага, не купленага — наканаванага. Ад таленту — як знаку абранасці Божай. Як знаку пакутнасці Божай. Верш і ёсць паэтаў крыж, а паэзія — вечная Галгофа. Але Бог сваім Крыжам-абсалютам, сваім Крыжам-збаўленнем змяншае паэтаў крыж, бо інакш, як жа можна было б выжыць?..

На скрыжалях лёсу — у гатычным Гданьску і пад дажджом Перуджы, на «безнадзейна калючых вятрах» і ўкленчанаю ў касцёле, на старым Віленскім шляху і ў спавітым нематой радзінным садзе лірычная гераіня нясе сябе годна і велічна, натуральна і шчыра, проста і адкрыта — да самай глыбіні свайго светлага і высокага болю. Яна — не, не дэманструе чысціню і вышыню сваіх пачуццяў, яна проста — дыхае імі, проста — жыве імі, яна — проста сама з'яўляецца ўвасабленнем гэтай чысціні і вышыні. «А лёс нялёгкі, як дарога»... Але ад яго адыходзіць святло, промні якога падаюць і на нас... Калі б я хоць крыху валодала музыкай, я б напісала два цудоўныя рамансы — «А скрыпка ведала пра ўсё...» і «Успамін». Яны дыхаюць музыкай. Як дыхае балюча-прыцішанай светла-пакорнай цютчаўскай мелодыяй верш «Шапэн...»:

Вось так адчужана, знябыта
пакутна, ціха і забыта
згасае промень пачуцця.
І ўжо наўрад ці ўваскрэсне
для слова, музыкі і песні.
Для хвалявання і жыцця.

Ад гэтых радкоў, як і ад многіх іншых, вее першатворнай некранутай чысцінёй. «Умееш слухаць. Лечыш раны мае душы збалелай, — прызнаецца паэтка. — Не дакранаешся да іх рукамі.» Да яе вершаў-ранаў не хочацца дакранацца словам, сваім нейкім разуменнем, адчуваннем. Гэта, як: выпаў снег — а ступаць боязна... Няма ўнутранага дазволу на разбурэнне гэтай Боскай прыгажосці... Але спачатку, калі чытала кнігу «На далонях любові», да вершаў дакраналася слязамі. А потым прыйшлі радасць і спакой. Гэты стан застаецца. Не пакідае мяне ўжо другі тыдзень. Магчыма, ён падтрымліваецца — ствараецца — сілай духу лірычнай гераіні — самой паэткі... Магчыма, Хрысцініны вершы па сваім дзеянні — уздзеянні — падобныя да той ракавінкі, прывезенай з Мартынікі, што ў аднайменным вершы ксяндза Яна Соханя:

Ракавінка, прывезеная
з Мартынікі, спявае.
Яе голас, дыханне, цяпло

сну абдымаюць
усё навокал;
а я прабіваюся
туды, дзе яна плача (...)
(...) дзе нарастае боль,
які ацаляе назаўсёды.

Здаецца, менавіта гэты аўтар з другога раздзела кнігі «Чытаю Тваё неба» найбліжэй самой паэтцы сваім светаадчуваннем, сваёй вытанчанай вобразнасцю. Так, верш «Крыніцы» яшчэ раз фіксуе хвіліннасць шчасця і расстайнасць дарог — «Ёсць толькі дарогі расстанняў». А сама кніга «На далонях любові», хіба гэта не дарога расстанняў?.. Кніга любові — кніга расстанняў...

Усе пераклады і парастварэнні другога раздзела вылучаюцца глыбокай тэалагічнай думкай і мастацка-вобразнай разнастайнасцю. Вядома, імёны аўтараў гавораць самі за сябе — Караль Вайтыла, Чэслаў Мілаш, ксёндз Ян Твардоўскі… Але трэба прызнаць і майстэрства перакладчыка — Хрысціны Лялько, а таксама яе высокую патрабавальнасць у падыходзе да выбару твораў, таму што кожны з іх унікальны і значны. Незалежна ад таго, ці гэта будуць чатыры афарыстычныя радкі Эвы Скаржыньскай («Духоўнае чытанне») ці сціслы тэалагічны трактат Тадэвуша Ружэвіча. «Без Езуса наша малая зямля не мае значэння» — сцвярджае апошні ў вершы «Дастаеўскі казаў...»

гэты Чалавек
Сын Божы
калі памёр
уваскрасае
на досвітку кожнага дня
у кожным
хто Яго наследуе.

Працытаваныя радкі Т. Ружэвіча могуць служыць галоўнай тэзай другога раздзела кнігі. Але хіба найбольшая тэалагічная глыбіня віруе ў вершах ксяндза Яна Твардоўскага! Ад яе займае дух, яна палохае і прыцягвае адначасна. «Вера — гэта змаганне за веру, — сцвярджае ён, — так як любоў змагаецца за любоў» («Выйсці ў дарогу»). Таму ён і просіць: «Не пасыпайце цукрам рэлігіі», таму ён і не прыходзіць да яе «па суцяшэнне як па цёплы булёнчык», а двума строгімі сурова-вобразнымі радкамі вызначае сутнасць рэлігіі:

хацеў я нарэшце абаперці сваю галаву
аб глухі камень веры

*(«Просьба»).*

Яго вершы — гэта глыбокі роздум, глыбокае спасціжэнне, можна сказаць — святое спасціжэннне нараджэння Божага, і жыцця, і ўваскрашэнння: «Езус, аднак, нагадвае ўсім, што тужаць па Ім: блізкі Яму той, хто жыве духам ахвяры» і інш. Ксёндз Ян Твардоўскі дзеліцца з чытачамі сваімі таямніцамі. Непасрэдна і змірэнна гаворыць ён у вершы «Я не прыйшоў Вас навяртаць...», што вылецелі ў яго з галавы «ўсе мудрыя казанні», што ён страціў красамоўства, і яшчэ доўга пералічвае, чаго ён не будзе рабіць, каб раптам прызнацца чыста па-евангельску:

проста сяду каля Вас
і адкрыю свой маленькі сакрэт
што я, ксёндз,
веру Пану Богу як дзіця

Без гэтых яго «маленькіх сакрэтаў» — вялікіх спасціжэнняў — свет быў бы намнога бяднейшым...

А я ў каторы раз знаходжу і перачытваю, то асобныя радкі («Падабаецца апошнім часам нязбытнасць — прымаецца як непазбежнасць»), то цэлыя вершы:

Навошта думаць пра цябе,
калі ўжо промні на адкосе,
калі прадвызначанасць лёсу
не паддаецца варажбе?..

Нязбытнасць — непазбежнасць — прадвызначанасць... Цяжкія, як кроплі дажджу, словы... Лёгкія, як слёзы ачышчэння... І толькі, калі спасцігаеш іх глыбіню, яны становяцца маўчаннем — высокім, нябесным... «Мне словам не абняць тугі...» І ўсё ж, Хрысціна, сведчу: абняла. Абняла ўладна і моцна. Толькі ў сапраўдных паэтаў боль, туга становяцца спадручным матэрыялам — як воск, як гліна, — з якога лепяць шэдэўры. І так яскрава абазначыўся гэты вялікі трохкутнік: Вера, Айчына, Каханне... Ты скажаш: «А мама?»... — А мама — аснова гэтых лёсавызначальных момантаў (момантаў — што ўровень з вечнасцю) чалавечага — паэтавага — жыцця.

***Ала НІКІПОРЧЫК***

# ЭКСПРЭС «БЯРЭСЦЕ — БРЭСТ»




Ці многа ведаем мы пра Брэст, акрамя як з дзяцінства замацаваных у памяці гераічнай абароны крэпасці і вядомага штампу наконт «акна ў Еўропу»? У большасці сваёй, вельмі мала. І толькі ў наш час, час стабільнасці і паступальнага развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці, калі ў многіх беларусаў усё больш актыўна прачынаецца цікавасць да сваёй гісторыі, да сваіх вытокаў, пачынае з'яўляцца новая краязнаўчая літаратура, адрасаваная шырокаму колу чытачоў.

Тым, хто шчыра цікавіцца беларускай мінуўшчынай, варта звярнуць увагу на нядаўна выдадзеную кнігу брэсцкага журналіста Васіля Сарычава «У пошуках страчанага часу»*. Ці сталі гэтыя пошукі паспяховымі, вырашаць вам, чытачы. А пакуль праімчымся на гістарычным экспрэсе, за штурвал якога рашуча ўзяўся спадар Сарычаў.

***Пасадачная станцыя — «Бярэсце».*** Сучасны Брэст... Вельмі стары і, адначасова, ледзь не самы малады ў Беларусі. Гораду, па вуліцах якога сёння мы можам прайсціся, значыцца каля ста васьмідзесяці гадоў.

Як жа так, скажа дасведчаны чытач, мінула ўжо 987 год з першага ўзгадвання Бярэсця ў летапісах. Але ў тым і справа, што ад таго старажытнага ўсходнеславянскага паселішча, культурнага, прамысловага і гандлёвага цэнтра засталіся ледзь бачныя руіны на тэрыторыі сучаснай Брэсцкай крэпасці. Захавалася толькі назва горада, дый тая зменена.

Калі хто пажадае адчуць атмасферу старажытнага Бярэсця, уявіць панараму старасвецкіх будынкаў, касцёлаў і цэркваў, камяніц палацаў, акружаных каналамі і непрыступнымі ўмацаваннямі, няхай звернецца да першай часткі «Пошукаў» пад сімвалічнай назвай «Горад, які мы згубілі». А згубілі мы тое няўлоўнае і непаўторнае зачараванне, уласцівае старым мясцінам.

Трагедыя Бярэсця унікальная ў сваёй жахлівасці, якая ў значнай ступені сімвалізуе гістарычны лёс тых земляў, што складаюць сёння Беларусь, лёс іх насельнікаў.

Старадаўняе Бярэсце знікла назаўсёды з карты і з зямлі продкаў не ў выніку прыроднага катаклізму, не ў выніку грому і маланкі, пасланых Панам Богам за грахі мяшчан. Яно не было пакінута насельніцтвам, як гістарычны Менск, пасля знішчальнага паходу ворагаў.

Горад, які стваралі сваёй працай многія пакаленні жыхароў, які заўсёдыаднаўляўся пасля набегаў ворагаў з Захаду і Усходу, Поўначы і Поўдня, быў назаўсёды зраўнаваны з зямлёю, як сёння сказалі б, па разліках геапалітычнай мэтазгоднасці, па высачайшай волі гасудара імператара Мікалая І. Адбылося гэта ў 1830—1842 гадах.

Менавіта тады на месцы горада, гэтай прыбугскай Венецыі, была збудавана Брэсцкая крэпасць. Крэпасць, якая на тыя часы фактычна не мела ваеннага прызначэння, умацаванне, якому, па іроніі лёсу, толькі аднойчы прыйшлося паўдзельнічаць у баявых падзеях, пасля якіх яна была практычна зруйнавана.

Мяшчан з усім нажытым скарбам улады прымусілі перабрацца прыкладна на тры кіламетры на ўсход і збудаваць на балоце па правым беразе Мухаўца новы горад — Брэст-Літоўск.

Дарэчы, ёсць яшчэ адзін горад, які яшчэ раней ступіў на шлях Бярэсця — ў 1807—

---

* Сарычев Василий. В поисках утраченного времени. — ОАО «Брестская типография», 2006.

1836 гадах. Гэта старажытнае беларускае месца Бабруйск.

Першая палова пазамінулага стагоддзя ўвогуле была не спрыяльнай для нашага краю. Імгла расхінула свае крылы і загнала ў цень прасторы між Бугам і Дзвіною, Сожам і Нёманам.

Пад крылом расійскага царызму ішоў гвалтоўны злом усяго ладу грамадскага жыцця, які будаваўся і выкрышталізоўваўся стагоддзямі. Вынішчэнне спадчыны Рэчы Паспалітай, як негатыўнай, так і прагрэсіўнай, вельмі супярэчнай, але ж значна вальнейшай за расійскія парадкі, перайшло ў гранічна жорсткія формы. Гэтыя формы ва ўсе часы больш за ўсё былі знішчальныя для самой Расіі, і менавіта яны з часам падтачылі фундамент імперыі. Ці трэба казаць, што яны неслі яе суседзям і, асабліва, прыняволеным народам-«інародцам».

Палітычныя фантазіі цара Мікалая не ведалі межаў, і прынеслі шмат бяды не толькі беларусам. Так, у актыве «жандара Еўропы» задушэнне польскага руху (у якім удзельнічалі і беларусы), пагром венгерскага паўстання.

Асаблівасцю гэтага імператара і падабраных на яго капыл набліжаных стала імкненне панаваць ва ўсіх сферах і ствараць з падданых велікарускіх «клонаў» адным вельмі немудрагелістым метадам — гвалтам.

На Беларусі масава знішчаліся і перарабляліся дзесяткі культавых пабудоў, сярод якіх былі сапраўдныя шэдэўры. У 1832 годзе пракацілася хваля масавых перабудоў касцёлаў на цэрквы. У 1831 годзе на Берасцейшчыне зачынены Бярозаўскі кляштар картэзіянцаў (разабраны потым на цэглу для казармаў). 1839 год — Жыровіцкі кляштар базыльян стаў буйным праваслаўным цэнтрам. 1840 год — Заслаўскі касцёл стаў Спаса-Праабражэнскай царквой. Яшчэ раней, у 1804—1807 гадах, перабудаваны пад праваслаўны сабор у псеўдарускім стылі Гарадзенскі фарны касцёл, або Фара Вітаўта. 1830 год — зачынены Полацкі езуіцкі калегіум. Па асабістым загадзе Мікалая I разбурана Мінская ратуша, адноўленая толькі некалькі гадоў таму.

Увогуле, такая палітыка ўласціва ўсім імперыям. Кожная з іх імкнулася руйнаваць усё, што хоць нейкім чынам магло нагадаць заваяваным народам іх незалежнае мінулае. Духоўную, матэрыяльную культуру, лепшых прадстаўнікоў нацыі нішчылі македонцы і рымляне, кітайцы і арабы, асманы і германцы, англічане і амерыканцы...

***Наступны прыпынак***, які прапануе нам аўтар, — ***«Брэст-Літоўск»***.

Мінуць гэты прыпынак зусім незаўважаным нельга — як-ніяк 120 гадоў гісторыі, хаця ў нашага рулявога ён і самы кароткі. Дый падзей, значных для Брэста, у гэты час амаль не было. Да 1870 года горад знаходзіўся пад неабмежаванай уладай людзей у пагонах. Гэта таксама дыктавалася наяўнасцю крэпасці.

Як піша В.Сарычаў, у Брэсце не было гарадской Думы, нельга было ўзводзіць дамы вышэй, чым у два паверхі, любая пабудова магла з'явіцца толькі з дазволу ваенных інжынераў і разбурана па іх загадзе. Горад быў больш падобны да ваеннага лагера, чым да месца для жыцця. Толькі ў апошнюю трэць XIX стагоддзя Брэст крыху ачуняў, пачаў разбудоўвацца, ператварацца ў прыгожы, заможны горад.

Прыпыніла гэтае развіццё Першая сусветная вайна.

Сапраўды містычным успрымаецца той факт, што загад на паўторнае знішчэнне Брэста зноў аддаў самадзержац Мікалай, толькі ўжо II. Царская ўлада фактычна зноў пацвердзіла сваімі дзеяннямі той факт, што Брэст і яго жыхары так і не сталі для Расійскай імперыі сваімі. Бо так бязлітасна абыходзяцца толькі з чужынцамі.

Даўно ўжо непрыдатная, зыходзячы з патрабаванняў ужо нават тагачаснай ваеннай тактыкі і стратэгіі, крэпасць была паспешліва пакінута расійскімі «палкаводцамі» і па меры магчымасці ўзарваная. Пасля рэйду царскіх сапёраў і казакаў засталося разбуранымі дзве трэці дамоў і ўся прамысловасць горада. Ваяваць з будынкамі і ўласным грамадзянскім насельніцтвам аказалася значна лягчэй, чым стрымаць нямецкі наступ. Дымам папялішчаў сустракаў германцаў і аўстрыйцаў у чарговы раз зруйнаваны Брэст-Літоўск, мёртвы горад без насельніцтва, гвалтоўна эвакуіраванага ў цэнтральныя раёны Расіі.

Праз тры з паловаю гады германскай акупацыі, пасля заключэння Брэсцкага міру і паражэння кайзераўскіх войскаў, брастаўчане даведаліся, што зноў змянілі гаспадароў. А мы, чытачы-пасажыры, у сваю чаргу рыхтуемся да прыбыцця на станцыю, дзе наш экспрэс прастаіць не адну гадзіну, — ***«Брэст над Бугам»***.

У пачатку 1919 года ў горадзе з'явіліся польскія войскі. Здаецца, пачала здзяйсняцца вялікая мара палякаў пра адраджэнне дзяржавы «ад мора да мора». Армія Пілсудскага дайшла да Дняпра, акупіравала Кіеў. Але саманадзейныя польскія «жаўнеры» пад напорам чырвонаармейцаў вельмі

хутка адкаціліся ажно да Варшавы, потым, дзякуючы памылкам савецкіх камандзіраў, зноў прасунуліся да цэнтральнай Беларусі. Гэтыя знішчальныя хвалі ў чарговы раз зрабілі наш край разменнай манетай у высокай палітычнай гульні, у выніку якой Брэст, як і ўся Заходняя Беларусь, амаль на дваццаць гадоў апынуўся пад польскай уладай.

Менавіта гэтаму часу ў асноўным і прысвечана кніга Васіля Сарычава.

Палякі прынялі Брэст у руінах. За сем пасляваенных гадоў удалося адбудаваць трохі больш за пятую яго частку, хаця насельніцтва масава вярталася на радзіму. Кіравалі горадам вядомыя і паважаныя ў Брэсце людзі, прозвішчы і фотаздымкі якіх не аднойчы сустракаем на старонках «Пошукаў».

Увогуле кніга надзвычай багатая на старыя фотаздымкі, па ўсім відаць, з сямейных архіваў. На іх мы бачым прыгожых, годных мужчын і жанчын, і можам рабіць нейкія высновы пра іх жыццё, побыт. Ілюстрацыі выдатна даносяць да нас, як зараз модна казаць, ауру Брэста дваццатых гадоў.

Мы бачым ваенныя парады, на якія, трапна заўважае спадар Сарычаў, нікога прымусам не выганялі; рускую гімназію з яе вучнямі, дзе ўдалося захаваць уласцівую дарэвалюцыйнай рускай культуры інтэлігентнасць і бліскучую класічную адукацыю; польскія гімназіі і школы з высокім нават на наш час узроўнем адукацыі; маршы і спартыўныя святы, што праводзілі «сокалы» і «саколкі», сябры адной з самых моцных у тыя часы маладзёжных славянскіх арганізацый; шэсці і канцэрты гарадскіх духавых аркестраў і хораў.

За ўсім гэтым стаяць жывыя людзі, брастаўчане, — беларусы і палякі, рускія і ўкраінцы, людзі, якія яшчэ не ведаюць, што рыхтуе ім бязлітасны лёс усяго праз некалькі гадоў. Яны кахалі і жаніліся, нараджалі і гадавалі дзяцей, радаваліся жыццю і пераадольвалі цяжкасці, яны тварылі, працавалі і будавалі свой родны горад. Колькі з іх прайшло засценкі НКУС і сібірскія лагеры, колькі загінула і было скалечана падчас гітлераўскай навалы!..

Немагчыма абмінуць увагай цудоўны фотаздымак элегантнай пары — Надзеі і Леаніда Чарвінскіх; а таксама таямнічую ўсмешку адной з лепшых польскіх актрыс, паэтэсы, пісьменніцы, жанчыны неверагоднай прыгажосці Ніны Андрыч; гранічна сканцэнтраванага першага беларуса-алімпійца Міколы Дранько. Нельга не зацікавіцца іх гісторыямі, простымі і ў той жа час такімі ж складанымі, як само жыццё.

Брэст заўсёды быў адным з буйных яўрэйскіх цэнтраў Вялікага княства Літоўскага, а потым Расійскай імперыі.

Яшчэ Вялікі князь Вітаўт у 1388 годзе выдаў брэсцкім яўрэям прывілей, які пазней распаўсюдзіўся на ўсю дзяржаву і забяспечыў ім шырокую аўтаномію ў княстве. Гэта рабіла беларускія гарады моцнымі гандлёвымі і прамысловымі цэнтрамі.

Не ўсё так проста складвалася потым у жыцці беларускіх яўрэяў, але гэта нешматлікая, але магутная нацыя заўсёды адраджалася, хутка вяртала свае ўплывы. Не справіліся з імі ні хрысціянскія дагматыкі-экстрэмісты Рэчы Паспалітай, ні расійская дзяржаўная палітыка русіфікацыі і ахрышчвання, загнання ў гарады ў «мяжы аселасці», масавых пагромаў.

І дагэтуль старажытная Брэсцкая сінагога, ператвораная народнай уладай у кінатэатр, праяўляе свой містычны характар. Непаўторныя, нават экзатычныя для нашай краіны, яўрэйскія абрады і звычаі, што захоўваліся тысячагоддзямі, рэдка ўдавалася занатаваць і тым больш сфатаграфаваць. Але аўтару ўдалося недзе знайсці здымак яўрэйскага вяселля.

Брэстчына, як піша Васіль Сарычаў, стала своеасаблівай кадравай кузняй першых асоб дзяржавы Ізраіль. Першы прэзідэнт Хаім Вейцман нарадзіўся ў мястэчку Моталь, прэм'ер-міністр Голда Меір — у Пінску, прэм'ер Іцхак Шамір —на Пружаншчыне, прэм'ер Менахем Бегін — у Брэсце. Апошні, дарэчы, адзіны ўраджэнец горада, хто стаў Нобелеўскім лаўрэатам.

«Пошукам» Васіля Сарычава ўласцівы як быццам незаўважны, але моцны псіхалагізм. Аўтар праявіў сябе як майстар дэталі, які ўмее пачуць чалавека і правільна запісаць яго аповед. Вянок нарысаў сплецены настолькі натхнёна, што пры пэўнай фантазіі вы пераносіцеся ў той Брэст, ступаеце па яго вуліцах, вітаецеся з людзьмі, пра якіх чытаеце.

Цікавая кніга і тым, што выдадзена яна грамадою, талакой, па старым беларускім звычаі. Сярод сяброў кнігі — самыя выдатныя прадпрымальнікі Брэста. Гэта лепшы прыклад таго, што насуперак агульнапрынятай думцы наш айчынны бізнес не застаецца ў баку і падтрымлівае нацыянальную літаратуру.

Спадар Сарычаў вызначыў гэтае выданне «У пошуках страчанага часу», як кнігу першую... Шчыра спадзяёмся, што наша сумеснае гістарычнае падарожжа прадоўжыцца. Наперад, у мінулае.

***Андрэй МАЛАХОЎСКІ***




**АНАТОЛЬ КАЗЛОЎ. Юргон. Мн.: «Мастацкая літаратура», 2006.**

«Беларуская проза XXI стагоддзя» — ужо адна назва серыі сведчыць пра тое, што пісьменнікі, чые творы выдадзены ў ёй, людзі ў літаратуры не выпадковыя. Менавіта па іх творчасці будуць нашчадкі меркаваць пра сучасны літаратурны працэс, і выбар аўтараў, якія «заслужылі» прадстаўляць прозу XXI стагоддзя — справа вельмі нялёгкая і адказная. Анатоль Казлоў — аўтар кніг прозы «Міражы ценяў», «І тады я памёр...», «Незламаная свечка», пісьменнік, які даўно знайшоў сваю адметную «нішу» ў беларускай літаратуры, па творах якога абараняюцца навуковыя працы. Таму выхад яго твораў у такой прэстыжнай серыі цалкам апраўданы.

У новую кнігу пісьменніка ўвайшлі раманы «Юргон» і «Мінск і воран, Парыж і здань», аповесці «Я і Прарок-Уродка», «Раздарожаны саракоўнік» і апавяданні. Прычым з раманам «Мінск і воран, Парыж і здань» чытачы мелі магчымасць пазнаёміцца на старонках часопіса «Маладосць», а раман «Юргон» друкаваўся ў часопісе «Полымя». І гэта вельмі добра, бо творы, перад тым як увайсці ў кніжку, прайшлі апрабацыю ў перыядычным друку.

«Як і ў ранейшых творах, пісьменнік па драбніцах аналізуе ў сваёй прозе сучаснасць, у розных ракурсах разглядае партрэт «героя нашага часу». Мэтанакіравана вывучае прычынна-выніковыя сувязі, якія фарміруюць асобу, уплываюць на яе светапогляд, кіруюць дзеяннямі. Усім творам пісьменніка характэрна міфалагізацыя і містыфікацыя ў спалучэнні з сённяшнім жыццём. Падзеі раманаў бяруць пачатак у старажытнасці, а іх далейшае развіццё адбываецца ў сучаснасці...» — чытаем у анатацыі. Проза Анатоля Казлова — гэта старажытнасць і сучаснасць, рэальнасць і містыка, пошукі і знаходкі... Возьмем, да прыкладу, раман «Юргон». З галоўным героем, маладым чалавекам, які жыве ў наш час, здараецца няшчасце, ён страчвае «мужчынскую сілу». Здаецца, даволі банальная сітуацыя. Але аўтар па-майстэрску «раскручвае» яе, уводзіць вобразы Духа бяссілля Вісуна, ведзьмака-чараўніка Чорнага Гардзея. І ў выніку атрымліваецца глыбокі, псіхалагічна і эмацыянальна насычаны твор, які чытаецца на адным дыханні.

«Труціць лекамі сваё нутро няшчаснае чалавецтва, забыўшыся, што ўсяму асноваю з'яўляецца Слова і тая сіла, якая заключаецца ў ім». Анатоль Казлоў усведамляе гэта, а значыць у яго творчасці заўсёды будуць прыхільнікі.




**ВАСІЛЬ ШУР. Онім у мастацкім тэксце. Мн.: «Беларускі кнігазбор», 2006.**

Онімы (уласныя імёны, прозвічы, мянушкі, тапанімічныя назвы) вельмі часта адыгрываюць у мастацкіх творах даволі важную ролю. Спробы прааналізаваць іх ужыванне ў творчасці асобных пісьменнікаў былі і раней. А вось паслядоўным і сістэмным асэнсаваннем, вызначэннем іх ролі ў літаратуры сур'ёзна амаль не займаліся. Таму з'яўленне працы доктара філалагічных навук, прафесара, загадчыка кафедры беларускага мовазнаўства Мазырскага дзяржаўнага педуніверсітэта Васіля Шура «Онім у мастацкім тэксце» наспявала даўно.

Любое даследаванне — гэта вырашэнне пэўных задач. Пры вывучэнні і аналізе літаратурных онімаў ставіліся наступныя мэты:

«... — выявіць і сістэмна апісаць семантыка-стылістычныя асаблівасці онімаў у мастацкіх творах беларускіх пісьменнікаў;

— устанавіць тыповыя асаблівасці і заканамернасці функцыянавання онімаў у аспекце камунікатыўна-прагматычнай арганізацыі мастацкага тэксту;

— вызначыць ролю узуальных і аказіянальных сродкаў у стварэнні канатацыйных значэнняў літаратурных онімаў;

— выявіць заканамернасці і асаблівасці ў выбары пісьменнікамі кантэкстуальных сродкаў у фармаванні анамастычнай прасторы твора, а таксама семантыкі і стылістычнай канатацыі онімаў;

— апісаць з'явы апелятывацыі, анімізацыі і этымалагізацыі ў анамастычных адзінках мастацкага тэксту;

— выявіць ступень ужывальнасці і адметнасці выкарыстання разнавіднасцей онімаў у мастацкіх творах;

— паказаць спосабы ўвядзення анамастычных адзінак у мастацкі тэкст.»

Кніга складаецца з трох асноўных раздзелаў — «Агульная характарыстыка онімаў у мастацкім тэксце», «Лексіка-семантычная характарыстыка онімаў у творах мастацкай літаратуры», «Онімы як тэкстаўтваральныя і стылёваўтваральныя кампаненты сістэмы мастацка-выяўленчых сродкаў мовы мастацкай літаратуры», — у якіх аўтар на прыкладах з твораў беларускіх пісьменнікаў апісвае і аналізуе ролю і месца онімаў у мастацкіх тэкстах. Прычым дыяпазон пісьменнікаў, да творчасці якіх звяртаецца даследчык даволі шырокі: ад Францішка Багушэвіча да Уладзіміра Ліпскага, Алега Лойкі і інш.

Праца прызначана выкладчыкам і студэнтам-філолагам і, думаецца, выкліча вялікую цікавасць ва ўсіх аматараў прыгожага пісьменства.

*Аляксей ЧАРОТА*